

ТРАДЫЦЫЙНЫ
ЛАД ЖЫЦЦЯ

А. М. Ненадавец, Я. А. Ненадавец

# ЗАКАМЯНЕЛАЯ ПАМЯЦЬ



ТРАДЫЦЫЙНЫ
ЛАД ЖЫЦЦЯ



ТРАДЫЦЫЙНЫ
ЛАД ЖЫЦЦЯ

А. М. Ненадавец, Я. А. Ненадавец

# ЗАКАМЯНЕЛАЯ ПАМЯЦЬ



Мінск
«Беларуская навука»
2023

УДК 398(=161.3)
ББК 82.3(4Беи)
Н51

*Серыя заснавана ў 2014 годзе*

Р э ц э н з е н т ы:

кандыдат гістарычных навук В. М. Бялявіна,
доктар мастацтвазнаўства В. І. Жук

**Ненадавец, А. М.**

Н51 Закамянелая памяць / А. М. Ненадавец, Я. А. Ненадавец. – Мінск : Беларуская навука, 2023. – 239 с. : іл. – (Традыцыйны лад жыцця).

ISBN 978-985-08-2968-9.

У кнізе аналізуюцца ўрыўкі з міфалогіі, вусна-паэтычнай і літаратурнай творчасці беларусаў, у якіх закранаецца значэнне звычайных камянёў, а таксама метэарытаў у жыцці нашых продкаў. Згадваюцца шматлікія цікавыя звесткі пра час узнікнення, пра тое, як нароўні з жывымі істотамі, паступова ўваходзілі ў духоўную памяць народа камяні, якімі прыгожымі і самабытнымі легендамі і паданнямі, казкамі і песнямі яны станавіліся ў пераказах нашых продкаў.

Прызначаецца для работнікаў навуковых і культурна-асветных устаноў, выкладчыкаў вышэйшай і сярэдняй школы, аспірантаў і студэнтаў, усіх тых, хто шануе таемны свет даўніны.

**УДК 398(=161.3)**
**ББК 82.3(4 Беи)**

**ISBN 978-985-08-2968-9**

© Ненадавец А. М., Ненадавец Я. А., 2023
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2023

# УВОДЗІНЫ

Агульнавядома, што камень служыць чалавеку з сівой мінуўшчыны. Першыя наканечнікі для стрэл і дзідаў, першыя нажы і іголкі былі зроблены з каменя. Самай першай зброяй у руках чалавека былі зноўтакі дубіны і камяні. Менавіта пры дапамозе камянёў першабытныя людзі здолелі выжыць у бязлітаснай барацьбе з прыроднымі стыхіямі і ў пастаянных бітвах з суседнімі плямёнамі. У якасці прыкладаў можна звярнуцца да больш старажытных, чым беларуская, міфалогій: кельцкай, егіпецкай, міфалогіі Брытанскіх астравоў. Цікавым будзе не толькі прасочванне найдаўніх каранёў, але і адшукванне нейкіх агульных (сусветных) сюжэтаў і матываў.

Гэта толькі на першы погляд усё здаецца аднолькавым, аднастайным, а калі пачнеш аналізаваць, пранікаць у існасць праблемы больш глыбока, то акажацца, што даволі лёгка можна адшукаць і пэўныя нацыянальныя адметнасці і рэгіянальныя асаблівасці, якія хаваліся да гэтага моманту пад напластаваннямі ўсемагчымых сацыяльна-грамадскіх фактаў-

драбніц і спрасаваліся яны за працяглы час трывала і нагадваюць сабою аднародную (у дадзеным выпадку – каменную) масу.

Тое, што жыццё ў розных рэгіёнах нашай планеты развівалася далёка няроўна (у залежнасці ад спрыяльнасці клімату, сацыяльна-грамадскіх адносін – на іх у няроўнай ступені адбіваліся вынікі тагачасных навуковых і чыста выпадковых адкрыццяў) – таксама праяўлялася толькі ў глыбокіх супрацьпастаўленнях, якія давалі магчымасць вылучыць сваё, роднае і знайсці чужое, запазычанае (можна характарызаваць яго і як «наноснае», што прыйшло з міграцыяй плямёнаў, развіццём іхніх промыслаў, уменнем працаваць і апрацоўваць каменныя глыбы, ствараць з іх велічныя манументальныя збудаванні). Не сакрэт, што і тут было намнога больш адрозненняў, чым падабенстваў, аналогій і г. д.

Нам падаецца, што беларуская міфалогія, нашы нацыянальныя аспекты адносна шанавання, абагаўлення і выкарыстання каменя (камянёў) намнога пазнейшыя за гэтакі ж аспект у іншых народаў. Захаванасць вуснапаэтычных твораў, якая звязана, найперш, з хрысціянізацыяй краю і толькі рэдкім-рэдкае прадчуванне таго, што недзе тут былі (ці павінны былі знаходзіцца і куды больш ранейшыя (язычніцкія) матывы), сведчыць пра непарыўную сувязь у нашых продкаў матэрыяльнага жыцця з духоўным. Пакланяліся і абагаўлялі, але ніколі не забываліся і пра тое, што гэтыя міфалагічныя і вуснапаэтычныя тэксты абавязкова неабходна захоўваць як адбіткі своеасаблівай памяці, як непараўнальна прыгожыя фальклорныя адзінкі, якія лішні раз сведчылі пра багаты духоўны свет нашых продкаў. На вялікі жаль, разбурэнне ягонай цэласнасці, а ў тое, што ён такім быў на досвітку чалавецтва ў нашых краях, мы ніколькі не сумняваемся, прывяло да цяжкіх наступстваў, звязаных найперш з «вырванымі і страчанымі старонкамі» з найбагацейшай Кнігі жыцця. І не заўсёды менавіта само жыццё патрабавала такіх учынкаў, а былі яны ад непрадуманасці і абыякавасці далёкім-далёкіх продкаў, а то ўжо і ад іхніх нашчадкаў. Асабліва балюча гэта было адчуваць тады, калі ў справу ўступала цэлая сацыяльная сістэма грамадства, якая заклікала і вымушала знішчаць усё старое, даўняе, як пэўны перажытак, нейкі цяжкавытлумачальны забабон, што не адпавядаў запатрабаванням новых часоў.

А камяні, параскіданыя па ўсёй чыста беларускай зямлі («дзе вельмі густа, а дзе то і пуста...») былі сведкамі многіх падзей, з'яўляліся своеасаблівымі ўдзельнікамі мінулых дзён; продкі, прыцягваючы вялізную камлыгу і ўстанаўліваючы яе на перакрыжаванні дарог, у шматлікіх мясцовых парках і лясочках, на парэштках былых сядзіб імкнуліся толькі да

аднаго – да як мага даўжэйшага захавання памяці пра «тых, хто жыў і тварыў тут, прынесіў славу і гонар нашай зямлі», стараліся такім чынам гэтую памяць увекавечыць. Павінны агаварыцца, бо далёка не заўсёды дапамагалі і такія спробы. Аказваецца, што не вытрымлівалі і камяні: то людской дурноты-абыякавасці, то празмернага імкнення «да правільнага гаспадарання і выкарыстання гаспадарчых матэрыялаў», то яшчэ неведама да чаго, але даставалася і камяням. Неяк К. Цвірка напісаў: «Не засталося і таго памятнага каменя, што ляжаў тут і дзе было напісана, хто і калі садзіў гэтыя дубы. Знішчылі самую памяць» [37, с. 159].

У яго ж неаднаразова сустракаем указванні на тое, што камяні асабліва часта выкарыстоўваліся дбайнымі гаспадарамі пры ўзвядзенні ўласных сядзіб для трываласці фундаментаў і падмацоўкі «грунту-плывуна», які не асядаў адразу і значна перашкаджаў узвядзенню будынкаў. «У Люцінцы ад былой сядзібы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча засталіся толькі ўрослыя ў зямлю камяні падмурка на ўзвышэнні, да якога падступалі хаты невялікай вёсачкі...» [Тамсама, с. 238]. Аналагічная сітуацыя і на былой сядзібе іншага беларускага класіка Ф. Багушэвіча: «Больш за ўсё, аднак, засмуціла нас з Содалем “апрацоўка” падмурка даўнейшай хаты, у якой жылі яшчэ з сям’ёй бацькі Францішка Багушэвіча, а мо і яго дзяды, хаты, у якой рос і гадаваўся сам паэт да яго адыходу “ў людзі”. Падмурак гэты, выкладзены з камянёў, змацаваны нейкім даўнейшым растворам, быў на той жа сядзібе, непадалёку ад дома Францішка Багушэвіча. Калі мы падышлі туды, то ўбачылі ў самай сярэдзіне гэтага падмурка... бульдозер, які паспеў ужо развярнуць яго частку» [Тамсама, с. 253].

Даставалася камяням не толькі ад людской злосці і абыякавасці, але і ад нябесных «палючых стрэлаў-вужоў». Амаль што не было такой навальніцы, каб вялізная камлыга не звінела, не стагнала глуха ад стралы гнеўнага бога-грамоўніка, які пацэліў у яе. Так і зазначалі вяскоўцы, без асаблівай удумлівасці і шкадавання: «Пярун каменю шкуру чысціць!», «Пярун камень залоціць!», «Пярун каменю бубны выбівае!» Ды мала што яшчэ мог сказаць чалавек, якому было ўсё роўна да таго, што адбывалася навокал. Галоўнае, каб яго самога не патрапала, каб не ўдарыла ў хаціну ці ў гаспадарчыя будынкі, каб не чапала нябеснае ліха людзей ды хатняй жывёлы.

Нават старажытныя замкі, складзеныя ўмелымі продкамі для надзейнасці, трываласці і недаступнасці з дзікага вялізнага камення, звезенага са значных тэрыторый, і тыя не вытрымлівалі ціску часу, ворагаў і кліматычных умоваў («вада кропелькамі каменне точыць, не дае яму крэпка скласціся, а рушыць і рушыць; спачатку тыя трэшчынкі нават ча-

лавечаму воку незаўважныя, а з гадамі (дзесяцігоддзямі, стагоддзямі) пачынае ўсё рушыцца...»). Сённяшняя кансервацыя замкаў спазнілася на некалькі стагоддзяў як мінімум, і галоўнае тут не недахоп вялізных грашовых сродкаў, хоць і без іх не выкруцішся, а страта тэхналогій, якімі продкі валодалі ў поўнай меры дасканаласці. Тое, што здавалася б, вечныя будынкі рассыпаліся і камяні раскочваліся («па сваіх адвечных месцах»), і іх нельга было болей аднавіць, тлумачылася нават адмысловымі майстрамі тым, што даўнейшыя замкі былі скрэплены «людскою крывёю і чортавай кляцьбою...». У гэта свята верылі, а магчыма, што і стараліся прытрымлівацца ў будзённай практыцы.

Прасочваліся звесткі, што яшчэ ад часу ўзнікнення Светабудовы, калі магутны д'ябал ставіў сябе ўпоравень з Панам Богам, і ўсё стараўся рабіць многае гэтаксама, як і Усявышні, толькі намнога горш, камяні ўтвараліся («плавіліся», «абсякаліся», «абломваліся», «паказваліся на паверхні», «збіраліся ў гурбы») там, дзе яны ўвогуле ўзнікалі на зямной паверхні. Аказваецца, што яшчэ пад зямлёю, дзе была чартоўская майстэрня па вырабе гэтакіх камлыг, усё нячысцікамі планавалася наперад: дзе і калі параскідаць камяні, а дзе і ў які час назаўсёды зацвердзіць іх на зямной паверхні і зрабіць гэта так, каб яны вечна перашкаджалі людзям хадзіць па дарогах, ездзіць, перасоўвацца. Атрымліваецца, што ўжо тут уліваласяў іх адмоўная энергетыка і заставалася ў камянях назаўсёды.

Больш за тое, наша спадчынная міфалогія вылучаецца не празмернай легендарнасцю і міфічнасцю, як, напрыклад, добра вывучаныя і даследаваныя грэчаская, рымская, кітайская ці індыйская, а грашыць празмернай будзённасцю, дзе і багі і легендарныя (міфічныя) героі вымушаны займацца звычайнай сялянскай працай, выконваць цяжкую фізічную працу, удзельнічаць у круглагадовых працоўных цыклах земляробаў, паказваць, што і гэтыя заняткі не чужыя для міфалагічных персанажаў нашай міфалогіі. Бог (багі, анёлы, святыя, Маці Боская) жылі не абасоблена, а сярод людзей, падкрэсліваючы характэрную рысу, якая ніколі не давала ім абасабляцца ад зямнога жыцця, аддаляцца ад людскога свету. Гэтак было на самым пачатку. Потым ужо Бога (Усявышняга, Маці Боскую, анёлаў і святых) народныя дарадцы «перасяляць» значна вышэй ад зямнога свету – у завоблачны, адкуль яны пачнуць кіраваць усім тым, што рабілася на зямлі, назіраць за імі ж устаноўленымі парадкамі, узнагароджваць, а то і сурова караць парушальнікаў заведзеных (устаноўленых) законаў (канонаў). Не сакрэт, што так было значна прасцей выкручвацца людзям з розных сітуацый, якія ўтвараліся і ў выніку сваіх жа непрадуманых дзеянняў, і ў выніку паступовага развіцця са-

цыяльнага жыцця. Такой была традыцыйная карціна Сусвету як па сваім утварэнні, так і па сваім існаванні.

Паступова тут закрадвалася яшчэ адна істотная заканамернасць: чым больш удасканальваліся і сістэматызаваліся звесткі пра Сусвет, здавалася, што ўжо і чорных плям у ім увогуле не засталося, тым усё радзей імкнуліся звяртацца да гісторыі развіцця Сусвету, ягонага класічнага станаўлення нашы продкі. Атрымлівалася, што іх болей цікавіла не стройнасць і арганізаванасць, а беспарадак і ўсеагульны хаос, у якіх ім бачылася больш цікавая для іхняй бязмернай і невычэрпнай фантазіі матэрыя. Любы з больш-менш дасціпных апавядальнікаў-складальнікаў, смела запазычваў паасобны факт і на ягонай аснове ствараў вусна-паэтычны твор на ўпадабаную ім самім тэму. Дзеянне магло развівацца крыху і ў іншым ключы: ведаючы, што дзядзька ці дзед добра «брэша» (распавядае пра ўсялякія былічкі, здарэнні, казкі і выпадкі), яго прасілі распавесці твор і на цікавую для людзей тэму. А твора такога ў наяўнасці, якраз-такі, і не існавала! Яго неабходна было прыдумаць, увесці ў кругазварот фантастычна-фальклорных твораў. Таму будучы аўтар-складальнік вымушаны быў пад любой зачэпкай пацягнуць час, свядома выгандляваць яго для таго, каб і паспець прыдумаць тое, чаго не хапала, а гэта прасілі пераказаць. Не выпадала вопытнаму дарадцу хібіць у такой справе. Прыдумае, распавядзе зацікаўленым асобам, а потым яшчэ нібы самога сябе і пахваліць: «Доўга дома думаў. Прыгадвалася ўсялякае, пакуль у памяці на след гэтай показкі не натрапіў, то думаў, што галаву ад празмернага напружвання зламаю. Па-ўсялякаму ў жыцці здараецца, але трэба ўмець карыстацца тым, што ад старэйшых у спадчыну перадалося. Яны ж таксама многага вартыя былі ў сваім жыцці...»

А з кожным годам з'яўляюцца ўсё больш адметныя звесткі пра цудадзейныя камяні, пра тое, што нават па сваёй знешняй форме яны стаяць паасобку, і растлумачыць: чаму так здарылася, што вучоныя так і не змаглі адказаць на спрэчныя пытанні, хоць ламаюць свае галовы, прапаноўваючы ўсё новыя і новыя гіпотэзы і домыслы.

Так, размешчаны на беразе вадасховішча Джэнінгс-Рэндольф у штаце Заходняя Вірджынія (ЗША) гэты загадкавы камень узростам больш за 300 мільёнаў гадоў працягвае ставіць у тупік усіх вучоных свету. Магчыма, ён з'яўляецца доказам старажытных тэхналогій.

Упершыню аб цудадзейнай скале стала вядома ў снежні 1984 года. Камень адразу ж атрымаў назву Вафельны камень з-за падабенства яго правільнага геаметрычнага малюнка з ячэйкамі формы-краткі, выкарыстанай пры гатаванні вафляў.



*Вафельны камень, якому больш за 300 мільёнаў гадоў. Фотаздымак узяты з інтэрнэт-рэсурсу*

Камень першапачаткова быў ледзьве прыкметны над паверхняй зямлі, але падчас стварэння вадасховішча Джэнінгс-Рэндольф яго вырашылі адкапаць і перамясціць у іншае месца. Але калі рабочыя выкапалі камень, то здзівіліся дзіўнаму малюнку на яго паверхні, быццам спецыяльна выразанаму рукою чалавека. Зрабіўшы гэтае адкрыццё, палкоўнік Марцін Уолш-малодшы, які камандаваў інжынерным корпусам, прыйшоў да высновы, што камень усё ж мае натуральнае паходжанне, пра што і паведамлялася ў газетным артыкуле, апублікаваным у снежні 1984 года. Ягоная гіпотэза дапускала, што пясок адкладваўся ў скалах слаямі ў час Апалацкага арагенеза і ў выніку аказаўся фрагментаваны на «складкі» 300 мільёнаў гадоў назад.

Паводле тлумачэнняў вучоных, у выніку геалагічных змяненняў парода раскапалася ў рэгулярным парадку, па «швах», аддрукоўваючы «вафельны» ўзор на адкладах. Потым, маўляў, кварц змешваўся з адкладамі ў пустотах, утвараючы састаў, устойлівы да атмасферных уздзеянняў. З цягам часу змяненні клімату, выклікалі эрозію пароды, якая ўтрымлівалася ў прамежках, пакінуўшы пры гэтым характэрны вафельны ўзор.

Але такое тлумачэнне не задаволіла нават саміх вучоных. Ім цікава, ці з'яўляецца загадкавы краткавы ўзор, адбіты на скале, простай геалагічнай шарадай ці выступае рэшткамі нейкай надзвычай старажытнай тэхналогіі? Спляценне геаметрычнах узораў настолькі гладкае, што абсалютна не верыцца ў тое, што створана прыродай. Калі пацвердзіцца, што структура не натуральная, то тады гэта будзе азначаць, што яна пра-

дукт нейкай старажытнай цывілізацыі, якая валодала невядомай тонкай тэхналогіяй.

Існуе мноства гіпотэз аб гэтай дзіўнай скале. Некаторыя ўфолагі лічаць, што на камяні бачны «зашклёныя» сляды, выкліканыя інтэнсіўным выпраменьваннем, якое пакінуў незямны карабель, які прыбыў на Зямлю 300 мільёнаў гадоў назад. Іншыя сцвярджаюць, што сляды з'яўляюцца адбіткамі ўзору на скуры гіганцкай рэптыліі. Таксама няма недахопу ў тых, хто сцвярджае, што гэтая скала ўсяго толькі сведчанне таго, што старажытныя падарожнікі ў прасторы-часе пакінулі свой след падчас пасеву жыцця на нашай Зямлі.

Аднак афіцыйнае навуковае таварыства ўпарта сцвярджае: «Вафельны камень з'яўляецца натуральным геалагічным утварэннем. Крытыкі гэтай тэорыі, аднак, не аспрэчваюць працэс, стварыўшы форму сеткі, а хутчэй задаюцца пытаннем: ці могуць горныя пароды натуральным шляхам прымаць такі дакладны і паўтаральны ўзор. Некаторыя даследчыкі высунулі гіпотэзу, што магнітныя палі ад маланкі маглі спрыяць фарміраванню геаметрычных узораў Вафельнага каменя, – гэта значыцца, што маланка магла паўплываць на стварэнне ўзору.

Тэарэтыкі электрычнага Сусвету лічаць, што, магчыма, прырода магла стварыць вафельную кратку з дапамогай электрамагнітнага поля. У якасці прыкладу яны прыводзяць сняжынкі, якія фарміруюцца ў электрамагнітным полі і маюць форму, аналагічную ўзорам на камені. Аднак гэта ўсяго толькі меркаванні. Праўда ж заключаецца ў тым, што, нягледзячы на гіпотэзы, афіцыйная навука не ў стане растлумачыць паходжанне гэтага каменя.

Паводле гэтай прычыны і згодна з самым экзатычным даследаваннем, магчымасць таго, што камень не мае прыроднага паходжання, нельга з вялікай доляй упэўненасці адмаўляць. Але калі гэта так, то якія інструменты выкарыстоўвалі старажытныя майстры для стварэння такой неверагодна дасканалай мадэлі вафельнай формы? Альтэрнатыўныя гісторыкі лічаць, што палеазойскі Вафельны камень з'яўляецца рэшткамі нейкай невядомай цывілізацыі, якая жыла на нашай планеце ў старажытныя часы і валодала неверагоднымі для нас складанымі тэхналогіямі.

Здаецца, што самым простым тлумачэннем вафельнаму правільнаму малюнку можа служыць тое, што 300 мільёнаў гадоў таму назад на месцы каменя стаяў рукатворны аб'ект, які пазней разбурыўся, згніў (як своеасаблівы варыянт – некуды паляцеў), а адбітак аб'екта ў зямлі з часам скамянеў і захаваўся. Канечне ж, афіцыйная навука не жадае пагаджацца, што 300 мільёнаў гадоў назад хтосьці ў нас тут жыў і нешта будаваў, хоць пабочныя доказы мы ўжо прыводзілі не раз: адбітак

чалавечага абутку з добра бачнай прашытай ніткай. След голай чалавечай нагі таго ж часу...

Аднак можна прапанаваць і яшчэ адну гіпотэзу, якую, здаецца, да нас ніхто не разглядаў. Уфолагі і прыхільнікі палеакантакту даўно гавораць пра тое, што старажытныя мегаліты служылі ў глыбокай старажытнасці не проста культавымі забудовамі, але выступалі яшчэ і нечым падобным да станцый падпітак іншапланетных караблёў. Іншапланецяне, як сцвярджаюць уфолагі і прыхільнікі палеакантактаў, зараджалі свае заралёты энергіяй магнітных палёў Зямлі. На месцы такіх «станцый» і вырасталі мегаліты, якія былі нечым падобныя да разетак для прышэльцаў і іхніх караблёў. Прымітыўныя туземцы-зямляне пакланяліся гэткім месцам і распавядалі аб багах, якія прылятАлі туды (гэтыя аповедылегенды супадаюць па ўсіх кантынентах у розных народаў) на сваіх грымлівых лятучых калясніцах.

Аднымі з такіх багоў-прышэльцаў былі старажытнаскандынаўскія асы: Одзін, Тор, Фрэйр... Даследчыкі адзінадушныя ў тым, што апісанне васьміногага лятучага каня Одзіна па імені Слейпнір (Склізкі) лёгка растлумачыць, калі толькі ўявіць сабе, што гэта быў лятальны апарат на нейкіх васьмі апорах. Дзіда, якая пастаянна вярталася, належала Одзіну і мела назву Гунгнір (Стралок), разбівала на дробныя парэшткі розныя перашкоды і нават скалы. Яна нагадвала сучасную ракету, якой ён паражаў сваіх ворагаў і іхнія ўмацаванні. Одзін страляў, а дзікім людзям здавалася, што гэта ўсё тая самая чарадзейная дзіда, якая да яго вярталася пры любых умовах...

А верныя вораны Одзіна Хугін (Думка) і Мунін (Памяць), якія распавядалі свайму гаспадару пра ўсё, што адбывалася навокал, – гэта тыповыя разведвальныя дроны. А легендарны молат Мьольнір бога Тора – паводле ўсіх апісанняў – агнястрэльная зброя: яна грымела і раскідала маланкі, разбіваючы імі сілы зла. З выгляду гэтая зброя (гармата) нагадвала ў нечым молат, таму яе гэтак і назвалі. Дарэчы, Тор таксама лётаў у апараце па небе, толькі, як меркавалі старажытныя скандынавы, у каштоўнай калясніцы, запрэжанай казламі, што сучасныя даследчыкі тлумачаць яшчэ лягчэй: гэты лятальны апарат, час ад часу, выдаваў папераджальныя сігналы падобныя да бляяння казла, што можна і сёння пачуць у многіх будаўнічых машын і катараў.

Старажытнаму чалавеку ўсё гэта прывівала пастаянны страх і пастаяннае пакланенне, а з пункту гледжання тэхналогій нашага стагоддзя ўсё гэта нам даволі блізка і зразумела. І вось бог Одзін, лётаючы на сваім «склізгальным» па небе «кані» на васьмі апорах, падзараджаўся энергіяй ад чагосьці, што вельмі нагадвала сабою тры сплеценыя трохву-

гольнікі, якія і сталі графічнымі сімваламі Одзіна. Але нават у раннюю Эпоху вікінгаў усё гэта перадавалася толькі на словах, бо жывых сведкаў усіх гэтых цудаў не існавала і існаваць не магло.

Але што гэта за трохвугольнікі Одзіна? Гэты сімвал Одзіна з трох сплеценых роўнастаронніх трохвугольнікаў называецца валькнут. А цяпер прыгледзьцеся добра да ўзору каменя, што мы вылучылі на здымку стрэлкай і кружком: там прамыя лінія, якія перасякаюцца, ствараюць быццам бы з трохвугольнікаў своеасаблівую зорку. І як тут не прыгадаць яўрэйскі сімвал – Зорку Давіда, якая складаецца з перапляцення двух роўнабедраных трохвугольнікаў, сімвал настолькі старажытны, што самі яўрэі не ведаюць яго дакладнага зместу. І ці няма агульных каранёў у Зоркі Давіда з валькнутам бога Одзіна, складзенага з трох пераплеценых роўнабедраных трохвугольнікаў? Ці не рэплікі гэта таго, што мы бачым на Вафельным камяні?

Сімвал валькнут традыцыйна адносяць да скандынаўскай культуры, аднак у некаторых першакрыніцах можна сустрэць думку, што дадзены знак мае куды як больш старажытныя карані – старажытнагрэчаскія ці яшчэ больш архаічныя егіпецкія. І хутчэй за ўсё гэта праўда.

Знаходка валькнута ў выяўленчым мастацтве многіх народаў і адлюстраванне яго побач са скандынаўскім богам Одзінам гаворыць пра тое, што гэты сімвал – спадчына агульная, усіх жыхароў Еўропы. Але што ён азначаў у іх? Валькнут уяўляе сабою пераплеценыя лініі, якія складаюцца ў тры трохвугольнікі. Амаль як на Вафельным камені. Такая канфігурацыя здаўна называецца «вузлом забітых» ці «вузлом абраных».

Гэты магічны сімвал па сённяшні дзень выкарыстоўваецца ў якасці абярэга, але сустракаюцца таксама тэорыі аб непажаданым нашэнні валькнута жывым чалавекам. Валькнут часцей за ўсё сустракаецца на рунічных камянях, выявах бітваў ці смяротных пакаранняў. Таксама гэтакі знак знаходзяць і на рытуальных прыладах для пахаванняў. Тут прасочваецца адназначная яго сувязь з пазамагільным светам, з багамі.

Традыцыйна гэты сімвал выбіваўся на ахвярных камянях, якія ўжываліся для здзяйснення пакарання «крывавы арол», калі ў ходзе пакарання ворага яшчэ жывому чалавеку рассякалі рэбры, выварочвалі іх у бакі і даставалі лёгкія. Апошнія клалі на плечы ахвяры, каб былі падобныя да крылаў. Такі бязлітасны спосаб пакарання прымяняўся да ворагаў, палоненых у ходзе войнаў, а ў некаторых першакрыніцах ён апісваўся як спосаб пакарання за забойства. Гэта лічылася прынясеннем ахвяры Одзіну, таму валькнут, як непазбежны атрыбут такога пакарання, і звязваюць з гэтым богам.

Па значэнні валькнут, хутчэй за ўсё, адлюстроўваў нейкі «шлях воіна» ад зямнога існавання да Вальхалы і сустрэчы з Одзінам.

Таксама археолагі знаходзілі валькнут на зброі і даспехах. Мяркуюць, што такі знак таксама наносіўся ў якасці рытуальнай татуіроўкі воінам, якіх пасылалі ў бой і з якога амаль не заставалася шанцаў вярнуцца жывым. Верагодна, што такім чынам воінаў загадзя рыхтавалі да пазамагільнага жыцця. Дакладнае значэнне тэрміна «валькнут» – «вузел загінулых (воінаў)». Але чаму менавіта тры раўнабедраныя трохвугольнікі, сплеценыя разам?

Здаецца, што гэты сімвал быў пераняты ад папярэдніх пакаленняў як сувязь з багамі. Такія бачылі на караблях прышэльцаў? Таму што недарма загінулыя воіны накіроўваліся ў Вальхалу да багоў, каб баляваць разам з імі. Гэтае месца знаходзіцца ў Асгардзе – нябесным горадзе, дзе жывуць багі. Вальхалай кіруе вярхоўны ас Одзін. Значэнне валькнута – аб'яднанне свету людзей (Мідгарда), багоў (Асгарда) і мёртвых (Хельхейма).

Значэнне валькнута часта тлумачаць тым, што яно асацыюецца з трыма багінямі лёсу – Урд («мінулае»), Верандзі («сапраўднае») і Скульд («будучае»), паколькі ў ім аб'ядноўваюцца тры трохвугольнікі. Але гэта ўсяго толькі позняя версія, а сам сімвал існаваў яшчэ задоўга да з'яўлення ўсёй скандынаўскай міфалогіі. Таксама гэтак як і старажытныя яўрэі не ведалі дакладнага тлумачэння трохвугольніка Зоркі Давіда, так і старажытныя скандынавы не маглі дакладна перадаць сэнс трохвугольніка Одзіна. Гэтыя сімвалы яны атрымалі ў спадчыну, калі і іўдзеі, і старажытныя германцы былі адным народам. Формы арыгінальнага сімвала з часамі змяніліся, але сэнс – правільныя трохвугольнікі, сплеценыя разам – не. І верагодна, што Вафельны камень на самой справе мае адносіны і да валькнута, і да Зоркі Давіда. Але выразнага адказу пакуль што няма. Усяго толькі захапляльная гіпотэза...

Узрост каменя ацэньваюць у 300 мільёнаў гадоў – няўжо продкі людзей існавалі ўжо тады? [19, с. 9]

Чарговая загадка, над якой выпадае добра падумаць, каб прыйсці да нейкай праўдападобнай высновы.

У выданні выкарыстаны фотаздымкі з кнігі Э. Ляўкова «Маўклівыя сведкі мінуўшчыны» (1992) і з асабістага архіва Я. Ненадаўца.

# КАМЕННЫЯ ТРАДЫЦЫІ Ў МІФАЛОГІІ ІНШЫХ НАРОДАЎ

Шмат гаварылася пра чарадзейнасць і цудадзейнасць, пра сумеснае існаванне багоў і людзей, якія не толькі жылі побач, але і вялі кровапралітныя войны паміж сабою. «Але племя багіні Дану нядоўга карысталася гэтай чароўнай крыніцай. Пра яе існаванне вельмі хутка даведаўся малады правадыр фамораў, Актрыалах, сын Індэха. Ён са сваім сябрам вырашылі ноччу накіравацца да крыніцы. Сябры прыхапілі з сабою агромністыя камяні з дна ракі Дроўс. Падышоўшы да крыніцы, яны скінулі ў яе камлыгі, а зверху накідалі іншых камянёў. Зрабілі так, што расцяклася ўся чароўная вада і наглуха заклалі крыніцу пірамідай з камянёў. Легенда называе гэтую мясціну па імені героя “піраміда Актрыалаха”» [14, с. 113–114].

Часам камень проста называўся «цудадзейным» і выступаў грознай зброяй у руках кельцкіх багоў ці асілкаў: «Але як толькі вока ворага расплюшчылася напалову, Луг кінуў у яго свой цудадзейны камень, які дазвання выбіў вока і наскрозь прабіў галаву Балора. Вока выцекла на зямлю

прама перад Балорам і, падаючы, загубіла тройчы па дзевяць воінаўфамораў, на якіх выпадкова патрапіў ягоны пагляд, што пачаў згасаць».

Прывядзём старажытны верш, які апавядае пра таямніцу гэтага магічнага каменя. Камень гэты насіў назву «татлум», што азначала «каменьмозг». У даўнія часы існавала павер'е, паводле якога ірландскія ваяры часам захоўвалі мозг забітых ворагаў, прысыпаўшы яго вапнай.

О, татлум крепкий и тяжелый!
Как меток был бросок Де Данаан!
Он выбил глаз губительный Балора
Встарь, в грозной битве двух великих войск.
Кровь жаб и яростных медведей,
Кровь благородных львов,
Кровь змей и Осмуиннова потомства –
Вот из чего был сделан татлум тот.
Песок со дна Арморианской хляби,
Священный моря Черемного песок,
Просеянный, сверкающий, отборный –
Вось из чего был сделан татлум тот.
Бриун, сын Бетара, известный воин,
Что правил на брегах морей восточных, –
Вот кто сумел смешать все воедино,
Вот кто слепил тот самый татлум.
И татлум тот тотчас вручили Лугу, –
Тяжелый, твердый, а не мягче мха, –
И тот в сраженье при Маг Туиред
Своей рукой метнул его в Балора [Тамсама, с. 115–116].

Так атрымалася, што на старажытнай тэрыторыі рассялення кельцкіх плямёнаў да нашых дзён засталіся своеасаблівыя сведчанні – помнікі тых сівых часоў: «Вежы», ці калоны, паводле паданняў, якія служылі памятнымі знакамі на магілах загінулых, да гэтых дзён захаваліся на раўніне Кэроумор непадалёку ад Сліга. Яны ўяўляюць сабою дагістарычныя ўзоры манументаў. Сярод іх можна сустрэць мегалітычныя збудаванні практычна ўсіх вядомых тыпаў: піраміды з камянёў з дальменамі ўсярэдзіне; дальмены, што стаяць асобна; дальмены, якія акружаны адным, двума ці нават трыма каменнымі кругамі, такія ж кругі з камянёў без дальменаў. Агульны лік такіх дальменаў перавышае сотню. Каля шасцідзесяці такіх жа дагістарычных манументаў знаходзіцца на ўзвышаным плато шырынёю не больш за мілю, уяўляючы сабою велічныя руіны – апошні напамін пра бітву ля Маг Туірэд» [Тамсама, с. 116–117].

Першабытныя людзі, якія былі акружаны і спавіты прыроднымі з'явамі і стыхіямі, адначасова былі бяссільныя выйсці з прыроды ці глыбей

пранікнуць у яе нязведаныя таямніцы. Няпрошаная прырода, яна без папярэджання глыбей уцягвала людзей у свой карагод і пачынала кружыць, ажно да таго доўгачаканага моманту, калі стомленыя ўдзельнікі нябачнага глабальнага працэсу адвольна не выскліззвалі з-пад уплыву. Атрымліваецца, што людзі жылі ў ёй (сярод яе), але ў той жа час і былі ёй чужымі, бо прытрымліваючыся традыцый продкаў, размаўляючы і падказваючы рашэнне нейкіх праблем, яна ніколі не раскрывала, нават не імкнулася да раскрыцця сваёй асноўнай таямніцы. З іншага боку, людзі пастаянна нібыта на яе ўплывалі, але ўлады ніколі не мелі.

Увогуле, цікава нават тое, як умелае выкарыстанне камянёў змяняла многае ў даўнейшым укладзе жыцця народа. Звернемся да егіпецкай міфалогіі: «Лічылася неабходным забяспечыць надзейную абарону для муміі фараона, каб ворагі не маглі яе знішчыць і тым самым перапыніць існаванне ягонай душы. Так пачыналі будавацца трывалыя каменныя грабніцы, а цагляныя і драўляныя канструкцыі, якія ўзводзіліся для цароў у Абідосе, выйшлі з моды» [10, с. 10].

Індывідуальнасць быццам бы галоўнае для яе, але індывідуумаў яна ніколі асабліва не трывала і не ўспрымала. Атрымліваецца, што прырода вечна будуе і вечна разбурае, але яе складаная майстэрня заўсёды з'яўлялася непрыступнай для чалавека.

Яна жыве, пастаянна аджывае і папаўняецца ў сваіх дзецях. Але калі канкрэтна запытацца: а сама маці, дзе яна? Велічная мастачка, яна ад найпрасцейшай матэрыі незаўважна ўздымаецца ажно да грандыёзных кантрастаў; без асаблівага заўважнага напружання – да нечуванага і небывалага ўдасканалення; да дзівоснай дакладнасці, і ўсё гэта адбываецца пад покрывам нейкай нечуванай мяккасці...

Яна разыгрывае дзеянне: ці бачыць яна яго сама, мы не ведаем, яна разыгрывае яго для нас, бо мы, атрымліваецца, тады знаходзімся нібыта на поўнай адлегласці. Прырода змяняецца пастаянна, не ведаючы ніводнай хвіліны спакою.

Можна сцвярджаць, што палац кіраўніка Старажытнага царства быў пабудаваны з каменя. Калі царскія будаўнікі адмаўляліся ад цэглы, распачаўшы здабычу і абчэсванне каменя, тады надышла эпоха хуткага прагрэсу егіпецкай цывілізацыі. Пачатак прагрэсу быў пакладзены барацьбой з сіламі прыроды ў Нільскай даліне. Узрослае насельніцтва краіны існавала ў мірных умовах, калі праблема выкарыстання вады была вырашана шляхам будаўніцтвам каналаў. Ірыгацыйная сістэма патрабавала кантролю, і адказнасць за водавыкарыстанне была ўскладзена на фараона. Такім чынам, добрая адміністрацыйная сістэма стала неабходнасцю: недахоп вады быў прычынай голаду і народных хваля-

ванняў. Тым, хто апрацоўваў зямлю, і тым, хто абараняў земляробаў, прырода давала шчодрую ўзнагароду.

«Мы можам сцвярджаць, што актыўнае выкарыстанне каменя было адной з найвялікшых заваёў, здзейсненых егіпцянамі. Навукоўцы слушна сцвярджаюць, што новыя рамёствы былі прынесены ў Егіпет дасіміцкімі плямёнамі паўднёвай Палесціны, якія высякалі ў вапнавых скалах агромністыя пячоры. Выбітнае майстэрства, прадэманстраванае старажытнымі егіпецкімі каменацёсамі з амаль драматычнай нечаканасцю, мабыць, было вынікам працяглага вопыту. Іх майстэрства было дасканалым з самага пачатку; камяні вымяраліся і апрацоўваліся з вялікай дакладнасцю і акуратнасцю. Змяненне ў пахавальных абрадах, якое мела месца ў перыяд кіравання першых дынастый, таксама ўказвае на тое, што Старажытнае царства адчувала на сабе знешні ўплыў» [10, с. 146].

Якім бы заблытаным не было паходжанне каменяцёсаў, хутчэй за ўсё ў самы ранні перыяд яны былі звязаны з Мемфісам. Мы згадвалі, што мастацтва апрацоўкі каменя і буйнамаштабнае будаўніцтва з гэтага матэрыялу было ўпершыню прадэманстравана прыхільнікамі Птаха, бога-рамесніка. Таму цікава адзначыць, што Менефон захаваў устойлівыя егіпецкія традыцыі, якія звязвалі Мемфіс са з'яўленнем новай індустрыі. Ён прыпісвае Джосеру, будаўніку прыступкавай піраміды ў Сакары, адкрыццё апрацоўкі каменя. Манефон таксама напісаў, што першы егіпецкі храм быў узведзены ў Мемфісе царом Менесам і прысвечаны богу Птаху. Назва горада Белыя Сцены, магчыма, указвае на тое, што гарадскія ўмацаванні былі пабудаваны з вапняку.

«Нам вядома, што камень выкарыстоўваўся ў Абідосе да пачатку кіравання Джосера – аднак не раней за заваёву поўначы – але традыцыйная асацыяцыя Мемфіса з новай індустрыяй ад усяго гэтага не становіцца менш значнай. Верагоднасць таго, што калонія майстроў з Мемфіса пасялілася па суседстве з каменаломнямі Асуана і прынесла з сабою майстэрства апрацоўкі каменя ў Верхні Егіпет, пацвярджаецца пакланеннем Хнуму, богу першага парога, які меў дзіўнае падабенства з Птахам. Больш за тое, Хнум таксама лічыўся стваральнікам Сусвету. Як і Птах, ён асацыяваўся з яйкам хаосу, і існуе мноства адлюстраванняў, на якіх Хнум вылеплівае першага чалавека на ганчарным крузе» [Тамсама, с. 146–147].

Ніколі нельга забывацца і пра тое, што ў далёкім-далёкія часы людзі таксама ўлічвалі вопыт папярэдніх пакаленняў: «На стаянкі качэўнікі спыняліся ў месцах, асвячоных аўтарытэтам першапродкаў; да таго ж гэтыя мясціны былі адзначаны свайго роду натуральнымі "пазнакамі" – дрэва-

мі, скаламі, валунамі, крыніцамі. Паводле іхніх разважанняў, у гэтых дрэвах і камянях, у крыніцах і вадаёмах жылі духі-апекуны, ад размяшчэння якіх залежаў дабрабыт плямёнаў; з часам у месцах іхняга пражывання сталі ўзнікаць свяцілішчы, дзе духам (на якіх) прыносілі свае ахвяры і пакланяліся. У кожнага племені было ўласнае свяцілішча, але качэўнікі з пашанай адносіліся не толькі да ўласных "кумірняў", але і да свяцілішчаў іншых, паступова яны пакрылі сабою ўсю тэрыторыю Брытаніі» [24, с. 17–18].

Пачынаючы прыблізна з пятага тысячагоддзя да нараджэння Хрыстова на вялізнай прасторы ад сучасных Іспаніі і Партугаліі да Брэтані, Ірландыі, Англіі, Шатландыі і Скандынавіі сталі з'яўляцца таямнічыя каменныя збудаванні, узвядзенне якіх патрабавала даволі высокага выканаўчага майстэрства і значных ведаў у галіне будаўніцтва. Сярод найстаражытнейшых і найбольш велічных збудаванняў такога роду – Нью-Грэйндж у Ірландыі, Мэйсхау на Аркнейскіх астравах і Брын Келі-Ду паблізу Энгліса. Іх адрозная асаблівасць – падземны калідор, столь, сцены і падлога якога выкладзены каменнымі плітамі; гэты калідор вядзе ў падземную пячору, паверх якой насыпаны курган і ў мностве складзены камяні. Археолагі звычайна трактуюць гэтыя збудаванні («хенджы») як грабніцы, але не падлягае сумненню і тое, што функцыі мегалітычных збудаванняў не абмяжоўваліся толькі пахавальнымі абрадамі. Многія камяні мегалітаў, асабліва ў Ірландыі, упрыгожаны малюнкамі нерасшыфраванага да гэтага часу значэння. Некаторыя з прыгаданых сімвалаў намаляваны з такім разлікам, каб у пэўную часіну года на іх падаў прамень сонца ці месяца. Больш за тое, калідор, які вёў у падзямелле, быў узведзены такім чынам, каб у канкрэтны дзень года прамень святла мог па ім пранікнуць у падземную камеру. У Нью-Грэйнджы, да прыкладу, святло трапляе ў сярэдзіну ў дзень зімовага сонцастаяння. Гэтыя даныя дазваляюць меркаваць, што мегалітычныя збудаванні выкарыстоўваліся не толькі як грабніцы, але і як храмы і як своеасаблівыя астранамічныя лабараторыі.

Па выніках радыёвугляроднага аналізу самым старажытным з насыпаных курганоў у наш час прызнаецца манумент у Кернаку ў Брэтані, узведзены каля 4800-х гадоў да нашай эры. Вядома ж, мегаліты маюць, калі можна так казаць, нацыянальныя асаблівасці, аднак падабенстваў у брытанскіх ці іспанскіх мегалітаў значна болей, чым адрозненняў, таму лагічна будзе дапусціць, што для гэтых збудаванняў агульным будзе паходжанне і прызначэнне.

Дж. Фостэр Форбс так тлумачыў узнікненне такіх велічных мегалітычных збудаванняў: «Гэтыя камяні ўзводзіліся з восьмага тысячагоддзя

да нашай эры і ўстанаўлівалі іх людзі з Захаду, а менавіта: жрацы, якія перажылі страшную катастрофу Атлантыды. Яны ўзводзілі свае грандыёзныя збудаванні, каб усталяваць і падтрымліваць адпаведны парадак у грамадстве. Мегаліты служылі адначасова месячнымі абсерваторыямі і храмамі, у якіх вяліся свяшчэнныя календары; да таго ж яны забяспечвалі пладароддзе зямлі і развіццё грамадства, кіруючы магнетычнымі вітальнымі патокамі ў зямной кары» [Тамсама, с. 23].

У свой час А. Торн даводзіў наступнае: «Каменныя кругі будаваліся ў адпаведнасці з геаметрычнымі прататыпамі ў рэчышчы класічнай піфагарэйскай традыцыі. Адзінкай вымярэння пры іх узвядзенні служыў гэтак званы мегалітычны ярд – 2,72 фута. Камяні з сярэдзіны і звонку кругоў узводзіліся такім чынам, каб зафіксаваць пэўную кропку гарызонту, у якой месяц і сонца займалі “экстрэмальнае” становішча, напрыклад, у час сонцастаяння. Тым самым можна зрабіць выснову, што будаўнікі мегалітаў валодалі вельмі глыбокімі навуковымі ведамі, заснаванымі на геаметрыі і навуцы лічбаў, і былі вельмі дазнанымі інжынерамі і астраномамі» [Тамсама, с. 23–24].

З пачатку 1970-х гадоў было прынята шмат даследаванняў каменных кругоў. У прыватнасці, шматлікія экстрасенсы і прадстаўнікі афіцыйнай навукі старанна вывучалі анамальныя энергетычныя ўласцівасці мегалітаў. Выкарыстанне лічыльнікаў Гейгера і ультрагукавых дэтэктараў дазволіла зафіксаваць анамальныя пульсацыі энергіі ў межах каменных кольцаў. Да прыкладу, многія даследчыкі адзначалі, што ўзроўні ультрагуку і радыяцыі ў межах мегалітычных колаў значна ніжэй, чым звонку.

Калі ўспрымаць як устаноўлены факт, што будаўнікі мегалітаў узводзілі свае колы ці іншыя манументы на месцах, якія валодалі пэўнымі фізічнымі ўласцівасцямі, то гэта азначала, што яны ўмелі знаходзіць патокі прыроднай энергіі і выкарыстоўваць іх на ўласную карысць. Цалкам лагічным будзе дапусціць, што гэтыя патокі, гэтыя загадкавыя сілы прыроды персаніфікаваліся ў духах, якім і пакланяліся ў каменных колах. Больш за тое, у вандроўным качэўным грамадстве свяцілішчы былі «задзейнічаны» толькі ў канкрэтную часіну года, якая супадала з міграцыяй племені. А ў грамадстве аседлым свяцілішчы функцыянавалі круглы год. Гэты духоўны пераход ад качэўніцтва да аседласці пераканаўча ілюструецца міфалагічнымі паданнямі аб перамозе над міфічным цмокам ці драконам. Паводле алхімічных тлумачэнняў, цмок – меркурыянскія зямныя токі, якія забяспечваюць урадлівасць зямлі; перамога над цмокам і прыбіванне, прыгвазданне ягонай галавы да зямлі калом ці камянём – традыцыйны спосаб падпарадкавання зямному току.

Дзейнасць будаўнікоў мегалітаў сумесна з распаўсюджаннем аседлага ладу жыцця і ўвядзеннем сельскай гаспадаркі азначала радыкальнае змяненне брытанскага ландшафту. Храмы ўзводзіліся на месцах неалітычных свяцілішчаў, паміж імі, як і ў спрадвечныя часы, пракладзены былі сцяжынкі паломнікаў, уздоўж якіх выраслі камяні-ўказальнікі і іншыя «меткі». Таму ў выніку ландшафт атрымаў самую сапраўдную сетку манументаў – «леяў», якія і зафіксавалі сакральную прастору Брытаніі. Сцяжынкі паміж храмамі і свяцілішчамі, трэба адзначыць, валодалі асаблівай святасцю: яны трактаваліся не толькі як дарогі паломнікаў, але таксама як і сцяжынкі мёртвых і сцяжынкі духаў, на якіх у пэўную пару года можна сустрэць самых неверагодных істот. Таму мегаліты, якія стаялі на перасячэннях такіх сцяжынак, карысталіся ў народзе адначасова і добрай і дурной славай як месцы цудоўнага збаўлення ад хваробы і межы паміж гэтым і тым светамі.

Ствараючы свяшчэнны ландшафт эпохі мегалітаў, жрацы аседлага грамадства старанна захоўвалі неалітычны «ўзор»: храмы і прыродныя свяцілішчы разглядаліся імі як адзіны агромністы храм, як увасабленне свяшчэннай зямлі. Шэраг рытуалаў і святаў на працягу года быў заклікаы ўлітасцівіць духа зямлі і праз ягонае апекаванне забяспечыць квітненне аседлых суграмадстваў.

З'яўленне на астравах гэтак званых *людзей кубкаў* (назва тлумачыцца з найбольш характэрнай для гэтай даволі ўжо шматлікай людской групы формаў сасудаў) і асацыюецца з пачаткам апрацоўкі металаў. На астравах прадстаўнікі гэтай групы змешваліся з прадстаўнікамі групы *людзей баявых сякерак*; апошнія ўжо прыручалі коней, карысталіся тачкамі на калёсах і апрацоўвалі медзь.

Непадалёку ад кургана Сілберы знаходзіцца знакаміты хендж Эйуберы – адно з найбуйнейшых рытуальных збудаванняў Еўропы. Манумент плошчай у 12 гектараў акружаны рвом і знешнім насыпам, у якім маецца чатыры сіметрычна размешчаных уваходы. Уздоўж унутранага краю ірва размешчаны рад пліт з пясчаніку, у цэнтральнай частцы знаходзяцца два колцы з камянёў, кожнае ў дыяметры каля 92 метраў. Ад паўднёвага ўваходу пачынаюцца прысады менгіраў, якія складаюцца з двух паралельных радоў камянёў і працягваецца на 2,5 кіламетра; яна заканчваецца ля рытуальнай пабудовы – магчыма, старажытнага свяцілішча.

Самы вядомы з брытанскіх мегалітаў – безумоўна, Стоўнхендж. Можна толькі здагадвацца пра тое, колькі працы і сілы каштавала ягонае ўзвядзенне, колькі грандыёзных фінансавых сродкаў, якіх запатрабавалі перамяшчэнне камянёў з Прэселі-Хіл ва Уэльсе і ўзвядзенне манументальных каменных колцаў.

Паводле легенды, добрая частка Стоўнхенджа належала магу Мерліну. Так атрымалася, што кароль брытаў Амброзій Аўрэлій вырашыў увекавечыць памяць аб сваіх падданых, па-здрадніцку забітых саксам Хенгістам, пры гэтым жадалася яму, каб помнік уяўляў сабою «новае і дагэтуль не бачанае збудаванне». Але ніхто з тагачасных дойлідаў не ўзяўся за выкананне загаду караля, баючыся яго не выканаць. Тады Амброзій Аўрэлій звярнуўся да славутага прадказальніка Мерліна. Апошні адразу ж запрапанаваў перанесці ў Брытанію камяні з Колца Веліканаў на гары Кіларао ў Іберніі (Ірландыя): «Калі ты хочаш упрыгожыць магілу забітых мужоў надзвычай моцным збудаваннем, пашлі да Колца Веліканаў, якое знаходзіцца на гары Кіларао ў Іберніі. Яно выкладзена камянямі, з якімі ніхто з нашых людзей не мог бы справіцца, не падпарадкаваўшы мастацтва розуму. Камяні велізарныя, і няма такога чалавека, чыя б сіла зрушыла іх з месца. І калі размясціць гэтыя камяні вакол пляцоўкі, дзе пахаваны забітыя, так, як яны размешчаны там, то яны будуць тут непарушна стаяць заўсёды» [24, с. 31].

Войска брытаў высадзілася ў Ірландыі, разграміла войска ібернійскага караля Гіламаурыя і захапіла Колца Веліканаў. Ваяры так і гэтак спрабавалі зрушыць камяні з месцаў, але ў іх нічога не атрымлівалася. «Назіраючы за дарэмнымі іхнімі намаганнямі, Мерлін засмяяўся і прыдумаў свае ўласныя прыстасаванні. Потым ён з лёгкасцю зрушыў камяні і загадаў перанесці іх на караблі. Узрадаваўшыся, яны адплылі ў Брытанію і з спадарожнымі вятрамі паспяхова дасягнулі яе. Пасля чаго прывезеныя камяні, даставілі да магіл забітых мужоў». Па загадзе караля Мерлін паставіў гэтыя камяні на грабніцы ахвяраў Хенгіста «не іначай, чым яны былі расстаўлены на гары Кіларао ў Іберніі, і даказаў тым самым, што розум мацнейшы за сілу» [Тамсама].

«Найстаражытнейшае ядро Стоўнхенджа (калі 2000 гадоў да нашай эры) мела акруглую форму і дыяметр каля 120 метраў; яно складалася з рова і ўнутранага вала з праходам пасярэдзіне. З унутранага боку вала знаходзілася колца з 565 ямін, якія прызначаліся для камянёў блакітных, як і 82 яміны ў цэнтры колца. Ад прахода ў вале да ракі Эйвон цягнуцца два ірвы. Знакамітыя дальмены Стоўнхенджа складзены з сарсанавых пліт вагою ў 50 тон кожная; яны былі пастаўлены вертыкальна, такім чынам, што цэнтральнае колца акружалі пяць трылітаў (два слупы з перакладзінай). Арыентацыя мегалітаў Стоўнхенджа па восі паўночны ўсход – паўднёвы захад дазваляюць меркаваць, што гэтае збудаванне выкарыстоўвалі як астранамічную абсерваторыю і як храм сонечнага боства.

Паколькі ўэсекская культура мела пэўныя кантакты з культурай мікенскай, то некаторыя вучоныя прасочваюць у Стоўнхенджы мікенскі ўплыў. Аднак аналагічныя каменныя збудаванні за межамі Брытаніі невядомыя.

Насуперак распаўсюджанай думцы, Стоўнхендж не мае ніякіх адносін да кельцкіх друідаў, якія з'явіліся ў Брытаніі на паўтары тысячы гадоў пазней узведзенага манумента» [Тамсама, с. 30–33].

Затое агульнавядома, што ў дзень летняга сонцастаяння ў Стоўнхендж з'язджаюцца натоўпы людзей – назіраць узыход сонца над Пятачным каменем. Відовішча гэтае сапраўды ўражвае. Скрозь бэзавы туман, які звычайна ўецца ў даліне ў гэтакі ранні час, раптам прабіваецца яркі прамень – і адбываецца гэта якраз над вяршыняй Пятачнага каменя! Поўны дыск сонца ўзыходзіць над ім з такой дзівоснай дакладнасцю, якая падштурхоўвае да містычных разважанняў аб ведах і здольнасцях нашых далёкіх продкаў. Кірунак, у якім патрэбна глядзець, вызначаецца камянямі гэтак дакладна, быццам бы нечая ўладная рука накіроўвае яго ў вызначаную кропку: глядзі толькі адсюль і ўбачыш! Дакладна замацаваныя прамяні зроку, на думку астраномаў, прымушалі назіральніка глядзець строга на канкрэтна акрэслены ўчастак неба, задавалі кірунак, дзе і адбываліся чаканыя з'явы-дзівосы. Вывады шматлікіх даследчыкаў супадалі: часта паўтараныя кірункі Стоўнхенджа ўказвалі на Сонца і Месяц.

Для чаго гэта ўсё патрэбна было старажытным людзям? Напэўна, для прадказання пачатку пасяўных работ. Потым усёведныя жрацы маглі наладжваць тэатралізаваныя прадстаўленні пры ўзыходзе і заходзе Сонца і Месяца.

Выказваліся думкі, што 56 лунак Обры ў старажытным комплексе служылі для прадказання зацьменняў. Гэтыя лункі размешчаны ўздоўж правільнай акругласці на роўнай адлегласці адна ад другой. Лункі глыбінёй да паўтара метра былі выкапаны ў вапнавым грунце і потым зноўку запоўнены тоўчанай вапнай. Жрацы маглі прадказваць год зацьмення, скажам, зімовага Месяца, перакладваючы каменьчыкі з адной лункі ў іншую па акружнасці, па адной лунцы ў год.

Лічылася, што гэтыя камяні валодаюць надзвычай моцнай энергетыкай. Аднойчы на вачах шматлікіх відавочцаў, дзеля эксперымента, хлапчук дакрануўся да камянёў дротам, сагнутым у выглядзе егіпецкага крыжа з пятлёй на канцы, і ўпаў, нібы падкошаны, быццам бы нейкая патаемная сіла кінула яго на зямлю і пазбавіла свядомасці. Амаль паўгода ў яго былі паралізаваны рукі. У лютым 1954 года фатограф, які

рабіў здымкі камянёў Стоўнхенджа, заўважыў на стужцы дзіўны «дэфект»: ад камянёў сыходзілі ў неба «светлавыя калоны». У 1968 годзе відавочца паведаміў, што назіраў у Стоўнхенджы светлавы аб'ект у колцы агню, здавалася, што ён сыходзіў ад камянёў. А ў 1977 годзе над помнікам зафіксавана цэлая эскадрылля НЛА, пры гэтым у відавочцаў зламаўся магнітны компас і пераносны тэлевізар, а пражэктар, прамень якога быў накіраваны на НЛА, быў выведзены са строю. Усё ўдалося зняць на стужку, і гэты фільм у тым жа годзе паказала брытанскае тэлебачанне.

Сур'ёзна «святымі» месцамі даследчыкі заняліся ў 50-я гады XX стагоддзя. І ўсё роўна найбольш важнае адкрыццё зрабілі народныя лазаходцы (людзі, якія пры дапамохзе пруцікаў лазы адшуквалі падземныя водныя патокі. – *А. Н., Я. Н.*): кожны мегаліт стаіць над падземным патокам вады, менавіта там, дзе гэтыя патокі перасякаюцца. Самотны мегір устанаўлівалі, як буй, над скрыжаванымі падземнымі рэкамі, дальмены – над крыніцамі, а хенджы над дзясяткамі рэчак і ручаёў, якія залягалі на розных глыбінях. Мяркуюць, што вада – гэта крыніца збору і захоўвання энергіі і інфармацыі. І ў месцах, дзе рэкі, быццам бы змейкі, сплятаюцца ў клубок, вада набывае ўласцівасць магічнага крышталю.

Нашы продкі ля гэтых каменных збудаванняў любілі варажыць: заклінаді зямлю на пладарод, а неба – на надвор'е. Яны даўно заўважылі, што ля мегалітаў заўсёды іншае надвор'е: калі ідзе дождж, то над камянём будзе свяціць сонца. Ці хмара быццам бы спыніцца і кружыцца да таго часу, пакуль не пральецца нябесная вільгаць.

Гальскія ваяры здзіўляліся – варта ім выправіцца ў паход, як праціўнікі, якія знаходзіліся за дзясяткі кіламетраў, даведваліся аб іхніх перамяшчэннях. Аказалася, што калі пастукваць па мегалітах пэўным чынам, то гук распаўсюджваецца з каменя на камень у адным кірунку, а па баках зусім не праслухоўваецца. І калі на гэтым канале перадачы прыкласці да зямлі вуха, то можна выдатна пачуць кодавы сігнал на адлегласці 15 кіламетраў!

Іншыя даследчыкі паказалі, што менгіры, быццам бы своеасаблівай змейкай, абвіты энергетычнай стужкай, якая падымаецца ўверх. І стаяць яны ў кропках збору адмоўнай энергіі, пераўтвараючы яе ў станоўчую, а дальмены самі выпрацоўваюць станоўчую энергію. У народзе гэтыя месцы называюць зонамі Сілы. Дастаткова дакрануцца да мегаліта – і рукі быццам бы абмываюцца нябачным струменем вады. Прыборы паказалі: каля мегалітаў зменены ўсе вядомыя характарыстыкі гуку, гравітацыі, магнітнага поля. Калі, напрыклад, абысці Стоўнхендж вакол з компасам і біяэнергетычнай рамкай, то чырвоная стрэлка заўсёды будзе глядзець у цэнтр збудавання, а біялакатар шалёна круціцца. Можна

прывесці ў прыклад яшчэ вялікую колькасць цікавых гісторый, звязаных з гэтым намоленым з даўніх часоў месцам.

У рускіх былінах, як і мае быць, згадваюцца і каменныя, высокія ды неператадольныя (ці цяжкапераадольныя) горы і паасобныя скалы, якія служаць своеасаблівым «прымерачным» матэрыялам для асілкаў. Двубой паміж волатамі ці бітвы паміж войскамі замяняюцца паказальнікамі фізічнай сілы канкрэтных воінаў.

На тых горах высокиих,
На той на Святой горы,
Был богатырь чюдный...
...К тому же Святогору да богатырю,
На тыи было горы на высокии.
Приезжает тут казак да Илья Муромец [3, с. 42].

Ужо нават у гэтым найстаражытным жанры рускага фальклору, засведчана тое, што на магілы міфічных асілкаў, калі яны гінулі ў няроўнай барацьбе, ці калі проста надыходзіў канец іхняму зямному шляху, сябры-паплечнікі клалі вялізны валун. Камень, які адначасова з'яўляўся і помнікам і аб'ектам пакланення, а то і вечнага шанавання слаўных подзвігаў быліннага героя пры жыцці.

Они выкопав могилу преглубокую
И спустили в могилу гроб Святогора Романова,
Засыпали песком – хрящом сыпучим;
Навалили они сер камень великий же
И зделали на нем да надпись высекли:
– Лежит под тем камнем сильный могучий богатырь
Святогор Романович;
Он родившись же был да во городе Чернигове;
По судьбе же Бога он помер во чистом поле,
Во чистом же он поле, под сим серым камнем.
«Погребение Святогора» [Тамсама, с. 55].

Наступны прыклад якраз-такі прысвечаны своеасаблівым спаборніцтвам у фізічнай сіле паміж асілкамі. Трэба было перакінуць цераз сябе (цераз галаву, за спіну) вялікі камень. Толькі на самой справе аказалася, што такая простая задача далёка не простая, бо выканаць яе не могуць ні Дабрыня Мікітавіч, ні Ілля Мурамец, а толькі справіўся з задачай Міхайла Іванавіч Патыка.

А посылает Ильюшенка Добрынюшку
А приздынуть тот камешок горючии.
Скочил-то тут Добрынюшка Микитич-он,
Хватил он этот камень, здынул его,

Здынул-то столько до колен-то он,
А больше то Добрынюшка не мог здынуть,
А бросил этот камень на сыру землю.
Подскакивал ведь тут Илья Муромец,
Здынул он этот камень до пояса.
Как больше-то Ильюшенка не мог здынуть.
«Михайло Потык» [Тамсама, с. 83–84].

Але самае непрадказальнае – гэта таксама прырода, у яе праявах і стыхіях. Таму дзіваку, які не здольны заўважыць яе, яна ніколі і нідзе не адкрыецца, не скажа пра сваю прысутнасць. Яна шматлікай колькасцю вачэй і сэрцаў вечна прыкутая да сябе самой. Яна размножыла саму сябе, каб сабою і любавацца. Яна пастаянна гадуе новых і новых нашчадкаў роду людскога і паступова прапаноўвае ім свае таямніцы.

Яна пакрывае чалавека змрокам і пастаянна гоніць яго да святла. Яна робіць яго залежным ад зямлі, непаваротлівым і цяжкім, каб потым зноў і зноў уздымаць яго ўверх. А робіць гэта праз своеасаблівую «перадачу» пэўнай каштоўнай інфармацыі, карысных выкапняў і г. д. Так атрымалася і з каменем.

Шанаванне каменя ў славянскіх народаў вядома з даўніх часін (з раннеязычніцкага перыяду, калі людзі свята абагаўлялі элементы Сусвету). Нашы продкі асаблівую ўвагу надавалі аграмадным камлыгам, тым, якія вылучаліся незвычайнай формай, а яшчэ таксама асаблівым прыродна-геаграфічным месцазнаходжаннем. Многае з шанавання было заснавана на нейкіх фізічных уласцівасцях (цвёрдасць, важкасць, здольнасць «іскрыць» пры ўдары адзін аб другі), пэўных якасцях формы (круглы, квадратны, выцягнуты, шурпаты, абсклізганы). Свяшчэннымі безагаворачна лічыліся камяні, якія ў нечым нагадвалі антрапаморфныя ці зааморфныя сілуэты, выявы чалавечай нагі, звярынага следу, а таксама камлыгі, якія знаходзіліся ў вадзе і пастаянна, трэба думаць, былі пэўнай небяспекай пры руху па водных артэрыях на чаўнах і плытах.

Паводле П. Шэйна, эстонцы, напрыклад, па-свойму тлумачаць з'яўленне камянёў на свеце. У аповесці гаворыцца, што калі Майсей пад Сінайскай гарой набіў табліцы закону, то вецер іх пыл размёў па ўсёй зямлі і з кожнай пылінкі вырас камень, а на кожным камені напісаны закон і лёс людзей» [2]. Атрымліваецца, што камяні не проста выступалі маўклівымі сведкамі сівой мінуўшчыны, але кожная здаравенная камлыга несла на сабе яшчэ і пэўны тэкстава-сімвалічны падтэкст. Раз іх уводзілі ў міфалагічны рад, то любым чынам імкнуліся зрабіць так, каб адначасова паказаць і развіццё камянёў, займанне адпаведнага становішча

ў жыцці, якое потым утрымлівалася імі на працягу ўсяго «каменнага жыцця». І гэтая пазіцыя паступова ўзбагачалася (абрастала) усемагчымымі міфічнымі, фантастычнымі і вусна-паэтычнымі гісторыямі і прыкладамі, якія давалі падставы меркаваць пра багацце духоўнага свету цэлага народа.

У беларускай міфалогіі таксама згадваецца пра тое, што камяні даўней былі жывыя, рухаліся, пілі і елі, гэтаксама, як людзі і жывёлы, але былі пакараны Божай Маці ці самім Богам за тое, што яны аб іх паранілі босыя ногі. Маўляў, іх столькі ў даўнія часы валялася (было раскідана на зямлі), што не было магчымасці чалавеку і святым нават спакойна ступіць. Здарылася гэта так: хадзіў Хрыстос па свеце і, неяк раз ідучы па дарозе, ён балюча ўдарыўся пальцамі нагі аб камень і за гэта пракляў камяні, каб яны больш не раслі. М. Нікіфароўскі сведчыў: «Камяні раслі да таго часу, пакуль Маці Божая не пабіла аб іх да крыві босую нагу, спяшаючыся да распятага сына свайго. Угнявіўшыся, яна пракляла толькі той камень, аб які пабіла нагу. Але дзеля таго што камяні ляжалі "скупіўшыся", то праклён перайшоў і на другія камяні і распашырыўся на ўсё каменне». Ён жа сцвярджаў і наступнае: «Перасталі камяні яшчэ расці і дзеля таго што хітры чалавек разгадаў боскія тайны, якія былі ўложаны ў камяні, і дзеля гэтага Бог спыніў рост камення. Па ўсім небе таксама рассыпана каменне, якое грэшнікі зносяць у адно месца. Калі камення набярэцца так многа, што яно можа праламіць неба і прычыніць людзям незаслужаную бяду, тады другія грэшнікі раскідаюць ізноў каменне па небе. Ад гэтага і вынікае гром. Здараецца, што грэшны пакутнік няўмела кіне, і тады камень ляціць на зямлю».

А. Сержпутоўскі згадвае пра іншы аспект валуноў: «Часто за грахі людзей Бог робіць іх каменем. У нас тут недалеко ляжаць кала дарог тры камені: гэто, кажуць, калісь адзін упрамы чалавек пашоў на Вялікдзень араць. Толькі ён запусціў соху, як ось зазванілі ў цэркві. У той момант сам чалавек і валы абернуліся ў камене да так і ляжаць да тых час, бо ніхто не асмеліцца чапаць іх, каб яны ляжалі да напаміналі людзям, як Бог карае за грахі» [30, с. 49].

Пра здольнасць валуноў павялічвацца ў памерах сведчаць некаторыя беларускія загадкі: «Без кораня, а расце» ці «Што расце без кораня?». Разгадка, натуральна, – камень. Тыя камяні, што ляжалі на водных шляхах і з'яўляліся сур'ёзнымі перашкодамі для лодак, суднаў і плытоў, карысталіся асаблівым шанаваннем, захаваннем і выкананнем пэўных рытуальных дзеянняў. Аб такія камяні і каменныя платы («заборы») часта разбіваліся чаўны і гінулі тавары, ды і людзі таксама пастаянна рызыкавалі жыццём.

Такім «заборам» усе, хто праплываў па рэках, у абавязковым парадку прыносілі паднашэнні – набліжаючыся да небяспечнай перашкоды, кідалі прама ў ваду акрайчык хлеба, іншыя прадукты, а таксама нешта з тых тавараў, што везлі з сабою. Мясцовыя жыхары, асабліва ў даўнія часіны, вымушаны былі пастаянна ахвяраваць «заборам» свойскую жывёлу (казу, авечку, свінню) ці птушку (гусака, пеўня). Тое ж самае адзначалася і ў суседніх з Віцебшчынай раёнах Расіі.

У руках кемлівага чалавека камень служыў і сельскагаспадарчай прыладай, без якой немагчымае было існаванне нашых далёкіх продкаў. Нават першыя свае гаршчкі людзі рабілі не з гліны, як мы сёння думаем, а выдзёўбвалі з суцэльных камянёў і толькі праз значны прамежак часу здагадаліся, што ўсё гэта можна зрабіць намнога прасцей, з меншымі затратамі сіл. Так з'явіўся гліняны посуд, які да нашых дзён верай і праўдай служыць чалавеку.

Да гэтага часу ў народзе згадваюць камень з дзіўнай, здавалася б, назвай Вітаўтавы талеркі (Лепельскі раён, ваколіцы возера Варонецкага). Народная легенда апавядала, што на беразе возера доўгія часы ляжаў камень, у верхняй частцы якога былі выдзеўбаны шэсць талерак. Людзі сцвярджалі, што за гэтым своеасаблівым сталом палуднаваў вялікі князь Вітаўт, калі ў 1426 годзе браў прыступам замак Варонеч. Дакладна вядома, што ў 1844 годзе камень гэты разам з берагам абваліўся ў возера, але потым яго выцягнулі з вады і прывезлі ў маёнтак Варонеч. Сам па сабе ён быў не такі ўжо й высокі – прыкладна адзін метр у вышыню і ў акружнасці каля чатырох метраў.

Камень для старажытнага чалавека сімвалізаваў сабою веліч і сілу. З каменем ён сам не заўсёды мог управіцца і бачыў у гэтым адлюстраванне магутнасці, якая была большай за яго ўладу і сілу. М. Мялешка ў свой час сцвярджаў, што «вераванні і выабражэнні, звязаныя з каменем на раніцы жыцця чалавека, паклалі свой след у так званым святарным пісанні». У кнізе Ісуса Навіна (У, 2) апавядаецца, што Ягова загадаў Ісусу зрабіць тры каменных нажы (у Бібліі «вострыя». – *А. Н., Я. Н.*) і абрэзаць імі другі раз сыноў Ізраілевых. У перакладзе гэтай жа кнігі сямюдзесяццю тлумачамі (кн. І. Н. XXIV, 29 і 3) чытаем гэткае паданне: "І ў магілку, у якую апусцілі яго (Ісуса Навіна), палажылі каменныя нажы, каторымі ён абразаў дзяцей Ізраілевых у Галгалах (Галгале. – *А. Н., Я. Н.*), пасля вываду іх з Егіпту, па загадзе Яговы, і яны (тыя нажы) там да цяперашнага часу". Як сведчаць Герадот (кн. ІІ. ч. 86) і Дзіядор Сіцылійскі (кн. І, ІІ), егіпецкія бальзамоўшчыкі мумій ускрывалі нябожчыкаў нажамі, якія былі зроблены з крэмня альбо наогул з каменя. Ціт Лівій (І, 24) кажа, што ў рымлян загадчык таварыства афіцыялаў... у час замірэння калоў ахвяр-

нае парася крамнёвым нажом. Народ этрускі, які, згінуў, насіў крамнёвыя стрэлы на шыі, якія лічыліся ў іх галоўнай аздобай сярод дарагіх залатых пацерак. У егіпцян, фрыгійцаў, грэкаў меліся каменныя нажы і сякеры з выразанымі на іх іерогліфамі, малюнкамі боскіх эмблем і пасведчаннямі. Падобныя рэчы шмат якія народы, каторыя ўжо мелі багатую металёвую прыладу, клалі нябожчыкам у магілы пры пахаваннях» [25, с. 11].

Старажытныя людзі верылі ў тое, што ўсё на свеце можа жыць і размнажацца – ці то чалавек, дрэва, знічкі ці звычайныя камяні. Таму і пакланяліся нашы далёкія продкі камяням, лічылі, што яны жывыя і могуць расці, аддзяляцца адзін ад другога, перасоўвацца на значныя адлегласці, разумець не толькі стыхійныя з'явы прыроды, але ўмешвацца ў будзённае жыццё сялян. Усё гэта знайшло адлюстраванне ў вуснапаэтычных творах.

Аб веры людзей у тое, што камяні раслі, яскрава сведчыць наступная легенда: «Даўней камянё раслі вялікія, так, як хаты. Аднаго разу йшла матка найсвета і збіла пальцы аб камень, так заплакала, раўне і кажа:

– Ах, дай Божа, каб вы ўжо гэтакія не раслі!

Так ужо ад гэтае пары хаця растуць, але памалу і ўжо невялікія» [20, с. 354].

Пасля ўвядзення хрысціянства, каб падкрэсліць перавагу новай веры, паданне сведчыла, што камяні растуць, як толькі ў царкве пачуецца першае пяянне «Хрыстос уваскрэс», пакуль не будзе выканана апошняе слова малітвы. Рост гэты такі малы, непрыкметны, што, пражыўшы тысячу гадоў, чалавек убачыў бы, што камень вырас толькі на таўшчыню "мезенага пазгногця" на руцэ чалавечай.

Паводле А. Сержпутоўскага: «Каменне раней расло, як усялякая расліна, але яно так глушыла ўсё на зямлі, што Бог вялеў яму расці толькі на адну пушку ў вышкі. От затым мы не прыкмячаем, як камене расце» [30, с. 49].

У народзе нават існуе казка, «паводле якой камяні даўней хадзілі па зямлі, елі, пілі і рабілі ўсё патрэбнае для людзей. Людзі тады жылі без працы і клопату. Гэта была самая шчаслівая пара чалавечага жыцця. Але ўмяшаўся чорт, і ўсяму шчасцю прыйшоў канец. Адзін раз камяні сышліся і пастанавілі выбраць сабе царом залаты камень. Але чорт захацеў паказаць, што крэмень можа зрабіць больш, чым залаты камень. Чорт паклікаў да сябе крэмень і жалязняк, сказаў ім стаць каля хаты і ўдарыцца галовамі адзін у другога. Ад удару з крэменю пасыпаўся агонь і полымя, і полымя ахапіла ўсё кругом. Людзі ў агні сталі знаходзіць спечаных звяроў і скарбы, якія спадабаліся ім, і яны сталі ў сябе

дома раскладваць вогнішча і варыць страву. Бог, бачачы, што ад гарачага агню шмат дзеецца шкоды і каб пастрымаць людзей, забіў маланкай дзесяць чалавек. Камяням жа за тое, што яны выклікалі агонь, Бог зрабіў так, што яны перасталі хадзіць і гаварыць, есці і піць і заўсёды ляжаць як нежывыя» [20, с. 353].

Здаравенныя камяні здольныя былі ўзнагароджваць, спачуваць, а то і сурова караць людзей, якія жылі побач з імі, звярталіся да іх за нейкай парадай ці дапамогай. Так спрадвеку пераказвалася ў народных паданнях, і нашы продкі не надта імкнуліся нешта адмаўляць, перайначваць. Для іх за лепшае было, каб усё заставалася па-старому (славутае «мы старыны не рушым...» гаспадарыла і тут; паспрабуй, перарабі, а потым давядзецца адказваць ці на ўласным лёсе ўсё гэта адчуць). Напрыклад, паданне «Бога блюда». «Калісьці, як я быў яшчэ невелькі, у дзевятым року, гадоў чатырнасце меў я, пасвіў быдла ў Каргадох у дзеда. І там з пастухамі мы гулялі, лёталі, потым пастухі кажуць:

– Ідзём паглядзець, на Гіркоўскім полю ест блюда, Бога блюда, дзево блюдас па-літоўску.

Павялі мяне паказаць. То харошая пліта, на той пліце пасярэдзіне такой велічыні, як талерка, тое блюда. А па сторанах такія, як сподачкі, глыбіною, зноў выбітыя і так як вышліфаваныя, гладзенькія. Дзево блюдас – называлі людзі.

То там адзін шляхціц задумаў тую пліту прывязці на пліту пад дзверы, дзе ходзіць. Харашо яму паглядзець, яна такая гладкая тая пліта была, і тое блюда яму наравілася там. Наліць вады, то і куры могуць наліцца з таго блюда. Павёз ён тую пліту. Не малая тая пліта – якія чатыры мужчыны трэба каціць у воз. То той шляхціц прывёз пад ганак і палажыў. І стаў хадзіць ужо ён, углядацца, цешыцца. То калі стала яму ногі круціць, сталі балець ногі, рамацізма якая ўзяла круціць. То ён потым дагадаўся, кажа:

– Мусі я зграшыў Бога, трэба етая пліта вясці там, дзе яна была.

Як адвёз назад, тады перасталі яму балець ногі. І тая пліта ляжала да шаснаццатага року, добра помню, ніхто з таго месца не рушыў. А тэрас я не ведаю. Ужо я чалавек стары, а каб паінтарэсаваўся, то дапытаўся б, абнашоў бы яе, тую пліту, божа блюда. От, маё ты дзіцятка, ета ж не дзіць быўшы, а ўсё помню» [Тамсама, с. 355].

Культ камянёў быў шырока распаўсюджаны на Беларусі. Некаторыя з іх мелі нават уласныя імёны: Кравец, Сцяпан, Змяіны камень, Чортаў ступень, Святы камень і г. д. Славіліся камяні Дзям'ян і Сцяпан ля вёскі Пярэжыр Пухавіцкага раёна. Лічылася, што ўсе яны маюць магічную сілу, лечаць хворых. У старадаўнія часы да іх неслі палатно, грошы,

цялят, парасят. Дзяўчаты, просячы сабе жаніха, прыносілі пярсцёнак альбо некалькі пацерак.

Чамусьці ў народнай традыцыі вельмі часта камяні цесна звязваліся з агромністымі гадамі, вужамі, змеямі. Мабыць, гэта асацыяцыі з тым, што пад такімі камянямі заўсёды жылі гады, а раз камяні велізарныя, то і гады, адпаведна, маюць (мелі) гэткія ж самыя памеры. З'яўленне такіх гадаў на зямлі часта таксама падавалася зыходзячы з фантастычна-казачных пазіцый. «Ад вёскі... у адлегласці дзвюх вёрст, быў узгорак ля дарогі, на ім ляжаў вялізны Вужаў камень. Старыя людзі гэтак аб ім расказвалі.

Раз улетку ў ціхую пагодлівую ноч ляцеў, агнём шыбаючы, вуж з поўначы на паўдня, як бы несучы з сабой многа золата і срэбра грэшніку, каторы чорту душу запісаў. Бачылі гэта дарожнікі і налле, ідучы з прыгону. Раптам адчынілася неба, светласць вялікая разлілася, людзі, молячыся, валяцца на зямлю, а вуж, выцяты нябеснымі косамі, валіцца на ўзгорак і пераварочваецца ў камень. Скарбы ж золата і срэбра, што нёс з сабой, там жа на месцы самі закапаліся ў зямлю і з таго часу з'яўляліся на розных месцах узгорка ў розных постацях. Адны бачылі плачку на камені, каторая выцірала сабе слёзы насаткай, палючай агнём, другія – позна ідучы дарогай, угледалі карлюкоў чорных і тоўстых, як бочка, іншым з'яўляліся чорныя казлы, каторыя з зямлі скакалі на камень, а з каменя на зямлю, і шмат іншых дзівосаў.

Гукалі яшчэ, што калі хто асмеліцца ля Вужавага каменя начаваць, то дастане гэтыя скарбы» [Тамсама, с. 351–352].

Часам нават падкрэслівалася, што камень нагадваў сабою чалавечае жыллё, у якім гаспадарыў мудры і прыгожы (аднагаловы, а то і некалькі галовы) змей. Займаўся народнымі рамёствамі і дасягнуў у іхнім выкананні незвычайнай дасканаласці. Нікога з бліжэйшага наваколля нельга было паставіць з ім побач у гэтым плане. Як тыя майстры не стараліся, а ўсё роўна яны саступалі. Таму і засталася самабытная пагудка сярод простага люду на доўгія стагоддзі. «Паміж Коўткава, паміж Гогалеўкі і ад Віркаў недалёка ёсць пры старадарожжы, на Ігрыв, Змяёў камень, з вакном і з дзвярамі.

Старыкі казалі, што калісь-то даўно ў гэтым камені змей жыў, з адной галавой, у вобліччу чалавеччу, і гаварыў так, як чалавек. І ён большы кравец быў, бальшы дужа, харошы. І занясуць яму сукно шыць, і пададуць яму праз вакно, і папросяць:

– Майстрок, пашый абы надзець, хоць бы дрэнна!

Дык ён пашыец, што і на свеці ніхто так добра не пашыец, як ён. Прыдзець за сярмягай за той і прынясець яму грошы. Ён гэту сярмяжку

яму аддась, а грошы возьмець к сабе – абы колькі там, хоць і троху. Ну, як хто скажаць:

– Майстрок, пашый мне хорашанька, каб было ў цэркву ў чым схадзіць, – дык ён адзін рукаў пад задам прыш'ець, а другі ў плячах. Гэнак і выш'ець. Не прасі яго, каб у цэркву схадзіць. Як просіць – кала сахі хадзіць, дык вышыець, так адчаканіць, што хоць куды. А як просіць – на святы дзень, дык здзелаець так, што ні сабе ні людзём. Прыдзець ён браць – грошы падай! Возьмець грошы, тагды праз вакно выкінець – палучай тваё!

Дык вот ён у Бузер'і (Абазер'і) пад Лукомлем любіў дзеўку. Дык яна ад яго хавалася, харанілася, але ён яе ўсюды находзіў. Ну й к таму прывёў, што мусіла яна жыць з ім. І доўга так жылі – як мужык з жонкай. А дзяцей не было: ад іх не бываець. Дык ён бывала абернецца так, дугой, над возерам над Лукомскім, ды так і цягнець. А як толькі на зямлю апусціцца, дык і здзелаецца ў чалавечае аблічча – паніч такі, што хоць куды.

Ну, дык вот раз, у нядзелю, была яна, дзеўка, пасціла свінні на полі. І ён прыляцеў і к ёй на поле. І ўзяў ён свіней сабраў у кучу, і сказаў:

– Паішчы ў мяне ў галаве. Ды толькі паглядай, каб адкуль хмара не пацягнула.

Ён лёг і заснуў. Яна ў яго ішчаць. А хмара находзіць з западнага боку, дзе сонца заходзіць. І яна яго не разбудзіла наўмыслі: "Што? Пакуль ты мне будзеш дакучаць?" І датуль не будзіла, пакуль гром загрымеў над галавой. Як загудзеў гром, так ён і ачхнуўся. Ачхнуўся і гаворыць:

– Вось жа калі ты мяне зжыла з свету.

Ускочыў ён, і так ляснуў ёй па шчацэ па левай з правага боку – так і высмаліў на шчацэ пяць пальцаў, і пачарнелі. І на ўсю жысць так асталісь пальцы знашно, і памерла з тымі пальцамі. А сам выцягнуўся дугой і паляцеў цераз вазяро, паміж Агурца і паміж Сіманавіч – дзеравушкі, – прама ўдарыўся, з тыя дзярэўні да ў сваёй хаці. Так яго пярун і дзёрнуў на возеры. Дзёрнуў, а ён ляціць. Ён другі раз, – дык ён упаў на возеры. Але ўхваціўся знова і паляцеў.

Старык быў у Бузер'і, дык ён случыўся на гэна дзіва і ўсё гэна відзеў. Ну, дык ён пераляцеў цераз вазяро, а пярун у трэці ўдарыў, у лясу ўжо, саўсім з берагу, з поля зляцеўшы. І ўбіў яго.

І трое сутак дождж ішоў пасля таго, пакуль яго найшлі. Старык той паказаў:

– Шукайце, – каець, – там і там: на наша поле паляцеў.

Ён так, як дуга ці вужака, ляціць; знашна, што змей. Ну, найшлі і закапалі яго. Так дождж і паціх. Але цераз суткі апяць ён на версе. Так

узнова дождж і пайшоў. А грамоты большыя: пярун уцяшаецца, пярэць у яго нежывога – каб не джыў. Хавалі яго гэнак разоў тры ці чатыры. Дык усё на версе. І як выйдзець, так сажняў на колькі і цягнець усё ў той бок, дзе яго хата, усё пацягуець далей. Старыкі кажуць, што каб пагода пастаяла, дык ён аджыў бы. Ну, а Бог міласцівы так даваў, што сычас нацягнець хмара, і грамоты, і дажджы дужа пойдуць, і перуны паляць у яго. І дужа была вада вялікая: чуць зямлю не адтапіла. Ну, дык прыснілася тады таму старому Бузерскаму, што сабраць малых дзяцей-неязнатак, і жарабятак гэных сяголетніх, і вазіць зямлю ўва топках, і ў прыполах, а жаробачкам торбачку насыпаць ды на шыю. Сталі так насіць, сталі насіць, дык і засыпалі, і прапаў...

І курган цяпер там, паміж Сіманавіч дзярэўні, і паміж засценку ў лясу. Дзеўку тую шчэ дзед мой – памёр, як я маленькі быў, – казаў, што відзеў» [Тамсама, с. 352–353].

Архетып вужа ў беларускім фальклоры займае значнае месца. Асноўныя жанры, дзе ён сустракаецца: казкі, замовы, былічкі, зрэдку – загадкі, прыказкі, прымаўкі. Прычыны абагаўлення, відаць, патрэбна шукаць зноў-такі ў тым, што ў старажытнасці патрыярхальны чалавек не мог растлумачыць само з'яўленне вужоў на зямлі, звязваючы яго то са струменямі дажджу, то з глеем, то з непасрэдным нараджэннем Зямлі. Чамусьці менавіта вуж надзяляўся ў народзе найбольш таямнічымі рысамі (у адрозненне ад гадзюкі, якой уласцівы былі бязлітаснасць, хітрасць, уменне нечакана нападаць). Прыгадаем, дзе, у якім выпадку вуж выступаў носьбітам нейкіх адмоўных рысаў. Такога амаль не здаралася, за выключэннем хіба што аднаго-двух прыкладаў.

Вужы – істоты водна-зямныя. Іх любімае месцажыхарства – вадаёмы, забалочаныя мясціны, падземныя норы. Маскіровачная афарбоўка надае ім знешняе падабенства з парыжэлай на сонцы купінай, каменем ці проста расколінай у засохлай глебе. Патрыярхальны чалавек, якому ўся прырода ўяўлялася адухоўленай, бачыў у гэтым таямнічы, магічны сэнс. Калі ўсе іншыя істоты нараджаюцца звычайным шляхам, то стварэнні хтанічныя з'яўляюцца на свет прама з глебы, шчодра змочанай апладняльным дажджом, яны – прамое параджэнне Сусвету. Яшчэ Плутарх быў цвёрда перакананы ў тым, што жабы і мышы, вужы і гадзюкі самі па сабе нараджаюцца з марскога глею.

Асноўная ўласцівасць зямлі, якая мела ў вачах старажытнага чалавека першаснае значэнне, – гэта ўрадлівасць. Нязведаная цудадзейная сіла штогод давала жыццё раслінам і збажыне, людзям – хлеб надзённы, а жывёлам – корм. З'яўленне з мёртвай глебы жывых парасткаў было шматвяковай загадкай. Паралельна з абагаўленнем шчодрай глебы па-

ступова фарміраваўся і культ жывёл (жывых істот), якія ў сваю чаргу лічыліся яе адлюстраваннем і сімваламі. Таму ўсе якасці зямлі прыпісваліся ў роўнай ступені і ім. Так і атрымлівалася, што хтанічныя стварэнні насуперак сваёй нязначнай ролі ў жыцці чалавека ў народнай міфалогіі набылі зусім іншае, можна сказаць цудадзейнае значэнне.

У сілу вышэйназваных прычын вужоў шанавалі як істот, ад якіх у некаторай ступені залежала ўрадлівасць зямлі. У іх бачылі пасланцоў добрых багоў і звярталіся з малітвамі аб хуткім дажджы, добрым ураджаі, а часам і аб простым чалавечым шчасці. Акадэмік Б. Рыбакоў не без падстаў адзначаў: «Вуж, які жыве ля вады і выпаўзае падчас выпадання нябеснай вільгасці, тым самым быў ужо звязаны ў свядомасці першабытнага земляроба з незразумелым механізмам з'яўлення дажджу» [29, с. 190–191].

Старажытныя славяне лічылі, што вужы – гэта не што іншае, як дажджавыя струмені, якія льюцца з неба на зямлю і застаюцца на ёй назаўжды. На гэты факт скіроўваў увагу і Б. Рыбакоў: «Жывы пачатак зямлі адлюстраваны толькі вадаплаваючымі птушкамі і змеямі-вужамі» [Тамсама, с. 516].

Як бачым, просты метэарыт, які вогненнай вужакай на вачах у людзей праляцеў праз усё неба і ўпаў на зямлю, асацыяваўся ў свядомасці патрыярхальных людзей з вобразам усёмагутнага свяшчэннага вужа, нестамляльнага пасланніка нябёсаў.

А вось што аб гэтым можна прачытаць у А. Афанасьева: «У вогненным змеі (у нашым выпадку вужы. – *А. Н., Я. Н.*) народная фантазія, ствараючы міфічныя вобразы не інакш як на аснове падабенства і аналогіі з сапраўднымі з'явамі, увасабляла маланку, мудрагелістыя формы якой нагадвалі паўзучую па зямлі змяю, а раўназначна паветраныя метэарыты і знічкі, якія неразвітаму народу з-за таго ўздзеяння, якое яны аказвалі на вочы людзей, здаваліся аналагічнымі з бліскучым маланкам... У старажытнасці погляд гэты быў агульнапрынятым, як бачна з летапісаў і іншых старажытных помнікаў. Пад 1028 годам летапісец гаворыць: "Знамение явися змиево на небесехъ, яко вид ти всей земле"; пад 1091 годам: "Спаде превеликъ змий отъ небесе – ужасашася вси людье"; 144 год: "Бысть знамение за Днепромъ въ киевской волости: летящю по небеси до земли яко кругу огнену, и остася по следу его знамение в образе змея великаго, и стоя по небу съ часъ дневный и розидеся"; "1556 год: "Бысть знамение того места, где звезда была на небеси, явися, яко змий образомъ, без главы стояше... ино яко хобот хвостъ сбираше, и бысть яко бочка, непадя на землю огнёмъ, и бысть яко змий на земли"» [2, с. 509–510].

Амаль паўсюдна на Гомельшчыне вядома легенда пра славуты Цітаў камень, які, паводле сцверджанняў мясцовых жыхароў, раней мог свабодна перамяшчацца з аднаго месца на другое і ўвесь час павялічваўся ў памерах (дарэчы, ён з двух бакоў акуратна абчасаны. – *А. Н., Я. Н.*). Людзі сцвярджалі, што гэты валун вельмі дапамагаў сялянам, асабліва бедным. Калі не было чалавеку чаго есці ці апрануць, трэба было толькі звярнуцца да каменя, і ён адразу ж выручаў – карміў, паіў, апранаў, прычым усе гэтыя паслугі валун аказваў задарма.

У навуковай літаратуры можна знайсці і іншыя выказванні, якія лішні раз падкрэсліваюць святасць асобных камянёў. «У Магілёўскай губерні апавядаюць аб камянях-краўцах, маўляў, патрэбна толькі з вечара пакласці на гэты камень сукно і сказаць, што сшыць, а да раніцы вопратка будзе гатова. Некаторыя камяні карыстаюцца шанаваннем і прыцягваюць да сябе прыхільнікаў» [25, с. 4].

Згадванне шматлікіх камянёў-краўцоў і камянёў-шаўцоў сведчыць пра тое, што гэты сюжэт быў надзвычай пашыраны ў вусна-паэтычнай творчасці беларусаў. Можна прывесці некалькі прыкладаў. «У Вароніне, кала Сякірына. Ёсць камень кала ракі, над вірам. Там, гаворацць, бывала, шыў нехта. Верна, чорт, хто ж там болі? Вот, прынясі сукно ці што сабе другое, ды палож на камені, грошы палож – пятак ад штукі – не трэба ні мерацць, нічога, – чараз ноч будзець гатова. Ну, й шыў ён гэдак доўга. Але раз адна баба прынесла сукно, палажыла на камень ды кажыцць:

– Пашый мне не тое, не гэта.

Ён узяў і пашыў ёй ні тое, ні гэта: адзін рукаў у плячо ўшыў, а другі адзаду. І бросіў шыцць з таго; і цяпер не шыецць. Дык і цяпер яшчэ ёсць логавішча, што ён сядзеў, і кажуць, знашны былі ножні і ўсё кравецкае, струмэнт, але цяпер мохам ён парос, дык толькі адно логавішча знашно» [20, с. 353–354].

Што самае цікавае, у фальклорных творах абавязкова падкрэсліваецца, што здарылася ўсё гэта быццам бы і вельмі даўно і, разам з тым, засталіся сведкі, іхнія сведчанні, на бліжэйшай мясцовасці запроста маглі паказаць тое месца, дзе ляжаў некалі легендарны камень. Тут дзейнічала характэрная рыса фальклору – пераемнасць. Калі ад аднаго пакалення да другога перадаваліся звесткі, цікавыя сюжэты, якія падкрэслівалі багацце духоўнага свету нашых продкаў, якое назіралася, здавалася б, у самым звычайным і будзённым. Умелі яны з гэтага простага стварыць захапляльнае. «У нашым баку многа ё камняў... На іх каплічкі строяць. Адзін такі камень... увесь на літарах. І толькі трох слоў не разабраць. А калі б разабралі, да ба зналі, як на том свеце, як на етам. Такі камень е ў Васілевічах Мазырскага павета.

А ў Славені дак е такі камень-кравец. Ён усім адзежу шыў. Як прынясе хто сукно да скажа:

– Сцяпан, сшый мне кафтан! – Дак ён і сшые.

Звечара сукно палажы, а нарання й гатова. Дак адна баба прынесла раз сукно да й кажа:

– Сцяпан, сшый мне ні тое, ні сёе.

Назаўтра прыходзя – агу! Адзін рукаў там, дзе трэба, а другі на поле, унізу.

Ну й годзе з тых пор шыць. А ножні й цяпер на ім знашны» [«Камень-кравец» [Тамсама, с. 354].

Іншым разам падкрэслівалася не тое, што камень быў краўцом ці шаўцом, а ў назве захоўвалася ўказанне на «цудадзейнасць» валуна. Ягоную начную працу мясцовы люд адносіў да самых, што ні на ёсць, «цудаў». У іх верылі. Прычым, верылі без сумневу, безагаворачна, бо лічылі, што калі пачнеш сумнявацца, то тады камень таксама можа павесці сябе па-іншаму і перастаць выконваць людскія замовы («Цудадзейны камень»). Што немалаважна адзначыць, то ўсе камяні, звязаныя ў народзе з шавецкім і кравецкім промысламі, Э. Ляўкоў адносіць да валуноў, якія мелі трывалыя адносіны з нячыстай сілай. У ягоным светапоглядзе знайшло адбітак позняе хрысціянскае трактаванне такой справы: калі нешта, што можна было падаваць як незвычайнае, царкоўнікамі адразу ж прылічвалася да праяў чараўніцтва. «У Ашмянскім павеце, за мястэчкам Смаргоні, пры Мінскай паштовай дарозе, на лузе ляжыць камень даўжынёй пяць аршын, шырынёй – чатыры. Далей, за Смаргонямі, ёсць камень яшчэ большы за гэты... Ад яго і бліжняе мястэчка завецца Камень... Пра гэты больш камень расказвалі, што нібы ў даўнія часы, калі хто пакладзе на яго два злотых (30 капеек серабром), дык, вярнуўшыся дадому, знаходзіў боты, якія невядома адкуль узяліся» [Тамсама].

У некаторых паданнях гаварылася пра тое, што, звяртаючыся да каменя з замовай, неабходна было памятаць яшчэ і пра пэўныя ўмовы, без якіх ён не мог спакойна працаваць, бо тады адчуваў на сабе нейкі непажаданы ўплыў, найперш, рэлігійна-царкоўны. Так у выніку і атрымалася, што менавіта святчэннікі паклалі канец бескарыслівай працы каменнага шаўца на карысць простых людзей («Камень-шавец»). «Невялікае мястэчка Камень названа так ад вялікага каменя, які знаходзіцца непадалёку на вельмі відным месцы. Пра той камень расказваюць такую гісторыю. У ім, у камені, жыў шавец. Дзвярэй у яго хаце не было, а было толькі адно акенца, хоць цяпер ад гэтага акенца і слядоў няма. Усякаму, каму трэба былі боты, варта было падысці да акенца,

сказаць аб сваім жаданні, назначыць час і пакласці грошы, колькі – невядома, а вядома толькі, што лішка выкідалася праз акенца, і абутак быў гатовы ў свой час. Боты былі цудадзейныя: іх можна было насіць пятнаццаць гадоў і чым часцей бываць на ігрышчах, тым лепш, але толькі з умоваю не хадзіць у царкву, там яны адразу распадаліся на дробныя кавалкі. Свяшчэннікі, угледзеўшы ў гэтым шаўцы злога духа, сатварылі заклён над каменем, і з таго часу спыніўся выраб цудадзейных ботаў. Самога шаўца ніхто не бачыў, ніхто з ім не гаварыў, і хто ён такі – застаецца таямніцай» [Тамсама, с. 354–355].

У Э. Ляўкова пра гэтакую сумную падзею і распавядаецца значна трагічней: «Толькі аднойчы п'яны жартаўнік папрасіў зрабіць яму "ні тое, ні сёе". Пакрыўдзіўся камень – перастаў шыць. Даведалася пра гэта Ульяна, прыбегла ў поле. Упала на камень і доўга горка плакала. Але той маўчаў. Цяклі слёзы па гладкіх баках каменя на зямлю, збіраліся ў ручаі, раку. Толькі вецер шумеў у кронах навакольных дрэў: "Ву-у-лля-на... Ву-у-лля..." З таго часу і сталі называць раку Вулля або Вялля (Вілія)» [22, с. 135].

Ці вось такі распаўсюджаны варыянт: «У Ашмянскім павеце, за мястэчкам Смаргонь, пры Мінскай паштовай дарозе, на лузе ляжыць камень пяць аршын, шырынёй – чатыры. Далей за Смаргонямі ёсць камень яшчэ большы за гэты... Ад яго і бліжняе мястэчка завецца Камень... Пра гэты большы камень расказвалі, што нібы ў даўнія часы, калі хто пакладзе на яго два злотых, дык, вярнуўшыся дадому, знаходзіў боты, якія невядома адкуль узяліся» [25, с. 5].

Агульнавядомы сюжэт, паводле якога вынікала, што пярэчанне царкоўным уладам, царкоўнікам, выступленне супраць строгіх хрысціянскіх канонаў, заўсёды сурова каралася. Сурова і павучальна. «Усім астатнім на навуку!» Каб ведалі, як у нечым сумнявацца, спрабаваць насміхацца, недавяраць царкоўнаму вучэнню і г. д. Самае галоўнае, што пры такім пакаранні заўсёды знаходзіліся абавязковыя сведкі, якія запроста маглі засведчыць тое, што тут адбылося на самой справе, каб потым пераказаць сваім нашчадкам. Мала таго: у народзе таго шаўца называлі «філосафам», што ў тыя часы сярод простага люду заўсёды асацыявалася «з адмаўленнем усяго святога...» («Пра камень Гомсін»). «Каля мястэчка Кура, у дзевяці вёрстах ад павятовага горада Вілейкі, на полі ляжыць здаравенны камень, які завецца Гомсін. Сяляне расказваюць, што на гэтым месцы даўным-даўно жыў шавец Гомсін. Ён быў філосаф, ні ў ва што не верыў, не хадзіў у царкву і не пільнаваўся свят. І вось на Вялікдзень Гомсін разважыў так: калі ў будзень ён можа пашыць адну пару ботаў, дык у Вялікдзень пашыць дзве пары. Сказаўшы пра гэта сваім і суседзям, ён заўзята пачаў рабіць, яшчэ і пасмейваючыся з тых,

што пайшлі ў царкву, – маўляў, тады, як яны марнуюць час, ён у той дзень удвая больш зробіць.

Вось народ валіць ужо з царквы, а Гомсін усё яшчэ сядзіць за работай. Але як толькі людзі падышлі да яго хаты, на ясным блакітным небе раптам з'явілася грозная хмара, лінуў дождж і ў той жа час грымнуў гром у хату самога Гомсіна. Уражаныя і асепленыя так нечакана бліснуўшай маланкай, людзі пападалі на калені і закрылі вочы рукамі. Калі ж усё сціхла і крыху заспакоеныя людзі адкрылі вочы, – які жах іх ахапіў, калі не ўгледзелі ні хаты Гомсіна, ні яго самога, нібы ніколі іх і не было. На тым жа месцы, дзе была хата, ляжаў вялікі камень, як нямы сведка грознай падзеі...

Камень той і зараз ляжыць. Многія з сялян упэўнены, што... нахіліўшыся да камня, чуюць, як спявае певень і стучыць шавецкі малаток. Яшчэ сцвярджаюць, што амаль штолета ў гэты камень ударае гром, а ён і сапраўды ў многіх месцах патрэсканы» [20, с. 355].

А вось пра што згадваў М. Мялешка: «Каля вёскі Рудабелкі б. Бабруйскага павета знаходзіцца камень, які, згодна з народным паданнем, дапамагае ад хваробы вачэй і інш. Пры царкве ў в. Горках Дзеравенскай воласці Слонімскага павета Гарадзенскай губ. некалі стаяў вялікі камень накшталт калоны. Гэты камень расшчапіўся на тры часткі. Верхняя частка, затрымаўшыся ў сваёй аснове, адным канцом абаперлася на зямлю так, што пад каменем утварыўся праход, праз які даўней мог лёгка праходзіць чалавек. Камень гэты ў народзе лічыцца ўбогаяўлёным, і некаторыя святыя (у значэнні вернікі. – *А. Н., Я. Н.*) людзі, стаўшы на калені, праходзілі пад ім, веруючы, што камень дасць ім жаданую дапамагу. Надзвычай цікавы камень гэтай групы знаходзіцца каля м-ка Пагост на Случы, Слуцкага павета ў Дарогінскай парафіі, у Мардвілаўскім лесе. Гэты аграмадзісты валун мае форму ўсечанае піраміды, пляцоўка піраміды мае да 4 метраў у квадраце. Пасярэдзіне гэтае пляцоўкі праз невялікую атворыну б'е фантанам халодная крынічная вада. На "Макавея" каля каменя адбываецца сход народа, які прыходзіць кланяцца каменю: цалуюць яго і п'юць ваду. У часе апошняй вайны (маецца на ўвазе Першая сусветная вайна. – *А. Н., Я. Н.*) адзін ваенны інжынер меўся ўзарваць яго, але народ, зышоўшыся, упрасіў не чапаць каменя» [25, с. 6].

ТРАДЫЦЫЙНЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

# МАГУТНЫЯ ЯЗЫЧНІЦКІЯ БОСТВЫ І ІХНІЯ СУВЯЗІ З КАМЯНЯМІ

Агульнавядома, што дакладных звестак пра нашых продкаў-язычнікаў вельмі мала, ды і тыя надзвычай моцна дэфармаваныя часам, падзеямі, уплывамі, увядзеннем хрысціянства на спрадвечна нашых землях. Усё гэта накладвала (і наклала!) значны адбітак на светапогляд продкаў. Таму светапогляд і светаўспрыманне далёкіх прашчураў застаюцца для нас, сённяшніх, той таямнічай схованкай, да якой амаль немагчыма дабрацца. Трэба абавязкова ўлічваць і тую акалічнасць, што як бы мы не імкнуліся, але ўсё роўна так і не зможам прасякнуцца той надзвычай далёкай ад нас своеасаблівай сістэмай каштоўнасцей, зажыць ужо зніклым адчуваннем свету, які некалі існаваў, напоўніцу квітнеў, але да драбніц растварыўся ў часавай прасторы.

Менавіта ў дахрысціянскім часе, а можа яшчэ і значна глыбей, знаходзяцца карані беларускай народнай міфалогіі. Язычніцкія ўяўленні нашай зямлі адрозніваюцца ад агульнаславянскіх і нават ад некаторых усходнеславянскіх. Так здарылася ў сівыя стагоддзі. Плямёны, якія на-



*Камяні са старажытнымі знакамі*

сялялі ўсходнеславянскія землі, развіваліся нераўнамерна з нейкіх прычын, што ўплывалі на гэты працэс. Шматлікія этнічныя кантакты, якія мелі плямёны, што жылі па суседстве, міжволі прыводзілі і да непадабенства ў шанаванні багоў.

Падкрэслім, што ў беларускай міфалогіі няма ўсяго таго раду вярхоўных язычніцкіх багоў, якія ўпершыню падаюцца ў Лаўрэнцьеўскім летапісе. Там яны ідуць у наступным парадку: Пярун, Хорс, Дажджбог, Стрыбог, Сымаргл, Макаш (Мокаш). У Густынскім летапісе да іх дадаюцца Лада, Купала, Каляда, Пераплут. Нельга забываць, што гэты пералік закранае толькі тых язычніцкіх багоў, якія былі ўведзены князем Уладзімірам на Старакіеўскую гару. Трэба адзначыць, што гэта быў параўнальна позні час славянскага язычніцтва. Указвае на гэта адна акалічнасць: першым называецца Пярун – усемагутны бог, ахоўнік-заступнік князя і яго дружыны. Цяпер жа дакладна вядома, што не Пярун быў у найбольшай пашане ў нашых далёкіх продкаў. Звычайныя людзі, якія асноўнае сваё прызначэнне бачылі ў працы на зямлі, вышэй за ўсіх ставілі Рода. Звычайныя працаўнікі, якія ў любой сітуацыі, найперш, імкнуліся выжыць, неяк пракарміцца (спачатку), каб захаваць, працягнуць сваё «калена», спадзеючыся на ўдалыя паляванні і шчодрыя палявыя, лесавыя ды лугавыя збіранні, з якіх можна было не толькі знайсці нешта паесці, адна-

віць патрачаныя сілы, але аднагасова і даставіць нейкі запас у стаянку, дзе іх заўсёды чакалі галодныя ці напаўгалодныя родныя. Відаць, асабліва разважаць тут пра нейкія высокія матэрыі не выпадала, і шчодрыя паднашэнні вярхоўным багам (боствам) прыносіліся толькі ў выключных выпадках, а так абыходзілася ўсё хутчэй выпадковым паднашэннем, ад якога і святасцю асаблівай не патыхала.

Ведалі члены роду, што гэты стод прысвечаны быў пэўнаму боству, што апекавалася яно, паводле даўніх іхніх перакананняў, пэўнымі заняткамі і спрыяла ў сітуацыях, калі гаворка вялася пра надзвычай адказныя справы, калі магло здарыцца нешта надзвычай важнае, жыццёва неабходнае, без якога б проста магло не быць далейшага поспеху-спрыяння, і ранейшыя жыццёва-традыцыйныя пазіцыі ў нечым не вытрымалі б далейшага выпрабавання і саступілі б свой, у нечым ужо адвечны, здавалася б, увогуле непарушны стан рэчаў. Такія б дзеянні ўспрымаліся як паслабленне вярхоўнага бóства (бостваў), ягоных здольнасцей і ўласцівасцей. Але, што самае галоўнае, пра такое спрабавалі нават не разважаць шараговыя члены калектыўнага грамадства, бо пра ўсё ў жыцці, дзейнасць і будучае для іх думаў-разважаў міфічны, нават канкрэтна не вельмі ўяўлены бог. Іншая справа, што і сярод гэтых багоў была свая «градацыя», свае цвёрда ўсталяваныя ўласцівасці, уяўленні і прадказанні. І першым сярод гэтых грозных і маўклівых багоў быў Род.

## Род

Да гэтага часу не высветлена дакладнае значэнне і прызначэнне названай вышэй боскай асобы. Меркаванні былі і існуюць самыя розныя, але, як нам здаецца, далей за ўсіх у разгадцы таямніцы пайшоў акадэмік Б. Рыбакоў: «Род прыраўноўваўся да магутнага Ваалу, які хадзіў па нябёсах». Гэтая першакрыніца нас ужо не можа здзівіць: другі раз Род аказваецца сапернікам біблейска-хрысціянскага Бога-творца, Бога-ўсётрымальніка. Але тут адзначаюцца і важныя ўдакладненні: па-першае, невядомы каментатар сцвярджае, што паводле перакананння язычнікаў, Род «сядзіць на паветры», гэта значыць знаходзіцца дзесьці на небе, у боскай сферы. Гэта яшчэ раз ураўноўвае Рода з Ваалам, які «ездзіць на воблаку». Далей даследчык яшчэ больш падрабязна тлумачыць функцыі Рода: «Род аказваецца ўсеабдымным боствам Сусвету з усімі яго светамі: верхнім, нябесным, адкуль ідзе дождж і ляцяць маланкі, сярэднім светам прыроды і нараджэння і ніжнім з яго «вогненным родствам. Тады становіцца зразумелым супрацьпастаўленне Рода хрысціянскаму Богу Сусвету Саваофу».

У працытаваных выказваннях Б. Рыбакова Род пакуль што адзін супрацьпастаўляецца стваральніку ўсяго Сусвету – паводле хрысціянскай рэлігіі Богу, але нельга забывацца і пра тое, што сустракаліся выпадкі, калі Род увасабляў сабою не адзіную, а нават трыадзіную стваральную сілу (напрыклад, Стрыбог, Дажджбог, Пераплут). Здаецца дзіўным. Ды гэта на першы погляд, а калі расшыфраваць значэнне кожнага паасобку, то атрымаецца, што Стрыбог – боства Неба, паветра і вятроў, Дажджбог – боства Сонца і жыватворнай сілы, Пераплут – боства глебы, каранёў раслін і вегетатыўнай сілы. Такім чынам, гэтыя асобна пералічаныя боствы ўяўляюць сабой увесь аспект магчымасцей і здольнасцей язычніцкага Рода.

Б. Рыбакоў паспрабаваў іх класіфікаваць больш падрабязна і ў нейкай пэўнай паслядоўнасці. Вось што можна заўважыць:

Род – творца Сусвету.

Род удзьмухвае жыццё ў людзей.

Род – бог Неба і дажджу.

Род звязаны з зямной вадой (крыніцы, радзіцы).

Род звязаны з агнём.

Род звязаны з падземнай апраметнай (родства вогненнае).

Род звязаны з чырвоным колерам (рдзяны, родры).

Род звязаны з шаравой маланкай [29, с. 451].

Спынімся больш падрабязна на разглядзе асноўных асаблівасцей Рода, а больш дакладна, тых з іх, якія ўсё ж у нейкай ступені захаваліся ў беларускай народнай міфалогіі, у вусна-паэтычнай спадчыне. Справа ў тым, што класіфікацыя Б. Рыбакова датычыцца ўсіх славянскіх народаў, а захаваліся гэтыя асаблівасці далёка не ў аднолькавай ступені. У беларускай міфалогіі сувязь з усёмагутным Родам прасочваецца толькі ў адным аспекце – «удзьмухванні жыцця ў людзей». Праўда, гэтую аналогію можна было б адразу працягнуць, бо выцякае яна з усемагчымых прыкладаў. На першае месца паставім **стварэнне прыроды.** Тады мы крыху нібы самі сабе супярэчым, бо ўзнікненне прыроды па волі нейкага боства будзе тлумачыцца не інакш як стварэнне Сусвету (Зямлі). Справа ў тым, што яе падкрэсліваюць толькі мовазнаўцы. На вялікі жаль, факт гэты, які прама ці хоць бы ўскосна ўказваў у беларускай міфалогіі на стварэнне Родам Сусвету – прыроды, намі не зафіксаваны.

Амаль спрадвечная земляробчая культура абавязкова павінна была своеасабліва паўплываць на склад народнага светапогляду, надаўшы яму культурна-земляробчае адценне, падпарадкаваўшы яго памкненні і жаданні ўладзе зямлі. Па меры разумовага развіцця народа гэтае механічнае асацыятыўнае ўспрыняцце перайшло ва ўсвядомленае, ма-

гічнае. Бясспрэчна, яно захавала многія адбіткі язычніцтва, праўда, значна дэфармаваныя часам, пачынаючы ад таго, як далёкі наш продак, калі араў зямлю, баяўся нават нейкую частку сваёй сахі зрабіць з жалеза, бо лічыў, што тады глебе будзе балець. Патрыярхальны чалавек быў цвёрда перакананы ў тым, што зямля жывая. Нічым іншым, як толькі гэтым можна растлумачыць штогадовы росквіт зеляніны і ажыванне ўсёй прыроды вясною? Як давесці тое, што расце трава, а потым яна жаўцее і засыхае, што лістота на дрэвах распускаецца, а пасля ападае, што некаторыя жывёлы позняй восенню ўпадаюць у зімовую спячку і прачынаюцца толькі вясною? Раз так вялося, то паводле перакананняў прашчураў, гэтым жа нехта ўсё роўна кіраваў, падказваў, а то і адсочваў, каб усё ішло менавіта гэтакім шляхам, а не іншым, «ішло-цягнулася ад веку», а раз так, то яго ні ў якім разе нельга было перайначваць ці перапыняць, бо нешта ды магло б пайсці наадварот, «не тым, адвечным, шляхам...». Такіх непрадказальнасцей тады вельмі засцерагаліся і баяліся, бо бачылі ў іх прычыны глабальных прыродных змяненняў.

Менавіта зыходзячы з такой своеасаблівай зямной «прывязкі» мы і станем разглядаць культы язычніцкіх багоў у беларускай народнай міфалогіі (неабходна, мабыць, удакладніць – рэшткі тых далёка не ўсіх персанажаў, якія называліся ў Лаўрэнцьеўскім і Густынскім летапісах). Можна адзначыць, што і з пантэона, які стаяў на Старакіеўскай гары, у нас зафіксаваны толькі адзін Пярун. Прычым значыцца ён пад сваім уласным імем, з характэрнымі асаблівасцямі, сярод якіх пазначана і такая: даваць зямлі і ўсяму, што на ёй расце, ваду. Застаўся адзін, дайшоў адзін, а мы яму ў «кампанію» дадалі жывёльнага бога Вялеса (Воласа) і Лялю, бо сярод валуноў на тэрыторыі Беларусі сустракаюцца камяні, прысвечаныя гэтым боствам.

## Пярун

Некаторыя даследчыкі ў галіне археалогіі, гісторыі, фальклору, міфалогіі прыйшлі да думкі, што «культ Перуна – дружынна-княжацкі культ кіеўскіх Ігаравічаў – прама звязаны з нараджэннем дзяржаўнасці і з прычыны сваіх недалёкіх каранёў – культ малады, нядаўні». Адным словам, не паспеў добра ўсталявацца на Старакіеўскай гары, няхай сабе і на самай яе вяршыні, як вымушаны быў тэрмінова адтуль «прыбірацца»... Б. Рыбакоў адзначае: «...культ Перуна, з пункту гледжання рускага кніжніка XI – пачатку XII стагоддзя, толькі-толькі высунуўся на першае месца ў сістэме шматвобразных язычніцкіх уяўленняў і не выціснуў, а толькі адціснуў папярэднія культы, якія аказаліся надзвычай жывучымі і прыносілі



*Пярун-камень каля в. Дубкі Сенненскага р-на*

царкоўнікам клопатаў значна больш, чым культ дружыннага Перуна, які хутка ўзнік. Тыя самыя княжацка-баярскія колы, якія нядаўна ўводзілі культ Перуна, вельмі хутка змянілі яго на хрысціянства». Такім чынам, атрымлівалася, што Пярун – гэта бог кіеўскіх князёў і княжацкіх дружынаў, пры дапамозе якіх князь кіраваў дзяржавай і трымаў трон. Адсюль бачна, што па сваіх функцыях Пярун вельмі нагадваў бога вайны, бо чым тады можна растлумачыць тое, што, прысягаючы ці заключаючы нейкі пэўны дагавор, княжацкія дружыннікі ды і самі князі, акрамя таго, што кляліся зброяй, заўсёды далучалі ў гэты рытуал і імя Перуна [29, с. 585]. З гэтай нагоды не здзіўляе асабліва і тое, што на Беларусі сустракаюцца камяні (купамі ці параскіданыя), але сярод якіх адзін безагаворачна носіць назву Перуна, Перунова каменя, Перунова судзілішча і г. д.

У летапісных зводах, дзе гаворка вядзецца пра Перуна, адзначаецца яго пэўнае гістарычна-адміністрацыйнае месцазнаходжанне: князь Уладзімір паставіў ідалаў на вяршынях Старакіеўскай гары над Дняпром. Вось як пра гэта згадвае старадаўні сведка тагачасных падзей: «Володимер... постави кумиры на хълме... Перуна древяна, а главу его сьребряну, а ус злат». І тады бог князёў і дружыннікаў стаў агульнадаступным богам. Дарэчы, Перуном у народзе яшчэ называлі нябесны агонь, «прыляцеў да нас пярун з неба і нарабіў на зямлі шмат бяды, пасля яго некрануты-

мі і цэлымі засталіся адно што вялізныя камяні», а старажытныя наўгародцы яшчэ апрача ўсяго іншага мелі і бога агню, які таксама з'яўляўся Перуном (Пярунчыкам).

Цікава і тое, як выглядаў ідал Перуна. Бясспрэчна адно: і ў беларусаў, і ў рускіх, і ва ўкраінцаў ён быў падобны да чалавека, толькі ў кожнага з гэтых усходнеславянскіх народаў вылучаўся памерамі. Тулава звычайна высякалі з дуба, галаву адлівалі са срэбра, вусы ж рабілі з золата: «Першым у іх тады быў бог Пярун, з дрэва зроблены вобраз чалавечы. Галава ў яго была срэбраная, а вусы залатыя. У якога ў руках камень быў вельмі ясны. Перад якім агонь заўсёды гарэў. А калі здаралася за недаглядам служкі агню згаснуць, такога служку без усялякай вымовы, як ворага свайго, забівалі». Звычайная людская абыякавасць успрымалася, няйначай, як адкрытая варожасць да свайго роду-племені і таму патрабавала неадкладнага пакарання.

Густынскі летапіс дае яшчэ больш поўны «партрэт» Перуна. У ім сцвярджаецца, што ногі ў бога былі жалезныя, але суставы, відаць, былі далёка не прапарцыянальныя чалавечым. Калі б яны адпавядалі прапорцыі чалавечага цела, то срэбная галава і жалезныя ногі хутка ўтапілі б Перуна ў рацэ падчас прыняцця Кіевам хрысціянства (аднак там бог плыў па вадзе і прыбіўся да берага). Вочы – з каштоўных камянёў. У руках ён трымаў каменнае падабенства стралы, абсыпанай яхантамі. Н. Велюс пісаў, што ў літоўцаў Пяркунас нагадваў магутнага барадатага паляўнічага са стрэльбай (зафіксавана матэрыяльна-тэхнічнае змяненне ў старажытным промысле).

Рукатворныя выявы багоў (ідалаў) мелі самыя розныя памеры – ад некалькіх сажняў у вышыню да некалькіх вяршкоў. Маленькія насіліся на шыі. Іх выразалі (высякалі) з цвёрдых парод дрэў, найбольш дуба, пазней сталі пакрываць featureрознакаляровымі фарбамі ці нержавейнымі матэрыяламі.

Археалагічна зафіксаваны таксама тыповы для свяцілішча вогненны рытуал і нават знойдзены чалавечыя ахвярапрынашэнні. Плошча, дзе стаяў ідал, мела васьмікутную ў плане структуру, якая адлюстроўвала абрысы так званага *Перуновага цвету*. Па такой жа васьмікутнай схеме было ўзведзена раскапанае пад Ноўгарадам свяцілішча Перуна. Там ідала апярэзваў роў з васьмю дугападобнымі выступамі. Калі ў дні святкаванняў у кожным з такіх выступаў-паглыбленняў запальвалі вогнішча, то Перуноў цвет станавіўся вогненным і нібыта вяртаў прысутных да вытокаў старадаўняй памяці.

У А. Кіркора знаходзім апісанне капішча Перуна, пабудаванага ў Вільні ў 1265 годзе (нават дата дакладная). У даўжыню яно мела

150 аршынаў, у шырыню – 100, вышыня сцен складала 15 аршынаў. Збудаванне было без даху, мела адзін уваход з заходняга боку. Усярэдзіне стаяў магутны дуб, пад якім узвышаўся ідал Перуна. Над сцяною храма доўжылася шаснаццаціаршынная галерэя, у якой быў зроблены алтар шырынёю ў дзевяць аршынаў і вышынёю ў тры аршыны. На алтары, у нішы сцяны, гарэў вечны агонь. Ніша была так мудрагеліста зроблена, што агонь не маглі затушыць ні вецер, ні дождж. На прыступках быў акрэслены рух месяца. З супрацьлеглага, усходняга ад варот боку храма стаяла альтанка, у якой знаходзіліся розны посуд і свяшчэнныя рэчы, а над ёю ў спецыяльным склепе – змеі і гады. Побач з храмам размяшчалася жыллё вярхоўнага жраца і яго падначаленых. З высокай каменнай вежы, што ўзвышалася над жыллёвымі дахамі, галоўны вяшчун язычнікаў перадаваў людзям волю багоў. Але спецыяльная прысутнасць валуноў тут нідзе не была зафіксавана.

Часам у вусна-паэтычных апавяданнях даводзілася чуць ад сваіх інфарматараў: «З Перуном не толькі ў нашых землякоў цвёрда асацыяваўся нябесны валадар і нябесны агонь, але яшчэ і здаравенны камень, які ляжаў на пагорку і які, здавалася, пастаянна пасля моцнай навальніцы быў асклізканы да бляску. Гэта сведчыла пра тое, што Пярун «гасцяваў» у сваім зямным доме, пастаянна наведваў яго, калі толькі здаралася такая магчымасць, ніколі не абмінаў. Старыя людзі не забываліся падкрэсліць такую акалічнасць нябеснага боства, паказвалі, дзе і што пра гэта сведчыла, а маладзейшыя то ў адкрытую сталі абыякава адносіцца да ўсяго гэтага, пагарджаць тлумачэннямі і ўспамінамі. Таму і забыліся ўсемагчымыя традыцыі надзвычай хутка, бо ніхто не імкнуўся іх збіраць, класіфікаваць, пераказваць і г. д.»

У беларускіх пісьмовых помніках сцвярджаецца, што гэты бог быў высачэзнага росту і з доўгай барадой (барада, мабыць, – сімвал хмараў, якія пакрываюць неба). Зброю яго складалі не каменная страла і цяжкая дубіна, а лук і стрэлы. І ездзіў ён па небе на вогненнай калясніцы, ганяючыся і забіваючы нячысцікаў (ці не матыў гэта якраз пачатку ўзаемаадносін язычніцтва і хрысціянства, калі Перуну проста сталі прыпісвацца ўласцівасці хрысціянскага Іллі-грамоўніка), паказваючы, хто ў свеце гаспадар: "Пярун, магутны нябесны цар, якому Белбог уручыў нябесны молат, каб весці адвечную барацьбу з Чарнабогам і яго д'ябальскім войскам, жыве ў памяці ўсіх славян і літоўцаў. Ён цалкам можа адпавядаць Індры індзейцаў, Зеўсу грэкаў, Тору германцаў. Беларусы добра яго ведаюць і нават апісваюць знешні выгляд. Пярун, паводле ўяўлення беларусаў, велічны, статны, высокага росту, з чорнымі валасамі і доўгай залатой барадой. Яго стрэлы – гэта маланкі. Імі ён разбі-

вае варожыя войскі Чарнабога. Яны нагрувашчваюць цяжарныя хмары, каб засланіць сонца, сарваць месяц, сабраць у хмары напітак жыцця – ваду. Але Пярун адным ударам свайго каменнага молата разбівае хмары, і вада льецца на зямлю, і тут іх наганяюць стрэлы Перуна. Чэрці ведаюць, што Пярун любіць чалавека і аберагае яго, таму яны кідаюцца ў жыллё людзей, каб выратавацца сярод іх, але ў такіх выпадках Пярун трапляе ў жыллё чалавека, а калі здараецца, што страла заб'е чалавека, то багі ўзнагародзяць яго ў будучым жыцці (пазамагільным). Цікава яшчэ і тое, што молат каменны. Гэта сведчанне раннеязычніцкіх уяўленняў, калі зброя і неабходныя прылады працы выраблялiся продкамі з касцей і каменю, які ўжо нават у параўнанні з касцямі быў больш трывалы. Вялізны таму, што трымаў яго ў сваіх руках нябесны бог, які сілу меў куды большую за любога самага моцнага чалавека.

Беларусы спрадвеку верылі, што зямля не раскрываецца да першага веснавога грому да выезду Перуна на неба. Духі, якія падпарадкоўваюцца Перуну, носяцца па палях і лясах, гаворыць беларускае паданне, на імклівых конях, хуткія, як стрэлы; ворагі ж іх, цёмныя сілы Чарнабога, ператвараюцца ў вобразы драпежных птушак і ствараюць вятры і буру. Сама назва маланкі і грому мала выкарыстоўваецца на Беларусі: іх паўсюдна клічуць Перуном – і бляск маланак, і грамавы ўдар. Калі пачынаецца навальніца, беларусы хаваюцца па хатах, усклікваючы: «Ай, ай, Пярун заб'е!» Да гэтага часу чуюцца праклёны: «Каб цябе Пярун забіў!», «Каб цябе Пярун спапяліў і самога да смерці давёў!», «Пярун заўсёды, калі ўсходзіцца, то ворагаў чалавека ні ў якім разе не пашкадуе, але і чалавеку падчас маланак неабходна асцерагацца, бо і для яго гэта небяспека вялікая».

Неабходна згадаць і пра тое, што ў старажытнаславянскай мове слова «страла» азначала «прамень, сонечны прамень». Перуновы стрэлы ў народзе яшчэ называлі д'яблавымі пальцамі, і ім прыпісвалася цудадзейная сіла, здольная засцерагчы чалавека ад удараў маланкі, прадухіліць пажар. Да перуновых стрэл адносілі таксама знойдзеныя ў зямлі старажытныя каменныя прылады і зброю: молаты, сякеры, наканечнікі, нажы, якія старанна захоўвалі, бо былі перакананы, што яны дапамагаюць ад грамавых удараў і хвароб. З дапамогай перуновых стрэл, як лічылася, можна паставіць на ногі самага знясіленага і саслабелага чалавека. Дастаткова стралу апусціць у звычайную ваду, якая адразу «падзарадзіцца» і стане гаючай. Згадваўся перуновы (громаў) вугалёк, які таксама ў многім дапамагаў людзям. Асабліва каштоўнымі лічыліся тыя прылады працы, якія ўваходзілі ў склад скарбаў і былі схаваны ў свой час пад вялізнымі камянямі. Продкі, пакланяючыся канкрэтна-

му каменю, як Перуноваму, пад яго стараліся захаваць і ўсемагчымае прычындалле, якім карысталіся падчас малітваў і ўшанавання Перуна.

Адгалоскі страху продкаў-язычнікаў перад Перуном захаваліся ў беларускіх праклёнах: «Каб цябе забіў Пярун», «Каб цябе спляжыў Пярун», «Каб цябе спаліў Пярун», «Каб цябе трэснуў Пярун», «Каб цябе забіў Пярун на глухой дарозе», «Каб цябе Пярун забіў, а маланка пяты пашчапала», «Каб цябе Пярун калядны забіў», «Каб табе Пярун голаў разбіў», «Каб табе Пярун зубы павыбіваў».

Паўсюдна на Беларусі сцвярджалі, што нельга тушыць пажар, які ўзнік ад удару маланкі. Толькі вельмі багаты чалавек мог патушыць такі агонь, але не інакш як заліўшы яго малаком. Гаварылі, што калі ў час грому ўтвараецца слуп пылу, то гэта азначае, што нячыстая душа гуляе; калі падабрацца пад такі слуп і ўторкнуць вастрыё нажа ў зямлю, то з зямлі пырсне кроў. У жахлівых лясных ураганах, якія губілі сотні дрэваў, паляшук бачыў чортава вяселле. Варажбіту, воку якога бачны ўсе штукарствы, лёгка растлумачыць народу, як над лесам імчыць д'ябальскі вясельны поезд, паказаць, дзе сядзіць маладая, дзе дружкі і г. д. У той жа час ён звяртае ўвагу на музыку, якую ўсе чуюць: гэта гул, завыванне, стогны ўрагану. У некаторых выпадках падкрэслівалася, што «ў выніку імклівага прасоўвання такога дзіўнага поезда на зямлі заставаліся вялізарныя валуны, якія былі параскіданы ў нейкім дзівосным хаатычным беспарадку і таму стваралася ўражанне, што тут на самой справе толькі што пагаспадарыла неўтаймаваная нячыстая сіла, якая свае д'ябальскія намаганні скіравала на тое, каб патрушчыць, паразбіваць, параскідаць усё тое, што сустракалася на яе зямным шляху. Такім чынам, варажбіт мог «убіць у галовы» астатніх, што такое Перунова неўтаймаваная сіла і якім чынам яна можа паўплываць на ход зямнога жыцця, пакінуўшы ўспаміны пра такія наведванні.

Пераконвалі таксама, што адвечныя смертазабойчыя спрэчкі Перуна з нячысцікамі могуць часам тлумачыцца і пакражай яго зброі, якую чэрці ўмудрыліся, «пасля яе ўмыкання ад нябеснага валадара», схаваць пад здаравеннымі зямнымі камянямі, якія ў народзе ўжо асацыяваліся з панаваннем і валадараннем Перуна. Бог-грамоўнік нярэдка выступае і як творца сваёй баявой зброі, або яму дапамагаюць у гэтым нябесныя кавалі, што выконваюць любы яго загад. Паводле некаторых народных тлумачэнняў, маланка можа ўтварацца ў выніку трэння нябесных жорнаў. Аўтары наўгародскіх летапісаў дадаюць, што Пярун трымаў у руках не стралу, а дубовую паліцу і тварам быў павернуты на ўсход. Няхай сабе і страла, але ж дубовая, якая асацыявалася з пэўнай народай зямнога дрэва, заўсёды прысвечанага Перуну.

Звязаны цесна з Перуном, яго дуб упершыню згадваецца ў летапісах за 1302 год у грамаце галіцка-валынскага князя Льва Данілавіча, у якой князь звяртаецца да Пярэмышльскага епіскапата: «А отъ тои горы до перунова дуба горе скломь. А от Перунова дуба до Белых береговъ». У Іпацьеўскім летапісе сустракаецца назва Перуноў пень. Але, як слушна разважае Г. Івакін, «...гэта пясчаная каса, мыс нейкага канкрэтнага вострава, які знаходзіўся крыху ніжэй славутых рачных парогаў: “...и проиде сквоз порогы изверже и ветер на пень юже и до сего дни словет Перуня пень”» [34, с. 137]. Сам летапісец тлумачыць гэты факт тым, што ў 988 г., у час хрышчэння Русі, дакладней, спачатку толькі Кіева, кіеўскі князь Уладзімір загадаў «перавярнуць ідалаў – адных пасекчы, а другіх спаліць. Перуна ж загадаў прывязаць да конскага хваста і валачы яго з гары...» [Тамсама, с. 129].

Паводле ўкраінскіх міфаў, чалавек, забіты маланкай, ачышчаецца ад грахоў, таму што сам стаў ахвярай з прычыны схаванага ў ім д’ябла. Беларусы пераконвалі, што чалавеку, якога спапяліла маланка, даруецца дванаццаць найцяжэйшых зямных грахоў. Літоўцы запэўнівалі, што любы прадмет, у які ўдарыла маланка, свяшчэнны, а чалавек, калі ён атрымаў маланкавы ўдар, адпаведна святы. Святасць гэтая вызначалася іншымі членамі роду. З іншага боку, тут яшчэ прасочваецца і адсутнасць у далёкіх продкаў страху перад смерцю. Гэтакая акалічнасць пастаянна ўбівалася ў галовы зямных жыхароў, што «смерць – гэта проста пераход чалавека ў іншы стан, але само ягонае жыццё, тым не меней, не перапыняецца...»

У славянскіх народаў вядомыя назвы населеных пунктаў, урочышчаў, узгоркаў і г. д., дзе часта сустракаюцца такія спалучэнні, як Перунова гара, Перунова дуброва, Перуноў камень, Перунова прошча, Перуноў валун, Перунава камлыга. Гэтая ж з’ява характэрная і для прыбалтыйскіх народаў, дзе шанаванне Перкуна захоўвалася ў значна пазнейшыя часы. Так, у Э. Вальтэра мы знойдзем такое выказванне: «Перкуна шанаванне ў літоўцаў цесна звязана з найвялікшым шанаваннем старадаўніх дубоў, ля якіх прыносілі ахвяры пафарбаванымі ніткамі, яйкамі, сырам і іншымі прадуктамі». Заварожаны зварот да Перкунаса у жэмайтаў заўсёды здзяйсняўся ля свяшчэннага дуба. Вундэрэр у 1613 годзе падчас свайго падарожжа па Курляндыі сустрэў у Марыенхаўзене язычніцкі дуб, якому пакланяліся латышы, называючы яго Перуновым дубам. У Латвіі рэшткі пакланення дубам захоўваліся ажно да пачатку XIV стагоддзя. Асабліва шанаваныя дрэвы былі тыя, якія раслі побач з вялікімі камянямі і на іх размяшчалі ўсемагчымыя паднашэнні і падарункі, якія прыносілі мясцовыя жыхары» [18, с. 46].

Гістарычная памяць захавала імя бога-грамоўніка і ў назвах беларускіх населеных пунктаў: в. Перунова (Лунінецкі і Кіраўскі раёны), Перуноў Мост (Чэрвеньскі раён). З апошняй назвай асацыюецца цікавае паданне, якое нібыта падкрэслівае, што Пярун далёка не заўсёды быў добрым і спагадлівым да людзей ці да таго, што яны рабілі. Жыхары адной з вёсак пабудавалі на месцы напаўгнілой кладкі мост, каб надалей не сустракацца з адвечнымі дарожнымі клопатамі. Але неўзабаве мост згарэў ад удару маланкі. Праз пару дзён людзі пабудавалі новы, толькі і ён заняўся ад нябеснага агню. Ужо на наступны год сяляне зноў зрабілі мост, і на гэты раз Пярун, уражаны настойлівасцю людзей, адчапіўся. Так і назва вёскі пайшла. А яшчэ непадалёку ад маста сустракала прахожых і праезджых людзей пара старых заімшэлых камянёў, якія своеасаблівымі горамі насоўваліся на дарогу.

Своеасаблівы страх перад лесам як непасрэдным ворагам земляроба адлюстраваны ў многіх беларускіх вусна-паэтычных творах. У народзе існавала павер'е, што дуб (магло быць і іншае моцнае дрэва) з'яўляецца сімвалам дрэва-хмары. Зіма выпівае з яго сок, і дрэва заміpae, а вясною з абуджэннем прыроды ажывае і пачынае цвісці маланкамі. Адсюль і выслоўе «Цвіце Пяруновым цветам». У беларускім фальклоры можна знайсці шмат прыкладаў, дзе маланка б'е менавіта ў вяршаліны магутных дубоў: «Але ось і пачаў Пярун палыскаць: трэсне ў хвою – дак і расколе ад самага верху аж да карэння, трэсне ў дуба – расколе дуба, як цэўку» (казка «Каваль-волат»). З аднаго боку, ствараецца ўражанне, што маланка быццам бы назнарок толькі і рабіла, што шукала ў лесе дуб, каб ударыць у яго. З іншага боку, лёгка растлумачыць, чаму менавіта ў гэтае дрэва біла «страла» Перуна. Дубы заўсёды любяць расці крыху асобна ад іншых дрэваў, на невялічкіх палянках; да таго ж яны ўзвышаюцца над ляснымі абшарамі, таму часцей за ўсё ў іх і трапляла маланка. Неабходна было ўлічваць і высокую канцэнтрацыю жалеза ў драўніне гэтага дрэва, што таксама моцна прыцягвала да сябе «стрэлы» Перуна.

Гэтай звычайнай з'яве старажытны чалавек, які не мог яе растлумачыць, надаваў магічнае значэнне. Яна захавалася ў некаторых мясцінах і да нашых часоў: «Як даў Пярун у дуба!», «Стралою Пярун дастаў дуба», «Расколаты дуб перуновым ударам», «Дапяў Пярун старога дуба», «Маланкай Пярун дуба спаліў», «Пярун дуба злюбаваў, што ні гром, то паляваў», «Перунова страла ў дубе схавалася», «Калі гром грыміць, то дуб трасецца, бо Пярун з ім моцна б'ецца», «Пярун стралою кінуў у дуба», «Пярун зноў патрапіў у дуба», «Дуб ад Перуна атрымаў, але не смяртэльна». Часам канкрэтна ўказваецца, адкуль б'е Пярун: «А з лугу дождж

ідзець, з-пад цёмнай хмаркі Пярун б'ець» або дзеянне Перуна для людзей, бо менавіта дзякуючы яму яны зведалі, што такое агонь: «Першы агонь к нам прыляцеў з Перуном, да як загарэўся адзін хварастовы курэнь, то людзі збегліся адусюль хапаць галавешкі да па сваіх куранях і зямлянках у попелі пераховываць, а ля вялізных камянёў пачалі ў попеле перахоўваць вугольчыкі, якімі хутка можна было развесці новае вогнішча».

Узыходзячы да язычніцкай даўніны з яе верай у магчымасць уплываць словам і абрадам на сілы прыроды, стыхіі, у народных творах дзіўна перапляліся вобразы, паняцці розных эпох, хоць сутнасць іх і прызначэнне заставаліся нязменнымі. Некалі А. Мілер не без падстаў сцвярджаў: «Старое з вуснай славеснасці цалкам ніколі не знікае, хаця гэта не перашкаджае мала-памалу ўваходзіць у яго новаму. Пры такой... жывучасці даўніны ў народнай славеснасці ў ёй да гэтага часу ўцалелі рэшткі самай архаічнай пары – міфічнай». У гэтым сэнсе больш цікавымі з'яўляюцца творы, дзе ў якасці каральнай сілы заклікаюцца Пярун, маланка, хмары. Найбольш часта яны сустракаюцца ў народных замовах. Якраз гэты жанр вусна-паэтычнай творчасці, асабліва беларускай, дае дастатковы матэрыял для характарыстыкі агульнаславянскага культу Перуна, які ўзыходзіць да індаеўрапейскай традыцыі. Іншая справа, што працяглы час старадаўнія язычніцкія культы ў беларускай міфалогіі ўвогуле не разглядаліся, яны прапускаліся. Тым болей, калі гаворка вядзецца пра значэнне і шанаванне валуноў і камянёў увогуле.

Паводле старажытнага беларускага павер'я, зямля «не адчыніцца» агню да таго часу, пакуль не прагрыміць першы веснавы гром. Першы перуноў выезд абуджае прыроду, увесь раслінны свет на зямлі. Вятры, як лічылася, прымушалі распускацца пупышкі на дрэвах. Нездарма Перуна называлі богам-карміцелем. У той час нават мох на валунах зелянеў новым колерам, што сведчыла пра ягонае цвіценне і штогадовае абнаўленне.

Перуну нашы продкі прысвячалі асобны дзень тыдня – чацвер, калі ад бога заўсёды чакалі дажджу. У гэты ж дзень лепш за ўсё было распачынаць новую справу, бо яна павінна была закончыцца паспяхова. Чацвер – дзень здзяйснення жаданняў і мар. У гэты дзень неабходна было палічыць грошы, каб яны пастаянна вяліся і надалей. Чацвер называлі чыстым і ці не адтуль гэта пайшло-захавалася – «Пасля дожджыка ў чацвер». Маглі сцвярджаць яшчэ і больш абагулена: «І камяні ў чацвер умываюцца».

Гаварылі яшчэ, што калі першы гром прагрыміць ноччу, то гэты год будзе надзвычай цяжкім для людзей, а калі днём – то наадварот. Калі першы гром прайшоў у сераду, то год будзе шчодры на мёд. Вадою пер-

шага перуновага дажджу-грому палівалі дасведчаныя гаспадыні кароў, «каб болей было малака і каб яно было тлустым, як смятана»; не забываліся таксама пра коней і авечак – іх не толькі аблівалі дажджавой вадою, але таксама і перакідвалі туды-сюды шанаванымі любымі гаспадарамі каменьчыкамі, якія для такога выпадку заўсёды зберагаліся ў хлявах і пунях. «Пакарыстаюцца вяскоўцы сваімі каменьчыкамі нейкую хвіліну-другую, выкарыстаюць старадаўні звычай засцерагання жывёлы і зноў, да будучага году, тыя каменьчыкі, якія часта перадаваліся з пакалення ў пакаленне, хаваюць куды-небудзь ў падстрэшак ці на які слупок, каб чакаў свайго новага часу...»

Пярун, палюючы за чортам, нярэдка запроста падпальваў і ўшчэнт нават разбіваў сам дуб – Дрэва Сусвету. Паводле старажытнай міфалогіі, у яго кроне жылі птушкі, а ў каранях пладзіліся хтанічныя істоты: вужы, гадзюкі, змеі, удавы і іншыя. Чорт жа, вядома, таксама належыць да хтанічных жывёл. Таму не выключана, што ў найбольш старажытных міфах і вусна-паэтычных жанрах нячысцік вяртаўся або панічна ўцякаў ад Перуна пад дуб таму, што там, паводле народнага павер'я, знаходзіцца добра замаскіраваны ўваход-адтуліна ў ягонае падземнае жыллё. У такіх выпадках богу-грамоўніку нічога іншага не заставалася, як, забіваючы свайго адвечнага ворага, біць у магутны і непакорлівы дуб, нягледзячы на тое, што дрэва гэтай пароды было нават адвеку прысвечана яму самому – Перуну.

Неабходна падкрэсліць і наступны факт: калі ў найбольш старажытных пластах літоўскай, латышскай і рускай міфалогій Пярун заганяў чарцей пад дуб і там біў-паляваў, то ў беларускай міфалогіі адвечным месцам чарцей і нячысцікаў з'яўляюцца балота, багна, моцна забалочаныя лясныя прасторы, у рэдкіх выпадках – гэта прыгаданы намі вышэй падземны свет: «Дзіўна, што Пярун біў у сасну, вольху, лазняк. Большасць у нас ён біў у гэтыя дрэвы. Кажуць, што за чарцямі ганяецца, а чэрці толькі ў такія дрэвы і хаваюцца, бо ў іншых ім ніякага паратунку нямашака; калі ж уздымалася небывалая навальніца, то грозны нябесны бог шпурляў на зямлю вялізныя камяні. Там, дзе яны са страшэннаю сілаю падалі, надоўга ўтвараліся глыбокія варонкі, якія нават не зацягваліся тванню. Гэта быў своеасаблівы напамін аб гневе грамоўніка, якога да такой ступені шалу давялі нячысцікі нейкімі сваімі дзеяннямі». Абавязкова заўважым, што пералічаныя нашымі інфарматарамі пароды дрэваў заўсёды растуць на балотах. Здаралася, што чорт, у выпадках нявыкруткі, хаваўся і ў гаспадарчыя будынкі. І далей ужо здаралася тое, што здаралася і было трывала замацавана ў народнай памяці.

Старажытныя людзі па-сапраўднаму лічылі, што гром – гэта грукат Пероновай хуткаімгненнай (залатой, а то і суцэльна каменнай) калясніцы, а маланкі – Перуновы стрэлы. Калі ж маланка трапляла (даволі часта!) у хаціны сялян, іх іншыя гаспадарчыя будынкі, то лічылі, што гэта бог гневаўся і гнаўся за чарцямі, а загнаўшы іх менавіта ў тую будыніну, якая была спалена, забіў. За прынесеныя страты Пярун нібыта адпускаў гаспадарам грахі перад далейшым замагільным жыццём. Часам прыгаворвалі, што на такім месцы болей нічога не будавалі, бо на ім station назаўсёды заставаўся ляжаць вялікі камень-валун, абрынуты грамоўнікам з-за воблачных вяршыняў.

У адным з народных паданняў, якое было зафіксавана П. Драўлянскім (П. Шпілеўскім), гаворыцца пра тое, як Кляскун, бог месяца, аднойчы без дазволу Перуна пакінуў свяціла, якім ён апекаваўся, і ўвогуле доўга адсутнічаў без дай прычыны. За гэты праступак раз'юшаны Пярун скінуў Кляскуна на зямлю. Паводле іншага падання, Пярун ніколі не шкадаваў Месяца – мужа Сонца. Калі апошні яшчэ быў паспрабаваў заляцацца да Дзянніцы, то Пярун, выхапіўшы меч, напалову рассек Месяцу твар. Такім з тых часоў Месяц застаецца да нашых дзён.

Народная памяць захавала ў мясцовых назвах «рэальнасць» спрэчак і боек суровага бога з нячыстай сілай, чарцямі і г. д. Большасць з іх узнікла як вынік пераследавання Перуном чарцей. Параўнайце тапонімы кшталту «рака Перуна», «возера Перуна», «дуб Перуна», «дуброва Перуна», з аднаго боку, і «балота чорта», «Чортава балота», «урочышча чорта» – з іншага. Людзі кажуць: «Дзе балота, там і чорт», «...але не толькі штоб у балоце, – куды ні зірні, усюды трапіш на гэтую нечысць. Вада, бывала, кішыць чарцянятамі. Толькі на Вадохрышча, як павыганяюць з вады, то яны таўкуцца ў паветры да паднімаюць такую хвілю, што леж не еж і з хаты не лезь». Цяпер становіцца зразумела, чаму сяляне так баяліся секчы дуплаватыя дрэвы: паводле іх уяўлення, там сядзелі, хаваючыся ад Перуна, яго ворагі. На сувязь вяльняса (чорта) з ніжняй часткай дрэва ўказваюць і літоўцы. Такая забарона доўгі час заставалася і ў іхнім народзе.

Замена Перуна Іллём, як ужо адзначалася вышэй, адбывалася яшчэ да хрышчэння Русі, калі толькі палова кіеўскага баярства прыняла хрысціянства: у дагаворы Русі з Візантыяй 945 г. гаворыцца аб русах-язычніках, якія кляліся Перуном, і аб хрысціянах, якія давалі прысягу ў саборнай царкве Св. Іллі. Сама дата ўшанавання Перуна – 20 ліпеня – адзначалася як вялікае (гадавое) земляробчае свята, якое было ўжо прысвечана... Іллі. Гэта да яго звярталіся сяляне, калі перад новым годам

рассцілалі збожжа на заснежаным падвор'і, прымаўляючы пры гэтым: «Ходзіць Ілля, носіць пугу жыцяную, дзе замахне, там жыта расце». Гаспадары прамаўлялі такія засцерагальна-магічныя словы, узбіраючыся на вялікія камяні, якія ў любога вяскоўца былі на падворку. Відаць, і прызначаліся яны толькі для такіх здарэнняў.

Іллёў дзень – гэта свята селяніна-земляроба. Ілля, як і Пярун, уладар грому і навальніцы, раз'язджае па небе ў калясніцы, запрэжанай крылатымі белымі конямі. Сама калясніца, як і коні, у святога белазалацістага колеру, гаворка пра каменную нават не вядзецца. Святы Ілля асабліва чулліва адносіцца да сялянскіх клопатаў і хваляванняў, адклікаецца на просьбы вяскоўцаў напаіць зямлю вільгаццю. Праўда, толькі ён мог і лёгка згнаіць доўгачаканы ўраджай. Нездарма ж пра дзень ягонага свята гаварылі: «Прыйшоў Ілля, нарабіў гнілля», «Ад Іллі, што было сухое, тое стала гнілое». Да Іллі звярталіся і ў значна пазнейшыя часы паляўнічыя; каб іх стрэльбы стралялі без промаху, «чысцілі свае стрэльбы здрабнёным на парашок каменем, каб ад такога дзеяння стрэльбы ў далейшым не іржавелі і не давалі прамашкі...». Падвучаныя старэйшымі маладыя людзі прасілі сабе будучага сямейнага шчасця, а хворыя, нават моцна запушчаныя і абяссіленыя, спадзяваліся на абавязковае вылячэнне і працяглы час пілі для гэтага завараную з зёлкамі і кавалачкамі камення ваду.

Раней на Іллёва свята ўвогуле не працавалі ў полі, каб не ўгнявіць святога, бо ён, раззлаваўшыся, мог усё чыста спаліць-спапяліць. Жывёлу не выганялі ў поле, бо «звер-воўк рыскаў у гэты дзень, шукаючы абавязковай здабычы». Недзе ў гэты часавы прамежак адбываліся наймацнейшыя навальніцы, з прычыны якіх нават цёмныя ночы атрымалі назву рабінавых. Калі пасля 20 ліпеня выходзіў новы пчаліны рой, то пчаляры, тым не менш, не стваралі яму новай пчалінай сям'і, бо яна ўсё роўна загінула б. Пасля Іллі сяляне баяліся купацца: «Да Іллі мужык купаецца, а пасля яго рэчка цураецца», «Прайшоў Ілля, то не лезь па сваёй ахвоце ў ваду, бо набудзеш сабе вялікія непрыемнасці», «Да Іллі вада чыстая, а пасля яго – спаганеная».

Таму ў барацьбу Перуна (Іллі) з чортам станоўчыя персанажы беларускай міфалогіі і фальклору амаль ніколі не ўмешваліся. Гэтага не рабілі нават казачныя героі-асілкі. Адвечнай была барацьба бога з нячысцікамі, і чалавек лічыў, што лепш трымацца ў баку ад чужых спраў. Таму і ствараліся выпадкі, аналагічныя ніжэй прыведзеным сітуацыям: «Лінуў дождж. Падняўся каваль-багатыр з-пад дуба, выбраў густую яліну і лёг пад ёю, каб дождж не даставаў. Ляжыць і любуецца, як Пярун чарцей палюе»; «Прызаве Бог Пятра й кажа, што няхай трохі Ілля папалюе чар-

цей. А Ілля тым часам падыме такія грымоты: Так-так-так! Го-го-го!» Што аж зямля стогне: няма ні дня, ні ночы; хмары таўкуцца, як уюны ў рэшаце; на небе кіпіць, як у гаршку; маланка бліскае, аж у вачах цёмна становіцца, а Пярун смаліць раз-пораз, паласуе хвоі і дубы ды паліць будоўлю або стагі. А Ілля едзе па небе ды камандуе: «Так-так-так! Го-го-го! Яшчэ, яшчэ... Лупі, лупі яго гада... От так-так... Го-го-го... Трэсні яго па затылку! У патыліцу! У патыліцу лупі яго, гада! Трах-трах! Просяць людзі напрамілы бог, каб уняліся грымоты, а Ілля не слухае». Вось і атрымалася, што ў народных павер'ях Перуна трывала замяніў Ілля, і яго сяляне сталі называць грамоўнікам, а пра чалавека, забітага громам, гаварылі няйначай як «яго Ілля забраў да сябе, каб вяршыць святыя справы».

Іх варожасць можна растлумачыць, зыходзячы з беларускіх вуснапаэтычных твораў, у духу ўжо хрысціянскай рэлігіі. Паводле легенд, чорт, сапернік Бога, імкнуўся паставіць сябе ўпоравень з Усявышнім, за што той гэтак жорстка і пакараў яго. У адным з беларускіх паданняў распавядаецца пра тое, як бог-грамоўнік ганяецца за чарцямі і забівае іх. Яны спрабуюць схавацца паўсюль: пад дрэвам, якое чалавек, калі ішоў міма, секануў сякерай, пад кавалкам дзёрну, перавернутым дагары травою, пад вуллямі, пад крыжам, пад каменнем і г. д. Літоўскі даследчык Н. Велюс сцвярджае, што «дэградаваныя рэлікты вяльняса (чорта ў беларусаў. – *А. Н., Я. Н.*) і Перкунаса (нашага Перуна. – *А. Н., Я. Н.*) можна знайсці ў казках аб адносінах героя звычайнага паходжання – каваля, салдата, цыгана – з вяльнясам, драконам, змеем, забойцамі, разбойнікамі; у казках, дзе чалавек спаборнічаў з вяльнясам, ён палохае вяльняса і многіх іншых. Творы, у якіх адлюстроўваюцца адносіны вяльняса і Перкунаса і дзе можна знайсці дэградаваныя рэлікты іх адносін, у Літве вельмі папулярныя» [34, с. 216]. У. Тапароў прытрымліваецца думкі, што «творы балтыйскага, славянскага і іншых індаеўрапейскіх фальклораў аб барацьбе бога грому і маланкі і яго праціўніка непасрэдна звязаны са старажытнымі міфалогіямі, а чорт і іншыя блізкія да яго персанажы – архаічныя рэлікты яго» [Тамсама, с. 218].

Н. Велюс падкрэсліваў, што ў Перкунаса было ружжо, з якога ён страляў па вяльнясах кулямі. У беларусаў Пярун карыстаўся сякерай, кідаўся вялізнымі камянямі, але і часта біў вогненнаю (палючаю, агністаю) стралою. «Паб'е цябе сам Сус-Хрыстос, выйдзе ў чыстае поле, паложа каляную стралу, праб'е цябе, любую змяю», «Вынімайце ярасць у раба Божага, а то святы Пётра-Павел залатым кап'ём праб'ець, Ілля – слаўны прароча таксама агненнай стралой праб'ець, святы архангел Міхаіл огненнай мечью галаву ататнець і агнём сажжэць, святым духам попел разадмець», «Ежалі ж ты будзеш маю малітву заядаць, то і буду прасіць

Госпада Бога. Сашлець Гасподзь Бог Міхайлу-архангела з громамі, малоднямі, будзець громам біць, малоднямі паліць». Так паступова хрысціянскія святыя пачыналі займаць месца язычніцкіх багоў, а на месцы стараязычніцкіх капішчаў заставаліся адно што маўклівыя камяні-камлыгі, якія ў свядомасці народа некалі выконвалі свяшчэнную ролю і мелі цудадзейныя ўласцівасці.

Яшчэ большы ўплыў хрысціянскай ідэалогіі адчуваецца ў рускіх замовах, у якіх дзейнічаюць Пярун і яго маланка. Прыведзеныя Л. Майкавым варыянты замовы «От нечистого духа» носяць відавочны характар літаратурнага ўплыву. Нячысты дух, паводле яе, – «демон кеен и мамонт насыльный и нахожий» – вобразы, чужыя народнай міфалогіі. Барацьба хрысціянскай царквы з язычніцкімі культамі зрабіла свой разбуральны ўплыў і на замовы, што асабліва прыкметна ў творах з рэшткамі культу Перуна. Таму сёння і нам прыходзіцца вывучаць гэтыя багатыя ў свой час культы (маецца на ўвазе міфалагічны вобраз Перуна), збіраючы паасобныя звесткі пра іх, каб хоць неяк стварыць калі не цэласны, то агульны вобраз.

Як толькі грымеў першы веснавы гром з маланкай-бліскавіцай, то на Беларускім Палессі, акрамя таго, што ўскліквалі: «Пярун палюе! Пярун палюе! Пярун б'е!», з хаты яшчэ выкідвалі ў двор сякеру. Гаспадары былі перакананы, што Пярун ужо ніколі ў іх будыніну не трапіць. Як бачым, тут назіраецца прамая сувязь са старажытным беларускім павер'ем, згодна з якім язычніцкі ўсёмагутны бог кідаў на зямлю сякеркі. Спачатку яны былі каменныя, а потым – жалезныя. Сцвярджалася, што па першым часе сякеркі ляцелі на зямлю, на ёй траплялі ў вялікія каменныя глыбы і выбівалі з іх процьму іскраў і густую сцяну смярдзючага дыму.

У старажытнасці былі перакананы, што каменная зброя суровага бога-грамоўніка была аднаразовая, ад моцных удараў яна не вытрымлівала і крышылася, а тыя парэшткі сыпаліся на зямлю і заставаліся на ёй назаўсёды. Усё адрознівалася толькі адным: некаторыя знаходзілі людзі і абагаўлялі, шанавалі іх, а некаторыя, так і заставаліся назаўсёды невядомымі, бо глыбока зарываліся ў зямлю ці падалі ў якое гнілое балота. Паводле Э. Ляўкова вынікала: «Іншыя лічылі, што Пярун трымае ў руках вялікія жорны. Ад удару камянёў бліснe маланка, ад трэння паміж імі пракоціцца гром. Аскепкі жорнавых камянёў ляцяць на зямлю. Адсюль каменныя нажы, сякеры і наканечнікі называюць і па сёння перуновымі стрэламі» [22, с. 62].

Сякера лічылася свяшчэнным сімвалам Перуна. На знойдзеныя ў месцах старажытных паселішчаў каменныя сякеркі ў эпоху Сярэдня-

вечча глядзелі як на кінутую ў зямлю зброю нябесных багоў. Ім прыпісвалі асаблівыя ўласцівасці: выратоўваць ад маланкі, хвароб, садзейнічаць ураджайнасці, засцерагаць ад усялякіх эпідэмій, непажаданых здарэнняў. Для магічных мэт рабіліся падобныя да каменных сякерак касцяныя ці каменныя дзіды. У вялікай колькасці былі распаўсюджаны прывескі, якія паўтаралі форму сякерак і выкарыстоўваліся як усёмагутныя талісманы. Свяшчэнныя сякеркі згадваюцца таксама і ў пераліку знойдзеных скарбаў, схаваных у старажытных дубах на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Так, вядома, што граф А. Плятэр у наваколлі Краслаўля на берагах Заходняй Дзвіны паблізу шматвяковых дубоў знаходзіў вялікую колькасць бронзавых, сярэбраных і залатых вырабаў, сярод іх даволі шмат было сякерак.

Вастраканечныя каменныя прылады, якія знаходзіў селянін на сваіх палетках, зберагаліся і называліся перуновымі стрэламі, святымі. Лічылася, што яны надзейна ахоўваюць, засцерагаюць ад пажару, нячысцікаў, іншай напасці ў навальніцу, з'яўляюцца незаменным сродкам ад хваробаў. Ні за якія грошы беларускі селянін не пагаджаўся аддаць неалітычны наканечнік. Вядомы этнограф Е. Раманаў у 1891 годзе скардзіўся: «Мне, напрыклад, нярэдка не прадавалі звычайныя рубілы за 15 рублёў, гэта значыць за цану беларускага коніка, на падставе такой логікі, што конь можа здохнуць, а ў страле заключаецца, магчыма, шчасце дому».

На Гродзеншчыне часам з зямлі выкопвалі паўпразрыстыя карычнявата-жоўтыя стрыжні, завостраныя з аднаго боку. Іх таксама называлі грамавымі або перуновымі стрэламі, хоць у сапраўднасці гэта былі рэшткі выкапнёвага шкілета даўно вымерлых жывёл з групы галаваногіх малюскаў – белемнітаў. Бывала, што такі наканечнік прымалі за палец забітага Перуном чорта. Некалі ў гэтай мясцовасці любілі паказваць, асабліва ў Іллін дзень, «нячысцікавы пальцы», адсечаныя чорту грамоўнікам за тое, што паспрабаваў было ўхапіць камень і кінуць яго ў бога, які мірна спаў і не чакаў небяспекі.

Яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя П. Шпілеўскі пісаў, што ў Беларусі некаторыя пагоркі называюць Перуновымі гарамі. Народная традыцыя звязвала Грамабоя з узвышшамі і небам. На такіх гарах размяшчалі капішчы, прысвечаныя Перуну. Яго ўвасабленнем мог быць не толькі стод, але і валун. Камень, што ляжыць на вяршыні грады ў Сенненскім раёне, – частка такога капішча. А паданне пра тое, што менавіта тут Пярун забіў самага галоўнага чорта, толькі пацвярджае вядомы міф аб барацьбе Бога навальніцы з нячыстай сілай або служыць адгалоскам былога саперніцтва за святое месца паміж служкамі розных язычніцкіх бостваў. Гісторыкі адзначалі, што ў X стагоддзі на месцы

капішчаў другі раз ставілі стоды Перуна. Нядаўна адшукаўся Пярун-камень побач з вёскай Дубкі Сенненскага раёна. Непадалёк ад Рагачова, каля вёскі Ходасавічы, на беразе возера Святое, археолагі натрапілі на сляды капішча, якое існавала тут у канцы X – пачатку XI стагоддзя. Яно размяшчалася на вяршыні пясчанай дзюны і мела форму круга дыяметрам каля сямі метраў. У цэнтры круга некалі стаяў слуп-стод. З чатырох бакоў свету ў адлегласці двух метраў ад круга былі выкапаныя чатыры серпападобныя ямкі глыбінёй каля метра. У іх распальвалі рытуальнае вогнішча. Паблізу знайшлі ямкі ад стодаў меншага памеру і нават паўзямлянку жраца. Археолагі вырашылі, што галоўным боствам на тым капішчы быў Пярун.

Звесткі пра былыя мясціны пакланення Перуну сустракаюцца ў розных пісьмовых крыніцах. Ёсць згадка, што каля Полацка, за ракой Палатай, недалёка ад Валовага возера, існавала капішча Перуна і бабы-ягі. Е. Раманавым запісана паданне «Божая кара» пра трагічную гісторыю радзімічаў. У паданні згадваецца служка магутнага Перуна, які прыплываў па Сожы з Крычава. Каля Нясвіжа ёсць Перунова гара, на якой разгневаны Грамабой нібыта разбурыў замак князёў-распуснікаў. Дарэчы, легенды і паданні, што апавядаюць пра пераўтварэнне людзей і жывёл у камяні, як правіла, падкрэсліваюць, што ў часе іхняга пераўтварэння ўдарыў Пярун [Тамсама, с. 63–64].

Літоўскі даследчык Й. Баліс сцвярджаў, што такія творы, дзе вядзецца барацьба паміж Перуном і чортам (у яго Перкунасам і вяльнясам) і дзе згадваюцца свяшчэнныя сякеркі, якімі бог забівае сваіх ворагаў, існуюць не толькі ў балтаў, але і ў іх суседзяў – германцаў, угра-фінаў. Супадаюць як сюжэты твораў літоўцаў і суседніх народаў, так і прырода галоўных дзеючых асоб. Баліс таксама падкрэсліваў, што матыў барацьбы бога-грамоўніка з яго праціўнікам быў папулярны ўжо ў стараіндыйскай, германскай, часткова грэчаскай міфалогіі, а паралелі сустракаюцца нават у Егіпце, Месапатаміі і іншых краінах [34, с. 316].

Даныя, сабраныя Й. Балісам, дапоўнілі матэрыялы са славянскіх фальклораў і міфалогіі У. Іванава і У. Тапарова. Славянскія (асабліва беларускія) матэрыялы аб барацьбе грамоўніка з яго праціўнікам адрозніваюцца шматвобразнасцю, разнастайнасцю, архаічнасцю. Для абгрунтавання іх архаічнасці даследчыкі знайшлі мноства пераканаўчых аргументаў, узятых з лексікі, этнаграфіі, фальклору, міфалогіі. Гэты шматлікі матэрыял яны трактуюць як трансфармацыю аднаго з асноўных індаеўрапейскіх міфаў. Абапіраючыся на спадчыну балтаў і беларусаў, Н. Велюс, каб пацвердзіць значнасць, архаічнасць і перавагу літоўскай міфалогіі над беларускай, піша: «...тых, хто жыў у месцах, дзе жылі балты,

і таму адчуў іх моцны ўплыў» [Тамсама, с. 219]. У. Іванаў і У. Тапароў рэканструююць і сам міф. Праўда, іх версія не прыжылася ў асяроддзі даследчыкаў-міфолагаў.

Але ў працэсе аналізу сувязі паміж дубам – Перуном – чортам у беларускай міфалогіі паўстае непазбежнае пытанне: чаму Пярун такі агрэсіўны, не зважае ні на што і ні на каго, калі дамагаецца сваёй мэты? Яго варожасць, мабыць, трэба шукаць у агульнай варожасці і неўжывальнасці нябесных, зямных і падземных багоў у індаеўрапейскай міфалогіі (параўнаем варожасць асаў і ванаў у германскай міфалогіі, барацьбу Зеўса і яго прыхільнікаў з хтанічнымі багамі ў грэчаскай міфалогіі і г. д.). Гэты антаганізм характэрны для найбольш развітых міфалогій свету, што сведчыць аб звычайнай устаноўцы нябесных багоў, якія заўсёды імкнуліся да ладу і гармоніі, выступалі супраць зямных і падземных багоў, якім у большай ці меншай ступені характэрны хаос, выбух стыхійных, неўтаймаваных сіл.

Антаганізм адлюстроўвае і няроўнае становішча сацыяльных слаёў у індаеўрапейскім грамадстве. Літоўскі вяльняс, славянскі Вялес (Волас) шанаваліся пераважна як жывёлаводы, земляробы, а Перкунас, Пярун, Зеўс, Юпітар, Одзін, Індра абагаўляліся як воіны. Перамога багоў, якія ўважаліся воінамі, над багамі жывёлаводаў і земляробаў быццам бы падкрэслівала і санкцыянавала больш высокае становішча сацыяльнага слоя воінаў. Гэта зразумела яшчэ і з той прычыны, калі ўлічваць, што да жывёлаводаў і земляробаў адносіліся і заваяваныя, варожыя да індаеўрапейцаў плямёны. Міф аб барацьбе бога навальніцы і яго праціўніка напоўніцу выражаў ідэалогію воінаў і, несумненна, быў больш папулярны ў іх асяроддзі. Невыпадкова падобныя міфы былі распаўсюджаны і ў міфалогіі хецкага, вавілонскага, егіпецкага і іншых уплывовых класавых грамадстваў, глыбока прыжыліся ў іх і занялі пастаяннае месца ў разгалінаваных міфалогіях тых народаў.

Сувязь гэтага міфа з ідэалогіяй воінаў пралівае святло на яго больш дакладнае датаванне. Магчыма, што сам міф узнік адначасова з сацыяльнай дыферэнцыяцыяй грамадства, таму і варожыя адносіны паміж чортам і Перуном патрэбна вымяраць тысячагоддзямі. Тым не меней неабходна згадаць і пра наступныя цікавыя назіранні: рэшткі славянскага язычніцтва трывала захоўваюцца ў геаграфічных назвах. Скажам, гідранімія басейна Ужа (колішняя тэрыторыя драўлян) засведчана шэрагам тапонімаў, асновы якіх могуць расказаць пра вераванні палешукоў Роду (богу); разам з тым на гэтым арэале не ўдалося зафіксаваць назвы, якая б зберагала ў сваёй аснове слова «Пярун». Акрамя таго, мы ўжо падкрэслівалі, што ў хрысціянскай рэлігіі язычніцкі бог-грамоўнік

трывала быў заменены Іллёю. Там, дзе Пярун згадваўся, яго ўласцівасці былі значна звужаны і галоўным чынам датычыліся толькі маланкі.

У пераліку, які падаваўся ў Густынскім летапісе, у беларускай міфалогіі захаваліся яшчэ згадкі пра некаторыя боствы: Купала, Каляда, Лада. Першае з іх не меней папулярнае, а, можа, нават і яшчэ больш вядомае ў простанароддзі, чым легендарны Пярун. Справа ў тым, што калі ў грамадстве пачалі змяняцца сацыяльна-эканамічныя адносіны, калі язычніцтва было гвалтоўна параможана хрысціянствам, а дзе гэта не ўдалося здзейсніць сілай, то перажыткі старой веры прыстасаваліся пад каноны новай, тады людзі імкнуліся ўсё ж, акрамя ўсёмагутнага Бога Хрыста, захаваць і памяць пра багоў сваіх продкаў. Толькі трэба ўжо абавязкова падкрэсліць, што перавага тут аддавалася не ваяўнічаму, грознаму, жахліваму боству, а таму, якое найперш было звязана з пэўнай часінай года, з сямейным жыццём, са звычайным дастаткам у старадаўняй патрыярхальнай сям'і. Жыццё было цяжкім, беспрасветным і патрабавала таго, каб чалавек працы бачыў нейкую перспектыву, надзею ў звароце да таямнічых магічных сіл ці нават да саміх ужо калі (пазней) і не боскіх істот, то свяшчэнных міфалагічных персанажаў, якім чалавек працягваў яшчэ пакланяцца, шанаваць, а ў асобных выпадках і абагаўляць іх.

## Вялес

Імя гэтага боства згадваецца ва ўсіх, без нейкага там выключэння, старажытных летапісах. А ўсё заключалася, найперш, у тым, што функцыі Вялеса (Воласа) былі вельмі шырокія і важныя: ён жа ў старадаўнія стагоддзі, у перыяд язычніцтва, загадваў (адказваў, падпарадкоўваў сабе) статкі жывёлы. Зыходзячы з гэтага, можна адзначыць, што калі Пярун апекаваўся княскімі дружынамі, то Вялес адказваў за захаванасць жывёльных статкаў, быў галоўным сярод жывёлаводаў. А менавіта тады недзе і закончылася суровая барацьба паміж дружыннікамі і жывёлаводамі за іхняе вярхоўнае месца ў тагачасным грамадстве.

Праўда, у нас з'явілася сумненне адносна таго, што Вялес меў уладу толькі над жывёлай. Не выключана, што ён меў многа поліфункцыянальных рысаў. На гэтакі аспект указвае легенда, запісаная ў канцы XIX стагоддзя П. Шпілеўскім: «Калісьці, вельмі-вельмі даўно, нейкі багаты купец не мог з вялікай колькасцю ўсялякага дабра прабіцца цераз дрыгву. Тады ён зрабіў бярозавую гаць, заваліў балота бяростай і такім чынам праклаў сабе біты, цвёрды шлях. На памяць пра гэтае здарэнне купец пабудаваў капішча і прынёс ахвяру паганскаму богу Вялесу». Так



*Камень Волас у лесапарку п. Крыжоўка Мінскага р-на*

і ўзнікла старажытнае Бярэсце. Купец, нягледзячы на тое, што быў надзвычай заможны, не мог пакланяцца Перуну, бо не быў дружыннікам, а вось Вялес для ягоных патрэб тут і пасаваў, таму што з'яўляўся апекуном гандляроў таго краю.

Упершыню Вялес згадваецца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 907 і 971 гадамі, дзе гаворка вядзецца пра заключэнне дамоў паміж русамі і грэкамі. Там выступаюць два язычніцкія боствы – Пярун і Вялес. Напрыклад, пад 907 годам зафіксавана: «Царь же Леонъ со Александромъ мир сотвориста со Олгом, имшеся по дань и ротъ заходивше на роту, и мужи его по Рускому закону кляшася оружьемъ своимъ, и Перуном, богомъ своимъ, и **Волосомъ, скотьемъ богомъ** (вылучана намі. – *А. Н., Я. Н.*), и утвердиша миръ». Пад 971 годам прыводзяцца словы клятвы іншага князя – Святаслава: «Яко же кляхъся ко царемъ гречьскимъ, и со мною все боляре и Русь вся, да схранимъ правая съвещанья. Аще ли отъ тех сам хъ прежеречеемъ клятву от бога, в его же веруемъ в Перуна **и въ Волоса, скотья бога...** (вылучана намі. – *А. Н., Я. Н.*)». Праўда, апошнім часам сярод навукоўцаў з'яўляюцца пэўныя сумневы адносна рэальнасці існавання першага дагавора ад 907 года.

Далей «скотьего бога» згадваюць у «Слове некоего христолюбца, ревнителя по правой вере» ў рэдакцыі зборніка «Золотая цепь» XIV стагоддзя Троіца-Сергіевай лаўры. Хрысціянам строга забаранялася маліцца «огъневи подъ овиномъ, виламъ, Мокошьи, Симоу, Пероуноу, Рыглоу, Волосу скотью богу. Хърсоу, родоу, рожаницямъ и всемъ проклятымѣ богомъ ихъ». Наступны раз Вялес згадваецца ў «Обычном житии св. Владимира», якое сустракаецца адразу ў некалькіх рукапісах XV–XVII стагоддзяў. Тут пішацца, што князь Уладзімір, вярнуўшыся з Корсуня ў Кіеў, «повел испровреци и избити кумиры, оныи иссъши, а иныя изжжещи, а Волоса идола, его же именоваху скотья бога, велъ въ Почайну ръку въвреци...». У «Южнорусском житии» Вялес згадваецца на другім месцы пасля Перуна: «Вторый въ ныхъ богъ былъ волос быдлячии». Другая рэдакцыя гэтага «Жития» гаворыць: «А волоса болвана (котории был мянованыи быдлячий и лесный богъ) казал (князь Уладзімір. – *А. Н., Я. Н.*) в выход посполитый вскинуть и в нечистотах утопит». У артыкуле «О идолах русских» (пад 988 годам) Густынскага летапісу XVII стагоддзя знаходзім такія словы: «Вторый Волосъ богъ скотий, бяше у нихъ во великой части» У «Житиии Авраамия Ростовского» гаворыцца, як надышоў «чюдесный конецъ поклоняшуся **идолу камену Вялесу**» (вылучана намі. – *А. Н., Я. Н.*), больш за тое, «въдрузи церковь малу на томъ мьсть», идежи б прежде идолъ Велесъ, въ имя святое Богоявленіе Господа нашего Іісуса Христа...». Нагадаем у гэтым пераліку і «Слова аб палку Ігаравым», дзе Баян называецца ўнукам Вялеса. Пра гэтае бোства знаходзім сведчанні і ў «Хождении Богородицы по мукам», дзе ў адным з эпізодаў архістраціг Міхаіл паказвае Багародзіцы грэшнікаў, якія «Трояна, Хърса, Велеса, Пероуна на богы обратиша...» Украінскі даследчык Ю. Пісарэнка адзначае, што пра Вялеса гаворыцца таксама і ў «Сказании о построинии града Ярославля». Успомнім і самабытную «Вялесаву (Влесову) кнігу», тэкст якой, як сцвярджалі змешчаны на драўляных таблічках.

Далёка не заўсёды тлумачэнні аб паходжанні назвы гэтага бога маюць пад сабою хоць нейкія пэўныя тэарэтычныя падмуркі. Напрыклад, А. Афанасьеў усё надзвычай спрасціў: «Першапачатковая назва гэта была не больш як адзін з эпітэтаў хмарагоншчыка Перуна (граманоснага Тура); пазней жа, пры забыцці яго карэннага значэння, яна абасобілася і прынята за ўласнае імя асобнага божышча. У якасці “скотьего бога” Вялес загадваў нябеснымі міфічнымі статкамі, быў іх уладыкам і пастухом; але потым са стратай народам свядомых адносін да сваіх старажытных уяўленняў, яму прыпісана было апякунства і ахова звычайных зямных статкаў». Такім чынам, атрымалася, што і гэтага ўсёмагутнага нябеснага бога нашы продкі ўмела «прызямлілі».

Затое папулярны славянскі міфолаг Любамір Нідэрле адводзіў Вялесу трэцяе месца (пасля Перуна і Сварога) у славянскай міфалогіі. У яго занатавана: «...Вялес належыць да ліку пашыраных, мабыць, агульнаславянскіх багоў і адзіная цяжкасць у вытлумачэнні яго імя і ўзаемасувязі паміж абедзвюма формамі імён Вялес і Валос. Я асабіста асноўнай формай схільны лічыць імя Вялес, на што ўказвае і яго чэшская форма і літоўскае vele – imago mortui (нар. velnas velnios – д'ябал). У аснове ж уяўлення пра Вялеса, мяркую, ляжаў дэман з катэгорыі хатніх багоў, спецыяльнай функцыяй якога была ахова гаспадаркі і статку. З цягам часу ў сувязі са значэннем функцый, якімі ён быў надзелены, Вялес, відавочна, узвысіўся сярод дэманаў і стаў вышэй іншых ушанаваных і, значыць, неабходных багоў. Як узнікла другая руская форма – валос, цяжка сказаць. Тут або адбіўся ўплыў паўночнай скандынаўскай рэлігіі, якая ведае дэманаў volsi, або, што больш верагодна, з'явіўся грэчаскі ўплыў святога Уласія (Власия), што ішоў з Малой Азіі» [2, с. 312].

Лічылася, што любое дзеянне, якое адбывалася ў Вялікі чацвер, спрыяла гэтаму занятку на працягу ўсяго года. Гаспадар з самай раніцы пералічваў грошы, якія ў яго былі, каб ніколі яны не пераводзіліся і адно толькі памнажаліся. Потым ішоў у хлеў, дзе чысціў, даглядаў жывёлу, каб і яна была «спасная, пладавітая і здаровая». Перамешваў зерне ў сусеках, «каб мышы не елі, каб чыстае расло», перастаўляў ці перавешваў прылады працы, каб і яны не ламаліся, не псаваліся, не тамілі «задарма рук». Для шанцавання ў промыслах рыбакі ў гэты дзень прасякалі апалонку, а паляўнічыя тройчы стралялі са стрэльбаў, пчаляры выстаўлялі на паветра вуллі, каб пчолы ў іх раіліся і былі меданосныя. Гаспадыні выпякалі свежы хлеб, частавалі ім хатніх і суседзяў. Акрамя таго яны імкнуліся перарабіць як мага болей спраў, «каб у гаду ўсюды паспяваць». Знаўцы перавязвалі ніткамі запясці рук і паясніцы родным, каб яны не балелі. Асабліва стараліся засцерагчы жывёлу, для гэтага гаспадыні нават «клікалі» яе ў комін, лічылася, што тады яна будзе здаровая і не прападзе за лета. Разам з тым у некаторых мясцінах у гэты дзень забівалі пеўня, якога з'ядалі ўсёй сям'ёю. Даследчыкі мяркуюць, што гэта згадванне пра прынашэнне ахвяры свяшчэннаму Воласу. Характэрнай асаблівасцю гэтага дня было і тое, што ў людзей стрыглі валасы, у жывёлы – поўсць, у хатняй птушкі – пер'е.

У вусна-паэтычнай творчасці ўсходніх славян таксама захаваўся выразны след Вялеса (Воласа). Праўда, само прызначэнне боства тлумачыцца па-рознаму. І зноў жа самая галоўная ягоная ўласцівасць – улада над жывёлай і жывёльным светам, суровае адсочванне вядзення гаспадарчых спраў земляробамі, за парушэнне якіх ён бязлітасна караў.

Паводле народных меркаванняў, бог Вялес, спусціўшыся на зямлю, набыў аблічча быка. Вось таму і пераконвалі, што камяні-валуны, якія мелі хоць нейкае далёкае падабенства да быка, былі прысвечаны Вялесу і ўжо толькі з-за гэтага іх выпадала шанаваць і абагаўляць. У некаторых выпадках сцвярджалі, што ён хадзіў сярод людзей у чалавекападобным вобразе. Вялес пільна сачыў за статкамі жывёл на зямлі, старанна ахоўваў іх ад усемагчымых хвароб-бед, ад зубоў драпежных жывёл, чым, адпаведна, выклікаў асаблівую павагу да сябе з боку пастухоў, якія прыносілі яму абавязковыя свяшчэнныя ахвяры. Таму і нядзіўна, што ў вачах простага люду ён быў куды важнейшым і значнейшым, чым сам грамоўнік Пярун. Капішчы, прысвечаныя богу Вялесу, знаходзіліся, як пераканаўча даказана археолагамі, на тэрыторыі найбольш значных усходнеславянскіх гарадоў (Кіеў, Ноўгарад, Пскоў, Растоў, Уладзімір, Полацк). Але аддзяляць асобна жывёлагадоўлю і земляробства, на нашу думку, будзе не вельмі правільна, таму што гэтае боства апекавалася і працаўнікамі ніў. Таму мы прытрымліваемся пазіцыі тых даследчыкаў, якія сцвярджаюць, што Вялес адначасова быў і богам земляробства. Гэта даволі выразна прасочваецца пры аналізе старажытных земляробчых абрадаў і культаў. Прыгадаем апісанне такіх свят у рускіх, беларусаў, украінцаў, каб пераканацца ў слушнасці нашых разважанняў.

Зыходзячы са сцверджанняў Б. Рыбакова, культ Вялеса бярэ свой пачатак ажно аднекуль з перыяду неаліту, а магчыма, яшчэ і раней – перыяду палеаліту. Першапачаткова гэта быў бог паляўнічай здабычы, прынесенай з удалага паходу за жывёлай. Выяве гэтага боства і падносіліся страдаўнімі продкамі найлепшыя ахвяраванні, каб не адвярнулася яно ад іх у наступны раз, каб не давялося ўсім ім у выніку гэтага галадаць. Кроў забітых звяроў вылівалі, у якасці ахвяравання, на вялізныя і маўклівыя камяні, прысвечаныя ўжо тады гэтаму боству. Паступова, недзе ў бронзавым веку, калі паляванне, як промысел, заставалася, але паступова ператваралася ў жывёлагадоўлю, Вялес стаў апекавацца і над ёю. Тут ён ужо выступаў магутным богам «мірных статкаў», з якім заўсёды і асацыяваўся дабрабыт людзей.

Вучоныя лічаць, што Вялес мог быць падобным да змея (змяі), мядзведзя, а Б. Рыбакоў увогуле абагульняльна сцвярджаў, што воблік гэтага боства трэба бачыць ва ўсіх славянскіх **каменных адлюстраваннях** (вылучана намі. – *А. Н., Я. Н.*) барадатага чалавека з рогам дастатку ў руцэ. Гэткае разыходжанне прывяло да таго, што «ўсплыла» непасрэдная сувязь гэтага боства яшчэ і з малазразумелым і з гэтай нагоды амаль невытлумачальным светам... памерлых.

Б. Рыбакоў пісаў: «Можа быць, менавіта тут мы знойдзем тлумачэнні пазнейшай сувязі Валоса з культам мёртвых. Першапачаткова, у далёкім паляўнічым мінулым, Вялес мог азначаць "духа забітага звера", "духа паляўнічай удачы", г. зн. бога таго адзінага багацця першабытных паляўнічых, якое ўвасаблялася ў тушы пераможанага звера. Сувязь Вялеса з мядзведзем дазволіла датаваць (стадыяльна) гэты культ больш позняй фазай развіцця паляўнічага грамадства, калі ранні культ нябесных парадзіхласіх часткова выцясняецца ўяўленнямі аб мужчынскім божышчы, гаспадары лесу, які выступае звычайна ў выглядзе мядзведзя. Тады ж, на той стадыі, адбываецца і замена найменняў сузор'яў: сузор'е Лася становіцца Вялікай Мядзведзіцай. На жаль, гэтая стадыя цяжка паддаецца абсалютнаму датаванню. Верагодна, гэта неаліт або бронзавы век» [29, с. 530]. У гэтага ж даследчыка знаходзім і яшчэ больш «удакладняльныя» словы: «Вялес, які ў часы татэмізму і веры ў рэінкарнацыю звязваў першабытнага паляўнічага са святам звяроў, цяпер прычапіўся да культу продкаў і аграрнага кругазвароту жыцця і смерці, стаў у нейкай меры эпіхтанічным божышчам, звязаным з урадлівасцю глебы, гэта значыць стаў "скотьим богом" у комплексным разуменні гэтых слоў» [Тамсама, с. 534].

Паводле Э. Ляўкова: «У былыя часы свойская жывёла была сімвалам дастатку і багацця. Старажытнаславянскае слова "скотніца" азначала "скарбніца". Той, да каго Вялес "меў ласку", жыў у дастатку, сыта і заможна. Жывёла складала важную частку гандлю. Нездарма ў беларускіх гаворках словам "тавар" называецца не толькі прадмет гандлю, але і свойская рагатая жывёла. У выніку "бог статку" стаў апекуном гандлёвага люду, часцей купецтва. Пераапрананне ў звяроў, гулянні падчас зімовых свят і Масленіцы – водгулле свят у гонар Вялеса» [22, с. 94].

Сведчанне пра тое, што Вялес быў апекуном гандляроў, захавалася і ў беларускім паданні, якое распавядае пра паходжанне назвы горада Брэста (Бярэсця): «Калісьці, вельмі даўно, нейкі багаты купец (госць), не здолеўшы прабрацца праз топкія балоты з вялікай колькасцю ўсялякага тавару, зрабіў плаціну з бярозавых дрэваў, завалiў самое балота бяростай, ці берасцю (бярозавай карой). І такім чынам праклаў сабе шляхавую дарогу (бітую, цвёрдую). У памяць свайго выратавання з гэтых балот прыезджы госць пабудаваў капішча і там прынёс ахвяру паганскаму (язычніцкаму) свайму богу Вялесу» [20, с. 97].

Рускі вучоны У. Тапароў прапанаваў сваю версію «абмежавання» тэрыторыі ўладанняў Вялеса, якая дае падставы для шматлікіх версій і гіпотэз. Паводле ягоных выказванняў вынікала:

1) вызначэнне злучанага з Вялесам персанажа;

2) повязь Вялеса і яго трансфармацыі з вадою, акрамя таго, з морам, ручаямі і крыніцамі;

3) злучэнне Вялеса са смерцю і замагільным светам;

4) уяўленне пра Вялеса-Воласа як змея, дракона;

5) прывязка з Вялесам абрадаў да стыку Старога і Новага гадоў;

6) паэтычная функцыя Вялеса;

7) трансфармацыі, варыяцыі, двайнікі Вялеса.

Адносна самой назвы Вялес (Воласа) можна адзначыць наступнае: «У сваёй язычніцкай функцыі Вялес успрымаўся пазнейшай праваслаўнай традыцыяй (у той ступені, у якой яна яго не асімілявала, спалучыўшы са св. Уласіем) як «чорт люты», «люты звер», «чорт», адсюль кастрамскі ёлс – «ляшак», «чорт», «нячысцік», дыялектнае: валасацік, воласень – «нячысты дух», «чорт»; гэтае ж пазнейшае значэнне – «чорт» вядома і ў роднасным чэшскім Велес – «злы дух», «дэман» (тэксты XVI–XVII стст.) [34, с. 234]. Аб агульнаславянскім характары Вялеса сведчыць і наяўнасць адпаведнасцей у паўднёваславянскай традыцыі рускаму Вялесу, дзе, як і ва ўсходніх славян, з імем гэтага бога звязваецца назва сузор'я Плеяд, а таксама назва вілы Вела ў македонскім фальклоры.

На беларускай зямлі таксама захаваліся «сляды» старадаўняга боства. Найперш гэта засведчана ў назвах населеных пунктаў, рэчак, азёраў. У Браслаўскім р-не, у басейне ракі Друйкі, ёсць возера Волас, у Кіраўскім раёне – вёска Власавічы, Іванаўскім – Власаўцы, Глыбоцкім – Валосава, Лепельскім і Акцябрскім – Валосавічы, Віцебскім і Талачынскім – Валосава, Пухавіцкім – Вялень, Глыбоцкім – Вялец, Хойніцкім – Вялецін, Пінскім – Велясніца, Лепельскім – Вялеўшчына. Не выключана, што частка з іх пачынае свой «радавод» яшчэ ад язычніцкага бога жывёл і земляробства.

Свята Валоса мела ў Беларусі шмат рэгіянальных форм. Напрыклад, жанчыны з самага ранку рыхтавалі багатую мясную страву, галоўным чынам са свініны і ялавічыны, мужчыны клапаціліся пра гарэлку. У гэтае свята кожны селянін стараўся запрасіць да сябе родных, блізкіх, сяброў, суседзяў на пачастунак. Пасля хмельнага застолля ўсе выходзілі на вуліцу, дзе адбывалася гулянне з песнямі, танцамі, качаннем па зямлі і проста блуканнем па вёсцы. Паводле мясцовага павер'я, з гэтым абрадам звязана ўяўленне аб добрым плёне: «Каб мужчынам вялася жывёла, а жанчынам урадзіўся валакністы лён». Адна з мэт абраду – «паласканне зубоў, каб там не засталося мяса, інакш будзе грэх»; «Трэба было абавязкова падысці да бліжэйшага вялікага каменя, дакрануцца да яго і крыху так пастаяць, прыгадваючы старажытнага Вялеса».

З Валосавым святам звязаны ў народзе звычай абворвання вёскі, які меў за мэту адмежавацца, засланіцца ад Каровінай смерці. Паводле народнага ўяўлення, са свята Стрэчання Смерць пачынае слепа блукаць па падворках, заглядвваючы ў сялянскія хлявы і хаціны, вышукваючы сваю чарговую ахвяру. Вялікае гора чакала таго гаспадара, які не паспеў да часу наведвання Смерці зачыніць вароты сваіх будынкаў, а яшчэ не парупіўся разам з іншымі ў працэсе абворвання вёскі.

Уласаў дзень – небяспечны і пагрозлівы для Каровінай смерці, асабліва калі ўся вёска выступала супраць нечаканага няшчасця. Галоўнымі ўдзельнікамі (дакладней, удзельніцамі) былі старыя жанчыны. Напярэдадні гэтага дня самая энергічная з іх абягала кожную вясковую хату, заклікаючы жанчын сабрацца на загадзя дамоўленую і важную справу. Мужчыны – ад малога і старога – павінны былі сядзець па хатах, не вылазіць нават за дзверы. Глыбокай ноччу бабулька-абвесніца, апранутая паверх аўчыннага кажуха ў белую сарочку, выходзіла за ваколіцу і пачынала біць калатоўкаю ў патэльню. Гэтыя гукі збіралі да сябе жанок, узброеных прыхопленымі з сабою гаспадарчымі прыладамі працы. Жанчыны прыносілі з сабою і драўляную саху, у якую запрагалі бабулькуабвесніцу. Адсюль і пачынаўся самы ўрачысты рытуал: тройчы абворвалі вакол вёску – рабілі гэтак званую водную барану. Шэсце праходзіла пад бурны шум, крыкі і грукат з адной толькі мэтай – запалохаць Каровіну смерць. Лічылася, што яна ні ў якім разе не пераадолее гэтую магічную перашкоду. Працэсію звычайна пачыналі ад бліжэйшага Воласавага каменя і ля яго ж завяршалі сваё ўрачыста-магічнае дзеянне.

Барацьба з культам Вялеса (Воласа) не мела б такога поспеху, калі б на змену яму вельмі ўдала не падабралі хрысціянскага святога Уласія (Власія, Аўласа). Імя новага апекуна жывёлы для простага селяніна гучала амаль аднолькава. Бажніцы гэтага святога часта ўзводзілі на капішчах «бога статку». Няма нічога дзіўнага ў тым, што абраз святога Уласія ставілі ў кароўніках. Яго дзень святкавалі ў час зімовага ацёлу.

На Валоса трэба было асабліва ўважліва ставіцца да жывёлы, добра яе даглядаць, шанаваць. На Віцебшчыне раілі таксама аб'язджаць маладых коней ці бычкоў.

Аўлас у народзе лічыўся «каровіным і конскім святам». На яго прасілі Аўласа (Уласа) засцерагаць каровак, авечак, свінак, козачак... Менавіта на гэты дзень царкоўнікі прызначылі шанаванне святога Уласія Севасцейскага, служылі малебен у царкве.

Кожнае свята народ спрадвеку адзначаў прыгатаваннем розных страў. Не быў выключэннем і Уласаў дзень. У гонар апекуна статкаў

пякліся малочныя пампушкі з такім разлікам, каб накарміць не толькі сваю сям'ю, але і пачаставаць (абавязковы рытуал!) жабракоў на дзядзінцы. Гэта называлася Уласавай міласцінай, а за гэта жабракі павінны былі звяртацца ў сваіх малітвах да святога з просьбай засцерагаць жывёлу «ад усялякага ліха». Адну пампушку хавалі за бажніцу і берaглі да наступнага года, «на ўсялякую жывёльную хваробу». Дастаткова яе толькі расцерці ў ежу хворай жывёліне, як яна адразу ж устае на ногі [21, с. 175].

Б. Рыбакоў прытрымліваўся думкі, што ў раннеязычніцкага Вялеса магло быць дзве іпастасі: больш архаічная, паляўнічая – мядзведзь і троху пазнейшая, звязаная з жывёлаводствам, – тур.

Паводле сцверджанняў Э. Ляўкова, на Беларусі раней знаходзілася некалькі вялікіх камянёў, якія, найхутчэй, з'яўляліся ахвярнымі і былі злучаны або асацыяваліся з Вялесам-Воласам: «Другому валуну Воласу больш пашчасціла. Ва ўсялякім выпадку дакладна вядома, які менавіта камень насіў гэтае імя. Зараз гэты непрыкметны метровы валун ляжыць у лесапарку дачнага пасёлка Крыжоўка недалёка ад Мінска. Чаму на ролю боства выбралі яго, не зусім зразумела. Добры дзясятак такіх камянёў можна было адшукаць бліжэй, аднак старыя людзі памяталі і расказвалі першым дачнікам, што да вайны камень ляжаў на невялікай палянцы, а вакол яе на дрэвах былі развешаныя чарапы свойскай жывёлы» [22, с. 92].

Акрамя гэтага, у беларускім фальклоры таксама захаваліся сведчанні аб пакланенні нашых прашчураў велічнаму Вялесу, а значна пазней – святому Уласію (Аўласу). На гэтае свята асабліва шанавалі свойскую жывёлу. Адбывалася гэта ў чацвер на першым тыдні посту. У той дзень аб'язджалі маладых коней і бычкоў. Затое іншая свойская жывёла мела поўны перадых, вызвалялася ад працы, атрымлівала дадатковы корм. У царкве нават заказвалі малебен аб захаванні жывёлы, яе добрай плоднасці. Паводле К. Каганца, вынікала, што ў гэты дзень «скацінай не робяць». А. Кіркор адзначаў, што ў беларусаў было свята, якое адзначалася летам (у ліпені месяцы), прызначалася яно Лысаму валу, які, згодна з меркаваннем даследчыка, і быў тым самым язычніцкім Вялесам.

У «Беларускім народным календары» А. Лозкі занатавана наступнае: «24 лютага / 11-га. Аўлас (Улассе, Уласце, Улас). Лічыўся святам жывёлы, "каровіным і конскім". У адрозненне ад Валосага, Крывога чацвярга, які бывае на Масленічным тыдні, Аўлас мае сталае месца ў календары. Магчыма, царкоўнікі, каб адцягнуць увагу ад язычніцкага культу Воласа-Вялеса, увялі па сугуччы на гэты дзень адзначэнне святога Уласія Севасцейскага.

На Аўласа таксама наглядалі за надвор'ем. Верылі, што каля свята сем маразоў: тры напярэдадні, адзін на Уласа і тры пасля яго (Паўлюкоўскі, 1934).

Каб адпудзіць ласку, якая нібыта псавала жывёлу ў адрыне, сяляне вешалі пад столлю забітую варону. На Смаленшчыне спявалі:

Ты, Улас, Улас,
Ты найміся ў нас
Скату пасвіць!
Нашы каровачкі
Каля дубровачкі,
Нашы авечкі
Каля рэчкі.
Нашы свіначкі
Каля асіначкі.
Нашы козачкі
Каля лозачкі» [21, с. 175].

Так ужо атрымалася, што, узнікшы недзе на пачатку зараджэння язычніцтва, культ Вялеса (Воласа) дажыў ажно да нашых дзён, што зафіксавана неаднаразова археалагамі і гісторыкамі, міфолагамі і мовазнаўцамі, фальклярыстамі і краязнаўцамі. І няма нічога дзіўнага ў тым, што, бываючы на роднай Піншчыне, абавязкова стараюся зазірнуць на далекаватае ад нашай вёскі Чухава ўзлессе, дзе ляжаць, грэючы на сонцы свае абымшэлыя бакі здаравенныя камяні-валуны. І назву тое зборышча мае адпаведную – Вялесава бяседа.

## Лада

Акрамя ўсяго гэтага ўсе боствы, якія былі звязаны з жаночым полам і згадваліся ў Густынскім летапісе, у народным усведамленні асацыяваліся з пэўным цыклічным перыядам, які быў адзначаны шматлікімі веснавымі і вясельнымі абрадамі і звычаямі. Нездарма ж у народнай міфалогіі (атрымліваецца, што і ў дэманалогіі) вясна – гэта абуджэнне да жыцця ўсёй прыроды. Надыходзіла часіна, калі ўсё навокал пачынала зелянець, прачынацца ад працяглага зімовага сну, і адпаведна ўяўлялася, што прырода, гэтаксама як і чалавек, адчувала на сабе пэўны «ўзроставы» перыяд. Толькі, бясспрэчна, у прыродзе ён не такі, як у жыцці чалавека, бо і сама прырода, паводле меркаванняў і ўяўленняў патрыярхальнага продка, здавалася вечнай. Проста праводзілася такая своеасаблівая паралель: вясна – маладое жыццё любога з людзей, лета –

яго сталенне, восень – час, калі ўваходзяць у заможнасць, найбольшую сілу, а зіма – старасць. Раскладваючы вось гэтак па прыродным календары перыяд чалавечага жыцця, прашчуры лішні раз падкрэслівалі, што ў прыродзе, асабліва ў язычніцкім уяўленні, адзін бог змяняе другога, бо праходзіў яго перыяд і трэба было зноў цярпліва чакаць свайго далейшага панавання на зямлі. Здаўна было правільна заўважана, што жыццё чалавечае для ўсёй прыроды (Зямлі) – гэта нішто іншае, як усяго адзін дзень, або, у лепшым выпадку, год з пералічанымі ўжо намі вышэй цыкламі-перыядамі. Таму даследчыкі слушна акцэнтуюць сваю ўвагу на тых вусна-паэтычных творах, дзе сустракаецца зварот да Лады як да сапраўднага боства.

Благослови, боже,
Благослови, мати,
Весну закликати,
Зиму проважати!
Зимочку в возочку,
Летечко в човночку...
Благослови, мати,
Ой, Мати, Лада, мати,
Весну закликати.

У той жа час расійскі вучоны А. Фамінцын, спасылаючыся на беларускага даследчыка-самавука ў галіне самабытнай беларускай міфалогіі Т. Нарбута, гаворыць, што «ў Літве (у Беларусі. – *А. Н., Я. Н.*) Ладу шануюць, як вялікую багіню» [35, с. 84].

Паступова гэтыя першасныя карані забываліся, а Лада згадвалася ўжо ў даволі цяжкавытлумачальным значэнні, у якім яе нельга было б ахарактарызаваць толькі з аднаго пункту гледжання. Б. Рыбакоў падкрэсліваў: «Нядзіўна, што прызначэнне Лады багіняй мы знаходзім толькі ў ранніх запісах, зробленых у XVIII ці ў першай палове XIX ст., бо ў другой палове XIX ст. старыя язычніцкія абрады і іх тэрміналогія сталі знікаць з незвычайнай хуткасцю ва ўсім славянскім сялянскім свеце» [29, с. 527].

Цікавым уяўляецца словазлучэнне «славянскім сялянскім свеце», але нельга забывацца пра тое, што адзначалася сувязь Лады з каляндарным (вясеннім) цыклам. А ён у сваю чаргу непарыўна звязаны з земляробствам, якое заўсёды асацыявалася з сялянствам. Праўда, у А. Фамінцына знаходзім іншае сведчанне, дзе падрабязна разглядаецца Лада як апякунка кахання і ўсялякага дабрабыту. Больш за тое, ён паспрабаваў спалучыць земляробчыя рысы боства з рысамі, якія ўказвалі на тое, што яна і апекавалася закаханымі:

Ладковать (Волынь) – славіць вяселле;
Ладковать //;
Ладковать (Разань, Тула) – сватаць;
Лады (Калуга) – помолвка;
Ладины (Осташков) – сговор;
Ладканя (Заходняя Украіна) – вясельная песня;
Ладаванне – спяванне вясенніх песень;
Ладавіцы – выканаўцы вясенніх песень;
Ладаванне – песні на Юр'еў дзень;
Ладуванье (Балгарыя) – гаданне (варажба) на жаніха;
Ладзіна хоро (Балгарыя) – вясеннія карагоды;
Ладзіна кола (Балгарыя) – вясеннія карагоды» [35, с. 86].

Б. Рыбакоў зрабіў нават своеасаблівую класіфікацыю адносна таго, калі выконваліся ў простанароддзі песні ў гонар Лады.

| «**У ліку** | **Па Вялікадні** |
|---|---|
| 9 сакавіка ("сорак пакутнікаў") | Масленіца |
| 25 сакавіка (Благавешчанне) | Сярэдзіна Вялікага Паста |
| 23 красавіка (Юр'еў дзень) | Лазарава субота |
| 1–2 мая ("чырвоная горка") | Фаміны тыдзень |
| 24 чэрвеня (Іван Купала) | Сёмік |
| 29 чэрвеня (Пятроў дзень) | Троіцын дзень» [29, с. 529] |

У вусна-паэтычнай творчасці і ў народнай міфалогіі добра вядома, што ўсе гэтыя песні галоўным чынам былі звязаны з маленнямі аб дажджы, першых усходах, першых каласках, увогуле – будучага ўраджаю. Як бачна з класіфікацыі Б. Рыбакова, пасля «пятровак» зварот да боства (багіні) Лады ўвогуле перапыняўся. Гэта азначала тое, што «час» Лады заканчваўся і ёй на змену, у народным язычніцкім календары, прыходзіў іншы бог з адпаведнымі яму культамі, абрадамі, песнямі і карагодамі.

Сельскагаспадарчы аспект песень таксама поўны архаікі, як і іхняя лексіка, якая ў некаторых выпадках была цяжкавытлумачальнай. Патрэбна адзначыць, што найбольш цесна з Ладай або (!) ... з дзедам Ладам у беларускім фальклоры звязана папулярная раней гульня «А мы проса сеялі». Па часе гульня гэтая прывязвалася да Фаміна тыдня пасля Вялікадня. Звернемся да варыянтаў песень, каб адзначыць найбольш істотныя іхнія асаблівасці.

А мы сечу чысцілі, чысцілі,
Ой, дідi-ладу чысцілі, чысцілі!
Ой, мы проса сеялі, сеялі,
Ой, дідi-ладу сеялі, сеялі!

А мы пашню пахалі, пахалі,
Дідi-ладу пахалі!
А мы ніўку аралі, аралі,
Да ў ладу ладам аралі.

Часам у песнях адлюстроўваўся ўвесь вясенне-асенні земляробчы перыяд, гэта значыць спявалі пра тое, як высякалі «сечу», «карчавалі ляда», засявалі яго, палолі проса, а потым ужо «вытоптвалі», што проса не малацілі цапамі, а старанна «вытоптвалі» коньмі ці валамі. Рабілася гэта надзвычай проста: жывёлін запрагалі і ганялі па разасланым на таку збожжы па крузе.

А мы просо вытопчем,
Ой, дид-Ладо, вытопчем, вытопчем.
Да чем же нам вытоптать, вытоптать?
Ой, дид-Ладо вытоптать, вытоптать
А мы коней выпустим, выпустим.

Цікава і тое, што ў беларускім фальклоры сустракаецца яшчэ адно язычніцкае боства, якое пастаянна ўжываецца ці згадваецца разам з Ладаю, – гэта Ляля. Менавіта яна, а не ён, як гэта часта трактуецца, напрыклад, у рускай вусна-паэтычнай творчасці. Праўда, пакуль што немагчыма дакладна растлумачыць, кім апекавалася Ляля ці ў сувязі з якімі традыцыйнымі дзеяннямі яна згадвалася. Часта даследчыкамі дапускаліся значныя спрашчэнні, якія дапамагалі ім «здзяйсняць» сваю сістэму ў язычніцкім пантэоне бостваў ці дэманалагічных персанажаў. Тады атрымлівалася, што калі Лада – багіня вясновага дабрабыту і апякунка закаханых, то і Ляля, а ў іх Лель з'яўляліся ўжо асобамі мужчынскага полу і ўяўлялі сабою закаханага персанажа, які ўжо тут выступаў у непарыўнай сувязі з Ладай. У старадаўніх беларусаў усё было значна прасцей і разам з тым Ляля выступала як памочніца ці як паўнапраўнае боства, якое зноў-такі ў нечым дапаўняла Ладу ці брала на сябе частку яе непасрэдных функцый.

Дай нам житцу да пшаницу,
Ляля, Ляля, наша Ляля!
В агародзе, сенажаци,
Ляля, Ляля, наша Ляля!
Ровны гряды, ровны зряды,
Ляля, Ляля, наша Ляля.

У свой час усё той жа А. Фамінцын падрабязна апісаў абрад-гульню, якая была прысвечана Лялі. Праводзілася яна напярэдадні Юр'я, 22 красавіка. Свята так і называлася – Ляльнік. Паводле народных традыцый,

дзяўчаты выбіралі са свайго асяроддзя самую прыгожую, яна выконвала ганаровую ролю Лялі. Для яе рабілі спецыяльна прыстасаваную лаўку з дзёрану. І дзёран гэты ці тое месца, дзе павінна была сядзець дзяўчына Ляля, сімвалізавалі сабою маці-Зямлю, з якой пачынае вырастаць усялякая расліннасць. На самую сярэдзіну гэтай лаўкі ўсаджвалі выбраную прыгажуню, а паабапал яе, з абодвух бакоў, пачыналі складваць паднашэнні, якія абавязкова павінны былі вылучацца сваёй натуральнасцю. З аднаго боку клалі хлеб, а з другога – малочныя прадукты. Каля ног Лялі ляжала цэлая горка сплеценых з зяленіва чвянкоў. Дзяўчаты вадзілі карагоды вакол прыгажуні, што сядзела, і спявалі песні, якія датычыліся буйнога, шчодрага ўраджаю і г. д. Найбольш характэрна тое, што дзяўчаты ўслаўлялі багіню Лялю як карміцельку і падавальніцу будучага ўраджаю. Пасля заканчэння ваджэння традыцыйных карагодаў Ляля ўзнагароджвала кожную з прысутных вянком. Гэтае дзеянне, што з'яўлялася неад'емным атрыбутам язычніцкага свята, падкрэслівала значнасць і самога боства Лялі. Нельга не сказаць і пра тое, што Ляльнік праводзіўся якраз-такі напярэдадні першага выгану жывёлы ў поле, калі адбывалася не менш магічнае, па сваім выкананні і сэнсе, запашванне. Дзень гэты вядомы – Юр'я.

Б. Рыбакоў па-свойму паспрабаваў растлумачыць сувязь і існасць Лады і Лялі: «Адкінем Палеля як песенны паўтор, прымем жаночы род для Лады і Лялі (да чаго нас абавязвае фальклорны матэрыял), і мы атрымаем архаічную пару: маці і дачка – багіні прыроды, якая ажывае і нараджае. Гэтая пара намнога старажытнейшая, так бы мовіць, спрадвечнейшая, чым антычныя міфы, фальклорныя рэмінісцэнцыі, і яна вядзе нас да пары паляўнічых парадзіх, якія таксама ўяўляліся маці і дачкою. Але тут мы маем справу ўжо з парадзіхамі аграрнымі, звязанымі не з прыплодам звяроў, а з вегетатыўнай сілай вясенняга росквіту расліннасці ўвогуле і хлебных злакаў у прыватнасці». Даследчык працягвае: «...са шматвобразнага агульнаславянскага фальклорнага матэрыялу вылучаюцца дзве міфалагічныя фігуры: Лада – вялікая багіня вясенне-летняй урадлівасці і апякунка вяселляў, сямейнага жыцця – і яе дачка Леля, Лёля, Ляля, якая ўвасабляе вясну, вясеннюю зеляніну, росквіт абноўленай прыроды». І ўсё ж пакуль не хапае матэрыялаў, нейкіх хаця б ускосных сведчанняў, якія б далі магчымасць станавіцца прыхільнікамі гэтай своеасаблівай гіпотэзы. У Б. Рыбакова прасочваецца даволі лагічная паслядоўнасць, асабліва калі яна датычыцца разважанняў адносна багіні Лялі: «Дачэрняя існасць Лелі-Лялі выяўляецца з цэлага шэрагу блізкіх да гэтага міфалагічнага імя слоў: "ляля", "лялька" – дзіця, лялька, цацка; "лелеять" – беражліва насіць дзіця; "люлька" – дзіцячая калыска;

"лелека" – бусел, з якім звязана павер'е аб тым, што ён прыносіць дзяцей, і многае іншае» [29, с. 527].

Такім чынам, язычніцкая боская пара Лада – Ляля да гэтага часу захоўвае ў беларускай дэманалогіі і міфалогіі многа таямнічага і незвычайнага, што, на вялікі жаль, пакуль немагчыма растлумачыць адназначна, без усемагчымых адгаворак на недахоп фактаў і дакладных тлумачэнняў.

Праўда, пра таямнічую Ладу, бостваў Лялю і Лелю нам даводзілася сустракаць своеасаблівыя звесткі, пачынаючы з нашага самага ранняга дзяцінства. Проста тады не паўставала задача: зафіксаваць, прааналізаваць, захаваць для нашчадкаў адгалоскі самабытных легендаў і паданняў, якія гучалі з вуснаў старэйшых вяскоўцаў. Пастуупова ўваходзіла (убівалася!) у галовы моладзі абыякавасць да таго, што гучала ад іхніх бацькоў і дзядоў, пастуупова, але затое надта імклва, стала яно ваяўнічым адмаўленнем усяго старога, а разам з ім і пэўнай часткі (найбольш архаічнай, каштоўнай з боку вывучэння) дэманалогіі і міфалогіі.

Памятаецца, як любіў расказваць такія свае «показкі» наш дзед Уладак – мамін бацька. Пакінуць яго са сваімі малымі ўнукамі, бо ў полі з дзеда працаўнік быў не надта каб шчыры і непаседлівы. Таму хатнія і тут знаходзілі своеасаблівае выйсце: з дзецьмі дык не надта стары яшчэ мужчына ўправіцца. Тым болей што малыя слухаюцца яго, а сваім языкам заменіць на сялянскай ніве нечыя ўмелыя рукі, якія не будуць ленавацца і выканаюць пэўны аб'ём неадкладнай фізічнай працы.

Пасадзіць нас усіх пад разгалістай яблыняй, ды яшчэ стане загадваць, пагражаючы скрыўленым пракураным пальцам:

– Глядзіце мне, слухайцеся... Посцілка вялікая... Хто спаць захоча, то кладзіцеся і спіце... Гэта вам дазваляю. А за іншыя спробы да свавольстваў буду караць крапівою... Бачыце, які вялізны пук яе паклаў побач... На ўсіх чыста хопіць...

Аднаго разу нечага ўсхадзіўся распавядаць пра Ладавы камяні. Іхнія рэшткі ў пяцідзясятыя гады мінулага стагоддзя сцягвалі калгаснікі, калі пашыралі поле пад каноплі. Добра памятаю, што знаходзілася яно побач са старым возерам. У гэтым людзям бачылася значная выгада, бо вырваныя каноплі надоўга замочвалі ў вадзе, каб яны, як у нас гаварылі, «загнівалі і станавіліся мяккімі», тады і валокны былі доўгія і пухнатыя, на здзіўленне нават самым спрактыкаваным жанчынам.

– Калі я быў такім, як вы зараз, то менавіта тады Ладавы камяні і пачалі разбіваць. Вайна тады з германцам пачалася. І спачатку рускія, а потым і нямецкія войскі стаялі ў нашай вёсцы. Былі тут агромністыя артылерыйскія склады, у якіх знаходзіліся запасы для гармат усяго За-

ходняга фронта. То аднаго разу, прыстрэльваючы гармату буйнога калібру, рускія афіцэры ў якасці мішэні абралі здаравенны Ладаў камень, які ляжаў недзе ў кіламетры ад перадавой. Вопытныя вайскоўцы не схібілі і даслалі снарады прама ў цэль. Ад іхніх пападанняў усё навокал traслося і раўло, а неўзабаве салдаты закрычалі задаволенымі галасамі:

– Усё, няма камлыгі! Раскалолася ад нашай сілы! Нарабілі мы млынарам на жорны нарыхтовак! Няхай сабе смела карыстаюцца ды нас успамінаюць! І з гэтакага каменя немалая карысць атрымаецца!

У наступныя дні і малыя, і дарослыя хадзілі паглядзець, што ж там атрымалася ў выніку стральбы. Уражанне было жахлівае: нібыта нейкая невядомая і ўладарная, страшэннай сілы стыхія пагаспадарыла тут. Усё было пераворана на вялікую глыбіню, а сам камень нагадваў сабою вынік працы агромністага Молахавага ці Перуновага молата, пра які некалі старыя людзі гаварылі, што ён разбіваў усё на белым свеце. Нават на крэпкім камені, на ягоных здаравенных аскепках, засталіся знакі-шнары ад сілы артылерыйскіх снарадаў, што патрапілі ў валун. Калі праводзілі па іх рукамі, то здавалася, што яны яшчэ захоўваюць цяпло ад нядаўніх выбухаў.

Стары быў задаволены – ягоная гісторыя спадабалася малым, яны не хуліганілі, не сваволілі, але і не спалі, а чакалі працягу гісторыі. Дзед Уладак закурыў новую самакрутку і павёў, нібы вяслом па вадзе, свой аповед:

– Яшчэ мой прадзед, які сядзеў з намі, калі я сам быў малы, гаварыў, што Лада – гэта прыгажэнная і вялізная багіня. Боства, якое апекавалася сіламі прыроды і ад яго напрамую залежала ўрадлівасць зямлі і будучыя ўраджаі. Яе сяляне вельмі шанавалі і прыносілі ёй шматлікія ахвяры і паднашэнні. Наладжваліся небывалыя ўрачыстасці, прысвечаныя Ладзе. На іх прысутнічала ўсё насельніцтва вёскі, але найперш пакланяліся ёй жанчыны і дзяўчаты. Яны адчувалі сілу гэтай апякункі, таму імкнуліся ні ў чым не змяняць стары абрад, не адмаўляцца ад яго, каб незнарок не абрынуць на сябе гнеў боства за непрадуманыя дзеянні. Таму знаходзілі самую статную і прыгожую ды працавітую жанчыну з паселішча. Калі абіралі Ладай на свята, то гэта было вялікім гонарам для яе. Гэтую падзею прыгадвалі потым на працягу ўсяго астатняга жыцця.

Самае галоўнае, мабыць, заключалася яшчэ і ў тым, што Ладаў камень, у атачэнні іншых, крыху меншых валуноў, ляжаў на невысокім узвышэнні, і таму атрымлівалася так, што калі ўзыходзіла (гаварылі – «пачынала іграць») сонца над далекаватым лесам, палошчучы свае прамяні ў азёрных водах, то ўвогуле стваралася нейкае боскае відовішча, у якім прысутнічалі не толькі людзі, але і сонца, вада, лес, камяні. Адным

словам, уся прырода. У гэтым людзям, бясспрэчна, бачылася непарыўнасць складанага для іх працэсу.

Ужо значна пазней, калі бываў з дзедам на паляваннях і на рыбалках на нашым возеры, то ён паказваў мне тыя вялізныя, расколатыя неўтаймаванай сілай пораху парэшткі легендарнага валуна: парослыя мохам, урослыя ў зямлю, адкінутыя (і забытыя!) людзьмі, бо не знайшлі ўмелыя чалавечыя рукі ім прымянення ў гаспадарчых справах. Каб быў адзін, каб не ведаў распавяданай старым легенды, то і ўвагі не звярнуў бы, а проста прайшоў бы міма, але ж тут быў іншы выпадак, ды і стары дзядуля знаходзіўся побач. Тым самым пацвярджаючы «рэальнасць» даўніх падзей і вераванняў.

## Купала

Вылучаецца сярод усіх астатніх язычніцкіх боствaў, вядомых у наш час, тым, што захавала найбольш самабытных каранёў і павер'яў. Па гэтым можна прасачыць і нават адназначна адказаць, багіняй чаго яна з'яўлялася. Праўда, думкі і меркаванні даследчыкаў розняцца. Відаць, так павінна быць на самай справе, бо кожная навуковая версія мае права на існаванне. Е. Бандке, М. Кастамараў, Я. Карскі лічылі яго вытворным словам ад грэчаскага «купель». Паводле меркавання Ф. Буслаева, А. Афанасьева, «Купала» мае корань "куп", "кып", тоесны з санскрыцкім «кіп», лацінскім *cupio*, якія азначалі: «ярыцца, злавацца, ускіпаць». Трэцяя гіпотэза належыць чэшскаму славісту І. Даброўскаму, які слова «Купала» выводзіць ад «купа, купець» – «гарэць». Сучасныя этымолагі І. Іваноў і У. Тапароў звязваюць гэта паняцце з агнём, яго сакральным, ачышчальным значэннем. Н. Гусева прапанавала па-новаму прачытаць санкрыцкае «куфпалам», у сувязі з чым славянскае «Купала» тлумачыцца як «абаронца, падавальнік дароў». Б. Рыбакоў схільны бачыць слова «Купала» вытворным ад «купа, купна», гэта значыць – «збірацца разам, купай». Крыху пазней У. Іваноў і У. Тапароў прапанавалі свой жа, але відазменены ранейшы погляд на слова «Купала» і на само гэта свята: «Як і самі абрады, так і назва "Купала" ад дзеяслова *купаць, кіпець,* роднаснае лацінскаму *купідо, купідон* – «імкненне»: параўнаем індаеўрапейскі корань "куп" са значэннем "кіпець, ускіпаць, ярасна жадаць" – указвае на суадносіны купальскіх рытуалаў з агнём – зямным і нябесным – сонцам, у купальскіх рытуалах, прадстаўленых колам і вадою – якія выступаюць у купальскіх міфах як брат і сястра» [21, с. 138].

Трэба адзначыць, што сувязь назвы «Купала» з салярнасцю і ёсць той ключык да адкрыцця шматвяковай таямніцы. Купальскі агонь з за-

паленым колам («сонцавым калясом») знаходзіўся ў цэнтры славянскай купальскай урачыстасці. У прымхлівых уяўленнях патрыярхальнага земляроба агонь сімвалізаваў, увасабляў сабою сонца, якому свята пакланяўся далёкі продак. А. Патабня пісаў: «...купальскія і іншыя агні мелі моц даваць ураджай і праганяць смерць не самі па сабе, а таму што ўвасабляюць сонца» [5, с. 147].

Гэтае сцверджанне будзе да месца таму, што свята Купалы адзначаецца ў ноч з 23 на 24 чэрвеня паводле старога стылю. Гэта быў экватар летняга сонцастаяння. Салярныя матывы з'яўляюцца пераважнымі ў купальскіх песнях.

Свята Івана Купалы нельга суаднесці дакладна з нейкай канкрэтнай эпохай, заўсёды падкрэслівалася толькі, што яно мае даўнія язычніцкія карані. Тыя звесткі, якія пададзены ў летапісах, бясспрэчна, надзвычай запозненыя. У Цвярскім летапісе яно ўпамінаецца пад 1175 годам, а ў Іпацьеўскім – у запісе пад 1262 годам: «Литву изгнаша ездов на конозы Ивана дни на сама Коупал». У адносінах да каляндарных дат Купала рэгулярна згадвалася старажытнабеларускімі граматамі з XIV ст.

Да Купалля рыхтаваліся загадзя (у некаторых мясцінах толькі з раніцы). Асноўная адказнасць і нагрузка ўскладвалася на дзяўчат і маладых мужчын. Першыя адпраўляліся на луг і там рвалі кветкі на святочныя вянкі, якія потым будуць пускацца па вадзе ў якасці своеасаблівага прадказальніка шчасця ці сямейнага дабрабыту. Яны ж таксама збіралі таямнічае зелле-краскі, што ўплывала на ўзаемаадносіны паміж хлопцамі і дзяўчатамі, і таму ім прыпісваліся чароўныя ўласцівасці. Калі дзяўчаты разлічвалі толькі на прычараванне хлопцаў, на іхняе каханне, што і нядзіўна, то замужнія жанчыны збіралі травы і карэнні, якія служылі для вылечвання ад усіх магчымых хвароб і пошасцей, а таксама (што немалаважна!) і ад уплыву на людзей розных звышнатуральных істот (нячысцікаў). З вядомых нам траў і красак, якія збіралі ў гэты дзень, можна назваць купалінку, папараць, васількі, руту, браткі і некаторыя іншыя. Праўда, у паасобных выпадках адзначалася, што найбольш моцныя чараўнікі (гаворка вялася толькі пра прадстаўнікоў мужчынскага полу) збіралі травы і кветкі-карэнні не ўдзень. А ўжо на пачатку ночы і да паўночы (калі яны ўсё яшчэ дапамагалі людзям, а не выступалі супраць іх) і пасля паўночы (калі чараўнік меў сабе за мэту адмоўна ўплываць на людзей). Што ў гэты час збіралі кветкі ды травы на лекі – не выклікае асаблівага здзіўлення, бо менавіта ў гэты час яны дасягалі сваёй спеласці, «знаходзіліся ў самай сіле».

Хлопцам, наадварот, выпадала роля выбіраць месца для купальскага вогнішча. І тут самае прамое захоўванне старадаўніх каранёў:

вогнішча звычайна распальвалі на высокай гары, на кургане, беразе вадаёма.

На гэтым прамая сувязь з язычніцкім боствам не парывалася. Справа ў тым, што свята, як вядома, пачыналася з запальвання вогнішча, якое ўжо атрымлівала значэнне не толькі сімвалічнага, але і ў многім ачышчальнага. Здабывалі агонь, выкарыстоўваючы старадаўні звычай, ад трэння двух дубовых кавалкаў драўніны. Сама драўніна выступала тут свяшчэннай, бо, як адзначалася вышэй, дуб асацыяваўся з магутным язычніцкім богам Перуном, а пасля прыняцця хрысціянства – з Іллём. Ад гэтага ж самага агню запальвалася кола, якое змяшчалася на высокім шасце і сімвалізавала нішто іншае, як сонечны кругазварот у ягоным гадавым цыкле ці ў значна прасцейшым – дзённым. Кола было адным з асноўных атрыбутаў свята. Нельга не згадаць і пра тое, што на больш раннім этапе святкаванняў удзельнікі іх выраблялі чучала, якое ў беларусаў называлася Мараю, а ў рускіх – ведзьмаю. Гэтага персанажа тапілі ў бліжэйшым вадаёме, калі такога не было паблізу, то проста спальвалі ў вогнішчы. У. Іваноў і У. Тапароў адносна гэтага выказваюць слушную думку, паводле якой «сюжэт кровазмяшальнага вяселля брата і сястры (першапачаткова блізнюкоў), асобныя матывы і імёны персанажаў (напрыклад, Мара, Марэна, пазней перааасэнсаванае як Мар'я) могуць адносіцца да часу, які папярэднічаў праславянскаму, што бачна з супадзенняў з балтыйскай міфалогіяй і абрадамі Іванавага дня (Ліга). Сам сюжэт у сваёй старажытнай форме тлумачыцца як увасабленне ў міфе ўзаемасувязей асноўных палярных супрацьлегласцей – агонь/вада і г. д.» [34, с. 317].

Калі запальвалася вогнішча, то на ім спальвалася не толькі старое і непатрэбнае хатняе начынне, але і некаторыя рэчы моцна хворых людзей (бялізна). Лічылася, што разам з імі на агонь перакінецца і цяжкавылечная хвароба, а самі людзі, наадварот, назаўсёды ачысцяцца. З мэтай ачышчэння пераскоквалі праз вогнішча хлопцы і дзяўчаты. Рабілі яны гэта як у адзіночку, так і парамі. Звычайна тыя, каторыя і надалей збіраліся быць «у пары», скакалі разам, каб ачысціць сваю будучую сям'ю ад злых вачэй, ад уплываў «чорных» чараўнікоў. Нельга не адзначыць і тое, што даўней усё рабілася ў адпаведным парадку, нічога нельга было перамяніць, бо ўсё тады б губляла сваю чарадзейную сілу. А. Багдановіч адзначаў: «Пасля першых песень вакол купальскага вогнішча моладзь пачынала скакаць праз агонь, каб ачысціць сябе і захаваць ад "немачы, сказы, намоў". Затым дзяўчаты ў вянках з кветак і жытніх каласоў станавіліся ўперамешку з хлопцамі і састаўлялі новы карагод, кружыліся і спявалі купалінкі. Потым з карагода выходзіла адна з сасва-

таных дзяўчат (яны звычайна загадзя запасаліся кавалкам тонкага палатна або ручніком). Карагод пачынаў спяваць: "Ішла Купалка сялом, закрыўшы вочкі чубром, чубром". Затым купальшчыца выбірала сабе да пары хлопца (раней – хто першым трапляўся, пазней – каханага). Абраны здымаў з купальшчыцы пакрывала і павязваў сабе праз плячо або на рукаў, як на вяселлі. Карагод у гэты час спяваў песню "На моры вутка купалася", у якой дзяўчына журылася над дарамі таму, што яны "хоць прадзены – не снованы, хоць снованы – дык не тканы, а хоць тканы – не белены..." Затым спявалася іншае – купальскія паважныя і жартоўныя песні. У гэтай частцы ўрачыстасці праглядвалі абрадавыя матывы кахання, заляцання.

Наступныя этапы святкавання – купанне на зары ў рацэ, пусканне вянкоў на ваду, сустрэча ўзыходу сонца. У купанні, качанні ў янаўскай расе бачылі магчымасць набрацца здароўя, пазбегнуць хвароб, зрабіцца недаступнымі розным чарам» [22, с. 71].

Колькі існуе чалавецтва, столькі яно спрабуе зазірнуць у будучыню, такая ўжо цікаўная натура ў чалавека, што хочацца яму ведаць, як жа будуць разгортвацца падзеі. Купальская варажба, чараўніцтва таксама звязаны з імкненнем людзей прадугадаць, што ж будзе заўтра. Праўда, варажба тут значна звужана, бо застаецца толькі чысты аспект (сямейны), прычым тых сем'яў, якія яшчэ не ўтвораны.

Прысутнічаюць у купальскім абрадзе нязменна і магічныя лічбы. П. Бяссонаў пісаў: «Паводле міфалагічных уяўленняў, сонца едзе да свайго мужа на трох конях, запрэжаных у каляснiцу: залатым, срэбным, пярловым і сыпле з каляснiцы промні і іскры. Адсюль і ўражанне, што яны ўзыходзяць іграючы». Але, як бачым, даследчык не ўдакладняе, хто, паводле яго даных, быў мужам самога сонца, бо паводле ўсё той жа народнай міфалогіі ім магло з'яўляцца неба.

Сярод нашых далёкіх продкаў купальская ноч вылучалася празмерным багаццем неверагодных і фантастычных павер'яў і паданняў. Пералічыць іх усе амаль немагчыма, таму спынімся на больш вядомых і папулярных. Праўда, і тут ужо ў некаторых выпадках згублены першасныя карані, якія б маглі дакладна растлумачыць узнікненне таго ці іншага павер'я або падання. Здараецца, што нават сярод усходнеславянскіх народаў сустракаюцца выключныя варыянты. Напрыклад, у рускай міфалогіі захавалася наступнае сведчанне: «У аснове міфа, які рэканструюецца па шматлікіх купальскіх песнях і іншых фальклорных тэкстах, ляжыць матыў кровазмяшальнай жаніцьбы брата з сястрою, якая ўвасабляецца двухколеравай кветкай іван-ды-мар'я – важнейшым сімвалам купальскіх абрадаў; жоўты колер увасабляе аднаго з іх, сіні – другога. У адным

з варыянтаў міфа брат збіраецца забіць сястру-спакушальніцу, а яна просіць пасадзіць кветкі на яе магіле» [29, с. 563]. Папулярнейшы на самай справе варыянт, але ж у беларускай народнай міфалогіі ён адсутнічае.

Адной з самых распаўсюджаных тэм, якая надзвычай шырока прадстаўлена ў нацыянальнай міфалогіі, з'яўляецца тэма адшукання скарбаў-багаццяў, якія ў купальскую ноч асацыююцца з адшуканнем папараць-кветкі.

Маці-прырода – гэта жыццёвая аснова, фарміраваныя «натуральныя» пачуцці чалавека да яе выступаюць як пасіўныя, сузіральныя: прырода стварае ўсё на свеце, а чалавек толькі прымае яе багацці, адкрывае яе прыгажосць. У прыродзе, правільна заўважылі нашы продкі, тоіцца вялікая стваральная сіла. Але чаму менавіта з папараццю звязвалі паданні і павер'і адносна адшукання кветкі, якая нібыта надавала яе ўладальніку казачную здольнасць да ўзбагачэння, а самае галоўнае – да прадбачання лёсу? На гэтае пытанне цяпер немагчыма адказаць адназначна. Тым не меней нам здаецца, што тут пераклікаецца матыў абнаўлення і шанавання свяшчэннага агню, ягоных ачышчальных і засцерагальных функцый. Можна прыгадаць той перыяд, калі свяшчэнны агонь на капішчах раскладваўся ў форме васьмівугольніка, або, як яшчэ яго называлі, «Перуновага цвету». Нельга не згадаць і пра тое, што, калі маланка біла ў вершаліны магутных дубоў, сцвярджалі, быццам яны цвілі «Перуновым цветам». Паводле некаторых міфалагічных сцвярджэнняў, менавіта дуб і папаратнік з'яўляліся «пасланнікамі» грознага і ўсёмагутнага бога Перуна на зямлі. Зафіксавана таксама і такая з'ява, як выслоўі тыпу «Пярун на зямлю срэбра кінуў», «Пярун багаццем шпурляе», "Перунова золата закапана", "Каб цябе Пярун золатам у зямлю ўвагнаў!" Прамая аналогія са "стрэламі" вогнеімгненнага Перуна, якія ўпіваліся ў дрэвы, будынкі, зямлю, а ў вачах патрыярхальнага чалавека яны былі яшчэ і захавальнікамі скарбаў. Скарб гэтакі адшукваць трэба было толькі там, дзе «расцвітала» папараць-кветка. Там, значыць, Перуноў скарб сам вылазіў наверх і прасіўся ў рукі. Безумоўна, народныя дарадцы свядома абмежавалі адшуканне скарбаў, цудадзейнай кветкі толькі адной ноччу – купальскай, а калі яшчэ больш дакладна, дык ад паўночы да досвітку. Паступова першапачатковы міфалагічны аспект набываў яркую сацыяльную накіраванасць. На гэта актыўна ўплывалі тыя сацыяльныя падзеі, якія адбываліся ў грамадстве. Безумоўна, калі грамадства было падзелена на бедных і багатых, дык і ўладальнікам чароўнай кветкі мог стаць толькі нехта з іх. Але гэта яшчэ не ўсё. Старажытныя продкі называлі яе па-рознаму: плакун-трава, скакун-трава, разрыў-трава, адалень-трава, святло-кветка, жар-кветка, агонь-кветка, але ўсё ж, найчасцей,

папараць-кветка. Паводле народнага павер'я, папараць-кветка давалася ў рукі толькі беднаму гаспадару. Калі ж багаты спрабаваў завалодаць ёю і нарэшце яму гэта ўдавалася, то потым ён і сам не рад быў такому набытку – усё ў ягоных руках дзейнічала наадварот і было накіравана супраць яго самога: пошасць нападала на жывёлу, хварэлі родныя і блізкія, нічога станоўчага не атрымлівалася з прыбыткам і г. д. Абавязкова папярэджвалі, што знайсці папараць-кветку можна галоўным чынам толькі выпадкова.

Сустракаліся выпадкі, што ў лапаць быццам бы магло адначасова забіцца некалькі кветачак і, адпаведна, такі валадар меў яшчэ большыя чарадзейныя сілы і ўласцівасці. Мэтанакіраванае адшуканне ні да чаго добрага не прыводзіла. Гэты купальскі матыў надзвычай стары, чаго не скажаш пра першыя запісы паданняў і павер'яў, якія тлумачылі паходжанне скарбаў або іх знаходжанне, бо такія вусна-паэтычныя адзінкі зафіксавалі толькі ў 30–40 гадах XIX стагоддзя.

Гэтая фантастычная кветка распускаецца глыбокай ноччу толькі раз у год, 24 чэрвеня – на Івана Купалу, у той момант, як Пярун выходзіць на бітву з дэманалагічнымі сіламі, якія спынялі калясніцу сонца. Недзе ў той самы момант ад магутных удараў Перуна разыходзілася зямля, і людзям адкрываліся захаваныя ў ёй каштоўнасці. Вывернутыя на паверхню зямлі, яны гараць сінімі заклікальнымі агеньчыкамі. Паводле легендаў, папаратнікавая пупышка заўсёды разрываецца з шумам і трэскам. І ўсяго за нейкае імгненне ўзнікала-вырастала незвычайнай прыгажосці залатая кветка, ад якой нельга было адарваць вачэй. Яна свяцілася, гарэла чырвова-крывавым полымем і так ярка, што праз кароткі прамежак часу вочы самі па сабе слеплі. Чорная, непраглядная ноч станавілася ясным днём. Над кожнаю Перуноваю кветкаю стаіць нячысцік ці «цэлая плойма нячысцікаў», якія пільна вартуюць патаемны дарунак, не даюць магчымасці кожнаму ахвотнаму авалодаць скарбам і кветкай. Была зафіксавана і такая гісторыя, што, маўляў, чалавек, які думае пра раптоўнае ўзбагачэнне, павінен напярэдадні Купалля ісці ў лес, выбраць куст папаратніку, абвесці вакол яго кола, сесці ў сярэдзіну і, не зводзячы вачэй з куста, чакаць патрэбнага моманту. Зрэдчас гэтую кветку называлі яшчэ «пеpанос-травой», ці «скакун-травой», бо яна быццам бы здольная сама пералятаць на вялікія адлегласці і разбураць усемагчымыя перашкоды. Згадвалася і «разрыў-трава», за якой асабліва палявалі рабаўнікі-разбойнікі, бо яна ім дужа дапамагала ў іхніх зладзейскіх справах. Калі некаму з іх шанцавала, і ён знаходзіў «разрыў-траву», то яны разразалі сабе палец, у рану ўкладвалі крышачку траўкі і чакалі, пакуль рана загоіцца. Далей ад аднаго дотыку такім пальцам з дзвярэй

спадалі-разбіваліся самыя вялікія і надзейныя замкі, развальваліся турэмныя сцены. Неўтаймавальная сіла, але і кветку здабыць было надзвычай цяжка: напярэдадні купальскай ночы неабходны было забрацца ў непралазны гушчар і касіць там траву, пакуль не перарвецца каса – гэта здарыцца ад таго, што яна натрапіла на разрыў-траву. Потым сабраць усю траву і кінуць яе ў рэчку ці ў ручай. Уся звычайная трава паплыве ўніз па цячэнні, а разрыў-трава – супраць плыні. Гэтую траву і трэба хапаць, бо яна праз колькі хвілін увогуле знікне.

Да купальскіх кветак адносілася і так званая плакун-трава, якую можна здабыць толькі на золку купальскага дня. Гэтай кветцы прыпісвалася ўнікальная здольнасць – яна сунімала злых духаў, прымушала іх выконваць волю людзей, а яшчэ не давала волі чараўнікам ды злым варажбітам, «замыкала ім зубы і рукі». Мала гэтага, крыж, зроблены з плакун-травы і надзеты на шыю сумленнага хрысціяніна, пазбаўляе яго ад уздзеяння ўсемагчымых злых духаў. Нават сам усёмагутны д'ябал за лепшае лічыў не ўступаць у своеасаблівую барацьбу з купальскай кветкай. Яна прымушае плакаць дажджавыя хмары, гэта значыць ад яе сілы плакалі злыя духі. Плакун, як і папараць-кветка, адкрывае скарбы, схаваныя глыбока пад зямлёю.

Менавіта з гэтай ноччу ў народнай міфалогіі звязаны ўсемагчымыя апавяданні пра тое, што ў гэты час найбольшую актыўнасць праяўлялі ўсялякія нячысцікі, нячыстая сіла і тыя з людзей-чараўнікоў, якія нібыта былі звязаны цеснай (кроўнай) сувяззю з дэманалагічнымі істотамі. Людзі стараліся не адыходзіць у глухія куткі, а калі надаралася аддаляцца ад вогнішча, то рабілі гэта папарна ці ўвогуле гуртам. Таму і на пошукі папараць-кветкі адпраўляліся толькі самыя смелыя ды адчайныя. Затое нячысцікі адчувалі сябе ў купальскую ноч надзвычай вольна. Збіраліся яны на свае гульні з усёй ваколіцы, а то і здалёку. Стараліся перасягнуць адзін другога ва ўсялякіх д'ябальскіх штукарствах і здзеках з нявінных людскіх душ, якія нейкім чынам патрапілі да іх у палон. Выйсце з годнасцю ў чалавека было адно – памерці, але ж памерці трэба было так, каб і душа не засталася запрададзенай. Як сцвярджаецца ў народных першакрыніцах, вырвацца было амаль немагчыма, таму чалавеку заставалася адзінае – скарыцца і запрадацца нячысцікам да скону жыцця. Першастваральныя сцэны ўздзеяння чарцей на людзей, якія б хацелі задарма ўзбагаціцца, зафіксаваны вядомым беларускім фалькларыстам Я. Баршчэўскім.

Шырокаўжывальнымі былі абрады і вераванні, якія звязваліся з гаспадарчай, земляробчай дзейнасцю чалавека. Адзначалі, што менавіта ў гэтую ноч ведзьмары могуць рабіць заломы ў збажыне, таму, пасля за-

канчэння купальскага свята, хлопцы і дзяўчаты стараліся параскідаць патушаныя галавешкі, каб такім чынам засцерагчы збажыну ад непажаданага на яе ўздзеяння. Гаспадары ні за якія грошы-каштоўнасці не пагаджаліся гнаць коней у начное. Калі толькі хто асмельваўся, дык адразу ж траціў сваю жывёлу: яна ці шалела, ці тапілася ў багне або ляцела на злом галавы ў невядомым кірунку, і болей яе ніхто не бачыў. Спрактыкаваным гаспадыням таксама хапала ў гэты час працы. Мы ўжо згадвалі, што яны збіралі лекавыя травы, яшчэ рвалі і крапіву-джыгучку і развешвалі яе на варотах двара ды на хляве, каб так адагнаць злых духаў і ведзьмаў, якія любым чынам імкнуліся ў гэтую ноч прарвацца, напрыклад, да кароў і пазбавіць іх малака. На досвітку бялілі палатно і збіралі купальскую расу, якою абавязкова ўмываліся ці мылі хлебную дзяжу. Тут можна гаварыць пра карані ахоўнай, засцерагальнай і нават лекавай магіі.

І на «нежывую» прыроду пераносіліся ўсемагчымыя рысы і ўласцівасці. Трава, кусты, дрэвы перашэптваліся паміж сабою, птушкі і звяры не лютавалі, ні на каго не нападалі, нікому не пагражалі. Навін у іх збіралася столькі, што ледзьве паспявалі пераказаць за цэлую ноч. На тых самых вадаёмах, паблізу ад якіх святкавалі Купалле, таксама ішло паўнакроўнае жыццё. Паводле сцвярджэнняў А. Кіркора, рэкі ў гэтую ноч свецяцца дзівоснымі водбліскамі. На іх чуваць прыглушаную гамонку і задзірысты смех. Гэта быў ніхто іншы, як русалкі. Мы ведаем, што на вадзе варажылі па вянках. Дзяўчаты пускалі іх па цячэнні і па тым, як яны плылі, спрабавалі прадбачыць, як жа будзе складвацца іхняе далейшае жыццё.

Увесь час ля купальскага вогнішча гучалі песні і ладзілі карагоды. Галоўнымі тэмамі былі аграрная і імкненне да ўласнага шчасця, кахання, сямейнага дабрабыту. Але адчуваецца адразу: матывы купальскіх песень значна пазнейшага перыяду, чым узнікненне самога боства, а адтуль і адпаведнага абраду. Іх можна смела назваць хрысціянскімі, бо язычніцкая тэматыка ці ўвогуле адсутнічае, ці надзвычай «завуаляваная» пазнейшай рэлігіяй. Бясспрэчна, свята Купалле – гэта абнаўленне і шанаванне найперш сонца. На першы план перад намі выступае не бОства, а чалавек працы, грамады або сама грамада:

Сягоння й Купала, заўтра Ян,
Да зайграй, сонейка, зайграй нам,
Каб зялёны лугі шумелі,
Каб сырая зямля стагнала.
Каб сырая зямля стагнала
Да й ад дзявоцкага гуляння,
Да й ад дзявоцкага гуляння,
Да й ад жаноцкага спявання.

Сонца ў дадзеным выпадку проста згадваецца, да яго звяртаюцца, каб яно «заграла», каб яно дало магчымасць тым, хто прыйдзе святкаваць, павесяліцца, паспяваць, каб нябеснае свяціла ўзбудзіла таямнічую жыццёвую сілу зямлі. Але ніякага пакланення, ніякага абагаўлення тут не адчуваецца. Наадварот, усё мацней гучаць матывы, дзе звяртаюцца да хрысціянскіх святых і падкрэсліваюць, што менавіта ад іх залежыць усё на зямлі, а тым болей, вядзенне гаспадаркі нейкім канкрэтным чалавекам.

Купала Ллю звала й на йгру,
Дунай, Дунаёк.
– Ллішча, хадзі на йгрышча,
Купаленька, мне некалі.
Трэба жыта пільнаваці:
У маім жыці змяя ходзіць,
Змяя ходзіць, жыта ломіць,
Хто заломы заламаець,
Зламі, божа, й рукі-ногі,
А галовы, як памёлы.

Як бачым, тут здзяйсняецца зварот да канкрэтнага хрысціянскага святога – Іллі. Характэрна, што менавіта на яго ўскладваецца ў народнай свядомасці тыпова язычніцкая засцерагальная функцыя будучага ўраджаю ад усемагчымых «заломаў», змей («змеяў») і іншай пошасці. Ілля паказваецца настолькі пільным ды ўважлівым, што нават адмаўляецца ісці святкаваць Купалле разам з людзьмі. Відаць, тут якраз будзе не лішнім падкрэсліць, што язычніцкія багі, паводле ўяўленняў нашых продкаў, размяшчаліся паўсюдна: на небе, у вадзе, на зямлі, у лесе і г. д. У хрысціянстве ж Бог і святыя былі размешчаны толькі ў адным месцы – на небе і гэта ўскладняла шлях «яднання» хрысціянскіх святых з людзьмі.

Часта ў такіх зваротах на першы план выступае не Ілля, а другі святы – Іван (Ян, Іаан). Можна гаварыць пра больш старажытны пласт матываў і персанажаў, што закранаюцца ў гэтых песнях, хоць прызначэнне іх тое ж самае – засцярэжэнне ўраджаю, жывёлы, гаспадаркі. Тут прама ўказваецца, што засцярэжэнне павінна адбывацца не ад нейкага цяжкавытлумачальнага змея (змяі), а ад ведзьмы, нячыстай сілы, нячысцікаў і іншых дэманалагічных істот.

Іван да Мар'я, Іван да Мар'я!
Іван Мар'ю клічыць, Іван Мар'ю клічыць:
Хадзі, Мар'я, дамоў, хадзі, Мар'я, дамоў!
Нясі, Мар'я, ключы, нясі, Мар'я, ключы!
Замкнём ведзьме зубы, замкнём ведзьме зубы!

Каторая ведзьма, каторая ведзьма
Кароў заклінаець, кароў заклінаець.
Малако забіраець, малако забіраець, –
Ой, чур-чур, ведзьма!
Ой, чур, чараўніца!

Тут нават згадваецца «чур», вобраз якога напрамую адносіцца да перыяду ранняга язычніцтва, бо менавіта пры дапамозе гэтага магічнага слова імкнуліся засцерагчыся ад уздзеяння ўсемагчымай нячыстай сілы. Нельга забываць таксама, што «чур», ці, як раней адзначалі, «ён», або яшчэ па-іншаму «шчур», – гэта правобраз нейкага таямнічага змея, які нямала гора прыносіў людзям.

Часта змей (змяя) асацыюецца ў купальскіх песнях з чараўніцай, варажбіткай:

Купала Йвана на вулку звала:
– Хадзі, Йване, на вуліцу.
Пойдзем, Йване, ў чыста поле.
У чыста поле жыта сцярэч
Ад тыя змяі-чараўніцы.
Што ў полі заломы заламываець,
У кароў малако адбіраець.

У некаторых вусна-паэтычных творах Іван і Мар'я нагадваюць сабою тых міфічных брата і сястру, якія саграшылі перад нашчадкамі, бо заключылі між сабою кровазмяшальны сямейны саюз.

Іваньская ночка цёмна, невялічка,
Чырвоная рожа зялёна, прыгожа.
Іван-Мар'я на гары расцець,
А ўнізе ў купелі змяюха паўзець.
Іван-Мар'я завуць: «Хадзіце, жоначкі!
У купельню сядзець, трох змяёў сцярэч!»
Як первая змяя залом заламала,
А другая змяя кароў заклінала,
А трэцяя змяя пражын пражынала.
Пражын пражынала, спор у хлебе змяншала.
А хто йдзець на купельню сядзець,
Стане той бярозаю,
Хто ж не йдзець на купельню сядзець,
Стане той калодаю.
Абві яе павіліцаю, накрый яе макрыцаю.

Тут яшчэ распавядаецца пра адно своеасаблівае павер'е, якое здавён існавала ў беларускім народзе. Паводле яго вынікала, што калі гас-

падар быў пераканаўны ў напусканні нейкай нячыстай сілы на ягоную ніўку, то запрашаў мясцовага варажбіта або варажбітку зрабіць «пражын» у сваім надзеле, каб праз яго потым выганяць непажаданую дэманалагічную істоту, якая, калі не рабіць тэрміновых захадаў, магла значна пашырыць свае ўладанні і прынесці куды большую шкоду.

Другой, найбольш пашыранай і актуальнай, тэмай купальскіх песень былі песні пра каханне. Яны, напэўна, вядуць сваю радаводную з таго перыяду, калі жаніхі сваіх нявест-дзяўчат не сваталі, а проста кралі («умыкалі»), і здзяйснялася гэта праз святкаванне боства Купалы. Хто з нас не памятае хрэстаматыйнай купальскай песні «Купалінка, Купалінка, цёмная ночка...»? Менавіта яе можна назваць гімнам гэтага старажытнага абраду:

– Купалінка, Купалінка,
Цёмная ночка,
Цёмная ночка,
Дзе ж твая дочка?
– Мая дочка ў садочку
Ружу, ружу поліць,
Ружу, ружу поліць
Белы ручкі коліць,
Кветачкі рвець,
Кветачкі рвець,
Вяночкі звівае,
Вяночкі звівае,
Слёзкі пралівае.

Шматлікія варыянты купальскіх песень, якія высмейваюць нядбайных «хлопцаў-дзецюкоў», перастаркаў-халасцякоў, злых свякровак і г. д., з'яўляюцца параджэннем значна пазнейшых часоў і прамой сувязі з язычніцкім боствам Купалам нічога агульнага не маюць.

На вобразах купальскай паэзіі ляжыць рэальны водсвет пантэістычнага светасузірання. Пры іх рэалістычным функцыянаванні відаць міфалагічныя вытокі. Ні ў адным каляндарна-абрадавым цыкле, акрамя каляднага, не ўпамінаецца так часта само свята, як Купалле, у розных яго міфалагічна-фанетычных мадыфікацыях.

Валуны, звязаныя з летнім сонечным супрацьстаяннем даволі рэдка згадваюцца ў народзе. Гэта адзінкавыя прыклады ды і забыліся яны да нашага дня. Мабыць, выпадае асацыяваць з Купаллем тыя камяні, дзе гаворка вядзецца пра Івана і Мар'ю, Мар'ю і Дзям'яна, Чартоўскую ноч, Ноч нячыстай сілы і г. д. Такія камлыгі яшчэ там-сям сустракаюцца па тэрыторыі рэспублікі.

У нашай мясцовасці купальскія вогнішчы доўгі час раскладвалі ля купальскага каменя, потым – вакол яго, а ў канцы то ўжо здагадаліся навальваць гаручыя матэрыялы прама на вялізарны валун. Невядома, хто гэта ўпершыню прыдумаў, але праз некалькі гадоў камень усё ж не вытрымаў рэзкіх перападаў тэмпературы і проста на вачах у тых, хто святкаваў, рассыпаўся на дзясяткі драбнейшых. Зразумелі прысутныя, што здарылася нешта не тое, але асабліва задумвацца над гэтым цяпер не выпадала. З цягам часу найбольш гаспадарлівыя сяляне і той каменны друз выкарысталі ў сваіх гаспадарках, прыстасаваўшы яго пры ўзвядзенні шматлікіх забудоў.

## Дажджбог

Так ужо атрымалася, што за час ягонага працяглага існавання, імя гэтага бога мела некалькі варыянтаў, якія, па шчырасці, мала ў чым адрозніваліся пры вымаўленні: Дажбог, Дажьбог, Даждьбог. Чамусьці лічыцца, што менавіта апошняя форма з'яўляецца больш позняй. Неадназначна тлумачыцца даследчыкамі і паходжанне самой назвы: адны цесна звязваюць яе з коранем *dag* у шмат якіх балтыйскіх мовах, што перакладаецца як «лета, спёка, ураджай»; іншыя – з санкрыцкім ***dagh*** – дзень або персідскім ***dagh*** – «пячы, паліць»; трэція са старажытнаславянскім ***даждь*** – той, хто дае, праяўляе пры гэтым шчодрасць. Пераконвалі, што ён з'яўляўся сынам Сварога, а таму зрэдчас называлі яшчэ і Сварожычам.

У раннеязычніцкай карціне Сусвету лічылася, што ў надземнай прасторы існавалі два вялікія паверхі. Паводле іхніх перакананняў, на самым верхнім захоўваліся вада і вільгаць («дажджавая вада»). Тут валадарыў Сварог ці Стрыбог. На ніжнім паверсе, трывала аддзеленым ад верхняга «нябеснай цвердзю», хадзіла кругамі Сонца і цараваў Дажджбог. Не здзіўляе нават тое, што ў самой назве гэтага боства адчуваецца сугучча з вільгаццю, з спрыяльнымі ўмовамі для ўраджаю, з цёплым дажджом, які спатаяў зямлю. Цёплая зямля, цёплы дождж («вільгаць, якая сышла з нябёсаў») – перадумовы шчодрага ўраджаю, які заўсёды падтрымае чалавека працы, апраўдае ягоныя надзеі на будучую збажыну і агародніну. Асаблівы дзень тыдня для пакланення Дажджбогу – нядзеля. Нават гэты факт сведчыў пра тое, што мы гаворым не пра боства ніжэйшага раду, а пра славутага «сонечнага сына». Калі б ён у нечым не адпавядаў ці саступаў прадстаўнікам боскага раду, то і дзень бы выпаў у своеасаблівым народным календары яму зусім іншы. Пераконваюць, што з Дажджбогам звязана і ўзнікненне 12-месячнага сонечнага

календара. Нават Уладзімір Красна Сонейка і пасля ўвядзення хрысціянства (здавалася, усё старое язычніцкае адмоўлена назаўсёды) усё роўна працягваў асацыявацца з Даждзбогам, нібы тым самым захоўваючы трывалую яшчэ веру нашых продкаў у бога – апекуна земляробства.

У язычніцкай веры кожны бог, няхай сабе самы магутны і славуты, кожнае паасобнае боства, тым не меней, выконвалі абавязковыя «зямныя» функцыі, якімі надзялялі яго сяляне. Пэўны занятак, промысел залежаў ад добрых адносін боства да людзей, бо ў іншым выпадку ўсё рэзка магло змяніцца. У тыя часы былі створаны «слоўныя» партрэты, якія знайшлі сваё адлюстраванне ў тагачасных «партрэтах» язычніцкіх багоў, якія дайшлі (цалкам ці ўрыўкамі) да нашага часу.

У даўнія часы для таго каб нават рэальныя падзеі лягчэй запаміналіся і перадаваліся наступным пакаленням, іх «свядома» ўзбагачаліўпрыгожвалі міфамі і легендамі. Рабілася гэта да такой ступені, што было цяжка зразумець, дзе сапраўдная рэальнасць, а дзе выдумка, «адшліфаваная» народнай думкай. Продкі свята верылі, што як сонечнае нябеснае свяціла Даждзбог кожную раніцу (досвітак) выязджаў на шыкоўнай залацістай калясніцы, запрэжанай чацверыком магутных і хуткаімгненных коней, са свайго велічнага палаца, збудаванага дзесьці на ўсходзе (на высокім-высокай гары) і рабіў штодзённы (сімвалічнаабавязковы) агляд, раз'язджаючы па небе. Верныя слугі пастаянна абмывалі яму свежай вадою твар, які ад гэтага станавіўся чырвоным (здаровым і маладым). Археолагі даволі часта знаходзілі на раскопах фібулы і дыядэмы, на якіх былі адлюстраваны выявы маладога мужчыны. Ягоная вопратка мела характэрныя рысы язычніцкай «зямной» сімволікі (квадраты з кропкай-зернем у цэнтры – сімвалы засеянага поля, на якім узышла рунь, і кроплі – сімвалічныя знакі дажджу. Часам сувязь боства з дажджом яшчэ больш канкрэтызавалася – ад выявы постаці мужчыны накіроўваліся зігзагападобныя стужкі-змейкі, якія сімвалізавалі сабою дождж. Па такіх «гаваркіх» фактах спецыялістам лёгка канстатаваць, што на адкапаным артэфакце адлюстраваны Даждзбог.

Э. Ляўкоў распавядае пра крамянецкі камень, які мае на сваёй паверхні пяць выраблены штучным шляхам лунак. Сваёй формай і адшліфаванай паверхняй яны нагадваюць старыя зерняцёркі. Відаць, даждзбогаў камень і быў такой старажытнай зерняцёркай, толькі што рытуальнай. На Беларусі захаваліся звесткі пра шэраг падобных зерняцёрак, якія таксама лічыліся святымі. Яны часта мелі і яшчэ адну надзвычай папулярную назву – Божыя камяні. Адзін такі па-свойму ўпрыгожвае экспазіцыю Бабруйскага гарадскога краязнаўчага музея, прыцягваючы да сябе ўвагу даволі глыбокай і шырокай адтулінай, якая і сапраўды



*Валун Дзед на беразе Свіслачы*

вельмі нагадвае сабою адтуліну жорнацёркі, ля якой нашы далёкія продкі здзяйснялі свае свяшчэнныя ахвярапрынашэнні. Яшчэ, па звестках даследчыкаў, такія камяні знаходзіліся недалёка ад Мядзеля, у вёсках Грандзічы Гродзенскага раёна,Ківачы Пружанскага і іншыя. Таму прасцейшае тлумачэнне абраду пакланення боству, якое «адказвала» за будучы добры ўраджай навакольных палеткаў, заключаў у сабе сімвалічна-рытуальнае здрабненне зерня новага ўраджаю [22, с. 118].

Паводле словаў шматлікіх інфарматараў, месца, дзе ляжыць Крамянецкі камень, раней было надта забалочанае, сырое. Лес там не рос, бо карнявой сістэме не было за што ўхапіцца. «Вакол каменя стаяў акуратна зроблены-адштукаваны невысокі плот з веснічкамі-брамкаю. У далекаватым левым баку пляцоўкі стаяла ўкапаная бочачка без дна (“адныя сценкі, сцягнутыя абручамі”). У ёй заўсёды стаяла вада, якую лічылі святой, гаючай. А ўсё з-за таго, што вада не затыхалася і мела свежы, прыемны пах і смак. У час святкаванняў ля бочачкі ўзнікалі стыхійныя чэргі з наведвальнікаў, якія імкнуліся набраць вады ў свае глечыкі і іншы посуд, каб потым ужываць яе ў складаных жыццёва-гаспадарчых сітуацыях.

Пераказвалі, што да каменя мелі завядзёнку хадзіць толькі па святах, асабліва на Яна, Вялікдзень, Сёмуху (Тройцу), у нядзелю. Дні, калі было меней працы і можна было на кароткі час адлучыцца з дому. Прыходзілі і ў страшэнную засуху, што можна было растлумачыць апекаванне Дажджбогавага каменя над нябеснай вільгаццю. Адным словам, збіраліся сюды ў любое надвор'е і старыя і маладыя. Дабіраліся тыя людзі, якія ведалі пра існаванне каменя і пра ягоныя цудадзейныя ўласцівасці. Стараліся патрапіць да валуна да ўсходу сонца. Тыя, хто прыйшоў, ля бочачкі абмывалі рукі, успацелыя твары, старанна мылі ногі і, размясціўшыся на пляцоўцы, чакалі ўзыходу сонца. Паміж сабою вяскоўцы называлі камень Дажджбогавым, Святым, Богавым. Здаецца, якую назву не пакладзі ў аснову, а ўсё роўна яна падкрэслівае святасць валуна.

Была свая, своеасаблівая сімвалічная працэдура, нават у падыходзе да каменя. Спачатку той, хто прыходзіў да свяшчэннага валуна, клаў прынесеную з сабою ахвяру (выбіралася яна адвольна і самім наведвальнікам ці наведвальніцай), «старанна ахвяраваўся». Для гэтага ахвяра клалася ў адну з лунак («слядок на камені»). Пасля гэтага чалавек ішоў да вады і не спяшаючыся рукою налівaў ваду ў адну з лунак. Потым, перачакаўшы непрацяглы час, шэпчучы абавязковую замову і тройчы перажагнуўшыся (вось яно і незаўважна традыцыйнае спалучэнне язычніцтва і хрысціянства!), старанна браліся абмываць свае балючыя месцы, хто руку, хто нагу, хто стараўся абліць вадою спіну, якая не давала спакою падчас працы.

Асабліва падкрэслівалася тое, што Дажджбогаў камень быў не надта патрабавальны ў плане паднашэнняў і яму можна было прынесці «задобрыванне» на ўласны выбар. Не надта нешта ўжо такое падбіралі: ішоў з хаты, то і нёс з сабою хатняе, а калі выпадала патрапіць з лесу, лугу, поля, то стараліся ўзяць тое, што адметнае траплялася на вочы: грошы, хусцінкі, тканіну, садавіну, пернікі і іншае печыва, ягады, кветкі, вянкі. Кожны з тых, хто прыходзіў, падыходзіў са сваёй просьбай, была ў чалавека надзея, што на гэты раз усё можа спраўдзіцца, толькі неабходна сур'ёзна да ўсяго паставіцца. А ў сялянскім жыцці просьбаў заўсёды хапала – выратаваць ад хваробы («ад нядугаў»), паставіць на ногі людзей і жывёлу, наслаць на палі-агароды ціхі і не залiўны дождж, тую вільгаць, «якая палівае, а не ламае...» [Тамсама, с. 127].

Некаторыя прыгадвалі яшчэ і тое, што, вярнуўшыся ад каменя дамоў, абавязкова шапталі малітвы ля сваіх дамашніх абразоў, нібы тым самым «замацоўваючы» гэты зварот да даўняга каменнага боства. Зноў жа людзі працы ва ўсім за лепшае бачылі пагаджацца, а не імкнуцца канфліктаваць, «хапацца адразу за чубы».



*Дажджбогаў камень на Лагойшчыне. Фотаздымак Я. Ненадаўца*

«Сцвярджалі, што зварот да Дажджбогавага каменя надта дапамагаў у працяглую засуху. Калі стваралася напружаная сітуацыя ў прыродзе, калі ў полі расло-прабівалася толькі зелле, а пра будучы ўраджай і гаворкі ніякай не заходзіла ўвогуле, тады мясцовыя жанчыны (толькі яны і ніхто болей!) дзейнічалі па старадаўняй завядзёнцы выклікання (“заклікання”) дажджу. У аснове ўвогуле ляжаў абрадавы звычай выклікання дажджу ў пэўнай мясцовасці, і зафіксаваны ён быў яшчэ некалькі стагоддзяў таму назад. Адна са старэйшых жанчын паселішча абыходзіла яго і збірала сабе “кампанію”, у якую ўваходзіла дзевяць жанчын (абавязкова, каб гэта былі ўдовы і не першы год). Яны нарыхтоўвалі моцныя калы ў свой рост, з імі ў прыцемку сунуліся да Дажджбогавага валуна. Стараліся пры гэтым не размаўляць, каб не выдаваць увогуле сваёй прысутнасці. Падышоўшы да валуна, акружалі яго з усіх бакоў, заганялі калы пад камлыгу і стараліся падважыць («зрушыць з ягонага ранейшага месца»). Спробы паўтараліся да таго часу, пакуль на самой справе камень “не завісаў” на калах. Лічылі, што раз так зрабілі, як ад іх патрабаваў старадаўні звычай, то на трэці дзень (“на трэція суткі”)

абавязкова павінен быў прыпусціць добры дождж, заклікаль для наталення глебы. Пасля таго як дождж болей не быў патрэбны, жанчыны разбіралі свае калы па падворках, а прынёсшы іх дамоў, папярэджвалі сваіх хатніх, не чапаць калы без дай прычыны, бо ў іх ад гэтага моманту тоіцца вялікая чарадзейная сіла і, выпусціўшы яе нават незнарок, можна было нарабіць вялікай бяды» [28, с. 65].

Падкрэслівалі, што калі звярталіся да Дажджбогавага каменя, то рабілі гэта не проста моўчкі, а старанна прамаўляючы словы спецыяльнай замовы: «Божачка, дапамажы! Дожджычак прынясі! Аддай нам з-за хмар ненатольны нябесны дар!» Нам падаецца, што ў такіх выпадках даволі часта мелі месца моўныя імправізацыі кожнага чалавека паасобку. Мабыць, лічылі, што галоўнае было прашаптаць, а як ужо атрымлівалася далей, то гэта не мела ўвогуле вялікага значэння. Э. Ляўкоў апісвае ў сваёй кнізе выпадак, які нібыта здарыўся з мясцовым панам у Бабрах. Будаваў, кажуць, той гаспадар сабе дом у паселішчы. Для трываласці вырашыў зрушыць з месца славуты Дажджбогаў камень і пасля гэтага пакласці яго пад кут у падмурку. Як пану захацелася, так і зрабілася. Тым болей што ягоную волю выконвалі майстры, а не ён сам. Але ў падмурку камень зрабіўся сырым, вільготным, пастаянна «нібыта плакаў горкімі слязьмі...». Вугал таго палацака пачаў адразу ж гніць, і ад яго пацягнуліся падцёкі гнілой вады па ўсім збудаванні. Не ведаў гаспадар, што і рабіць, якім чынам яму трэба ратавацца. Ужо і па бліжэйшых вёсках да знаўцаў хадзіў, але тыя толькі плячыма перабіралі, маўляў нічога не ведаем. Адзін са старых толькі буркнуў нехаця: «Пачакай, пакуль выйсце табе самому ў сне не прысніцца...» На самой справе ўсё так і здарылася: аднае ночы нехта моцна пагрукаў у аканіцу і пракрычаў, каб пан завёз камень на ранейшае месца, а то далей пойдуць яшчэ большыя беды. Сонца толькі з-за блізкага лесу выглядвала, а майстры ўжо пагрузілі камень на вялізны воз і павезлі яго туды, дзе ён яшчэ зусім нядаўна ляжаў. Цікавым аказалася і тое, што калі камлыгу везлі на будоўлю, то чацьвёра коней ледзьве выжыльваліся ва ўпражцы, а назад, то і адзін запроста справіўся [22, с. 167]. Ясная справа, што ў любым вусна-паэтычным творы, дзе асуджалася ці высмейваліся людская сквапнасць, хцівасць і крывадушнасць, абавязкова рабіўся акцэнт на тое, што за такія спробы, за стараннe ўсё рабіць толькі дзеля сябе і ўласных інтарэсаў, не ўлічваючы традыцыйнасць народных поглядаў і інтарэсаў, пагражала далейшым пакараннем для ўдзельнікаў. Маляваліся такія сцэны, адпаведна, з перабольшваннем (гіпербалізацыяй) ці са змяншэннем (літоталізацыяй), каб лішні раз указаць на тое, якая «страшная» атрымлівалася сітуацыя.

# КАМЯНІ Ў ЛІТАРАТУРНЫХ ТВОРАХ

Але не толькі вусна-паэтычныя творы захавалі звесткі аб камянях, якія маглі па-майстэрску шыць вопратку і абутак, але і дапамагаць людзям у іншых, больш складаных справах, часам, калі гаворка заходзіла пра сацыяльнае жыццё, то і пра адкрыта сімвалічнае параўнанне жыцця людзей і камянёў. І ў мастацкай літаратуры адносна ўсяго гэтага існуе шмат прыкладаў.

Пачнем, як і водзіцца: з класікаў нашага пісьменства. Але тут выявілася, што яны, якраз-такі, па-рознаму адносіліся да народных міфічна-сімвалічных матываў: адныя – узвышалі, узвялічвалі, ускладнялі, паказвалі іхні ўплыў не толькі на будзённасць, але і на духоўнасць, на свядомасць людзей, а іншыя – проста нібы «канстатавалі» існаванне камянёў, іхнюю прысутнасць у прыродзе, краявідах, на нейкім канкрэтным полі (палетку). Таму, напрыклад, нават Янка Купала па гэтай «прысутнасці» дае традыцыйна-міфічнае звычаёвае ўжыванне камянёў у гаспадарчым ужытку ягоных продкаў (або іхнюю абавязковую прысутнасць, не надта

радасную для сялянскіх змазалелых рук і стомленых плячэй), сцэнах сялянскага працоўнага жыцця. Атрымлівалася, што нават без простага згадвання камянёў, як атрыбутаў беднай, саскудзелай зямлі, было не абысціся. Ніяк не выпадала пісаць пра іншае, што на гэты раз не супадала з агалелай праўдай народу, які імкнуўся любым чынам «людзьмі звацца»:

Горы ды каменне,
Вузкія палоскі:
Гэта наша поле,
Поле нашай вёскі.
Курныя аконцы –
Каб святла хоць трошкі:
Гэта нашы хаты,
Хаты нашай вёскі [верш «Вёска», 17, с. 127].

З якога боку ні старайся ўглядацца ў курныя будыніны тагачаснай вёскі, як не імкніся знайсці нешта светлае, аптымістычнае, а ўсё роўна атрымлівалася, што без згадвання камянёў («камяністых палеткаў») нельга было абысціся. Зробіш па-іншаму, пакажаш нешта з уласных думак-парыванняў і запроста акажацца, што «выбіўся з каляіны традыцыйнага шляху».



*Камень Я. Купалы ва ўрочышчы Акопы Лагойскага р-на*

Больш шырока распавёў пра значэнне камянёў у жыцці беларускага народа як у будзённым, так і ў духоўным, давёў, што без іх не абыходзілася ніводная справа, нягледзячы на тое, надзвычай важная яна была ці ўвогуле нейкая нязначная («чыста сямейнага плана»), П. Броўка. Праўда, абавязкова скіруем нашу ўвагу на факт «падладжвання» ўласных паэтычных матываў аўтарам да значных абавязковых зменаў у сацыяльным жыцці сучаснай яму вёскі. Больш за тое, гэта было не простае пажаданне, а «ўказальна-бальшавіцкае, дырэктыўнае ўжыванне партыйных пастаноў і ўказаў у любым кірунку народнага развіцця...». Учытаемся лепей у радкі ягонага разгорнутага аднайменнага верша, дзе канстатуецца і звычайнае існаванне камянёў («камяніскаў»), і перарастанне іхняе з валуноў у крэмні. І тут таксама не абышлося без партыйнага ўздзеяння на духоўнасць творцаў, якія, у сваю чаргу, павінны былі ўжо ўсё гэта даносіць да шырокіх народных мас:

Гэта ў нас, як казалі, ад бога,
Дзе ні стань і куды ні зірні:
На палетках, шляхах, на дарогах –
Камяні, камяні, камяні...
Шмат ён нам наскідаў яго з неба.
Праз каменне нідзе не прайсці.
Хай бы лепей буханкамі хлеба
Бог парадаваў нас у жыцці.
Што ж на бога ківаць? Так не выйдзе,
Даўно ведае наш чалавек:
Нас паўночны ляднік не пакрыўдзіў,
Хопіць гэтага шчасця навек.
А раз так мы разважылі слушна –
Трэба з ніў нам каменне сабраць.
Пасклáдалі мы дробнае ў крушні,
Што на полі, як вежы, стаяць.
З іх у лазнях мы клалі пячуркі,
Больш буйное кацілі да сёл.
І таму на высокіх падмурках
Нашы хаты і клеці вакол.
Хто злічыць камяні нашы можа?
На зямлі іх – як зграяў варон.
Ды адзін ёсць вялізны, прыгожы,
Мабыць, кожнаму памятны ён.
Як узлезеш – раскрыюцца далі.
Быў за стол нам калісьці малым.
Мы даўно, як на пасту ганялі,
Раскрывалі ўсе лусты на ім.

Каманю, як пайшлі мы ўздымацца,
Давяраліся тайны не раз:
Ля яго, каб з каханай спаткацца,
Дамаўляліся многія з нас.
А тады, як пажары шугалі,
Як ваенны ўсхадзіўся віхор,
Ля таго камяня прысягалі
Быць з табой, партызанскі наш бор.
Мы не ведаем ў бітвах вагання
На прасторах любімай зямлі.
Нашы сэрцы ў нялёгкім змаганні,
Што камень той, цвярдымі былі.
Ёсць палі – разгарнуцца пластамі,
Быццам пух, толькі зерняты сей.
Нас жа лёс надзяліў камянямі.
Што ж, мы самі за крэмень мацней! [4, с. 378–379].

Жаданне паэта па-новаму паказаць знаходжанне шматлікіх камянёў на віцебскай зямлі, іхняе прыстасаванне для гаспадарчых патрэб умелага чалавека працы, зводзіла аўтара на іншы шлях: адлюстраванне ўсяго новага, што прыйшло са зменамі ў вясковай будзённасці, з калектыўным вядзеннем вясковай гаспадаркі, а ўдумаўшыся, па вялікім рахунку: П. Броўка проста... пералічыў тое, дзе ўжываўся (і працягваў ужывацца!) камень. І на самой справе аказалася, што нават самыя старадаўнія рамёствы ў асяродку сялян засталіся і не паспелі замяніць іх машыннай працай. Камлыгі, мала таго, увайшлі і ў шматвекавую духоўную спадчыну ягоных землякоў, сталі своеасаблівымі арыенцірамі закаханых пры прызначэнні... спатканняў. Яшчэ адзін аспект – вечныя камяні і вечнае, таксама, каханне, і з кожным новым пакаленнем у гэтым ланцужку нічога не мяняецца. П. Броўка проста па-свойму лішні раз увекавечыў (ужо нават не значэнне!) існаванне каменя, падкрэсліўшы тым самым аўтарскую пазіцыю ў адносінах да гэтай спрадвечнай тэмы.

А. Бялевіч у памфлеце «Замшэлы валун» своеасабліва ўмудрыўся раскрыць характары тых з людзей, якія імкнуліся да высокіх чыноўніцкіх пасад сягаючы праз галовы іншых, не задумваючыся асабліва пра наступствы, не даючы сумленным людзям ні спакою, ні адпачынку, абы ім самім «добра было, каб паспелі дасягнуць пастаўленай мэты...». А там ужо і гонар, і слава, і пачэснае месца. Пра ўчарашняе, пра мінулае ніхто не разважаў. Планы будаваліся на «выраст», толькі на будучыню. Вось таму менавіта навучыліся такія ганарліўцы не «распазнаваць» сярод атачэння нават былых сяброў дзяцінства і школьных гадоў. Толькі ж, як любяць паўтараць у нашым народзе: «Колькі вяровачцы не віцца...»,

бо самая «жалезная тактыка і логіка» такіх пустадомкаў даволі часта дае рэзкія збоі, і тады наступае крах усіх ранейшых спадзяванняў, страта здабытага, прыхаванага і нарабаванага.

– Што?! – смяюся. – Што ты, дружа?
Не пазнаў хіба мяне?
Помніш, бегалі па лужах?
Ну, прыпомніў?
Кажа: – Не.
Помніш дзірачку ў шчыкеце?
Помніш. Лазілі мы ў сад?
– А!.. Жанат?
– Ага.
– Ёсць дзеці?
– Трое.
– Трое? – Буркнуў: – Рад.
А, відаць, зусім не рады,
Нейкі холад у вачах.
– А ў мяне няма... Пасада!
Увесь гандаль на плячах.
Пра сяброў былых пытаю:
– Дзе Крыжывіч? Што ды як?
Пазяхнуў: – Я звесткі маю:
Аграном – зямны чарвяк.
– А Платон? Платон Сурвіла?
Да вучобы быў мастак.
– Пхе! Яго б даўно на мыла,
А стаў шышкаю, лайдак.
– А Шуляк?
– Свіння з рагамі.
Пад мяне падкоп вядзе.
Толькі будзе хай між намі, –
Бачыць рад яго ў бядзе... [6, с. 118–119].

Нават кароткая характарыстыка былых сяброў дзяцінства такім умелым прыстасаванцам да жыцця падаецца даволі коратка, затое з вялікай доляй сарказму і з'едлівасці, з старанным падкрэсліваннем уласнай важнасці і значнасці і, наадварот, імкненнем прынізіць знаёмых яму людзей.

Па-свойму распавёў пра лёс не звычайнага, а відушчага каменя А. Разанаў, які старанна распрацоўваў сістэму архетыпаў і архетыпізму ў беларускай міфалогіі і фальклоры, а пазней і ў нашай нацыянальнай літаратуры. Ён многае зрабіў для ўзбагачэння гэтага цікавага аўтарскага кірунку, таму і творы ягоныя вылучаюцца непаўторнасцю і адмет-

насцю, філасофска-міфалагічнай скіраванасцю да вытокаў першаўбраза (першавобраза), нават такіх, як камень. Прыведзены твор мае аднайменную назву:

З веку ў век ляжыць ля гасцінца камень.
З веку ў век ішлі па гасцінцы людзі.
Людзі глядзелі на камень, камень глядзеў на людзей, глядзеў-прыглядаўся
і ўрэшце зрабіўся відушчым.
І стала яго відушчасць праменіцца на гасцінец і абпраменьваць кожнага,
хто па гасцінцы ішоў.
І сталі рабіцца відушчымі людзі, і стаў кожны ў кожнага бачыць думкі –
пярэстыя, простыя, пакручастыя, белыя, шэрыя, чорныя, каляровыя, і стаў
кожны кожнага без слоў разумець.
Спачатку ўсе радаваліся, а потым палохацца сталі гэтага свайго разумення,
відушчасці гэтай нязвыклай сваёй.
Накінуліся грамадой на камень – і саштурхнулі яго ў глыбокую яму, але
на трэці дзень стала свяціцца яма,
укінулі камень у мора – на шосты дзень стала свяціцца мора,
закінулі камень высока ў нябёсы – камень адно ўсміхнуўся і стаў, быццам
новы месяц, кружыцца і ззяць над усёй зямлёй.
Так скончыўся колішні свет і настаў – відушчы [28, с. 129].

Паводле такога паэтычнага тлумачэння атрымліваецца, што камень першапачаткова знаходзіўся ля асновы ўтварэння Светабудовы і з цягам часу не толькі сам стаў відушчым, але і пачаў яшчэ надаваць такую ж самую характэрную ўласцівасць людзям, якія, гледзячы на яго, імкнуліся разважаць над усемагчымымі жыццёвымі (не толькі ўласнымі, але і агульначалавечымі) праблемамі. Так і застаўся назаўсёды ўзнесены думкамі сумленных людзей у той завоблачнай вышыні, каб адтуль, разам з Усявышнім (Боскімі сіламі), дапамагаць у вырашэнні розных жыццёвых пытанняў.

Адсочваючы «каменную» тэму ў беларускай літаратуры, абавязкова падкрэслім факт: яна пастаянна ўзбагачаецца, папаўняецца тлумачэннямі новых аспектаў і асаблівасцяў. Так, У. Някляеў напісаў верш з адпаведнай назвай – «Камень-жальнік»:

На сівы быльнёг,
На разбег дарог
Да вясёлых ног
Камень-жальнік лёг.
Не ступі – згарыш! –
На каменны крыж.
Калі ж смелы: кліч!
Пад сырой зямлёй
Залатой змяёй
Звіўся Вечны Зніч.

Як не ўпадзе кліч
З рота жабаю,
Выйдзе Вечны Зніч
З камень-жальніка.
Пабяжыць, гарун,
Да Старых Барун, –
Дзе згубіў Пярун
Залаты бізун, –
Не тварыць мальбу,
Не спраўляць жальбу,
А ці волю гуляць,
Альбо неба сцябаць [27, с. 74].

Як бачым, тут паэт звяртаецца да многіх вобразаў беларускай міфалогіі. Акрамя самога «каменя-жальніка» згадваецца «Вечны Зніч», «гарун», «Пярун», «боскі залаты бізун». Такі прыём У. Някляева сведчыць пра тое, якой важнасцю надзяляе ён «камень-жальнік», да якога вельмі часта звярталіся людзі (і працягваюць звяртацца!) са сваімі скаргамі і спадзяваннямі на іх станоўчае вырашэнне. Многае тлумачыцца яшчэ і тым, што сам корань «жаль – жаліцца» надзвычай глыбока ўрос у беларускую народную лексіку, заняў у ёй адно з найважнейшых месцаў, і гэты факт пацвярджае тое, што роля сімвалічных камянёў у свядомасці беларусаў пастаянна адыгрывала важнае месца.

У вершы Алены Маеўскай «Балада пра камяні» апавядаецца пра ўзнікненне горада Менска. Павінны прыгадаць, што гэта адна з самых улюбёных тэм у творчасці нашых прафесійных паэтаў. Праўда, тлумачыцца яна па-рознаму, з вылучэннем (ці дадаваннем) нейкіх новых рысаў. Амаль кожны іншы з творцаў спрабуе, калі не перамяніць факты ў старажытнай легендзе, паставіць іх у сваім парадку, які лепей падыходзіць да ягонай задумы, то дадаць аўтарскае бачанне падачы вядомага ўжо матэрыялу, каб такім чынам «выбіцца» са шматлікага пераліку паэтаў, падкрэсліць уласную адметнасць. А. Маеўская таксама паспрабавала па-свойму падаць версію паходжання назвы старажытнага горада Менска:

Час. У яго ёсць пісьмовыя
звесткі:
Шмат летапісных каштоўных лістоў.
Ёсць у дарогі маўклівыя сведкі –
Свет старажытных сівых валуноў.
Камень урос у зямлю між калосся,
Колькі ляжыць тут – няможна
злічыць.

Пэўна, і часу калісь давялося
Тут пры дарозе на ім адпачыць.
Час камяні тыя з месцаў парушыў,
Замкі-муры збудаваў на зямлі.
Час даравала ім легенды, як душы,
Продкаў, што ў вечны нябыт адышлі.
І камяні, як застыўшыя хвалі,
Буйных падзей затаілі усплеск.
Нібы паданне яны ўшанавалі:
Жыў тут на Свіслачы волат Менеск.
Дужы быў волат, не ведаў ён страху,
Млын збудаваў з камянёў на сем кол.
Жыў ён разумны, выдатны як знахар,
Жыў тут, адзін і нікога, вакол.
Тысяча год праляцела ці меней,
Кажуць старыя, што так і было:
Сыпаў той волат на жорны каменне.
Жыта з іх белай мукою цякло.
Кажуць, змалоў камянёў ён багата.
Час незапамятны той адлятаў.
Хутка народ працавіты і здатны
Горад ля млына яго збудаваў.
Менскам прыгожы той горад назвалі... [23, с. 15]

Славуты майстэрствам, сілай і ўменнем волат Менеск, які збудаваў (сам адзін!) млын ажно на «сем колаў» і, што самае галоўнае, малоў у ім не збожжа, а камяні, якія збіраў з навакольных палёў і лясоў. І яшчэ адна непаўторная адметнасць: камяні тыя размолваў ён у сваім млыне на бялюткую муку, што ўказвала яшчэ і на сувязь млынара з чарадзействам. Дарэчы, гэтакая рыса (ці асаблівасць) у адносінах да млынароў назаўсёды прымацавалася да іхняй працоўнай і жыццёвай дзейнасці. Тыя, хто мог самастойна падпарадкаваць на свае патрэбы сілу ветру ці вады, у народзе заўсёды лічыліся моцнымі чараўнікамі, здольнымі на ўсялякія штукарствы ў адносінах да людзей і жывёлы і нават да ўсёмагутных сіл прыроды.

Напоўніў глыбокім псіхалагічным зместам архетып каменя самабытны паэт Анатоль Сыс. Не жадаў аўтар тварыць у «старым» літаратурным рэчышчы, карцела яму паставіць уласную спадчыну паасобку (калі не вышэй за здабыткі іншых, то ва ўсялякім выпадку недзе непадалёку ад іншых). Многае яму бачылася па-іншаму, многае ён не хацеў успрымаць па-старому, а імкнуўся перапісаць па-свойму, бо менавіта так здавалася аўтару больш пераканаўча і даходліва, карцела давесці сучасна-

му чытачу, што старадаўнія вобразы і сюжэты хаваюць у сабе больш глыбінныя значэнні, і яны, калі іх не ўзнаўляць, паступова забудуцца. Могуць і не забыцца, але тады будуць мець непрадказальныя ў сваім развіцці вобразы і сюжэты. Іх можна будзе назваць «не залежнымі» ад волі і таленту паэта.

«Каб ты каменем стаў!»
І я стаў...
сярод поля.
Ані жыта засеяць, ані пожні ўзараць.
Разам з гневам ва мне скамянела патоля –
ацяжэлых вачэй на людзей не падняць.
І калі б я заплакаў – паўпіваліся б слёзы
скамянелым струпеннем у шчокі мае,
толькі я не заплачу, бо рана ці позна:
«Каб ты здраднікам стаў!» –
хтосьці зноў пракляне [33, с. 148].

Шырокавядомы народны праклён узяты паэтам за перасцярогу, за яшчэ страшнейшае злачынства, якое запроста магло паклікаць за сабою куды больш чорны ў вачах у людзей грэх – здраду: здраду перад самім сабою, перад людзьмі, перад Радзімай. І ніхто з іх яе не даруе, як бы ты не імкнуўся шукаць сабе нейкага апраўдвання, як бы не спрабаваў давесці іншым, што менавіта так на той момант склаліся абставіны, што не было магчымасці дзейнічаць па-іншаму, пакінуць сваё сумленне незаплямленым. Беларусы сцвярджалі, што здраду нельга замаліць, «саслаць у архіў чалавечых дзеянняў». Гэта асобны грэх, які не даравaўся і не даруецца нікому, пачынаючы ад боскіх персанажаў і завяршаючы людзьмі.

Наступны твор паэта пераклікаецца з адвечным болем селяніна-земляроба, якому валуны-камяні пастаянна перашкаджалі, бо яны пастаянна «працягвалі расці», займалі сабою ворныя землі, выводзілі іх з актыўнага севазвароту. А. Сыс не забываецца падкрэсліць, што менавіта здольнасці валуноў «да росту» выклікала ў ягоных продкаў асаблівы страх і цікаўнасць. Чаму, чаму такое адбывалася? У аўтара валуны не толькі раслі, але і «тапталі поле (палеткі)». Менавіта верш з сімвалічнай назвай «Тапталі поле валуны» закранае гэту праблему.

Тапталі поле валуны,
па ім качаліся са смехам,
нібы вялізныя збаны,
нібы гіганцкія гарэхі.
А ў небе галасіў жаўрук,

І ўсім, хто чуў яго хаўтуры,
займала дых, займала дух,
праймала ад душы да скуры.
Быў сіні лён, стаў чорным лён,
як д'яблы валуны рагталі
і поле, жаўруковы дом,
тапталі, рылі, катавалі [Тамсама, с. 164].

А. Сыс прыгадвае, што камяні ў сваім дзікім разгуле не ведалі ніякіх абмежаванняў, не было такой сілы, якая магла іх супыніць, нейтралізаваць, а камлыгі ўсё чыста вынішчалі на сваім шляху. І не было ім спраў да таго жывога, што жыло навокал: да людзей, звяроў, птушак. Д'ябальская сіла заўсёды страшная, а наступствы яе дзейнасці не падлягаюць аднаўленню, пасля яе застаецца толькі жудасны напамін, які надта нагадвае папулярныя сёння сярод моладзі сюжэты касмічных войнаў.

Найбольш удала, як нам падаецца, менавіта сімвалічны вобраз каменя выкарыстаны ў «Казках жыцця» Якуба Коласа. Пісьменнік па-рознаму абыграў сюжэт з выкарыстаннем маўклівага сведкі мінуўшчыны. У казцы «Камень» аўтар стварае, здавалася б, непаўторную сцэну райскага жыцця, і яно, на думку Я. Коласа, датычылася, найперш, вялізнага каменя. Адносна думкі аб прыгажосці мясціны, непаўторнасці таго краю, ягоным зацішшы і ацэнцы сітуацыі насельнікамі гэтых мясцін самому пісьменніку не раз даводзілася чуць, бо гэта была ўяўная народная пазіцыя аб спакоі і жаданым жыцці любога чалавека: «Ціха, нібы ў вусе, цёпла, нібы на печы, утульна, нібы ў куце. Чым не жаданае жыццё?» Таму і звычайны камень Я. Колас размяшчае ў такой мясціне, пры гэтым нічога не змяняючы ў адвеку заведзеных поглядах. «Такіх прыгожых месцаў, якім быў гэты куток, рэдка дзе можна знайсці. Прынамсі, так думаў даўганосы бусел, каторы меў тут, на старадрэвіне, пышны палац. А бусел усё ж такі трэцца па свеце, і на яго словы можна мець увагу...

...Але самым шчаслівым жыхаром быў тут, ведама, камень, – так злажылі і згадзіліся яго суседзі: рэчка, лес і другія. І праўда, як ні моцныя дубы, а ўсё ж іх матлашылі і сушылі вятры, іх паліла сонца, на іх мецііся цяжэрныя хмары залатымі стрэламі пякучых маланак, а ў час навальніцы па іх каранёх тапталіся людзі...

...А каменю што? Кажуць жа – моцны, як камень, і маўклівы, як камень. Дык што яму астаецца тут? Ляжаць сабе, як пан, у мяккім доле. Ні дождж, ні жар для яго не страшны. Блісне сонца, дзьмухне вецер, і сухі камень і цёпла яму.

І месца выбраў прыўдалае!

Тут і рэчка табе відаць, і белыя хмаркі-гускі, што плаваюць па бязмежнаму прастору сініх небясоў.

А колькі жыцця навокал яго! Чарнабровыя плісачкі любяць крыху падурэць каля каменя, а то проста сядуць на самы яго верх і пачнуць такія гамонкі, што толькі і можна пачуць іх увесну. Лясная жаваранка прылятае сюды начаваць і, пэўна, гэта каменю пяе яна такія прыгожыя песні, што душа замлявае. Што ж, шанцуе яму і толькі! Кожнаму свая доля» [16, с. 487–488].

Я. Колас малюе ідэальную, здавалася б, сцэну з жыцця працоўнага сялянства. Як гаротным працаўнікам бачылася менавіта бясклапотнае жыццё: ляжы сабе на ўлонні прыроды, убірай у сябе ўсемагчымыя гукі і фарбы, ніхто цябе не чэпіць, ніхто не замінае твайму зямному існаванню. Гэтакая думка сфарміравалася не ў аднаго чалавека, а ў цэлага народа. Заставалася толькі лішні раз пераканацца, што ўсё гэта менавіта так і было. Я нікога не чапаю, бо мая хата з краю. Тыя за чубы бяруцца, а я за лепшае пагаманю спакойна з жонкай, паслухаю, як дзеці дурэюць, і на душы маёй ад усяго гэтага намнога спакайней зробіцца. Толькі за такім спакоем, за ўласнай абыякавасцю да суседскіх і жыццёвых праблем, хаваюцца і тыя праблемы, якія потым прывядуць да таго, што іншыя ўвогуле перастануць заўважаць тваё існаванне, нават пераход у адвечны спакой будзе для людзей незаўважным: было, то і было, а, магчыма, што такога ніколі і не здаралася, і не існавала.

«Так казалі суседзі шчаслівага каменя. Аднаго толькі не маглі сцяміць тутэйшыя жыхары: камень ніводным слаўцом не выявіў свае радасці, што нямала ўсіх тут здзіўляла.

– Ну, што ж? Такая ўжо натура яго!» [Тамсама, с. 488].

Як бачым, усё роўна ў каменя і ў ягонай «жыццёвай пазіцыі», знаходзіліся прыхільнікі-апраўдальнікі. Па-рознаму прыкідвалі-выкручвалі, прыводзілі прыклады, але ад свайго ні ў якім разе не адступаліся. Любым чынам імкнуліся ўзмацніць, умацаваць тую пазіцыю, падкрэсліць, што лепей у жыцці і быць не выпадае. Усё і далей так працягвалася б. Толькі здарылася аднаго разу неспадзяванка (так заўсёды: круціся не круціся, а адбываецца): «Але адбылася тут вось якая рэч. Прылятае раз на сваё гняздо бусел ды кажа да дубоў:

– А ведаеце, браткі, што?

– А што? – усе разам запыталі яго.

– Шчаслівы наш камень... рассыпаўся.

– Ну?!

– Не можа быць! – зашумела рэчка.

– Што ж гэта такое? – прагукаў лес.

І ўсе дзівіліся такому здарэнню.

– З чаго ж такое ліха прылучылася з ім?

І ніхто не ведаў, што сказаць на гэта» [Тамсама, с. 488].

У гэтым творы беларускага песняра адчуваецца выразны ўплыў не толькі фальклорных матываў, але і надзвычай папулярных на той час «казак» рускага класіка М. Салтыкова-Шчадрына. Я. Колас ніколі і не аспрэчваў моцны ўплыў гэтага пісьменніка на свае творы, бо вучыцца на прыкладах з беларускай літаратуры не выпадала – занадта кволая яшчэ яна была на той час, не ставала магчымасці звярнуць сваю ўвагу на творчы запас некага з паплечнікаў, таму і даводзілася шукаць іншыя варыянты ўзбагачэння ўласнай творчасці. Тут амаль усё было запатрабавана: і народная філасофія, і народная мараль, і народныя традыцыі ў галіне самабытнай духоўнасці.

Акрамя гэтага народны паэт Беларусі прысвяціў камяням асобны паэтычны твор, у якім па-філасофску ўвасобіў і пераасэнсаваў ролю і значэнне валуноў для ўсёй нашай зямлі, – «Маленне камянёў». І паводле гэтага верша атрымліваецца, што не ўсё, далёка не ўсё так проста і ў прывабным, на першы погляд, жыцці-існаванні валуноў. Так, яны нерухомыя і маўклівыя, але і цярплівыя, збалючаныя. Проста, яны заўсёды маўкліва пераносілі ўласныя пакуты і прыніжэнні, боль і крыўду. Іхнія скаргі мог пачуць толькі відушчы, надзвычай чуллівы чалавек, сэрцу і душы якога чутны скаргі астатніх як адухоўленых, так і неадухоўленых істот. На вялікі жаль, на той час нават сярод сялян было надзвычай мала людзей, якія маглі па-свойму (па-іншаму, а не ў традыцыйным ключы!) растлумачыць новыя надзённыя задачы і праблемы, якія паўставалі ў сувязі з развіццём і змяненнем сацыяльнага жыцця.

Мы, стрыманыя камяні,  
Трымаем вежы, камяніцы.  
Вятры ў палях,  
Нас памяніце,  
Раса,  
Наш цень не абміні!  
Мы – стомленыя валуны,  
Маршчыны зніклі з нашых шчокаў,  
Мы глухнем ад набатных крокаў,  
Паны  
І сведкі даўніны.  
З нас кожны  
Прышлыя вякі  
Трымае на плячы балючым.

Мы ўсіх дарог спатканні лучым,
Сціскаем цішу ў кулакі.
Без нас бы гарады даўно
Зрабіліся б забытым полем.
Вас молім –
Нас з тугою, з болем
Успамінайце заадно! [15, с. 303–304].

У іншай «казцы жыцця» – «Чортаў камень» Я. Коласам ствараецца самая сапраўдная казачная сітуацыя. Аўтар пастараўся ўсё глыбока пераасэнсаваць, дайсці да вытокаў узнікнення (ці з'яўлення) каменя ў гэтым месцы. Яму падавалася, што, пераказваючы ўсё ў народна-казачным (сімвалічным) ключы, будзе значна прасцей дасягнуць пастаўленай мэты, раскрыць адвечную праблему. Нават паходжанне і размяшчэнне вялізнага валуна на самым ускрайку мясцовай бойкай дарогі, сама назва каменя падаецца Я. Коласам зыходзячы з вусна-паэтычнай традыцыі. Цяпер усім і ўсё павінна будзе зразумела: «Ніхто не памятае таго часу, калі і як папаў сюды гэты камень. Самыя старыя людзі расказваюць, што яшчэ іх дзяды і прадзеды помняць яго. І называўся ён Чортаў камень. Чаму далі яму такую назву, не ведаю. Можа за яго бязмерную



*Чортаў камень у Сенненскім р-не*

велічыню, а можа і за тое, што гэты камень многа зла прынёс і прыносіць людзям. Колькі людскіх калёс і восей пабіта і паламана аб камень! Колькі пакалечана рук і ног! А гузоў колькі набілі тут людскія галавы!»

Недзе з гэтых акалічнасцей і выпадала выводзіць саму назву каменя, бо калі чалавеку собіла спатыкнуцца (самому ці з возам), то найперш ён згадваў чорта і заходзіўся ў злосным праклёне, а не звяртаўся з малітвай да якога-небудзь святога. Так у будзённым жыцці заўсёды было павязана. Выйсце было дваістае. Паводле народнай маралі выходзіла: «Усё благое на зямлі ад чорта». Продкі былі перакананы, што гэта нячысцік (нячысцікі) так пажартаваў і такую «штуку» падладзіў людзям. Той шкоднік, не ведаючы лішняга сну і стомы, толькі і рабіў, што падбіраў зручны момант для «падробкі чарговай штукі». Не забываймася і пра тое, што ў адвечнай барацьбе-змаганні паміж чортам і чалавекам змаганне працягвалася з пераменным поспехам. Продак разважаў: «Калі не сёння, то заўтра ты абавязкова, нямытае рыла, трапішся ў мае рукі, і тады я ўжо навучу цябе, я табе ўсё чыста прыпомню і адплоціш ты мне крывёю, слязьмі і потам». «Каля каменя ішла дарога. Невядома, чаму людзі выбралі сабе тут дарогу, хто першы праехаў, пралажыў тут след і павёў за сабою другіх» [16, с. 517].

Самыя розныя версіі адносна размяшчэння каменя менавіта ў гэтых мясцінах прыводзіць Я. Колас. Але так і не падае пераважнай. Нібы спадзяецца на тое, што нехта яшчэ выкажа сваю, уласную, версію. Многа адказаў ёсць на гэта пытанне, многа легенд зложана людзьмі пра Чортаў камень: розум чалавечы не можа заспакоіцца, пакуль не вытлумачыць сабе цёмнага, невядомага, няяснага. Казалі, што камень прынеслі сюды нейкія старцы і налажылі на яго праклён, асудзіўшы яго на доўгія вякі ляжаць на гэтым месцы» [Тамсама]. Як бачым, дасталася ад аўтара і «старым людзям», у вобразах якіх увасобіліся Бог і святыя, што ў сівыя стагоддзі хадзілі па зямлі.

Пісьменнік стварае казачна-жыццёвую сітуацыю, калі ніхто не жадае браць на сябе першага адказнасць, прыступаць да рашучых дзеянняў, маўляў, не мною заведзена, то і не мне парушаць. Няхай лепей іншыя, а я ўжо пагляджу ды, калі што якое, потым далучуся да іх. Першых караюць, а іншых – толькі дакараюць. У гэтым таксама заключалася своеасаблівая сялянская мудрасць. Менавіта з-за гэтага вяскоўцаў і характарызавалі тады заўсёды: цярплівыя і... надта маўклівыя. «Людзі добра ведалі, колькі зла і няшчасця было ім ад Чортавага каменя, але ніхто не хацеў першы прыкладаць рук, каб скінуць яго. Праўда, на гэта былі важныя прычыны: быў надта вялікі – мала чым меншы за добрую хату; другая прычына – не ўсе сыходзіліся на думцы, што камень трэба непрыменна

прыбраць. Адны гаварылі, што чапаць камень – грэх; другія казалі, што на камень наложаны праклён і крануць яго боязна – можа здарыцца якое-небудзь няшчасце. Былі і такія людзі, якія проста стаялі за тое, што камень і павінен быць тут, каб людзі вучыліся быць асцярожнымі і разумнымі, каб умелі самі абладзіць сваю бяду, сваё няшчасце, бо каб не было на свеце зла, дык кожны дурань лёгка трапіў бы ў рай.

Прычына трэцяя – ніхто не давёў добрага спосабу, як узяцца за справу» [Тамсама, с. 517–518].

Як бачым, тут усё аўтарам тлумачыцца, зыходзячы з пазіцый старадаўняй прымхлівасці, з налётам нейкага цемрашальства, якое нельга было патлумачыць здаровым ладам жыцця. Магчыма, што такая задача не ставілася самімі сялянамі, якія прызвычаіліся да таго, што на ўскрайку той дарогі ляжыць здаравенная камлыга, і там выпадае быць асцярожным, каб не зачапіцца і не стаць потым аб'ектам для смеху, чарговага анекдатычнага выпадку: «А часы ішлі. Паміралі адны людзі, на змену ім з'яўляліся другія, трэція і гэтак далей. Змянялася нават само аблічча зямлі: лясы змяняліся палямі, на палях зноў раслі дрэвы; толькі Чортаў камень ляжаў і ляжаў такі ж вялікі, такі ж маўклівы, дзікі, непрытульны, абросшы густым мохам. Аднак доўгія вякі пакідалі і на ім усё ж свой след: камень, хоць і мала, асядаў у зямлю. І, казалі, будзе такі час, калі мінецца закляцце, ён сам знікне з твару зямлі, сыдзе ў яе нетры» [Тамсама, с. 518].

Многа стагоддзяў мінула, калі нехта першы спатыкнуўся аб Чортаў камень, а кардынальна нічога так і не перамянілася: «Змяняецца свет, разумнеюць людзі. Цяпер яны многа гавораць пра Чортаў камень, і думкі іх падзяліліся: адны стаяць за тое, каб справу з каменем аддаць на суд часу; другія даводзяць, што лепш адразу пакончыць з ім, парваўшы яго порахам. Чыя тут праўда, няхай мяркуе той, хто пачуе гэту казку» [Тамсама].

Нам падаецца, што А. Разанаў добра ведаў і «казку» Я. Коласа і вуснапаэтычныя творы, прысвечаныя валунам, калі ствараў свае аўтарскія «Камяні». Мяркуйце самі:

Што ты скажаш цяпер? – пытаюцца ў мяне камяні, калі мяне спасцігае якая няўдача, калі здараецца са мною якая неспадзяванка.

Яны пытаюцца, яны цешацца, яны ганарацца сабой, яны цяпер адчуваюць сябе мудрэйшымі за ўсе мае аргументы, якія я ім прыводзіў, за ўсе мае ўчынкі, якімі даводзіў, што быць людзьмі лепш...

Я пастаянна казаў, што меў,
я пастаянна кажу, што маю,
нічога не ўтойваючы,
нічога не пакідаючы на чорны дзень;

Мае канчатковыя аргументы тут – у кожнай хвіліне, у кожным дні, ва ўсім сваім існаванні.

А камяні мяркуюць, што я жабрак, што я жыўлюся чужым, што нічога свайго не маю...

Яны закрываюцца ад мяне:
у іхняй закрытасці – іхняя моц,
у іхняй закрытасці – іх каменнасць.
Я вучу камяні быць людзьмі.
Я іх прасвятляю сабою.
Дзень, калі яны адкрываюцца мне, – мой скарб.
Дзень, калі яны закрываюцца ад мяне, – чорны [28, с. 248]

Лірычны герой паэта здольны да таго, каб «вучыць камяні быць людзьмі, каб яны ўбіралі ў сябе боль і гнеў людскія...». Новае ў такой сітуацыі – гэта тое, што камяні не проста «маўкліва ўбіраюць», але неўзабаве будуць распавядаць пра ўсё тое, сведкамі чаго яны сталі. У сувязі з гэтым аўтар прапануе нават сваё летазлічэнне – «дзень светлы» і «дзень чорны». «Светлы» – калі душы камянёў адкрытыя для ўспрыняцця, а «чорныя» – калі яны закрываюцца і да іх звяртацца тады ўвогуле не выпадае.

У рамане беларускага пісьменніка Генрыха Далідовіча «Гаспадар-камень» разам з апісаннем пераменлівых сацыяльных падзей апавядаецца яшчэ і пра тое, як у цяжкія часіны жыцця вясковыя людзі, па старадаўняй завядзёнцы, прыходзілі да агромністага каменя, каб спытаць у яго парады, параіцца адносна будучыні, звярнуцца за пільнай дапамогай, але маўклівы сведка мінуўшчыны быў абыякавым да іхняга гора. Падобна на тое, што ў гэтым рамане камень сімвалізуе сабою скваппасць, бязлітаснасць, маўклівасць, абыякавасць да людскіх клопатаў і праблем; няма ў яго ніякага жадання-імкнення дапамагаць няшчасным у іхнім горы [7, с. 214].

У. Караткевіч па-майстэрску хораша і ўмела ўплёў неад'емны атрыбут беларускіх пейзажаў – россып вялікіх камянёў у дэтэктыўны раман «Чорны замак Альшанскі». Звезеныя ў свой час з вялікай прылеглай тэрыторыі сюды для будаўніцтва і далейшага драблення, камлыгі пазней парассыпаліся, бо замак пачынаў пáціху рушыцца і атрымлівалася тады, што нібыта кожны паасобны камень імкнуўся заняць сваё ранейшае месца. Толькі жаданне было, а вось сілы – не хапіла: «Цьмяна і таямніча стаялі ў катлавіне ў некім невядомым парадку вялікія і меншыя валуны. Гэта было месца, у якім старая народная фантазія ахвотна б змясціла пляцоўку для ракавання рознай больш ці менш шкоднай язычніцкай нечысці. Яна вымірае, але ўсё адно ў такія вось поўневыя ночы,

калі вакол светла і толькі тут пануе паўзмрок, сюды збягаюцца на начную капу, начны суд Вадзяніцы, Балотныя Жанчыны, феі-Мятлушкі, Вогнікі з балотаў, Карчы. Лесавікі, Хахолы і Хохлікі і іншыя напаўзабытыя бажышчы.

Сталёвыя воды туманам сплываюць,
Ледзь дыхаюць пасмы пажоўклай травы.
Ў нізіне, дзе замак спачые сівы,
Апошняя фея цяпер памірае.

Гэтая лагчына – апошні куток іхняга калісьці бязмежнага каралеўства. Гэтыя ледзь бачныя камяні – іхнія былыя павержаныя троны. Троны ў лагчыне, у якой густа настаялася іхняя трывога, бездамоўе і асуджанасць. Іхняя апошняя безнадзейнасць у мёртвай пустцы бездухоўнасці» [13, с. 232–233].

У. Караткевіч не проста апісвае камяні, а параўноўвае іхняе «лежбішча» са старадаўнімі язычніцкімі тронамі, кожны з якіх займаў велічны міфічна-дэманалагічны персанаж, які ў памяці беларусаў пакінуў значны след, а некаторыя з іх, так ужо атрымалася, згадваюцца сучаснікамі і па сённяшні дзень. А яшчэ сцвярджалі, што кожны такі самабытны трон захоўваў пэўныя рысы свайго гаспадара-ўладара. Асацыяцыі таксама заўсёды валодалі вялікай сілай [12, с. 68].

Асаблівай павагай карысталіся ў народзе так званыя крушні (горкі камянёў), ці «прошчы» (у склад прошчы ўваходзіла некалькі магутных старадаўніх дрэў і «крушня»). Ім прыпісвалі здольнасць вылечваць людзей ад усемагчымых хвароб і нядугаў, пошасцей і эпідэмій. Некалі мой старэйшы сябра і паплечнік Алесь Пятровіч Траяноўскі распавядаў (а апавядальнік ён быў цудоўны!): «Памятаю, што калісьці былі “прошчы” – мясціны, якія лічыліся цудадзейнымі. Гэта магло быць адно дрэва або некалькі, часам там ставіўся крыж. Неабавязкова, каб гэта былі дубы. Туды ішлі хворыя людзі, маліліся там. Толькі ці дапамагала гэта – цяжка сказаць адназначна. На нашай леснічоўцы Уздымач, за якіх метраў паўсотні ад хаты, за агародамі, памятаю, стаялі на невялікім пагорачку дзве высачэзныя і таўшчэразныя сасны. Побач ляжала крушня камянёў. У маленстве я любіў бавіцца там – ганяўся за яшчаркамі, якіх было на тым пагорку мноства. Побач з гэтымі соснамі быў вялізны пень – усё, што засталося ад трэцяй. Мая матуля расказвала, што калі мае бацькі пераехалі на Уздымач (было гэта недзе ў 1910 ці 1911 годзе), дык стаялі ўсе тры сасны. Гэтыя сосны і крушня камянёў былі прошчай. Маці сама бачыла, як аднойчы прыехаў нейкі чалавек, прывязаў каня непадалёку да плота, а сам пайшоў да соснаў. Выбраў адзін з камянёў,

узяў яго ў рукі і стаў абходзіць дрэвы. Пазней матулю ўжо не здзіўляла тое, што прыязджалі людзі і з малітвамі цягалі камяні – яны лячыліся, асабліва калі балеў жывот. Праўда, мае бацькі чамусьці не звярталіся да гэткае своеасаблівае медыцынскае дапамогі, хоць яна была побач, за агародам.

Яшчэ запомнілася тое, што на кожнай сасне было па пары гнёздаў чорных грувасткіх груганоў. Птушкі нікуды не адляталі, а маўкліва сядзелі і падавалі свае галасы толькі тады, калі нехта набліжаўся да прошчы. У 1917 годзе, пасля таго як скінулі цара, настала "слабода", і тады кожны рабіў, што яму хацелася. Менавіта ў тыя дні прыехалі недзе з палёў (палявых бязлесных мясцін Случчыны) людзі і спілавалі адну з соснаў на вал для новага ветрака. Пілавалі, змяняючыся, два дні. Дзве пературывалі і апошнюю вайну. Але калі я наведаўся на Уздымач недзе ў 1947 годзе, іх ужо не было. А гадоў дзесяць назад я ледзь знайшоў там астаткі пнёў. Як і не было той славутай прошчы!» [37, с. 163].

Да месца будзе прыгадаць і апавяданне, запісанае А. Сержпутоўскім для таго, каб паўней раскрыць значэнне слова «прошча» для звычайнага люду. Ён запісаў аднайменны фальклорны твор. «У глухом Палесі, за балотам, за такою тхланью, што адтуль і свету Божаго не відно, было сельцэ. У том сельцы была цэрква, старэнькая, закрывіўшаяся. Недалёко ад цэркві стаяла карчма такая ж старая, аблупленая, без страхі, з загатаю й падпоркамі. Бедны быў там поп, бедны й рандар, бо калі нема даходу папу, то нема й рандару. Але рандар быў вельмі хітры жыд. Тры дні ён сядзеў, ні піўшы, ні еўшы, усе думаў, як бы ему разбагацець. Спалохаласа жыдоўка, думае, што можэ Абрумка памешаўса. Толькі от на трэйці дзень Абрам сказаў "Рэхт", і пайшоў к папу. Позно ён седзеў у папа, немаль да трэціх пеўняў, усё штось гаварыў папу. От прышлёпаў Абрам да гасподы, а на другі дзень паехаў у местэчко.

От прайшла недзеля, а мо дзве. Пачалі касіць. Было пагоднае лето. От вечарком у недзелю седзяць людзі та на прызбах, та пад ліпамі каля цэркві, сядзяць, жупяць, люлькі кураць. Тут жэ, каля самаго села, пры рацэ гуляюць дзеці. Вечар пагодны, цёплы. От пачало цемнець; на небе загарэліся зоркі. Ось бегуць дзеці й крычаць: "Сюды, сюды, вонь па рацэ плывуць зоркі!" Падняліся мужыкі, бачаць, аж праўда па рацэ штось плыве з вадою й кругом яго як бы свечачкі гараць. Пабеглі сказаць аб том папу. Прыйшоў поп, паглядзеў і кажэ, што гэто цуд. Палез староста на званніцу й давай званіць, як на Велікдзень. Высыпало ўсе село к рацэ. Пабег поп у цэркаў, адзеўса ў рызы да й пайшоў з пратэсамі к рацэ сустракаць той цуд. Падышлі людзі бліжэй к рацэ, бачаць, ажно плыве старая дошка, а на ёй лежыць абразок паміж свечачак. Ціхо,

як у вусе, свечачкі гарацъ роўно, бы ў цэркві. Падплыла дошка к берагу, заплуталася паміж калітак да й стала. Узяў гэто поп абразок на бераг, паставіў на камені й давай служыць малебен. Усюды загаварылі, што ў тым сяле аб'явіўся цуд, і паваліл адусюль людзі к той прошчы. Несуць ахвяру, хто што можэ. Разжыўса скоро поп, але ешчэ больш папа разжыўса рандар, бо, ведамо, хто адкуль ні прыходзіць, та ўсе ж дасць рандару ўтаргаваць. І славітца тая прошча на ўвесь свет. Але кажуць, што гэты цуд зрабіў рандар, намовіўшыся з папом. А Бог его светы ведае! Кажуць, што з мястэчка крамар пазнаў батцэ гэто той абразок, што ў яго рандар купіў, нібы для папа. Моо й праўда!» [31, с. 79–80].

У гэтага ж даследчыка зафіксавана і іншае сцверджанне: «Прошчы-каменне. У нас шмат е прошчаў з такімі каменнямі, на якіх аддыхаў сам Бог ці Божая матка з Сусам Хрыстом. На тых камянёх застаўся толькі слядок ат нагі Божае маткі ці Суса Хрыста. Людзі ходзяць здалёк да тых прошчаў і там моляцца Богу, та Бог ім памагае ці здымае хваробу, або якую іншую плягу.

Часам находзяць каменьчыкі з дзюрачкамі. Яны даюць таму шчасце, хто мае іх у дамоўцы» [30, с. 49–50].

У яго ж чытаем і наступнае: «Матка Боская лепш ад усіх святкоў. Яна заўжды заступаецца за людзей, заўжды прыходзіць да іх, як толькі трапіцца якое-небудзь няшчасце – хвароба або паморак. Дзе яна аддыхае ці заставіць свой след, там у нас прошчы. Тыя прошчы вельмі памагаюць людзям у бядзе» [Тамсама, с. 216].

А беларускі пісьменнік У. Арлоў, наадварот, стварыў сімвалічна-філасофскі вобраз крушні: «Сяду на ўзмежку пад крушняй, каб было чым бараніцца ад тых, хто не такі, як я.

> Засвеціць вачыма ў прыцемку воўк – кіну камень у хіжака.
> Зашамаціць у траве вужака – кіну камень у яе.
> Праляціць бязгучна кажан – кіну камень у неба.

А ўначы, калі, маючы мяне за наўца, збярэцца крумкачыны грай, буду да знямогі шпурляць камяні ў птушак.

Падымецца сонца, і ўбачу сябе пасярод брукаванага пляца, а на камянях ляжыць белая птушка, і хтосьці паслужліва склаў ужо побач са мною новую крушню» [1, с. 7].

Паводле аўтара вынікае, што старажытныя крушні служылі людзям не толькі месцам звароту і просьбаў ад вылячэння, але і своеасаблівымі прыкладамі для далейшага пераймання. І таму побач са старымі каменнымі малельнямі ўвесь час узнікаюць новыя. Можна канстатаваць, што традыцыя працягвае жыць у нашым народзе. Пераемнасць гэтая

захоўваецца, нават нягледзячы на некаторую блытаніну паміж матывамі ранняга язычніцтва і куды ўжо пазнейшага хрысціянства.

Хочацца адзначыць і тое, што найбольш часта звяртаюцца прафесійныя пісьменнікі і паэты да шырокавядомых «каменных» тэм. Пераважна з беларускімі каранямі. Вось як адлюстраваў старажытную народную легенду ў сваім вершы «Барысаў камень» (легендарны камень-«пісанік», які не толькі знайшоў сваё адлюстраванне ў шматлікіх вусна-паэтычных творах, але і быў неаднаразова даследаваны археолагамі, гісторыкамі, этнографамі) А. Жамойцін:

Смягне Барысаў камень,
Кожны кране рукамі...
Ходзяць вакол, гурганяць;
Памяць варушаць... памяць...
Час даўніною свеціць:
Быў у вадзе па плечы;
Безліч крыніц і рэчак
Цеклі абвіць яго;
Веры ўзяць гаючай
Далей імкнуць праз кручы.
Жыў у Дзвіне крыштальнай
Ідалам недакранальным!..
Дзеўкі вянкі пускалі,
Лёсу ў яго пыталі.
Возьме каменнай дланню, –
Ўзыдзе яшчэ каханне... [11, с. 16]

Атрымалася, што гэта ўжо не проста сімвал боскасці, межавы дзяржаўны знак, але і прадказальнік чалавечага лёсу, будучага кахання. І хоць увогуле зніклі многія рэкі, зусім абмялелі, а Барысаў камень па-ранейшаму захоўвае ў сабе рысы таямнічасці, чароўна-варажбітнай здольнасці, да якіх працягваюць звяртацца ўжо прадстаўнікі маладзейшых пакаленняў.

У нашым народзе ўвайшло ў даўнюю традыцыю звязваць здараненныя камлыгі з імёнамі славутых асобаў, якія некалі жылі і працавалі ў гэтых мясцінах, навучаліся і займаліся прафесійнай дзейнасцю, праславілі сябе ўласнымі творчымі здабыткамі. Паэт М. Дукса прысвяціў верш каменю – помніку Ф. Багушэвічу, закранула творцу народная памяць пра славутага сярод мясцовага сялянства аўтара, «заступніка і абаронцу бедных і бяспраўных». Гэта ён, «сярмяжны адвакат», стварыў для іх свае вершы на зразумелай беднаму люду сялянскай мове. Атрымалася, што існуе каменны помнік (мемарыяльны камень) і да яго дадаўся яшчэ і паэтычны.

Вясна тут дыхае ў шчаку,
буяе лапушысты месяц травень.
І ўсё вянчае натуральны камень
Са словамі: «Мацею Бурачку».
Ніхто гадаць не будзе тут, чаму
такі валун узвысіла прырода
і ад сябе і за свайго народа
вялікаму абранніку свайму [9, с. 12].

Як бачым, камяні ўяўляліся жывымі істотамі не толькі нашым далёкім продкам, але і нашым сучаснікам, асабліва тым, хто паглыбляецца ў даўніну, у сівыя стагоддзі, каб там паспрабаваць знайсці адказы на вострыя сучасныя праблемы і пытанні. Падаецца, што спрабуюць адначасова адшукаць і вырашэнне даволі складаных супярэчнасцей, якія пастаянна ўзнікаюць у вірлівым грамадстве. Тым болей што месца, занятае некалі старым архетыпам-першавобразам, пустым быць не можа. Туды абавязкова будзе «ўведзена» замена, і характэрнымі яе рысамі і ўласцівасцямі стануць тыя, якія ў змененым варыянце намнога болей будуць уплываць на філасофскія і сацыяльныя аспекты, скіраванныя на духоўнасць грамадства. Калі ўмовы і час патрабуюць свайго, то такое запатрабаванне будзе выканана.

# ПАПУЛЯРНЫЯ ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ

Камяні, паводле некаторых уяўленняў беларускага народа, ёсць не што іншае, як зачараваныя зямля, людзі, жывёла, пні дрэў, печаны хлеб і г. д. У пацверджанне нагадаем вельмі папулярную на Беларусі легенду пра Сцёп-камень.

«Даўным-даўно, можа пры прыгоне, а можа яшчэ даўней, жылі ў гэтых мясцінах (непадалёку ад в. Баяры Докшыцкага раёна. – *А. Н., Я. Н.*) Сцяпан са Сцепанідай. Жылі, працавалі, з горам-бядой змагаліся, але ад беднасці пазбыцца ніяк не маглі. Паехаў аднойчы Сцяпан на валах на гэта поле араць сваю ніву. Рана ўстаў, рана сабраўся, жонка і снедаць не паспела згатаваць, Сцяпан і кажа:

– Паеду нашча, а ты, Сцепаніда, сняданак мне паднясеш, тады і полудзень пазней будзе.

Так і зрабілі. Прыехаў Сцяпан на ніву, запрог у саху валоў. Араў-араў, дужа змарыўся і згаладаўся, на дом пазірае, Сцепаніду чакае. А ворыва

цяжкае: камень на камені, пень на пні. Пад нарогам пясочак-жаўцяк, і невядома, будзеш з хлебам ці так. А Сцепаніды ўсё няма. Аж злосць яго забірае. Але зараз і яна паказалася з бельцам у руках, а што ў тым бельцы – зацірка ці крупнік, булён ці халаднік – Сцяпан не ведае. Кінуў араць, а жонка падышла ды давай упікаць:

– Ах ты, завала, ах ты, гультай! Спіш за сахою, ганей не ўзараў!

І пачалася паміж імі сварка, а за сваркаю дайшло і да клятоў. Сцепаніда на ўсё поле крычыць:

– Ах, каб ты каменем стаў: зранку паехаў ды, мусіць, спаў.

А Сцяпан ёй у адказ:

– Стань жа ты морам, сцюдзёнай вадою, можа б, не знаўся тады з бядою.

Ураз так і зрабілася: Сцяпан стаў каменем метры з два ростам, ды і ў папярэчніку недзе сантыметраў сто на семдзесят, на дзвюх нагах, якія, кажуць, за доўгія гады яго адзінокага стаяння ўвайшлі ў зямлю. А Сцепаніда стала даволі вялікім возерам, што раскінулася непадалёку ад Сцяпана. Назвалі гэта возера Засцеп'е, можа, ад імя Сцепаніды, а можа, ад таго, што ляжыць яно за Сцяпанам. Цяпер гэта возера сухое, кожнае лета зарастае такой высокай і густой асакой, разаком, што і кароў з яе не відаць, калі пастухі і запусцяць іх туды.

А Сцяпан стаіць не адзін: побач ляжаць яго валы – два ўжо меншыя камяні, стаіць ля яго і бялец-камень, невялікае драўлянае вядзёрка з накрыўкай і ручачкай у ёй, у якім у пільніцу сяляне бралі з сабой на ніву што-небудзь пасёрбаць і якое несла яму Сцепаніда. Ляжаць тут і яго дзве каменныя рукі, якія, зноў як кажуць людзі, адбілі яму перуны. Толькі невядома, дзе дзелася Сцяпанава галава і ці была яна ў яго, бо калі б была, то навошта было яму клясці родную жонку такім праклёнам. Лепш змаўчаў бы!» [20, с. 7]

Тое, як няшчыра, люта і дзіка маглі паразмаўляць паміж сабою, здавалася б, самыя родныя і блізкія людзі, «зачапіўшыся» за дробны «факт», нейкую нікчэмную навіну і г. д., сведчаць сотні вусна-паэтычных запісаў па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Калі мне, напрыклад, даводзілася размаўляць са сваімі выпадковымі інфарматарамі, каб даведацца пра нешта новае з «каменнай» гісторыі, то нярэдка і самі сустрэтыя людзі здзіўляліся: «І за што ўжо яны адзін аднаго так зневажалі? Там і правіны той, што вераб'ю і тое па калена не будзе, а такія клёны-праклёны сыпалі бацькі на дзяцей, дзеці на бацькоў, жонка на мужа і наадварот, што камяні, якія многае ўвабралі за праляжалы на гэтым месцы час, і тыя не вытрымлівалі такога сораму, а ажно свой колер мянялі – чырванелі! Вось да чаго даходзіла!» [УЗ, 1].

Распавядалі, што пара такіх мемарыяльных камянёў, якая ў народзе ўяўлялася вынікам не надта спакойнага і мірнага сямейнага жыцця, ляжала некалі ля вёскі Цітаўка, што непадалёку ад Бабруйска. Паводле мясцовай легенды, дык з'явіліся яны тут нечакана (зусім выпадкова і далёка не ад часоў утварэння Светабудовы. Здарылася такая падзея недзе ў позняе Сярэднявечча. Так і хочацца напісаць, што ліхіх ды дурных ва ўсе часы хапала. Своеасаблівы помнік паўстаў недзе ў канцы другой паловы XIX стагоддзя. Жылі ў Цітаўцы сяляне: Ціт і Ганна. Толькі надта дзіўная гэта была сям'я, бо ніколі і ніхто не пачуў ад іх, каб яны адзін да аднаго звярнуліся па імені, ласкава ці спакойна, наадварот, калі ў тыдзень раз-другі і загаворвалі, то яна да яго звярталася са словам «Буян!» (бык, асемяняльнік, няверны муж, той, хто ўсюды і за ўсімі жанчынамі валачыўся), а ён сваю Ганну «ўзвялічваў» не менш арыгінальна – «Караўка!» (нячыстая, запушчаная ў брудзе гаспадыня, ад якой заўсёды непрыемна патыхала-смуродзіла, і ад яе выпадала яшчэ трымацца людзям як мага далей, каб не ўхапіць ненарокам якую хваробу, бо такія пошасці падоўгу не вылечваліся і заставаліся ці не вечнымі знакамі таго роду-племені).

Самае цікавае, што нават час для сваіх кляцьбаў-зваротаў яны спецыяльна не выбіралі. Усё роўна было: позняя ноч, ранні досвітак ці божая нядзелька. Наадварот, здавалася, што толькі і чакалі таго моманту, каб у чарговы раз счапіцца, захлынуцца ў ярасці ды паспець нагаварыць адно другому болей непрыемнага і яшчэ (магчыма!) не пачутага да гэтага самага моманту.

Муж, напрыклад, сярод ночы збіраецца выйсці ў двор па сваёй патрэбе. І сеў на сваёй ляжанцы ціхутка і нічога не разбіў, нічым не паспеў грукнуць, а ў Ганны ўжо рот напагатове. Ажно прыўздымаецца ад празмернага напружвання. Узіраецца ў цьмяную фігуру. Ціт разумее, што «ўсё будзе, як заўсёды ці як тады», а не выключана, што і чакаў гэтага моманту таксама спецыяльна. Хто ж іх пойдзе ды разбярэ людскія лёсы ды людскія думкі. А словы, то і тым болей! Да іх толькі паткніся, то любога такою кляцьбою «ўзнагародзяць», што мілым свет белы не пакажацца!

– Што, Буян, да чарговай кароўкі забыўся падбегчы-падкруціцца?! Каб табе твае ногі павыкручвала, павыварочвала! Гэта ж так ціхутка прахапіўся, што я і то ледзьве пачула. А ў мяне ж слых, як у лясной коткі. Міма мяне ніхто не пройдзе і не прашмыгне, калі я толькі гэтага не захачу!

– Караўка ты – «караўка» і ёсць! У цябе толькі адно ў тваёй макітры пастаянна варыцца! А тое, што я за такі даўжэнны дзень на ніве натаміўся і ў мяне ўсё чыста цела смыліць, то табе такое і ў галаву не заходзіць?! Адразу Буяну цялушак падшукваеш, а тое, як людзі сцвярджаюць:

калі косяць, то самыя юрлівыя ў жанчын не просяць, а калі грабуць, то яны і маладых не ...ць! Чула пра такое ці не, Караўка ты няшчасная! Лепей бы лішні раз умылася ці хаця б ужо сухім ручнікам выцерлася, то, магчыма б, пасвятлела, а то толькі вачыма сваімі лыпаеш. Яны ў цябе ўжо ад бруду ды кароcты амаль пазарасталі!

Размова крапчае: ужо абое на нагах, ужо па хаце скачуць, а крычаць так, што, здаецца, ажно цікаўны месяц у вакенца перагнуўся ды хоча разглядзець, што там у ліхіх людзей у такую познюю часіну робіцца? Але ў гэты самы момант Буян знайшоў спосаб адпомсціць жонцы не словам, а справай: ухапіў яе за валасы і давай туды-сюды па хаціне цягаць! Пры гэтым не забываўся прыгаворваць:

– Ану, Каравачка, да кручочка, там і скончыцца для цябе гэтая ночка. На нармальнай мове гэта азначала, што прывяжа яе валасамі да кручка, убітага ў вушак дзвярэй. І там жонка прастаіць да самае раніцы, ажно пакуль не трэба будзе ісці на працу. Адным словам, вэрхал, крыкі і стогны стаялі падчас іхніх разборак такія, што з боку магло падацца, што недзе паблізу адбывалася бітва лютых ворагаў. Праўда, не заўсёды перавага ў такіх сутычках была на баку Буяна. Караўка таксама магла вызначыцца (што і даказвала, і рабіла неаднойчы!): то знянацку наляціць на мужа з якім цурбалкам і тромкне таго «пасярод вушэй», то па нагах з усяе сілы ўдарыць, то ў плечы папіхне, а потым ужо ляжачага дабівае. І ўсё з гэтакай нянавісцю і бязлітаснасцю, што сэрца крывёю абліваецца.

Яны і вешаць, і тапіць адно другога вадзілі. А не атрымлівалася задуманае не таму, што ім светлая думка ў апошні момант ударала, а таму, што нешта пайшло не так: умяшаліся нейкія другія ці трэція сілы, і выпадала тэрмінова «згортвацца». Гавораць сярод вяскоўцаў, што ліхімі ды дурнымі бываюць толькі ў маладыя гады, а пад старасць, адпаведна, людзі пачынаюць разумнець. У гэтых жа здарылася ўсё ды наадварот: яны з гадамі сталі яшчэ больш раз'юшанымі. І што самае галоўнае, то цяпер абавязкова імкнуліся выперціся перад суседзямі, аднавяскоўцамі, «каб іх не толькі чулі, але і добра бачылі».

Але ж усяму, нават самаму нечаканаму і непрадбачанаму, у жыцці абавязкова бывае канец (дакладней, лагічнае завяршэнне). Так і тут. Усё выйшла на Благавешчанне. Гэта адно з найвялікшых праваслаўных святаў. У такі дзень вяскоўцы баяцца не толькі сварыцца, але нават падумаць пра нешта дурное. А гэтыя ж за сваё! Ды сярод святочнага натоўпу, сярод разапранутых людзей. Якія кіравалі на святочны малебен у царкву. Найбольш цвярозыя галавы адразу пачалі «цыкаць»:

– Ганна, Ціт, супакойцеся! Што гэта вы здумалі ў такое свята вытвараць!? Мала на вашыя галовы і ранейшай няславы выпала? І так жа

сумленныя людзі пра вас не тое, што гаварыць, але і слухаць не жадаюць. А вы, вунь што зноў вырабляеце! Спыніцеся і супакойцеся!

Калі б на нармальных людзей, то словы, магчыма, і паўплывалі, але не на гэтую «пару». У адказ Буян ухапіў Караўку за валасы і пракрычаў:

– Зараз як кройну аб камень, то і дух свой нячысты назаўжды выпусціш!

Толькі так крыкнуў, як ціха-ціха стала навокал і змярцвелы народ убачыў самы сапраўдны цуд: там, дзе пару імгненняў назад скакалі раз'юшаныя муж з жонкай, цяпер ляжалі два здаравенныя камяні. У народзе іх так і празвалі назаўсёды: Ціт і Ганна, ці Буян і Караўка. Ляжалі сумным напамінам аб людской няўдзячнасці і злосці, ажно да таго самага часу, пакуль іх не пусцілі на каменны друз пры будаўніцтве бліжэйшай чыгункі.

Часта ў беларускім фальклоры згадваецца легенда аб пераўтварэнні людзей і жывёл у быкоў. Тлумачыцца ўсё надзвычай проста: парушылі рэлігійныя каноны, не сталі рабіць так, як іншыя, а паспрабавалі скруціць па-свойму. Вось і атрымалася такая незайздросная сітуацыя!

Некалі жыў адзін селянін. Звалі яго Пётрам. Не сказаць, каб у нечым асабліва выбіваўся чалавек. Працаваў-выжыльваўся, як і тысячы іншых, ад поту кашуля на ім закаравала так, што ажно хрусцець пачынала. Стараўся не адставаць ад суседзяў. Толькі ніколі на чужое не пасквапіўся, рот лішні раз не разявіў. Нікога не пакрыўдзіў. Жонка ў яго таксама такая ўвішная была. Нідзе не адставала. Як мурашка тая. Яе Тэкляй звалі. Здзіўляліся суседзі: для каго, маўляў, яны ірваліся, для каго стараліся? Бог дзяцей гэтай сямейцы не даў, а раз так, то і намаганні многія незразумелымі здаюцца. Развязка ў гісторыі здарылася вясною. Якраз перад Божым Вялікаднем усё завязвалася, а на гадавое свята і адбылося! Лёг Пётра спаць раненька. Неяк так атрымалася, а праз пару гадзін ужо гаварыў да жонкі:

– Вось табе і маеш... Лёг раней, бо свята вялікае ў людзей, а спаць болей не магу... Цела, праўда, чыста ўсё круціць-выломвае. Але гэта ад ранейшай стомы... Не прывык без справы ляжаць... Слухай, а калі паеду ў поле ды ў прыцемках узару тую нашу палоску, што ля самага лесу... Далекавата ад вёскі, з людзей ніхто там не ходзіць, ды яшчэ ў такі ранні час... Паеду, чаго дарма круціцца на палацях... На стале вячэра засталася, пару лыжак перахаплю, а сняданак мне ў поле прынясеш... Я да таго часу амаль працу скончу... Ніхто і не ўбачыць і не даведаецца пра тое, што так учынілася... Кожны з людзей нешта сваё ад іншых хавае...

Так і паехаў Пётра пад зоркамі з двара ды стаў працаваць у полі. Яно то і працуецца з аднаго боку добра, бо няма гнюсу, спёка не даядае... Хадзі за сахою ды думай пра свае думкі...

Сонца над лесам зайграла, а селянін адпачываць сеў, ды быкоў сваіх з ярма выпраг, бо справу завяршыў. Тым часам і жонка прынесла сняданак. Села побач з мужам ды нахвальвае яго, што за тую ноч гэтулькі працы перавярнуў. Усё добра ішло да таго самага моманту, пакуль Тэкля Бога са святымі не прыгадала. Як толькі прамовіла пра Усявышняга, то імгненне і людзі, і быкі, і гаршчкі, і нават іхні сабачка ў камяні ператварыліся. Так і скамянелі ды сталі нагадваць сабою суровае пакаранне за грэх перад святым Вялікаднем.

Гаварылася таксама і пра тое, што велізарная боская сіла адкідвала ад тутэйшых мясцін варожых салдат, якія, наскочыўшы нечакана, пачыналі паліць і рабаваць, забіваць і гвалтаваць, ні перад чым асабліва не спыняючыся. Так і на той раз адбылося. На гэты раз з'явіліся выпаўзні ажно аднекуль з сасаў. Многа іх было. Вайною ішлі на тутэйшага валадара. Нанеслі яму крывавае паражэнне, і той вымушаны быў адступіць, пакінуўшы сваіх мірных жыхароў безабароннымі перад такой страшнай навалай. Сагналі і старых і малых у мясцовую царкву і падпалілі яе, каб людзей такім чынам знішчыць. Але ў гэты самы момант нешта загрымела, страшна затрашчала, і царква праваліласе скрозь зямлю, пакінуўшы пасля сябе толькі невялічкае азярцо. А той крыважэрны саскі князь перакінуўся ў вялізарны валун, які трывала асеў на беразе вадаёма. Нібы і наканавана яму было нават у каменным выглядзе глядзець на тое, што панарабляў ён на захопленых землях.

У беларускім народзе часта згадвалася яшчэ і пра тое, што людзей невядомая (боская, чароўная) сіла перакінула ў каменне за іхнюю празмерную сквапнасць, ліхія адносіны да іншых. Рознымі даследчыкамі (у розных варыянтах) зафіксавана легенда «Зязюля». Сюжэт паўтарае вусна-паэтычны твор не толькі з такой назвай. Непадалёку ад вёскі Ражаны, што на Случчыне, уздоўж дарогі, параскіданы велізарныя валуны. Гавораць, што некалі тут была на дзіва заможная вёска. Гаспадары жылі ў ёй працавітыя, але скупыя і бяздушныя: нічога ў іх не выпадала папрасіць, нельга было спадзявацца на іхнюю дапамогу.

Так здарылася, што аднаго разу ішоў праз вёску падарожны: вельмі стомлены стары чалавек. Ледзьве ўжо ногі перастаўляў, але да каго не звяртаўся, каб пусцілі пераначаваць, то гаспадары адно што моўчкі рукамі паказвалі на канец вуліцы. А ў адным месцы дык і злюшчых сабак спусцілі, каб не перашкаджаў, маўляў, ім адпачываць пасля працоўнага дня. Даперабіраўся нагамі старэча да апошняй хаты, а тая такая старая, такая гнілая, што ў любы момант зваліцца можа. Сядзіць дзядулька і гаручымі слязьмі заліваецца. Тут адчыняюцца гнілыя весніцы,

і худзенькая дзяўчынка працягвае старому акрайчык хлеба. Узяў падарожны акрайчык, а сам шэпча малой:

– Дзякуй табе, унучка, за тваю сардэчнасць і спачуванне! А зараз уцякай хутчэй ад гэтага месца! Толькі, уцякаючы, не азірайся!

Пабегла малая. Бяжыць і чуе ззаду, што нешта крычыцца, валіцца. Не вытрымала і... азірнулася. Як толькі так зрабіла, то ўсё імгненна сціхла. Хаты тыя вялізныя зніякавелі і сталі камянямі, а сама яна ператварылася ў шэрую зязюльку, якая з тых самых часоў лётае і шукае сваіх родных.

Ля вёскі Камень Валожынскага раёна, на самым яе ўскрайку, ляжыць здаравенная камлыга, з якой у мясцовага люду звязана ажно некалькі легендаў. Першая з іх пабудавана на знешнім падабенстве валуна і сялянскай хаты. Жыў у ёй некалі надзвычай здатны шавец. Такі ўжо быў майстравіты ды ўмелы, што да яго пастаянна чарга людзей стаяла са сваімі замовамі. І хоць ён дарагавата ацэньваў свае вырабы, але гэты факт не адбіваў вяскоўцаў. Пазней аказалася, што яго падзуджвалі, яму дапамагалі нячысцікі з бліжэйшага балота. Прачуўшы, што шавец надта сквапны да грошай, чэрці і «перакупілі» ягоную душу, і ягоную працу разам з вырабамі, ды яшчэ і свае ўмовы паставілі: усё будзе толькі па-нашаму! Так у іх і павялося, што дзень шавец працаваў-шчыраваў, а ўсю ноч баляваў са сваімі нячыстымі хаўруснікамі. Тэрмін выканання працы быў надзвычай кароткі – усяго адна ноч, а з раніцы ўжо забірайце свае гатовыя вырабы, выстаўленыя побач з каменем. Толькі не існуе ў свеце таямніц, да першавытокаў якіх не дакапаліся б цікаўныя людзі. Так і тут атрымалася. Неяк, позняе ночы, хлопцы вырашылі праверыць, што ж робіцца ў той хатцы. І нарваліся яны на прывольнае баляванне. Чутка пра гэта хутка разнеслася па наваколлі.

Аднаго разу ў вялікае гадавое свята сабраліся вяскоўцы да царквы. Абулі найлепшыя боты і боцікі, каб іншыя ўбачылі, якія хвацкія вырабы яны носяць. Ды здарылася нечуваная справа: толькі ступілі яны ў вясеннюю гразь, як абутак адразу і распоўзся на іхніх нагах, нібы самая танюсенькая папера. Дайшло сялянам, што шавец і царква – рэчы несумяшчальныя! Сведкі-лапцюжнікі торкалі пальцамі на сваіх суседзяў і гаманілі, што гэта святыя пакаралі іх за тое, што яны адвярнуліся ад хрысціянскай веры. Асабліва весела было чарцям, якія месца сабе не знаходзілі ад празмернай радасці.

Не разгубіліся і вяскоўцы, знайшлі яны моцнага чараўніка-знахара і распавялі таму, што да чаго тут адбываецца. Стары адно толькі ўсміхнуўся ў адказ. Бліжэйшае ночы прыйшоў да каменнай хацінкі і закляў яе:

«Каб ты каменем шэрым навекі сеў і з людзей болей не здзекаваўся!» Адразу пасля гэтага абрынуўся моцны лівень. Загрымела-заблiскацела ўсё навокал. А з самае раніцы вясковыя пастушкі ўбачылі, што там, дзе яшчэ ўчора была злыднева хацінка, сёння ляжаў здаравенны камень, ад яго яшчэ шэры дымок цягнуўся...

У іншым варыянце легенды «спрацаваў» не мясцовы чараўнік, а тутэйшы бацюшка, які, даведаўшыся пра здольнасці каменя да майстэрскага шыцця, то наклаў на яго вялікую забарону, і камень пасля гэтага перастаў тлуміць вяскоўцам галовы, а назаўсёды застаўся ляжаць маўклівай камлыгай, ды яшчэ ад яго пайшла назва тутэйшай вёскі.

Яшчэ адзін варыянт самабытнай легенды сведчыць пра людскую няўдзячнасць, пра тое, што калі конік верай і праўдай служыў свайму гаспадару, то і той адносіўся да яго па-чалавечы, а калі стаў старым і нямоглым, то напоўніцу зведаў, што такое быць у людзей на другім плане. Надвор'е стаяла добрае, таму і карцела чалавеку ўсё дагледзець, каб нічога не згніло, а ўсё дазвання было сухое і пахкае. Паехаў селянін у бліжэйшую пушчу за сенам, якое накасіў на лясной паляне. Нагрузіў воз як мае быць і пусціўся ў адваротны шлях. Каля таго злашчаснага каменя ўсё самае горшае і пачалося. Аказалася, што дарога там брала крута ўверх, а ў коніка ўжо не хапала сілы ўсцягнуць воз туды, як гэта ён некалі рабіў не адзін раз у сваёй маладосці. Раззлаваны селянін не ўтрываўся і пракрычаў: «Каб ты, старая ваўкарэзіна, каменем стаў!» Як конік усё ж усцягнуў воз на гару, то на самым версе і стаў вялікай камлыгай.

Паводле М. Нікольскага: «Каменне – гэта не што іншае, як зачараваная зямля, людзі, жывёлы, пні, спечаныя хлябы і г. д. Што гэта так, відаць з таго, што многія камяні захоўваюць формы нейкіх рэчаў, а таксама з таго, што любы камень, перапалены ў лазні ці ў восеці на каменцы, ці ў печы або на вогнішчы, ператвараецца спачатку ў жарству, а потым, паступова драбнеючы, яднаюцца з зямлёй – сваёй першапачатковай крыніцай» [26, с. 210].

А. Кіркор пісаў: «У Літве і Жмудзі да гэтага часу захаваўся звычай, вядома, што існуе з часоў язычніцтва, па ручаінах і невялікіх рачулках класці камяні з высечанымі на іх выявамі ступні, падковы, земляробчай прылады, мяча і г. д. Гэта надмагільныя помнікі па памерлых, ці імкненне увекавечыць што-небудзь важнае з жыцця селяніна. У беларускіх прыходах, у даволі многіх мясцінах, гэткія ж знакі выразаюць на дрэвах, якія служаць кладачкай цераз ручэй ці рэчку; мы бачым такія кавалкі дрэва з выявай ступні і г. д. раскіданы сярод вуліцы ў вёсцы, калі праход па ёй вясною і восенню, а таксама ў дажджлівае надвор'е, вяскоў-

цам абмежаваны. Чалавек, які карыстаецца сядкамі пры пераправе, абавязаны за гэта памаліцца за душы памерлых, у памяць якіх гэтыя помнікі выкладзены.

На Літоўскім Палессі няма амаль ніводнага вялікага каменя, які б не меў асаблівай назвы і з якімі б не было звязана нейкае паданне» [Тамсама, с. 10].

Вядома і тое, што царква, асабліва на раннім перыядзе барацьбы з язычніцтвам і ягонымі шматлікімі культамі, асуджальна адносілася да шанавання камянёў. Тлумачылі гэта тым, што такія праявы абагаўлення прыродных стыхій і аб'ектаў ёсць нішто іншае, як пакланенне дэманалагічным духам, якія ў іх жывуць, валадараць над імі і г. д. Чаго варта адно толькі сцвярджэнне: «Не наклікайце сабе Бога... у камені». Але насуперак афіцыйна-царкоўным забаронам, нават праз стагоддзі пасля прыняцця хрысціянства на беларускіх землях, шанаванне камянёў заставалася. Проста пакланенне камяням паступова набыло народна-праваслаўны характар, а па-іншаму – адбылося напластаванне хрысціянска-біблейскіх сюжэтаў і матываў на ранейшыя легенды, паданні, павер'і. Цяпер атрымлівалася, што на першы план выступаў камень у асацыяцыі з Богам, Багародзіцай, Божай Маці, святымі анёламі. «На Чэрвеньшчыне (раней Ігуменшчына), каля м-ка Смілавічы ёсць "святая гара", на якой знаходзіцца камень з знакам, падобным на след чалавечы. Гэты след доўгі час быў прадметам багамлення, а потым над ім паставілі царкву. Легенда кажа, што некалісь ішлі тры Багародзіцы, шукаючы сабе месца, дзе б ім аб'явіцца. Адна з іх пайшла ў Дудзічы, другая ў Навасёлкі, а трэцяя ў Ляды. Лядзянская спынілася адпачыць на гэтай гарэ, дзе і пакінула свой след на камені. Першым цудам тут было выздараўленне зусім сляпога нейкага пана. Каля Навагрудку знаходзіцца камень, на якім відаць якісь-то след, быццам пяткі і пальцаў. Паводле народнага падання, пальцы – гэта сляды Багародзіцы, а пятка з'яўляецца следам чорта, які гнаўся за Багародзіцай, але не мог яе дагнаць, бо яна схавалася ў манастыры і стала праяўляць цуды. Да гэтага каменя сяляне ідуць на пакланенне, кладуць грошы, воск, лён і г. д., моляцца і шануюць след "багародзіцы", а на след "чорта" плююць, прычым здараюцца памылкі – след "чорта" цалуюць, а на след "багародзіцы" плююць» [25, с. 57].

Сустракаецца і такое сведчанне: «У нас е шмат прошчаў з такімі каменнямі, на якіх аддыхаў сам Бог ці Божая Матка з Сусам Хрыстом. На тых камянёх толькі застаўся слядок ад нагі Божае Маткі ці Суса Хрыста. Людзі ходзяць здалёку да тых прошчаў і там моляцца Богу, то Бог ім памагае ці здымае хваробу або якую іншую плягу» [30, с. 106].

Кажуць, што даводзілася чуць ва ўрочышчы Грынбут (на Вілейшчыне) нейкі піск, віск, лямант. Гэта не хто іншы, як нячысцікі, весяліліся. М. Мялешка адносна гэтага згадвае наступнае: «Паводле адной пагудкі камяні з'явіліся на зямлі дзеля гэткай прычыны: нячыстая сіла ў небе спрацівілася Богу, захацеўшы стаць сама роўнай Богу. Угнявіўшыся гэтым, Бог паскідаў нячысцікаў на зямлю і абярнуў іх у камяні. І вось цяпер, дзе вялікі камень – гэта быў большы чорт, меншыя ж камяні ўяўляюць сабою малых чарцянят. Дзеля таго ж каб абернутыя ў камяні чэрці не раслі і не множыліся, Бог, скідаючы іх на зямлю, пракляў» [25, с. 58].

Найбольш пашыраны варыянт зноў жа мае біблейска-рэлігійны сюжэт: нібыта нячысцік нёс здаравенны камень, каб ім заваліць дзверы царквы, але не паспеў данесці, бо прагучаў трэці крык пеўня. Чорт скамянеў на месцы, зліўшыся разам з камлыгай і адначасова даўшы ўсяму гэтаму такую ж назву. «Вядома і яшчэ адна легенда пра паходжанне назвы каменя. Варагавалі паміж сабой два чортавы кланы. Адно сямейства нячысцікаў утульна ўладкавалася ў месным балоце Чартовіца, другое ж імкнулася выжыць адтуль сапернікаў, ды толькі нічога з гэтага не атрымоўвалася. Тады варожы клан вырашыў цёмнай ноччу закідаць балота камянямі, зрабіць своеасаблівую меліярацыю. Адзін з чарцей выбраў самую цяжкую глыбу і з цяжкасцю панёс яе. Стала віднець. Прачнуліся і загарлапанілі пеўні. Нічога не заставалася, як пакінуць камень у тым балоце, дзе ляжыць да сённяшняга дня, на краі былога балота. Як кажуць, "меў чорт урадзіцца, ды певень запеў"» [Тамсама, с. 59].



*Вялікі камень ля в. Горкі Шумілінскага р-на*

Нярэдка камяні згадвалі і ў сувязі з адшуканнем ці захаваннем рэальных або фантастычных скарбаў. Камлыга магла ўяўляцца напамінам залатога веку, калі «срэбра-золата проста вось так валялася на зямлі». «Даўным-даўно гэта было. Калі сонца яшчэ свяціла ярка круглы год і камяні былі гарачыя і мяккія, як свежаспечаны каравай. Бегаў тады залаты алень шчасця – і дзе заставаўся след ад яго капыта, там астывала зямля, і ўсё, што на ёй знаходзілася, набывала цудоўную сілу»; «У Беларуцкай вол. на Меншчыне, недалёка ад вёскі Маганы, каля гарадзішча, знаходзіцца камень, з высечанай на ім падковай. Пераказваюць, што тут былі захаваны каштоўныя рэчы, у знак чаго і палажаны гэты камень з паметаю. Такі ж самы камень ляжаў і ля Сёмкава-Гарадка» [25, с. 60].

Розныя варыянты гэтага падання існуюць у беларускай вусна-паэтычнай творчасці ажно да нашага часу: дайшлі, нягледзячы на тое, што царкоўнікі старанна імкнуліся сцерці ў свядомасці простага люду веру ў цудадзейныя магчымасці камянёў. На першае месца выступала тут не што іншае, як суровае пакаранне, якое павінна было служыць павучальным прыкладам для іншых («Каменныя валы»). «Калісьці, на Вялікдзень, чалавек паехаў разважаючы: "Пабачым, ці многа я наару за вялікі дзень?" Жонцы загадаў прынесці абедаць. Яна прынесла абед у двух гаршках. Чалавек паабедаў, аддаў жонцы начынне і сказаў ёй ісці дамоў, не азіраючыся назад. Жонка пайшла, але цікавасць прымусіла яе азірнуцца назад, і яна ўбачыла, што валы скамянелі, чалавек яе скамянеў, сама яна скамянела, скамянелі і тыя гаршкі, якія жанчына несла.

Каменныя валы ўваходзяць у зямлю ўсё глыбей, а як схаваюцца ў ёй зусім, дык будзе канец свету. Калі каменем біць аб валы, дык з іх цячэ кроў...

Старыя людзі запэўніваюць яшчэ, што каля каменных валоў быў яшчэ трэці камень (скамянелы чалавек), які ляжаў спераду каменных валоў, і што... каля дарогі ў кірунку да хутара Нагорныя быў даўней камень, падобны да чалавека, а каля яго – два меншыя каменьчыкі (скамянеўшая жанчына і два гаршкі)... цяпер ёсць толькі два камяні – Каменныя валы і Каменнае ярмо.

Мясцовасць, на якой ляжаць каменні, мае назву Каменныя валы» [20, с. 355–356].

У некаторых творах, наадварот, падкрэсліваецца той факт, што «даўней людзі былі цёмныя, многага не разумелі з новых тлумачэнняў і за гэта ім даводзілася за многае адплочваць...» Нават па-свойму абыгрывалася значэнне слова «Вялікдзень», здавалася б, ужо агульназразумелага

сімвала новай веры. Тым не меней... «Каменныя валы»: «Калісь людзі былі цёмныя. Чалавек гаворыць на жонку:

– Я паеду араць, бо гавораць, што сягоння вялікі дзень.

Ён думаў, што вялікдзень – гэта вялікі дзень, і ён удвая зробіць.

Паехаў араць. Прыйшло ўрэмя абедаць. Жонка панесла яму абед. Ён сеў на камень, паеў. Калі жонка йшла дамоў, ён сказаў ёй:

– Ідзі ды не аглядайся.

Жонка адышла гець з кіламетр, аглянулася і акамянела. Акамянелі валы, чалавек і сабачка. Людзі сабраліся, паставілі хрэст. Хрэст быў з такога дрэва, што і гніль яго не браў. Палякі ўжо потым спалілі. Мы былі хлопчыкамі, бывала, пасядзем на валы і б'ем каменем, і сыплецца краска (з крыжа). Разатрэш на руцэ – чыстая кроў. З-пад каменных валоў выскаквае сабачка шэранькая і гоніць нашых авечак аж да Бібікаў. Пойдзем шукаць – авечкі стаяць у кучцы, а сабачкі ніякай няма. Гэтыя валы і цяпер ёсць, але яны ўвайшлі па клубы ў зямлю» [Тамсама, с. 356].

Маглі ўпамінацца і іншыя рэлігійныя святы, у якія ўзяўся было працаваць селянін, які не слухаўся ўсемагчымых папярэджванняў, «правіў і хацеў даказаць толькі сваё». «Пра камяні, падобныя на чалавека і валоў»: «У Вілейскім павеце, у лесе маёнтка Клесін памешчыка Каверскага, ляжаць тры камяні, два з якіх падобныя на валоў, а адзін на чалавека. Народ кажа, што гэта – араты з двума валамі, ператвораны ў камяні за тое, што чалавек араў зямлю на Барыса і Глеба» [Тамсама, с. 357].

У адным з раёнаў Беларусі ёсць цэлы «скульптурны музей» валуноў. У іх, згодна з легендай, быў ператвораны селянін разам з быкамі за тое, што ён уздумаў араць у дзень рэлігійнага свята. Да гэтага часу захаваўся нават камень, які нагадвае нешта накшталт язычніцкага капішча. Людзі гавораць, што ў гэтага каменя нашы далёкія продкі прасілі ў сухое надвор'е паслаць на зямлю дождж, таму і называецца ён «дажджбогавым».

Мясцовыя жыхары ў Чачэрскім раёне Гомельскай вобласці часта згадвалі валун, які быў абсечаны з двух бакоў, і валодаў ён вялікімі цудадзейнымі магчымасцямі і ўласцівасцямі: самастойна мог перамяшчацца на значную адлегласць, асабліва тады, калі яму прыносілі шчодрае паднашэнне. Тады, гаварылі вяскоўцы, ён напоіць чалавека, накорміць, апране яго, дапаможа ў цяжкім становішчы.

А вось што наконт усяго гэтага адзначаў М. Мялешка: «Паданні аб акамянеласці чалавека і скаціны спатыкаюцца даволі часта і маюць шмат варыянтаў. Камень каля м-ка Куранец б. Вілейскага павета Віленскай губ. узнік з гэткага здарэння. У гэтым месцы некалі жыў шавец Гомсін, які не верыў у бога. Адзін раз, на Вялікдзень, усе пайшлі ў царкву ма-

ліцца, а Гомсін узяўся шыць боты. Зараз жа ўзнялася хмара, загрымеў гром. Ударыла маланка, якая забіла шаўца і спаліла хату. На месцы, дзе жыў шавец, людзі ўбачылі гэты камень. Калі ў Вялікдзень нахіліцца да каменя, то чуваць, як пяе певень і майструе шавец.

У двары Клесін Вілейскага павета Віленскай губ. ляжыць камень, які стаўся з чалавека і пары валоў дзеля таго, што чалавек выйшаў на святога Барыса араць. Каля Нясвіжа, непадалёку ад ф. Лазовічы, ляжаць тры камені. Адзін тырчыць з зямлі і хаця слаба, але напамінае фігуру чалавека, а два ляжаць непадалёку ад першага. Апавяданне кажа наступнае: жыў князь, які не баяўся Бога, мучыў людзей і прымушаў хадзіць на працу ў вялікія святы. Адзін раз загадаў князь людзям на Вялікдзень ісці на працу, а хто не паслухае, таму пагражаў выразаць на плячах тры паласы скуры. Пайшлі людзі на поле, запраглі валоў, але араць не пачынаюць. Б'е войт батагом непаслухмяных, а людзі ўсё роўна не бяруцца за працу. Прыехаў на поле сам князь. Войт перад князем узяў саху сам і пачаў араць. Але не прайшоў ён і да палавіны баразны, як ударыў гром з неба, і войт з валамі акамянелі [25, с. 61].

Гавораць, што існуе легенда (варыянт легенды), паводле якой на месцы старажытнага язычніцкага капішча з зямлі не проста вытыркнуўся камень, а вылез велізарны каменны крыж. І здарылася гэта ад таго, што мясцовае насельніцтва па-ранейшаму працягвала пакланяцца сваім старадаўнім багам, учыняць свае абрады і святкаванні. Якія намаганні толькі не прадпрымалі мясцовыя бацюшкі, а ўсё заставалася даўнейшым. Звярнуліся тады яны, хоць гэтага і нельга было рабіць, але ж нейкае выйсце шукаць выпадала, да моцных знахараў, каб яны пасобілі ў амаль што безвыходнай справе. Тыя, у сваю чаргу, не адмовілі, паслухаліся і падрабілі так, што сімвал новай веры – крыж сам па сабе «вырас» з зямлі прама на капішчы. Тады атрымалася, што намоленае язычнікамі месца было апаганена, і яны вымушаны былі спраўляць свае службы ў іншым, больш глухім і недаступным куточку роднай зямлі.

Сустракаецца і крыху іншы фальклорны варыянт гэтага падання, але, зноў-такі, з дакладным вызначэннем мясцовасці і з суровым пакараннем за парушэнне рэлігійнага канона. «Тры камяні»: «Недалёка ад Нясвіжа (вёрст дзесяць-дванаццаць), непадалёку ад фальварка Лазовічы князя Радзівіла, ёсць тры камяні даволі вялікія. Адзін з іх тырчыць з зямлі, нагадвае, хоць і слаба, чалавека, а два ляжаць побач. Пра гэтыя камяні сяляне расказваюць. Жыў у Нясвіжы люты князь, які Бога не баяўся, вельмі народ мучыў. Мала таго, што людзі ў будні з сілы выбіваліся, адбываліся паншчыну, ён пачаў патрабаваць, каб яны і ў гадавыя святы на прыгон хадзілі. Вось надышоў Вялікдзень. Снег сышоў,

поле можна араць. І загадвае войт прыгон, а калі хто не прыйдзе па загаду, гразіць выразаць таму тры палосы са спіны. Так злосны пан загадаў. Плачуць людзі. Выйсці на ворыва – выйшлі, але за працу ніхто не бярэцца. А войт пахаджвае ды бізуном лупіць непаслухмяных.

Прыехаў сам князь. Тут войт яшчэ больш лютаваць пачаў, пану дагадзіць хоча. Вось і кажуць людзі войту.

– Калі ты такі разумны, паспрабуй сам узараць.

Войт захацеў паказаць сябе перад князем, схапіў саху за рагач і пагнаў баразну. Але не дайшоў і да паловы баразны, як ударыў гром нябесны – і войт зваламі акамянеў. Так і стаяць яны да страшнага суда» [20, с. 356–357].

Гэтаксама за працу на Вялікдзень акамянеў чалавек з валамі на Барысаўшчыне, каля в. Пустой. У г. Вільні, у Ваколіцы Сніпішкі, на правым баку Вількомірскай дарогі, на полі ляжыць некалькі камянёў, аб якіх у народзе захавалася паданне, што камянямі гэтымі з'яўляюцца маладыя і іх госці, якія бессаромна, не па-людску праўлялі вяселле. За гэта бог іх усіх абярнуў у камяні. Падобнае да гэтага існуе паданне аб камянях у м-ку Дзерачын Гарадзенскай губ. Тут знаходзіліся шэсць камянёў у адным месцы і адзін крыху воддаль. На камянях можна было разабраць рысы чалавечага аблічча, на адным нібы адзенне, як у маладой да шлюбу. У народзе трымаецца легенда, што гэта вяселле, абернутае чараўніком у камяні за тое, што, сустрэўшыся з ім, зняважылі яго, не аддаўшы належнага прывітання. Сёмы камень, воддаль, гэта быццам музыка, які ехаў за вяселлем» [25, с. 62].

Як бачым, народныя дарадцы імкнуліся перадаваць у сваіх творах любое парушэнне трывалай (кананічнай) традыцыі. Паводле іхніх разважанняў, у такім плане нічога не выпадала змяняць, бо за такія парушэнні ў народнай традыцыі «прадугледжваліся» абавязковыя пакаранні.

ТРАДЫЦЫЙНЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

# КАМЯНІ І ПРАЯВЫ ЧОРНАЙ СІЛЫ

Існуе і больш разгорнуты вусна-паэтычны варыянт пра гэтае чараўнічае пераўтварэнне вяселля ў маўклівыя камяні. Праўда, тут пакаральнай сілай выступіў не Бог і не святыя, а моцны мясцовы варажбіт, які не пашкадаваў людзей, за не такую ўжо і вялікую правіну перад ім. «Пра камяні ля мястэчка Дзярэчын»: «Каля ўсходняй дарогі, якая вядзе ў мястэчка Дзярэчын, за адну вярсту ад яго яшчэ і зараз можна бачыць сем камянёў, з якіх шэсць знаходзяцца разам, а сёмы – на пяць сажняў далей ад іх. Пра нечаканае з'яўленне гэтых камянёў расказваюць так. З местачковай царквы вярталася раз вяселле, і на гэтым месцы сустрэла яно лютага чарадзея, які, не дачакаўшыся звычайнага ветлівага вітання, пракляў вясельнікаў. Коні і калёсы праваліліся скрозь зямлю, а людзі абярнуліся ў камні. Яшчэ ў нядаўні час на гэтых камянях можна было бачыць ясныя абрысы людзей; на нявесце ж падвянечны ўбор.

А той камень, што асобна стаіць, ёсць няшчасны музыка, які звычайна едзе трохі здаля вяселля» [20, с. 358].

Сцвярджаюць, што вялізныя камяні маглі запроста з'явіцца на месцы раней заклятых (праклятых, заварожаных) мясцін. Калі гэта рака ці возера, то вада ў іх раней святая, гаючая, магла знікнуць з-за нейкага дурнога вучынка. «Камень на месцы заклятага возера, якое праваліласяся»: «Паблізу паштовага шляху з Падароску ў горад Ваўкавыск, на поўнач ад вёскі Галынкі, з правага боку, ляжыць вялікі камень, пад якім схавана зачараванае возера. Вельмі даўно праязджала тут нейкая знатная паненка з любімым сабачкам. Паненка захацела выкупаць сабачку і кінула яго ў ваду. Ці зачапіўся сабачка ў траве, ці яго праглынула рыба, але толькі сабачка загінула ў возеры. Раззлаваная паненка пракляла возера, і яно пайшло ў зямлю, пакінуўшы на паверхні адзін толькі камень» [Тамсама, с. 359].

Зрэдчас гаворыцца пра тое, што пакараны быў не адзін, канкрэтна абасоблены чалавек, а ўвогуле боскі храм, з усімі людзьмі, якія там маліліся. Сітуацыя даволі выключная нават для фальклорных твораў, бо лічылася, што Усявышні, Матка Боская, святыя заўсёды з'яўляліся моцнай засцярогай і абаронай перад уздзеяннем любой чароўнай сілы, не давалі ёй, ні ў якім разе, праяўляць сваю моц. «Камень ля маёнтка Старадворац»: «За тры вярсты ад маёнтка Старадворац, на ўсходнім баку, і зараз можна бачыць вялікі камень белаватага колеру, які нагадвае здалёку касцёл. І сапраўды, на гэтым месцы, кажуць, некалі стаяў касцёл; але за грахі людзей ён пайшоў у зямлю з усімі, што маліліся там. З таго часу невялікая лажбінка на камені пачала папаўняцца цудадзейнай вадой, якая вылечвала вочы, пакуль нейкі дурны пан не надумаўся памазаць гэтай вадой вочы свайму сабачку. Тады вада пачала памалу губляць сваю цудадзейную сілу, пакуль, нарэшце, зусім знікла» [Тамсама, с. 358].

Гавораць таксама, што ў камяні маглі абарочвацца людзі (асабліва дзяўчаты ці жанчыны ў крытычныя жыццёвыя сітуацыі, калі не было іншага выйсця), і з таго самага часу яны, валуны гэтыя, служылі сялянам своеасаблівым напамінам пра людскую чэснасць і непадкупнасць. Да такіх валуноў прыходзілі і прыносілі свае ахвяраванні тады, калі жадалі ўзмацніць сваю волю, сілу духа. «Пястун-камень»: «Каля курганаў, сажняў пяць ад дарогі, ляжыць дзікі камень, плоскі, даўжынёю аршыны з паўтара... Сяляне называюць яго пестуном. З даўніх часоў кладуць яны на яго грошы, палатно, паясы, прыносячы свае ахвяры часам здалёк, вёрст за пяцьдзесят і болей...

Пра гэты камень расказваюць: была вайна, праходзіла войска і гналася за краснай чэснай дзяўчынай. Уцякаючы ад войска, тая сказала:

– Лепш бы я каменем па зямлі качалася, чым ім на пацеху досталася.

І гэта сказаўшы, дзяўчына тая ў етат пястун-камень абярнулася» [Тамсама, с. 359–360].

Часта пераконвалі, што славутыя тураўскія камяні і крыжы былі здольныя да рознага цудадзеяння, асабліва ў купальскую ноч. Пра гэта ведала мясцовая моладзь і старалася прасіць пра нешта найбольш патаемнае. Але гэта здаралася ўсяго толькі адзін раз у год.

# АДВЕЧНЫЯ ПОМНІКІ ВЕРНАМУ КАХАННЮ

Камяні – помнікі каханню – маглі быць і рукатворнымі, узведзенымі з цэглы ці з меншых валуноў, у гонар чыстага чалавечага пачуцця. «Помнік вернаму каханню»: «Было гэта вельмі, вельмі даўно ў маёнтку Алешавічы. Суровы і хцівы пан быў у тыя часы. Многа слуг было ў гэтага пана. Жорстка распраўляўся пан са слугамі за кожную дробязь. Не любіў ён простага люду. Асабліва маладога дворніка Янкі. Сільны быў Янка, прыгожы, не адна дзяўчына ў наваколлі паглядала на яго.

Аднойчы Янка, як заўсёды, падмятаў двор. У той час па падворку праходзіла маладая паненка – дачка старога пана. Яна ўбачыла Янку і пакахала яго. Часта яны сустракаліся, каб ніхто не ведаў. Частыя сустрэчы прывялі да таго, што паненка павінна была радзіць. І яны вырашылі пажаніцца. Аб гэтым дазнаўся стары пан. Каб не зганьбіць свайго роду, ён вырашыў пакараць дачку і парабка самым суровым законам. Хлопца прыказаў забіць. А на дачку сваю прыказаў выкапаць яму і на вачах людзей жывую закапаў.



*Камень кахання ля в. Валоўшчына Мінскага р-на*

Прайшоў час. Жалка было пану дачкі, і ён паставіў на тым месцы высокі помнік з цэглы.

Ён і цяпер стаіць, разбураны крыху, ля вёскі Ятвеск, як памяць аб верным каханні» [20, с. 362].

Паасобныя паданні нагадваюць сабою высокамастацкія творы, у якіх перапляліся многія сюжэты: каханне і здрада, каштоўнасці і іхняе адшуканне (ці, наадварот, стараннае ўхаванне на доўгія стагоддзі, з пэўнымі ўмовамі, страшнымі заклёнамі-праклёнамі), бязлітасныя бойкі паміж разбойнікамі за валоданне пэўнай мясцовасцю ці за падзел здабычы або за безагаворачнае валадаранне ў рабаўнічай бандзе. Можам прыгадаць у якасці прыклада «Прыгожую Кінгі»: «Пры панаванні даўніх каралёў у аколіцы Нарвы, дзе цяпер квітнеюць палі і сады, былі магутныя лясы. Высокія, магутныя дрэвы гаманілі з нябёсамі, з сонцам, з месяцам. У такім лесе днём і ноччу было цёмна. Светлыя праменні сонца не маглі дастацца цераз сплёт галінак да лясных маленькіх раслінак. У лесе вадзілася многа розных звяроў і птушак. Мядзведзі, львы, тыгры, ваўкі вылі, птушкі крычалі. Усё гэта злівалася ў адзін магутны голас, ад якога цэлы лес дрыжаў, дрэвы хісталіся.

Праз лес працякала вялікая бурлівая рака Нараў. Яна цякла хутка, рвала берагі. Старыя дубы, таполі валіліся ў раку і разам з ёю плылі далёка-далёка. Ніхто і нішто не магло затрымаць шпаркага бегу ракі.

У тым месцы, дзе рака ўпадала ў другую раку, лес быў радзей, а за лесам цягнуліся зялёныя сады, палі і агароды, пасярод якіх, на беразе Нарвы, стаяў прыгожы палац каралевы Кінгі.

У садах спявалі птушкі. Каралева Кінгі цэлымі днямі бывала ў садзе, у лесе, збірала грыбы і ягады.

Вельмі рана, калі сонейка яшчэ не ўзышло, калі раса пакрывала раслінкі, выйдзе каралева Кінгі з кошыкам у руцэ ў лес. Распусціць свае доўгія прыгожыя косы, сядзе на пянёк і прыслухоўваецца да спеву птушак. Яна не толькі любіла слухаць спевы птушак, але саміх птушак вельмі любіла. Прыносіла ім яду: пшаніцу, авёс. І птушкі таксама любілі сваю каралеву, ляталі ўслед за каралевай: сядзе яна пад яблыняй – і яны тут, сядзе яна на лавачцы – і яны тут.

І ўсё пяюць і пяюць... А спеў іх нёсся далёка-далёка. Пачуюць яго сяляне, якія працуюць далёка ад палаца, стануць, здымуць шапкі ды прыслухоўваюцца да той чароўнай музыкі. І так лёгка робіцца на душы...

Аднаго разу, калі каралева выйшла ў сад, затраслася зямля. Затраслася раз, другі, трэці. Кругом пацямнела, і палац праваліўся пад зямлю.

З таго часу там, дзе стаяў палац, засталася невялічкая гара (якая захавалася і да гэтага часу). Каралева Кінгі не забывала сваіх дарагіх птушак, не забывала і прыроду. У поўнач яна выходзіла з зямлі, распальвала агонь і сядала на камень. Праязджаючы, людзі бачылі, як свяціўся аганёк на гары, але баяліся туды ісці. А каралева Кінгі кожную ноч выходзіла на гару. Яна чакала, каб які чалавек прыйшоў да яе і нарваў ёй букет кветак.

Аднойчы каля гэтай горкі на кані праязджаў стары разбойнік са сваёю здабычаю. Раптам забачыў ён агеньчык на гары. Ён падумаў, што гэта кусочак золата так свеціць, і пайшоў на гару. На самым версе гары, на камені, сядзела красуня-дзяўчына. Гэта і была каралева Кінгі. Яе прыгожыя льняныя валасы даставалі да самай зямлі, чорныя вочы свяціліся, як дзве зорачкі, а чырвоныя шчокі яе палалі проста агнём. Перад ёю стаяў адкрыты сундук, поўны золата. Брала яна гэтае золата ў жменю, падносіла руку ўверх і сыпала зноў у сундук. А здалёк здавалася, што гэта гарыць агонь. Стары разбойнік падышоў бліжэй да каралевы, але не мог вымавіць і слова. Кінгі павярнулася да яго і ласкава сказала:

– Ідзі, добры чалавеча, нарві кветак і прынясі іх мне, а я табе аддам усё золата.

У той момант стары разбойнік, як дзікі звер, кінуўся з нажом на каралеву. Але што за дзіва? На гэтым месцы, дзе сядзела Кінгі, нічога не было.

Разбойнік махнуў нажом у паветры. О, дзіва! На месцы, дзе стаяў стары разбойнік, ляжаў вялікі камень.

Са старога разбойніка зрабіўся камень, які і зараз ляжыць на гэтай гары» [Тамсама, с. 362–363].

Як бачым, тут у камлыгу пераўтварыўся стары рабаўнік-разбойнік, які многа крыві людской пусціў па белым свеце, не адно жыццё заўчасна перарваў, не шкадуючы пры гэтым ні старых, ні малых, ні багатых, ні бедных. Таму, паводле народнага разумення, і чакала яго такая далейшая доля, бо ранейшыя грахі не далі магчымасці зямлі-маці ўвабраць яго ў сябе. Яна яго «выплюнула». І зрабіла гэта з вялікай агідай да забойцы-душагуба.

З каханнем у жыцці людзей многае звязана. І, аказваецца, што гэта далёка не заўсёды само каханне, прыязнасць хлапца да дзяўчыны і наадварот. Існуюць камяні, якія сведчаць пра тое, што ў гэтым месцы некалі сустракаліся, бавілі свой час разам вядомыя асобы, даючы клятву адно аднаму, што будуць вернымі сваім пачуццям да апошняга ўздыху. «На ўскрайку Гайка пры дарозе мы (К. Цвірка і ягоныя сябры-спадарожнікі. – *А. Н., Я. Н.*) убачылі вялікі камень-валун з надпісам, што гэта – помнік прыроды. Для Марылі ж ён быў незабыўнай памяткай пра сустрэчы з каханым паэтам. Пасля таго як яе назаўсёды разлучылі з Адамам Міцкевічам, выгнаўшы яго за філамацкую дзейнасць з роднай зямлі, яна ўласнай рукой выдзеўбала на камені крыж. Крыж па сваім рамантычным каханні да вялікага паэта. Ён і цяпер значыцца на камені» [37, с. 41].

Высокая адухоўленасць маладых людзей, іхняя рамантычныя ўзаемаадносіны нібыта накладвалі незвычайны адбітак і на значэнне каменя-сімвала ў духоўнай культуры беларускага народа.

# КАМЯНІ І СВЕТАБУДОВА

Некаторыя камяні ў паданнях пра сябе даносяць нават адгалоскі часоў стварэння Светабудовы. Гаворыцца ў іх пра незвычайна цёплае надвор'е, цудадзейных звяроў і жывёлін, іхнія небывалыя магчымасці. «Камень каля Радашковічаў»: «Даўным-даўно гэта было. Калі сонца яшчэ свяціла ярка круглы год і камяні былі гарачыя і мяккія, як свежаспечаны каравай. Бегаў тады залаты алень шчасця – і дзе заставаўся след ад яго капытка, там астывала зямля і ўсё, што на ёй знаходзілася, набывала цудоўную сілу... Такую казку аб валуне, што ляжыць недалёка ад Радашковічаў, здаўна расказвалі вяскоўцы дзецям. Быў ці не быў ён чароўным – гэтага, вядома, ніхто не ведаў. Але хітрая выемка на ім і сапраўды нагадвае след аленя» [20, с. 360].

Мы ўжо згадвалі, што камень з'яўляўся адным з «асноўных падмуркаў пры стварэнні Сусвету». Як адзначаў Я. Карскі: «У многіх беларускіх, як і ўвогуле рускіх замовах, згадваецца камень Алатыр, напрыклад: "На полі на кіяні, на моры на сіяні ляжыць камень-латыр, на камені

на латырі сядзіць сівенькій старенькій дзядзька, ламаець трусок калінувый, пускаець пушок малінувый" і г. д.; "на моры на кіяні, на востраві на Буяні ляжыць белый камень..."». Далей даследчык паглыбляецца якраз-такі ў разважанні аб перыядзе стварэння Сусвету: «Дастаткова было папрацаваць над імі (народнымі легендамі. – *А. Н., Я. Н.*) народнай фантазіі, каб знайсці ў іх сімвалічны цэнтр: алтарны камень, алтар, на якім упершыню была прынесена бяскроўная ахвяра, усталявана вышэйшае таінства хрысціянства. У рускай народнай паэзіі гэты алтар стаў камянём алатыром (замест алатарь), латыром. Таму і ў духоўным вершы аб Галубінай кнізе спяваецца:

На белом Латыре на камени
Беседовал да апочив держал
Сам Исус Христос царь небесный
С двунадесяти со апостолам,
С двунадесяти со учителям;
Утвердил он веру на камени,
Распустил он книги по всей земли [25, с. 63].

У беларускай рэдакцыі верша гаворыцца: «Патаму лацір-камень усім камяням маці, што з яго ў Русалімі-градзі храм явіўся...» У іншых рэдакцыях беларускага верша аб Галубінай кнізе ёсць даныя для параўнання алатыра з бурштынам». Я. Карскі працягвае: «Гэтыя абставіны паслужылі асновай для А. М. Весялоўскага супастаўляць алатыр з altare – алтар, камянём-трапезай, звязаным з вядомым евангельскім апавяданнем аб Тайнай вячэры. Аднак у некаторых беларускіх варыянтах гэтага месца маецца асаблівы адбітак, які дае падставы тлумачыць яго інакш. Менавіта:

Патаму Латыр-камень усім камяням маці:
Ляжыць ён сірыдзі мора,
Сірыдзі мора сірыдзі сінява,
Ідуць па моры многа карабельшчыкаў,
Ля таго камня астанаўліваюцца,
Яны бяруць многа з яго снадаб'я,
Пасыпаюць па ўсяму свету беламу.

Як адзначаў у свой час М. Надзеждзін, а з ім пагаджаўся У. Мачульскі, тут латыр ляжыць на Балтыйскім моры, беразе, які вядомы здабычай бурштыну. Апошні і маецца на ўвазе тут пад снадаб'ем – лекамі, якія ўжо старажытныя народы ўжывалі не толькі для ўпрыгожванняў, але і як лекі-амулеты» [Тамсама, с. 62].

У казачным эпасе нечаканае з'яўленне каменя на шляху героя, які выпрабоўвае ўласны лёс, амаль заўсёды азначае тое, што яму давядзецца

пабываць у царстве смерці, судакранацца з ёю. Так, у рускіх былінах гэта славуты герой-асілак усходнеславянскага эпасу Ілля Мурамец, на раздарожжы асілак сустракае незвычайны камень, які па-рознаму прадказвае герою будучы лёс:

Едет добрый молодец да во чисто поли,
И увидел добрый молодец ды латырь камешок,
И от камешка лежит три росстани,
И на камешку было подписано:
«Во перву дороженьку ехати – убиту быть,
В другую дороженьку ехати – женату быть,
Третью дороженьку ехати – богату быть» [5, с. 263].

Пры гэтым камень выступае ў ролі ўмоўнай мяжы, за якою герой павінен набыць адзін з прадказаных лёсаў. Толькі як пазней праясняецца – усе тры дарогі вядуць да немінучай смерці. На першай дарозе асілка чакаюць разбойнікі; на другой – сустрэча з каралёўнай-хлусліўкай, якая ўсіх праезджых малойцаў засаджвае ў "пограб на сорак сажняў глыбінёю", пры гэтым апісанне дэталяў пограба не пакідае сумненняў, што ён уяўляе сабою магільную прастору. З гэтымі перашкодамі дзвюх дарог пад сілу справіцца такому герою, як Ілля Мурамец. Накіроўваючыся па трэцяй дарозе, ён знаходзіць скарб, за кошт якога будуе царкву, і пасля гэтага ўсё ж... памірае.



*Вялікі камень (даўжыня 6,9 м) ля в. Кудаева Аршанскага р-на*

У казачных і былінных тэкстах пад камянем знаходзяцца чароўныя рэчы і прадметы, неабходныя асілку ў небяспечным падарожжы:

Отправлялся Илей к стольному городу Киеву.
Пришел к тому каменю неподвижному,
На каменю была подпись подписана:
«Илей, Илей, камень сопри с места неподвижного,
Там есть конь богатырский тебе,
Со всеми-то доспехами богатырскими,
Там есть то шуба соболиная,
Там есть-то плеточка шелковая,
Там есть то палица булатная» [5, с. 267].

У народных казках гэтыя чароўныя прадметы, у тым ліку і незвычайны конь, як водзіцца, аказваюцца «дзядулінымі», гэта значыць «спадчыннай, перададзенай ад продка да героя».

# КАЗАЧНЫЯ РЫСЫ ВАЛУНОЎ

У казках камень выступае ў якасці магічнага прадмета, які дае герою багатырскую сілу ці паглыбленыя незвычайныя веды. Агульнавядома, што ў сібірскай казцы «Пра трох асілкаў – Вячэрніку, Паўночніку і Светлавіку» героі сустракаюць чарадзейнага саперніка, які ім прапаноўвае: "...тут выдаўся са скалаў белы камень гаручы, лізні яго, і сіла ўдвая прыбудзе". У самарскай казцы герой Сценька забівае цуду-юду Ваўкадзіра і ліжа камень, знойдзены ў ягоным страўніку. Гэта адразу дае Сценьцы веды пра ўсё, што існуе на белым свеце.

Каб пазбавіць казачнага ці былiннага героя здольнасці рухацца і магчымасці актыўна дзейнічаць, яго сапернік (вораг, непрыяцель), надзелены магутнай магічнай сілай на нейкі час, а то і назаўсёды ператварае яго ў камень. Часовае скамяненне – адзін з галоўных матываў рускай быліны пра асілка Міхайлу Патыку. Ён адразу камянее тады, калі ягоная жонка Мар'я Белая Лябёдка, якая валодала чараўнічай сілай, даторкваецца да яго камянём з чыстага поля:

...Отвозила его да во чисто поле,
Хватала тут да бел горюч камень,
Колотила его да по правой щеки:
Окаменей ты, Михайла, ровно на три годышка,
Как три года пройдет, пройди да сквозь землю!
Поворотила его большим камнем [5, с. 266].

Калі чароўныя памочнікі пераўтвараюць асілка з каменя, ён, як і пасечаны на кавалкі, а потым ажыўлены мёртвай і жывой вадой гаворыць: «Як доўга я спаў».

Як бачым, у касмаганічных уяўленнях камень успрымаўся як апора, «аснова асноў», зямны пуп («пуп зямлі»), мяжа паміж тым і гэтым светам. У гэтай сувязі невыпадкова, што першавобраз каменя даволі часта сустракаецца ў міфапаэтычных тэкстах, дзе аказваецца і адным з істотных прасторавых арыенціраў і магічных прадметаў, якія звязаны са зменамі ў лёсе таго ці іншага персанажа, вобраза, міфічнага героя. Таму даволі часта з каменем звязаны яшчэ і матыў замоў: «Ці ляжыць белы камень Латыр у моры-акіяне, а вакол таго каменя ляжаць яшчэ трыдзевяць замкоў. Амінь». У некаторых выпадках, у сілу цвёрдасці, сам камень становіцца непарушным замоўным замком: «Маці Багародзіца Святая пячаць усіх наглых ворагаў і злыя ветры прылажыла залатым сваім пярсцёнкам-знакам. Ад гэтага часу і назаўсёды няхай так і будзе. Замок камень. Амінь. Амінь. Амінь».

Той самы алатыр-камень – падмурак Сусвету, Сусветнага дрэва – у народных замовах часта асацыяваўся з месцазнаходжаннем хваробы (адтуль яна вылазіць, туды вяртаецца, уцякае, там беззваротна гіне ў выніку праследавання яе магіяй слова, магічнымі рытуаламі, уздзеяннем добрых, спагадлівых варажбітоў). «...На сінім моры ляжыць камень – адзін метр шырыня, сорак сажняў глыбіня, на ім стаяў сам Гасподзь Бог, залатым кіём апёршы. Пад тым каменем ляжыць дзевяць камянёў. Стала каменя не ўзняць, ключэй з мора не дастаць і не адамкнуць, так і чарадзейцы, чарадзею ў мора вады не пажыраць, так у (імя) болі не бываць, выходзьце з (імя) голыя, босыя, касматыя, лахматыя, лесавыя, балотныя, ветраныя, дваровыя, палуношныя, заравыя». Або наступная замова: «На сінім моры ляжыць белы камень, на тым камені стаіць дуб на дванаццаць какатоў, на тых какатах сядзяць дванаццаць анёлаў, дзяржаць яны па дванаццаць прутоў сталявых, адсякаюць, адбіваюць ад рабы Божай усіх наглых ворагаў і злыя ветры-падвеі, буры злыя».

Часам камень, паводле народнага, проста здольны на ўсялякія цудоўныя пераўтварэнні і дзеянні. Але ён «паводзіць» сябе даволі дзіўна: не карае, не асуджае выпадковых начлежнікаў, а стараецца папярэдзіць

іх, прадухіліць куды большую бяду. Атрымліваецца, што камень, нібыта, валодаў нейкімі псіхалагічнымі якасцямі чалавечай душы. «Камень ля вёскі Імяніны»: «Крыху болей за вярсту ад вёскі Імяніны Кобрынскага павета, на высокай гары, пакрытай сасновым лесам, ляжыць вялікі камень, пра які расказваюць так: раз у дажджлівую пагоду начлежнік лёг ля каменя, каб ён быў пад галавой, падаслаўшы сваю торбу. Не паспеў ён заснуць, як пачуў грозны загад пайсці ад камня. Упарты начлежнік не паслухаўся грознага голасу і пасля трохразовага паўтарэння яго. Тады нябачнай сілай вырвала торбу з-пад начлежніка і аднесла яго самога крокаў на пяцьдзесят убок: начлежнік перамясціўся і лёг на новым месцы. Адсюль ён убачыў на камені то сіні, то чырвоны агонь; тое ж убачылі і іншыя начлежнікі, якія прыбылі сюды. Калі яны падыходзілі да каменя, агонь знікаў; але толькі яны адыходзілі ад яго, агонь ізноў з'яўляўся. На другі дзень начлежнікі знайшлі пры камені тры сярэбраныя манеты. Агонь з'яўляецца пры камені, кажуць, і зараз» [20, с. 358].

У якасці пакарання магла ўказвацца ўсеагульная правіннасць тутэйшых людзей, якія не адзін раз парушалі боскія запаветы, імкнуліся ўсё рабіць на свой лад, не прыслухоўваючыся да таго, як гэта рабілася ў іншых мясцінах. Ніхто пра пакаранне, тым болей пра такое суровае, нават і не задумваўся. «Камень ля вёскі Гарадзішча»: «Ля Гарадзішча, вот толькі не ведаю, з якога боку, камень ёсць вялікі, у зямлю ён моцна ўросшы. Зверху ён такі, нібы дах, на бакі спускаецца, і дзве дзіркі ў ім, як бы вокны ў хаце. У тыя дзіркі што ні кінь, ніколі не пачуеш, што аб дно ўдарылася, як бы ў прадонне якое ляціць. Адзін раз у тую дзірку ўвапхнулі сабачку невялікага, дык знік, не цяўкнуў, ні гуку, ні следу.

Людзі казалі, што некалі там горад вялікі быў, але за правіннасць людзей, ці як там было, пад зямлю пайшоў, толькі знак застаўся» [Тамсама, с. 357].

А. Сержпутоўскі запісаў іншы цікавы прыклад: «Лежыць на шляху вялізазны камень. Хто не йдзе та спыніцца ля яго, пасядзіць. Супачыне, а то й падсілкуецца трохі. Мо са ўсяе акругі зналі людзі той камень і шанавалі яго. Забудаваў сабе адзін чалавек млын, але німа дзе ўзяць каменёў. Паехаў ён у места да й купіў верхні камень, узваліў яго на воз, запрог пару валоў да й везе па шляху. Пад'еджвае ён к таму мейсцу, дзе ляжаў той камень, толькі ось прыгрэло сонейко, напалі на валоў авады, сьлепні да здракі да як пачалі іх рэзаць, дак на тых аж шкура лопаецца. Матаюць валы хвастамі да круцяць галовамі, аж кульбакі да занозы трашчаць. Лежыць на возе камень да думае: "От які я важны да патрэбны людзям, што мяне вязуць як пана. Вельмі я слаўны да высокі, не такі, як ось той, што валяецца ось на шляху. Набок з дарогі,

бо расцісну як порхаўку!" Тут валы як закруцілі, дак і зачапілі за камень: вось зламаласа, воз пахіліўся, горды камень шусь далоў да так рэзнуўся аб той камень, што аж печанцы ў яго трэснулі. Лежыць ён і не варухнецца да толькі злуе, што прышлосо легці разам з такім брыдкім каменям. Пабедаваў чалавек да й пацёгся з валамі да гасподы. Потым дагадаўса ён, што гэто так Бог даў, каб зьвернуць яго ўвагу на той камень. От пазваў ён майстра, агледзяў той да й выкаваў у млын сподні камень з таго вялізазнага каменя, што дарам валяўса на шляху. Прыўёз той чалавек абудва камені да млына да й палажыў іх як трэ ў под. Лежыць сподні камень да толькі радуецца, што хоць нарэшце дачакаўся таго, што мажэ паслужыць людзям, мажэ малоці ім муку, каб яны з яе пеклі сабе дар Божы. А верхні камень скрыгічэ зубамі ат злосці да лае сподняга таварыша: "Куды табе да мяне! Як захачу, дак я цебе задушу. Не ты, а я мелю муку да й мелю толькі тагды, як сам хачу. От пабачыш, як я замелю". Пры гэтым ён так закруціўса, так зашумеў, што аж распаўса на кускі. Пабедаваў мельнік да й выкінуў тыя кускі ў гразь, як нінавошто не патрэбные. Купіў чалавек новы верхні камень, доўго малоў, але й той змалоўса. А сподні камень папаўса такі добры, што меле мо й да тых час» [32, с. 72–73].

А. Сержпутоўскім занатавана і іншая казка, якае мае назву «Камене»: «Можэ бачылі часамі па дуброўцы паўз дарогу чэраду каменя. Бачылі, да, бадай, не чулі, скуль яны ўзяліся. Дак паслухайце старога. Ён вам скажэ не на кпінкі. Ён вам скажэ тое дзіво, што даўней было на сьвеці. Там растуць дубы ажно пад небо. Адны вырасьлі, згнілі ўсеродку, ці перун разбіў ім бокі, што зваліліся да долу. Замест тых растуць другіе. Таўшчыня бы печ, вышыня – злетае шапка. А ў землі лежаць калоды і з-пад берага крутого па рацэ на дне глубоко, пачарнеўшы бы вугольле, не гніюць з тых часаў даўніх. От дуб'е ў землі, пні дуб'я наверсе, а між іх лежыць ад веку чарада каменя, бы валоў на пашы. Хто ды скуль прыціс такую ценжар па беразе раскінуў бы картоплю ў вагародзе? Як вада цечэ ў рэццы праз лесы, балота, так прайшлі дзенькі да ночы, зімы і леты, так праходзяць век за векам і ніколі не вяртаюць. Як зьменяецца расліна, так зьменяюцца й людзі: родзяцца, жывуць, клапоцяць, потым паміраюць. Замест іх раджаюцца другіе. Пакрасуюцца на сьвеці, прагаруюць жыцьце да й праходзяць па калейцы, баццэ чаргу адбываюць. Так усе зьмяняецца ад веку. Толькі ціхенько ў дуброўцы чарада каменя сьпіць паміж дубамі да чакае цуду ці таго, як Бог пазволіць і ёй стаць на чэргу, атбываць калейку, баццэ ўсе на сьвеці. Дак якое ж то камене і за што яно ат веку не мяняецца як людзі? То не простае камене і ляжыць тут на пакуту, што зрабіло перад Богам грэх вялікі. Як цяпер, мо спраку веку тут жылі

якіясь людзі. Секлі лес, рабілі поле да лавілі ў рэццы рыбу, а праворныя мужчыны звера білі ў лесі. Як цяпер мо гаравалі, працавалі, даставалі, як умелі дробным дзеткам жыўнасьць. Раз прыйшоў туды дзядок старэнькі, занепаў ён у дарозі да й пачаў прасіцца нанач. Не пускаюць тые людзі. Дзед пакінуў вёску, сеў у лесі пад дубочкам да й чакае сьмерці. Толькі ось адна дзеўчына ціхенько прыносіць дзеду хлеба сьвежага паўбулкі да вады гаршчочак. Дзед падзякаваў дзеўчыне, хлебам ён падсілкаваўся да й запіў вадою. “Прашчавай, галубко! – дзед сказаў дзеўчыне. – Тут жывуць ліхіе людзі. Бог іх хутко пакарае, бо яны забылі Бога да й жывуць гарэй гаўяда. Дзе твой бацько?” – “Я не знаю бацька”, – дзеўка адмаўляе. “Старшы брат твой бацько, а сестра – браціха. Сьвет вялікі, ён без края. Усюды сьвеціць сонцо, а пад ім е людзі. Там цябе сустрэне шчасце, баццэ пчолку квешка. Уцекай хутчэй ты з вёскі, каб не стрэло ліхо. Уцекай, не азірайса”. Плачэ бедная дзеўчына, а дзядок бы дым расплыўса. Што рабіць, сама не знае, стала кала дуба, рукі белыя ламае. Як ёй кінуць родны вугал?! Там сестра да матка на вечэру мо чакаюць. Брат вернуўся з лесу, налавіўшы зьвера. Як пакінуць хатку, дзе яна аткрыла вочы! Добрэ йці ў чужые людзі, як у пары мілы, што ведзе за ручку, бы дзіцятко матка. Добрэ шчасьце за гарамі, як яго сустрэнеш, цяжко ж у дарозе дзеўцы без падмогі. Плачэ бедная дзеўчына, жаласно



*Валун Асілак (Вялікі камень) у Смаргонскім р-не*

галосіць, аж па лесі вецер яе голас носіць. Азірнулася на ўёску, не паслухалася старога, аж нема там хатак, дзе яны стаялі, толькі рад каменя, бы валы на пашы. Крыкнула дзеўчына да й закукавала. Што за дзіво? – замяст ручак – крыла. От з тых часоў мо праз векі рад лежыць каменя, а зеўзюленька над імі жаласна кукуе да радні шукае. Не паслухалася старога, азірнулася на ўёску дзеўка, дак заўзюлей стала да й праз цэло жыцце не стракае шчасця, бо не ўе сабе гнязьдзечка – мілае дамоўкі, толькі плача да кукуе на высокум дубе. А каменя чуюць, што зеўзюля плачэ, да сказаць не могуць, бо акаменелі» [Тамсама, с. 196–198].

Многія даследчыкі зафіксавалі вусна-паэтычныя творы, прысвечаныя камяням і іхнім цудадзейным асаблівасцям: здольнасці перасоўвацца з месца на месца, выступаць непераадольвальнай перашкодай на шляху у ворагаў, пераўтвараць у сябе жывёл, звяроў, нячысцікаў і людзей і многае іншае. Даволі часта гэта проста варыянты агульнавядомых сюжэтаў, якія пераказваліся амаль што ў кожным населеным пункце, асабліва калі там паблізу быў вялікі валун, звязаны ў народнай памяці з усемагчымымі (легендарнымі і рэальнымі, фантастычнымі і казачнымі) падзеямі. Ясная справа, што пераўвасабленне ці бітва камянямі маглі адбывацца толькі з удзелам магутных персанажаў (калі людзей, то асілкаў, калі дэманалагічных персанажаў, то нячысцікаў-чарцей). Менавіта яны і біліся-перакідваліся шматтоннымі камлыгамі, і пасля такіх бітваў назаўсёды засталіся на беларускай зямлі сведчанні тых паядынкаў.

Як людзей, так і дэманалагічных істот запроста маглі караць святыя, Усявышні, Божая Маці за парушэнні хрысціянскіх канонаў, за здзекі над рэлігійнымі пачуццямі вернікаў, за іхні ўдзел у будаўніцтве храмаў. Такія дзеянні з боку рэлігійных асоб успрымаліся прымхлівымі людзьмі як своеасаблівы напамін аб тым, што можа здарыцца з тым, хто ў адкрытую ці цішком спрабуе парушаць народную мараль. Праўда, нягледзячы на тое, што пакараны былі нячысцікі (чэрці), у беларускай тапаніміцы амаль не засталося напамінаў пра дэманалагічных істот. Атрымлівалася, што нашы продкі, апраўдваючы суровыя дзеянні супраць іх святых асоб, разам з тым, стараліся нават лішні раз не ўзгадваць пра прадстаўнікоў народнай дэманалогіі, каб не папулярызаваць іхнюю дзейнасць.

# ЧАЛАВЕК, НЯЧЫСЦІК І… КАМЕНЬ

Сустракаюцца ў фальклоры і сведчанні супрацьстаяння нячысціка з чалавекам. Даўняя, атрымліваецца, у іх гэта варожасць. Яшчэ недзе з тых самых часоў узнікнення Сусвету, калі Д'ябал (чорт, нячысцік) нёс сябе нароўні з Богам і, адпаведна, паводзіў сябе гэтаксама, імкнучыся ні ў чым не саступаць Стваральніку. «Пра камень у Валілах»: «Было гэта даўным-даўно, калі людзей тут зусім яшчэ не было. Вакол прасціраліся непраходныя пушчы-лясы, ды вілася сярод іх вось гэтая рэчачка. У балотнай твані сядзеў Д'ябал. Бачыце, калісьці нячысты толькі ў такіх месцах і вадзіўся. Гэта цяпер ён стаў адно па гарадах шляцца. Сядзеў ён ды так з нуды корпаўся ў балоце, ажно бачыць, берагам рэчкі ідзе чалавек. Здалёку, відаць, бедалага вандраваў: схуднелы ды абдзёрты ўвесь. Убачыў рэчку, прысеў на купіну, а свае змораныя ногі ў ваду апусціў ды пабоўтвае імі, каб хутчэй стомленасць з іх сагнаць. А Д'ябла са злосці аж чорт носіць: "Бач ты, – маўляў, – мала таго, што па маім беразе валочыцца, то яшчэ і мяне сваім боўтаннем непакоіць уздумаў! Чаго



*Чортавы жорны ля в. Асавы Докшыцкага р-на*

добрага – возьме і назаўсёды тут жыць застанецца. Ну, тут то я цябе і звяду са свету".

Выкалупаў нячысты з багны каменьчык, бы зерня бобу са струка, папляваў на яго, перакінуў разы са тры з адной сваёй калматай лапы ў другую, і тут уваччу маленькі камушок у аграмадны валун абярнуўся. Пачаў размахвацца Д'ябал з усяе моцы, але ж як на зло ўзяў ды пасклізнуўся ў топелі, і глыба замест у чалавека бухнула на скрай лугу. Убачыў вандроўнік, чым тут пахне, – лахі пад пахі ды ходу з гэтых мясцін. А валун так і застаўся ляжаць тут. Ад таго, што чорт уваліў тут валун, і павялася назва – Валілы» [20, с. 359].

У фалькларных запісах даволі часта можна прачытаць пра тое, як чорт старанна рыхтаваўся да бітвы з Богам, потым – са святымі, а потым ужо – і з чалавекам. Здавалася, што ўсё начыста прадугледжваў, не дапускаў ніякіх агаворак. Ідэальнае становішча, упэўненасць ва ўласных сілах. Толькі што бібся-малаціся ды выйгравай чарговы паядынак. Але гэта на першы погляд, на той, калі прысутнічае пэўная доля самаўпэўненасці, якая нячысціку і надавала дадатковыя (не толькі фізічныя, але, бадай што, і маральныя, сілы!).

«Аднаго разу пасварыўся з-за нечага чорт са святым Пятром. Угневаўся гаспадар балотных мясцінаў вельмі, ажно месца сабе не знахо-

дзіў, пакуль не сустрэў святога ды не выказаў таму чыста ўсё ў вочы. Заўважыўшы, што Пятро адно толькі пасміхваецца, нячысцік успыліў:

– Раз так, то давай не толькі лаяцца, але яшчэ і біцца на камянях! Не жадаў я да такога сыходу ўсё зводзіць, але раз так, то няхай будзе па-твойму! Даведаешся, якая ў мяне сіла і на што я здольны, калі мяне завесці і не даць спакою! Так павялося, што ад самага нараджэння я чыста ўсім перашкаджаю: Бог гневаецца на мяне, святыя – смяюцца, а людзі то пальцамі ў мой бок торкаюць, нібы якога праказнага ўбачылі! Час надышоў усім гэтым здзекам ды кпінам канец пакласці! Думаў, што сёння мірам разыдземся, а раз і ты за такое ўзяўся, то я і на прымірэнне з табою не пайду!

Выгаварыўся, выкрычаўся чорт і на святога Пятра ўтаропіўся, маўляў, як жа ён сябе паводзіць стане. А той, здавалася, што і ўвагі асаблівай не звярнуў на гнеўныя тырады свайго адвечнага саперніка, адно што крыва ўсплюнуў у прыдарожны пясок і, хмыкнуўшы, працягнуў:

– І я б ніколі не падумаў, што ты такі гарачы і смелы! Гэта ж трэба, слова нават не даў сказаць, рота раскрыць, а ўсё страшыў і пагражаў, палохаў і зневажаў! Мне таксама спачатку думалася, што можна неяк мірам разысціся, нічога дурнога не прыдумваць, але ж ты мне выбару ніякага іншага не пакінуў! Ну што ж, раз біцца, то няхай сабе і біцца! На камянях, дык на камянях!

Хацеў яшчэ нешта Пятро дадаць, але нячысты нецярпліва перабіў:

– Я ўжо і месца выбраў, і камяні знайшоў, а час, то ты сам прызначай, бо зноў станеш упікаць, што чыста ўсё толькі ад мяне пайшло! Вось, глядзі, якія камянюкі, а вось гэтая рачулка, якую людзі Вісліцай завуць, будзе нам памежнаю мяжою, да якой станем сыходзіцца. А з часам пачатку паядынку – усё вельмі проста: пачнем на досвітку. Толькі сонца зайграе, то і будзь гатовы. Ды не спазняйся, а то потым пачнуцца агаворкі, што праспаў, што перад гэтым напрацаваўся моцна, што сон салодкі сніўся. Раз ужо вырашылі, то вырашылі канча і ўсё на тым.

Яшчэ толькі сонца пачало іграць над лесам, а па беражочку ўжо, паціскаючы плячыма ды ляскочучы зубамі ад ранішняй прахалоды, хадзіў нячысцік. Глянуў пару разоў на супрацьлеглы бераг: не, там Пятра не было. Яшчэ болей ускіпела кроў у нячысціка:

– Ты, пабач, і дамовіліся канкрэтна, і не прыйшоў! Але гэта яшчэ адна зачэпка, каб літасці яму не даваць! Не стану пакідаць сярод жывых! Тут яму і канец настане!

Зноў ускінуў вочы на супрацьлеглы бераг, а там ужо Пятро стаіць і камень свой спрабуе-перакочвае з боку на бок. Заіскрыліся вочы ў нячысціка:

– Ну што, то пачынаем!? Заадно і сагрэемся, а то ночы ўжо халаднаватыя стаяць! Ты ў будыніне жывеш, то табе не гэтак страшна, а мне пад маім карчоўем, то любы скразняк сілы не дадае, а наадварот адымае ды хваробы ўсялякія прылепвае! Што ўжо тут прыглядвацца адзін да аднаго, быццам бы мы да гэтае часіны не сустракаліся!

Пятро гэтак спакойненька размахнуўся і як шыбануў сваім камянём, то той са страшэнным гудам паляцеў у бок нячысціка. Чорт не чакаў такой увішнасці ад святога, таму і паспеў адскочыць ад небяспечнага снарада толькі ў самы апошні момант. І патлумачваць нічога не стаў, а адразу ж пастараўся сваім камянём патрапіць у Пятра. Не атрымалася на першы раз, бо святы таксама быў напагатове і пільна сачыў за дзеяннямі саперніка. Таму ягоны камень высакавата праляцеў над месцам, дзе стаяў Пятро і гопнуўся ва ўзгорак, які знаходзіўся за спінаю ў таго. Так і пачалася іхняя бітва-паядынак.

Гэта языком трапаць, то нячысцік быў адмысловы майстра, а калі справа пайшла па-сапраўднаму, па-сур'ёзнаму, то ўсё аказалася куды складаней, бо насупраць яго аказаўся майстра такіх баёў; не раз і не два правучваў ён у такіх спрэчках-бойках чарцей прызнаваць сваё першынство, сваю сілу. Але ж нячысцікі таксама хітравалі ды варагавалі нават паміж сабою, таму не гаварылі адзін аднаму, як завяршаліся іхнія паядынкі са святым. Адбылося – адбылося, у тым ці ў іншым месцы, у той ці ў другі дзень, маўляў, цяжкавата давялося, але ж на дапамогу нікога не выклікаў, а сам-адзін справіўся.

Кідаліся, замыліліся ад поту, але ўжо вочы ў абодвух гарэлі і карцела кожнаму з байцоў хоць разок, але ж патрапіць у саперніка, прымусіць таго ўзвыць-закленчыць ад болю. Магчыма, каб біліся малымі камянямі, то справа б ішла па-іншаму, там бы складаней было ўхіліцца ці схавацца, а тут... Праўда, толькі неўзабаве заенчыў чорт і заскакаў на адной лапе:

– Каб на цябе пранцук! Гэта ж такой камянюкай мне па лапе патрапіў! Але не чакай, што я з-за гэтага стану адпачынку ці перадыху прасіць. Мне і раней часта даводзілася біцца-змагацца, і таму я прывучаны і ўсялякі боль трываць і адыгрывацца, каб потым выходзіць пераможцам з паядынкаў! Зараз і я цябе прыгрэю, зведаеш, якая і мая сіла, адчуеш, як гэта заходзіцца ад болю! Затлусцеў на небе лежачы ды іншымі толькі кіруючы, а сам ні да чаго рук не прыкладаў!

Стрымаў сваё слова чорт: шыбануты ім камень так блізка праляцеў над Пятром, што таго амаль усяго раскрывавіла. Пятро ўзлаваўся яшчэ болей і наступную глыбу кінуў так, што яна, лятучы, ажно засвісцела! У адказ на тым баку нешта віскнула і сціхла. Чорт болей не паказваўся, не чуўся і ягоны вісклівы голас. Пачакаўшы яшчэ крыху святы, падаўся

да сябе дамоў. Ішоў стомлены, скрываўлены, але ўвесь час думаў, што гэта ж выпала яму зараз біцца толькі з адным нячысцікам, а ў балоце іх колькі, то ніхто адпаведна і не ведае, бо не лічылі ніколі.

Тое месца потым вяскоўцы пачалі называць Пятровай ямінай, бо засталася на беразе, у жоўтым пяску, здаравенная нара, куды і схаваўся-ўпіўся шыбануты святым камень. Доўга ён там ляжаў, нібы нагадваючы нячысцікам, што ёсць у свеце сіла, пра якую яны павінны заўсёды памятаць, але на ўсё ў нашым жыцці здараецца канец. Так і тут атрымалася: калі спрамлялі рэчышча вольнай некалі Вісліцы, то бульдозеры і экскаватары разрылі дазвання тую нару і ледзьве выцягнулі з яе агромністую камлыгу, тую, якой Пятро і ўладзіў тады свайго ворага – чорта» [УЗ, 1].

Сустракаецца і іншае паданне, у якім гаворыцца пра нягеглыя намаганні нячысціка пры запрудзе мясцовых рэчак. «Гранітны камень»: «Д'ябал нёс камень здалёку, каб запрудзіць Дзвіну, але запяяў пятух, і д'ябал кінуў камень у балота, не данёсшы да Дзвіны ўсяго некалькі вёрст» [20, с. 361].

Існуюць і даволі арыгінальныя паданні аб паходжанні валуноў. Да іх можна аднесці «Камень Лысіна Паца»: «На Віліі насупраць цяперашняга гарадскога парку ў Вілейцы, бліжэй да левага берага, летняй парой, калі спадае вада, добра бачны вялікі камень. Некалькі вякоў таму назад на беразе ракі стаяў палац пана. Стары пан Пац ад безрабоцця цэлымі днямі ўзіраўся на раку. Угледзеўшы лодку або плыты, лысы Пац высоўваўся з акна і крычаў:

– Камень! Камень!

Так і ахрысцілі гэтую рачную ведзьмаватую гару – камень Лысіна Паца. Звалі яшчэ і Пацаў камень. Таму і ўвекавечыў сваё імя пан Пац» [Тамсама, с. 357].

Ні ў якім разе нашы продкі не забываліся падкрэсліць тое, што камяням пакланяліся на працягу доўгага часу і з верай у іхнюю «жывучасць» парвалі не адразу, а прадстаўнікі пэўных прафесій па-ранейшаму працягвалі пакланяцца і шанаваць камяні, прыносіць ім традыцыйныя ахвяры (ахвяраванні). «Прывітальны камень»: «Кожны плытагон, першы раз праводзячы барку або плыт над небяспечным падводным каменем-заборам, кідае ў ваду кавалак хлеба з соллю і гаворыць:

– Вітаю цябе хлебам-соллю! Хлеб-соль прымі і мяне прапусці.

Пасля такога прывітання, даўшы даніну, плытнік смела праходзіць небяспечнае месца. Гэты адвечны звычай адкупляцца данінай і даў таму каменю назву Прывітальны» [Тамсама, с. 363–364].

Згадвалася і пра тое, што валуны даследавалі навукоўцы. Праўда, як гаварылася, то было гэта яшчэ недзе напачатку XX стагоддзя: «Камень

у вёсцы Камень»: «Вялікі камень, як стог. Дзед расказваў, што ў нас камень і ў Пагосце камень, у вадзе, трэці стаіць, едучы ў Любань.

Тут была літоўская граніца, пані была, пані Падчашына. Пры ёй перасеклі гэты камень, і літары на ім былі. У 1909 ці ў 1910 годзе прыязджала камісія з Францыі ці Англіі. Мылі гэты камень, бялілі і вывучалі» [Тамсама, с. 364].

Даволі часта вялікія камяні ў народзе асацыяваліся з пэўнымі межавымі знакамі, якія аддзялялі адно княства ад другога, надзел ад надзела і г. д. Так значна прасцей тады было арыентавацца ў тэрытарыяльных уладаннях. «Межавы камень»: «Камень быў на мяжы паміж двух княстваў. Пры пагранічных спрэчках адзін з князёў ілжыва прысягнуў ля каменя, што граніца яго ўладанняў знаходзіцца далей каменя. Але калі ён, сышоўшы з каня, схацеў ступіць на набытую такім чынам зямлю – раптам памёр на ранейшай сваёй граніцы» [Тамсама, с. 361].

Камень заўсёды з'яўляўся межавым («памежным») знакам паміж тым і гэтым светамі, паміж рэальнай і казачна-фантастычнай прасторамі. Згадаем, як ва ўсходнеславянскіх казках асілак, багатыр, герой вымушаны спыняцца перад каменем, які ляжыць на раздарожжы і нават прадказвае не толькі далейшы напрамак станоўчага персанажа, але і ягоны жыццёвы лёс таксама: «Налева пойдзеш, то смерць знойдзеш, направа падасіся, то жанатым станеш, а прама пойдзеш, то багатым станеш, ад багацця гэтага галаву зложыш...» У багатырскім беларускім эпасе вядомыя наступныя прыклады: каб перамагчы Бабу Ягу і яе войска, волату Васілю Васілевічу патрэбна каменная страла, якую ён пускае ў Бабу Ягу і заганяе яе ў глыбокае падзямелле. Сярод магутных асілкаў Івана Злdensaтавуста, Вырвідуба, Вярнігары згадваецца і Камяннік. Падкрэсліванне казачнікамі агромністай фізічнай сілы ў народных герояў, асацыявалася, найперш, асабліва ў старажытныя часы, са зброяй, якой тым даводзілася змагацца са сваімі ворагамі. Нярэдкім было і такое сцверджанне: «Што пад рукі траплялася, то тым і біўся, бо падбіраць нешта зручнейшае і больш прыдатнае не даводзілася. Дарага каштавала кожнае імгненне: лішні раз проста азірнешся, то жыццё пакладзеш. Такое правіла неабодна было завучыць і памятаць праз усё жыццё» [18, с. 56].

Не забудземся і пра тое, што ў казачным эпасе чужы свет – «трыдзевятае» царства – знаходзіцца за прыродна ўтворанай, але тым не меней прыпісванай дэманалагічным персанажам каменнаю сцяною (высокімі непераадольнымі гарамі), якая вертыкальна ўздымаецца «ад зямлі да неба». І, вядома ж, пераадолець такую каменную перашкоду можа толькі чароўны герой, надзелены цудадзейнаю сілаю і здольнасцямі. Тым не меней ён усё роўна пастаянна атрымлівае дадатковую дапамогу



*Ведзьміны камяні з-пад Бярозы*

ад сваіх памочнікаў (добрых варажбітоў, кавалёў-майстроў, старых людзей-прадказальнікаў), бо «сцяна высачэнная, цвёрдакаменная, перабіць-прабіць яе нельга, пералезці таксама, а можна было толькі пераскочыць на верным кані ды так, каб яе капытамі гары той не закрануў, бо адразу ж самі скамянеюць». Акрамя гэтага, у некаторых выпадках станоўчы герой (асілак Каміннік) вымушаны даказваць сваёю ўласнаю сілаю, што «яна мацнейшая за самы вялікі камень», ён павінен зрушыць, скаціць, перасунуць з месца на месца такую вялізную камлыгу. У беларускіх чарадзейных казках сустракаюцца сведчанні таго, што асілак, які вызваляў з палону («з таго свету») царэўну-дзявіцу, кідае сабе за спіну зачараваны камень (атрыманы ад моцнага знахара), і тады адразу ззаду вырастае непераадольвальная каменная перашкода, якая не дае пагоні наблізіцца да ўцекачоў.

Не забудземся і пра тое, што калі нашы продкі перасталі спальваць сваіх нябожчыкаў, а пачалі іх класці ў дамавіны і хаваць у зямлі (закопваць), то зрэдчас згадвалася і пра тое, што таго ці іншага памерлага (загінулага) хавалі ў... дубовай дамавіне. Можна адразу проста агаварыцца, і ўсё будзе зразумела, што такім чынам «суправаджалі ў іншы свет заможных, багацейшых, прыбліжаных да кіруючага кола; ім аддавалася належная пашана, іх стараліся выдзеліць і па дарозе ў іншы свет, у якім таксама была свая "градацыя" прыняцця памерлых, незабыўна-



*Валун Божы камень у Любанскім р-не*

абавязковы падзел на тых, хто нечага варты і на тых, кім даражыць не выпадае...» [Тамсама, с. 64]. Дубовая дамавіна была намнога трывалейшая за сасновую ці яловую, а то якую і з іншай драўніны, якая толькі на той момант траплялася пад рукі родным і блізкім. Продкі выдатна ведалі, што вырабы з моранага дуба, якія да гэтага часу працяглы перыяд ляжаў у вадзе і ажно пачарнеў ад знаходжання там, надзвычай трывалыя і таму вылучаюцца сваёй даўгавечнасцю. Ён запроста мог сапернічаць з каменнымі саркафагамі. Нярэдка яшчэ археолагі знаходзяць рэшткі дубовых дамавін, засыпаных пяском шмат стагоддзяў назад.

У беларускім фальклоры можна адшукаць прыклады, паводле якіх вынікае, што ў камяні ператварыліся асілкі, якія выйшлі змагацца з лютымі ворагамі і ў выніку, у сілу нейкіх трагічных абставін, а яны маглі быць самымі рознымі: недаацэнка сілаў ворага, шматлікае пераўзыходжанне ворагаў, нечаканасць нападу і г. д. – прайгралі бітву. М. Мялешка згадвае: «Аб тым, як перавяліся магуты (асілкі. – *А. Н., Я. Н.*), на Русі перадае цікавую былінную аповесць В. Ю. Ластоўскі (цытата выгодна вылучаецца тым, што даследчык уводзіць у сваю працу адно толькі тэксты, якія датычыліся беларускіх земляў, беларускага матэрыялу і беларускіх

падзей. – *А. Н., Я. Н.*). Супраць сямёх славянскіх магутаў з'явіліся двое "сілы нетутэйшай", і што магуты перасякуць іх папалам, то становіцца іх удвая болей, і ўсе жывы. Урэшце атрымалася з дваіх сіла незлічоная:

Спужаліся магуты харобрыя, –
Пабеглі ў каменныя горы, у цёмныя пячоры...
Як дабяжыць магут да гары, – так і скамянее;
Як дабяжыць трэці, – так і скамянее...

З ліку старых магутаў не скамянеў толькі адзін св. Мяркуры (Смаленскі), дзякуючы заступніцтву Багародзіцы і апекаваўшамуся гэтым мітам духавенству». Гэта вельмі пашыраны прыём у вусна-паэтычнай творчасці, калі «дзейнічаў» прынцып «адваротнага злічэння – забівалі аднаго, а аднаўлялася адразу некалькі ворагаў. Таму, пасля працяглага змагання, не вытрымлівалі нават самыя грозныя і моцныя воіны-асілкі (магуты). Тут жа прысутнічае і спалучэнне праведнай барацьбы з моцным заступніцтвам праваслаўнай рэлігіі і канкрэтных яе святых (у дадзеным выпадку – гэта св. Мяркуры (Смаленскі) – апякун беларускай Смаленскай зямлі, які меў прамое дачыненне да фарміравання смаленскіх ваярскіх дружын, бо ягоная выява ўпрыгожвала сабою харугвы мясцовых палкоў. І яшчэ адна канкрэтная акалічнасць: пасля паражэння ад лютых ворагаў, асілкі болей не мелі права «ўмешвацца» ў ход гістарычных падзей і заставаліся маўклівымі сведкамі, пераўтворанымі ў камяні, назвы азёраў і рэчак, урочышчаў і г. д. Цяпер, паводле ўжо новай народнай традыцыі, павінна было з'явіцца новае пакаленне асілкаў, якому і выпадала браць на сябе адказнасць за непарушнасць межаў сваёй дзяржавы, станавіцца надзеяй свайго народа [25, с. 63].

З камянём часта параўноўваліся ў фальклоры дружыны і ваяры, «такія моцныя, што крышацца, але не адступаюць, гнуцца, але не падаюцца; нават прагіба тая – гэта пагібель для ворага, бо яна ўяўная, наўмысная і галоўнае было, каб чужынцы не здагадаліся заранёў што да чаго, бо разгаданы манёўр мог запроста прывесці да непажаданага заканчэння бітвы. Сустракаліся выпадкі, калі нават размяшчэнне камянёў «чыталася» народнымі дарадцамі як своеасаблівы каменны летапіс і ў ім зашыфраваныя адлюстраванні далёкіх падзей. Але калі сыходзіць з законаў гістарычнай памяці, то тады і атрымаецца, што галоўнае было запомніць, што была тая ці іншая падзея (слаўная ці трагічная) у мінулым народа, а ўжо пры дапамозе чаго гэта вывучалася, то не так і важна.

Магутны, выдатна складзены фізічна, ваяр, параўноўваўся продкамі з каменем, каменнаю гарою, гледзячы на такога асілка, любілі паўтараць: «Але ж і прыгажун! Гэты і за сябе і за іншых пастаіць! Нічога і нікога

не спалохаецца! Пакажа любому ворагу дарогу ў чортава балота, дзе яму толькі і месца! Такіх бы ды паболей у нашу дружыну, то яна б сабою запроста каменную граду напамінала: непераадольную, непадступную і недаступную, непераможную і слаўную.

У міфалогіі беларусаў камень займаў важнае месца ў міфалагічнай сістэме Светабудовы і міфалагічнай прасторы ўвогуле. Ён уяўляўся цэнтрам, ля якога, паводле народнага ўяўлення, знаходзіліся (дзейнічалі, уплывалі) усемагчымыя магічныя сілы, якія мелі выразную патойбаковую прыроду. Ці не гэта ўсё характарызуюць наступныя прыклады? Асабліва цесна гэта ўсё атаясамліваецца з будаўніцтвам (папярэднім выбарам месца) хаціны. Менавіта напярэдадні гэтай важнай падзеі гаспадар з вечара раскладваў камяні па чатырох уяўных вуглах будыніны. Калі на раніцу ўсё заставалася на ранейшых месцах, то чалавек быў перакананы, што месца выбраў удалае, што магічныя сілы будуць дапамагаць яму тут і надалей. Таму і даводзіцца нам бачыць на месцах былых вёсак, паселішчаў, дворышчаў адно толькі пакінутыя кутнія камяні ад фундаментаў. Іх нават самы гаспадарлівы чалавек не перавозіў на новае месца, бо надта надакучлівая і цяжкая фізічная праца гэта была. Лепей было адшукаць новыя, непадалёку ад месца будучага будаўніцтва.

Сілай, цвёрдасцю, магутнасцю каменя тлумачыцца і даўні звычай, паводле якога продкі лічылі, што хлопчыку-немаўляці лепей не перарэзаць пупавіну нажом (не перагрызаць зубамі, бо «ўсё жыццё будзе жыватом на грызь пакутаваць»), а перабіваць яе малым камянём на вялікім (асаблівае значэнне надавалася яшчэ і тады, калі гэты камень уяўляўся свяшчэнным). Раз было здзейснена такое, то сіла камлыгі адразу «ўваходзіла ў дзіця і заставалася з ім на працягу ўсяго жыцця». Калі малое доўгі час не магло навучыцца выразна размаўляць, то яго стараліся любым чынам прымусіць вымавіць «Камень у ваду блёх!». Як толькі яму гэта ўдавалася, то ўздыхалі з палёгкай, бо, маўляў, надалей з маўленнем ніякіх праблем не будзе. Раз дзіця не станавілася цвёрда на ногі, то яго сілаю вадзілі па гладкіх каменьчыках (у некаторых выпадках па рачных камянях, а яны, аблізаныя вадою, заўсёды гладкія). Пасля такога дзеяння малое вымушана было «цвёрда стаць на ногі» – навучыцца добра хадзіць, у пазнейшы перыяд гэтае выслоўе стала характарызаваць гаспадара, які ўжо адбудаваўся і мог самастойна пракарміць сям'ю. У народзе зафіксавана шмат павер'яў і прыкмет, якія цяжка адрозніць ад прымхаў, і звязаны яны таксама з камянямі ці з іхнімі ўласцівасцямі. Так вынікала, што чараўнікі маглі лёгка «забраць» малако ад чужой каровы і перадаць яго сваёй. Неабходна было ноччу

знайсці на полі ці ў агародзе таго гаспадара дзевяць невялікіх камянёў, а пад раніцу пракіпяціць іх у збанку з-пад малака. Абавязковай умовай было – «каб малако (вада) не пабегла цераз край, бо разам з гэтымі вяршкамі выбежыць і замоўленая сіла скрадзеных камянёў і тады малако ад чужой каровы не пяройдзе ні ў якім разе».

Нават адносна ўраджаю на будучы год продкі маглі меркаваць, у некаторай ступені, па камянях. Калі дзеці гуляліся ў сваіх гульнях з чарапкамі ад разбітых гаршкоў, то можа надарыцца неўраджай, а значыць, і голад; калі ж дзеці аддавалі перавагу каменьчыкам, то садавіна і агародніна павінны былі ўрадзіць. Часта згадваліся прадказанні і адносна... цяжарнасці мацярок на дзяцей, нават адносна таго, каго з немаўлят жанчыны народзяць: «Раз хацелі паздзекавацца з якой дзеўкі, то ёй у фартух непрыкметна падкідвалі камень, неўзабаве яна павінна была зацяжарыць», ці такое: «Цяжарнай жанчыне неабавязкова сядзець на камені ды яшчэ з распушчанымі валасамі, бо яе дзіця на ўсё будучае жыццё будзе з плешшу». Падкрэслівалі яшчэ і тое, што калі ў зямлі пад ложкам, на якім спалі маладыя муж і жонка, знаходзіўся камень, то жанчына абавязкова зацяжарыць сынам. Верылі і ў тое, што камяні маглі прыносіць шчасце: «Часам знаходзяць каменьчыкі з дзюрачкамі. Яны даюць таму шчасце, хто іх мае ў дамоўцы». Верылі ў тое, што гаспадар (уладальнік) каменя будзе валодаць чароўнай здольнасцю дабівацца пастаўленай мэты нават тады, калі перад ім будзе стаяць высачэнная і таўшчэразная сцяна з камянёў. Ён яе проста прабурыць наскрозь. І ўсё гэта дзякуючы таму рэдкаму каменьчыку, які ён аберагае і пакланяецца якому ў сваёй хаціне. Самае цікавае, што такое дзеянне сустракалася ў глухіх палескіх вёсачках яшчэ на пачатку XX стагоддзя. Вось якая трывалая сувязь існавала ў пакланенні быццам бы намоўленым камяням. Іншая справа, што іх яшчэ перадавалі па пакаленнях. Стараліся хаваць як сямейную таямніцу, асабліва не пахваляючыся, бо тады камень запроста можна было страціць. Ліхія людзі заўсёды знаходзіліся, ва ўсе часы ім было месца сярод іншых.

Можна гаварыць і пра тое, што ў беларускіх народных чарадзейных казках таксама актыўна ўжываецца «каменны» сюжэт. У іх ён найчасцей выступае нейкім пэўным (умоўным) межавым ці тапаграфічным знакам, ля якога ці побач з якім знаходзяцца мясціны, патрэбныя казачным героям. «Пра склятых братоў і сястру»:

«– Браточкі, пойдзем дамоў. Гэтак тата пастарэў і мама ўжо. Як жа жыць? Я ж іх не пракармлю.

– Мы цябе не пусцім, пакуль ты нас не адратуеш, бо нас матка пракляла. Вот, – кажуць, – ёсць у адным месцы камень такі, каб ты ўжо

як-небудзь да гэтага каменя дайшла, і там вада пад ім ёсць. Каб ты вады гэтай дастала, дык ты б на нас пырснула, можа б мы і аджывіліся.

Вось яна гэдак і пайшла. Прыйшла яна, а тамака камень гэдак ужо сільна вялікі. А тут дрэва таксама вялікае, яна і абначавала каля гэтага каменя.

Прыляцелі птушкі і сядзяць і гавораць, але не гэтыя птушкі, браты, толькі другія, будуць казаць:

– Вот дзіва, дык дзіва. У нашым лесе тры браты, і яны праклятыя, а сястра іх шукаець, вот найшла, але яна іх дамоў не можа вярнуць. Вот пад гэтым камнем вада ёсць, ёй ніяк не можна дабыць, але каб яна прайшла, там працякаець маленькі ручаёк, яна прасочваецца, гэта вада. Няхай яна набярэць, папырскаець на іх, і яны будуць добрыя ж ужо, як і належыць» [38, с. 130–131].

У сюжэце прыведзенай казкі камень выступае як своеасаблівы геаграфічны знак, з-пад якога выцякае магічная гаючая крыніца. Цікавая адметнасць заключаецца, мабыць, яшчэ і ў тым, што гаючая сіла вады павялічваецца за кошт яе пастаяннага судакранання з камене. Нам жа невядома, што тут знаходзілася раней. Магчыма, што тут былі і старажытныя прошча або капішча. На якім стаялі драўляныя, а то і каменныя стоды-ідалы язычніцкіх бостваў. У чыста геаграфічным (дакладней, тапанімічным) плане, таксама было значна прасцей растлумачыць, які камень неабходна шукаць ці адкуль выцякае тая славутая крыніца.

# ВАЛУНЫ І НАРОДНАЯ МЕДЫЦЫНА

Пра чарадзейнасць і незвычайную лекавасць валуна гаворыцца і ў казцы «Лякай-камень». «... – Падобны да падобны, але ў жыццю няпэўны: прыедуць да берагу да сваіх радзіцаў. Паложуць іх спаць у такі пакой, што там ёсць змяя пад падлогаю на дванаццаць галоў, і тая іх абоіх паесць; але хто чуе да адкажа гэта слова, то саўсім каменем абернецца.

...Дзе ёсць змяя на дванаццаць галоў, і яна іх абоіх паесць, але хто чуе да адкажа гэты слава, так заўсім каменем абернецца.

І як казаў усе гэтыя словы, так і заўсім абярнуўся ў камень.

...Так ён узяў два сыны свае, завёў да лядоўні і абодва зарэзаў. Вышмараваў тою кроўю камень. І стаў лякай з каменя і гаворыць:

– Ах, як я смачна заснуў.

А купец яму адказывае:

– Дзе ж ты заснуў, калі ты быў сем гадоў каменем; так я ўзяў свае два сыны, зарэзаў і пашмараваў тою кроўю камень, і ты з каменя зноў адвярнуўся» [38, с. 358–359].

Нашы продкі ў выпадку хваробы ці няшчасця, трагічнага здарэння здзяйснялі абавязковыя паломніцтвы да шанаваных камянёў (няхай сабе да іх была і даволі значная адлегласць), прыносілі ім ахвяры і падна-шэнні («падносы», а ў некаторых выпадках называлі таксама «адносы»). Гэта маглі быць хлеб, тканыя рэчы – ручнікі, хусткі, хусцінкі, стужкі, а таксама дробныя грошы, якія ці развешваліся на бліжэйшых дрэвах, кустах, устаноўленых крыжах ці клаліся побач. На Беларусі такі звычай захоўваўся да пачатку XX стагоддзя, а ля каменя, што ляжаў у Мінску, на беразе Свіслачы, нават у час Вялікай Айчыннай вайны. Тут камень суседнічаў з магутным дубам і жывой крыніцай, такім чынам утвараючы надзвычай моцную, паводле народных уяўленняў, гаючую тэрыторыю. Вада, якая ад дажджу ці ад расы збіралася ва ўпадзінах на паверхні каменя, лічылася гаючай, а па-іншаму – «жывучай» або «ажыўляльнай».



*Збярог-камень з в. Крэва Смаргонскага р-на*

У народнай медыцыне рэкамендавалася выкарыстоўваць камяні-белямніты падоўжанай формы, якія яшчэ называлі «грамавымі стрэламі», «грамавікамі». «Устаноўлена нямала выпадкаў, калі камень дапамагаў толькі тады, калі чалавек спажываў яго ўнутр. Так, каля в. Раменьнікі Трабецкай воласці Ашмянскага павета Віленскай губерні знаходзіцца камень, з якога народ скабліў парашок, верачы, што калі пры хваробе прыняць гэты парашок, то хвораму наступіць палёгка. На Крычаўскіх палях, каля Турава б. Мінскай губерні, ляжаць каменныя крыжы, якія, кажа народ, прывезены сюды ў пачатках хрысціянства. Народ адносіўся да іх з пашанай і пры хваробе таксама скабліў з іх парашок і прымаў як лякарства» [25, с. 57].

Ф. Буслаеў пісаў у свой час: «Старыя знаўцы, якія адкрылі сілы і ўласцівасці ў звярах, у птушках, і травах, і каранях, пакінулі нам сведчанні пра сілу і чаруючыя ўласцівасці нейкага каменя, які называлі “Арлоў камень”. Грэкі і Лаціняне называюць гэты камень ацітэс, а ў нашы часы ён вядомы як той, што паходзіць ад царскай птушкі, арла, ад каго і назву сваю атрымаў. Калі арол садзіцца ў сваім гняздзе на яйках, то ён і камень той кладзе сярод яек. А трымае арол той камень у гняздзе для зберажання дзяцей сваіх: таму што камень аберагае ад усялякіх пошасцей, паморкаў і ўсемагчымага зла. Камень той існуе рознага колеру: цёмна-карычневы і шэраваты. А калі ў нейкім камені нешта стукае, то гэта мужчынка, а калі камень той рассыпаецца на друз, то гэта жанчынка. У тым камені заключыў Бог розныя дзівосы, таму недасведчаным людзям нельга пра яго і веры пэўнай узяць. А дасведчаныя людзі пісалі пра той камень наступнае: Ізідорус пісаў у сваёй 60-й кнізе, у 4-м раздзеле, Плініюс у сваёй 36-й кнізе, у 23-м раздзеле, Дэаскардзіюс пісаў у сваёй кнізе пра камень. Албертус Магнус, Маціёлес ды Варфаламей Англічанін пісаў у сваёй кнізе пра ўсялякія ўласцівасці камянёў. Рэміюс Белсоў пісаў у сваёй кнізе аб каштоўных камянях і іншыя дасведчаныя людзі, якія ў сябе гэтакі камень трымалі, і што ў тым камені схаваны вялікія сілы і цудадзейныя магчымасці, і яны пра некаторыя з іх пішуць; каб жанчынам лёгка нарадзіць, дастаткова ўсяго толькі ўзяць той камень і прывязаць да левай рукі ці нагі цяжарнай, а калі яна народзіць, то камень адразу ж зняць» [5, с. 63–64].

У замовах на камені (пад каменем, паблізу каменя) знаходзяцца (сядзяць, месцяцца) хваробы, да якіх звяртаюцца з дапамогай, каб «хваробай хваробу выбіць, каб чалавеку палегчыць»: зляк-пераляк, хваробіца-ламавіца, чамярыца-чырвоная дзявіца, сорак саракоў – удалых малайцоў і г. д. Туды ж, пад камень, хаваецца (уцякае, адсылаецца) замоўленая замовай злая хвароба: «...табе, вогнік, тут не палаць, касцей-жылаў не ла-

мацць, а пад каменем невылазна ляжаць». Пад каменем (у каменнай пячоры, каменнай або каменна-залатой гары) жылі чароўныя ворагі справядлівых асілкаў, багатыроў-змагароў: Змей Гарынавіч, Тугарын Змей, Баба-Яга, мужычок з кагаток і інш. У некаторых выпадках менавіта з-пад каменя нечакана і незаўважна з'яўляюцца верныя памочнікі станоўчых персанажаў.

Ля свяшчэнных камянёў здзяйснялі рытуалы, мэтай якіх было папярэдзіць хваробу ці засцерагчыся ад яе. На Палессі, каб на працягу года не балела галава, стараліся пры першым громе тройчы ўскочыць на вялізны камень («тады ж галава будзе такая неўспрымальная да хвароб і болю, як і ён»), рабілі гэта ж самае і ў Чысты чацвер, праўда, пры абавязковай умове: трэба здзейсніць да ўсходу сонца («калі крыху прыпознішся і сонца ўжо выпаўзла з-за лесу, то галава будзе балець па-ранейшаму, бо камень не падзейнічаў»). Калі пачынала хварэць і выміраць хатняя жывёла, то шанаваныя камяні навокал абворвалі плугам («трайною раллёю»). Немалаважную ролю камень іграў у гаспадарчай магіі. Тут, найперш, аналогія праводзілася з цвёрдасцю, моцнасцю каменя. Гаспадыні былі перакананы, што каб качаны капусты былі цвёрдыя і крамяныя, то пры пасадцы расады неабходна пакласці на загон камень, ён і прыдасць раслінам незвычайную цвёрдасць. Каб жывёлу на пашы не падсцерагалі ваўкі, вопытныя пастухі закопвалі на полі камяні, прывезеныя з трох мясцін, прымаўляючы пры гэтым своеасаблівую закрэпку: «Гэтыя камяні – замок злым ваўкам на зубы-губы». Пастухі сцвярджалі, пасля здзяйснення абраду, што цяпер лясныя разбойнікі не здолеюць прынесці шкоду, бо замест жывёлы перад імі адразу ж будуць паўставаць, у выпадку небяспекі, камяні. Пераконвалі, што ў кожнага пастуха, асабліва «спадчыннага», бывалага, заўсёды былі ў запасе свае закрэпкі-засцярогі ад «звера ліхога ды ад воўка шэрага...»: «Наш Кірыла, пастух вясковы, то ў першыя дні, калі толькі выганяў жывёлу на запашванне, пёр з сабою з паўторбы заранёў сабраных па ўсялякіх лугах і палетках камянёў-каменьчыкаў. Рабіў усё на поўным сур'ёзе, стараўся, каб ніхто не назіраў за ягонымі дзеяннямі, а ён усё здзяйсняў у поўнай адзіноце. Пастух тыя камяні закопваў у розных месцах па лугах, палетках, балацінах, лясах, дзе ў гэтае лета збіраўся пасвіць людскую жывёлу. Цэлы дзень падпаскі стараліся ўпраўляцца самі, бо Кірыла быў заняты адказнай справай. Затое, калі ён усё чыста здзяйсняў ды яшчэ і ніхто яго не "падлавіў" за такім варагаваннем, то адорваў малых курынымі яйкамі, якія яму ў першы дзень давалі гаспадыні ў кожным двары, адкуль выганялі жывёлу» [УЗ, 1].

Адначасова шырока ўжываліся як магутныя лекавыя сродкі і знойдзеныя старажытныя прылады працы, найперш каменныя сякеркі, праз адтуліны ў якіх праліваецца чыстая вада, пасля чаго яна ўжывалася за лекавую. Мне самому даводзілася бачыць такія сякеркі. Характэрная асаблівасць заключалася ў тым, што гаспадары іх не хавалі далёка, а стараліся вешаць у сенцах ці ў хаце ля дзвярэй. Рабілася гэта для таго, каб іх можна было хутка адшукаць, калі спатрэбіцца. «Калі выходзіла чорная, груваcткая хмара і чакалася страшэнная навальніца, то ўмелыя гаспадары, імкнучыся заранёў засцерагчыся ад палючых перуновых стрэлаў, выкідвалі ў двор, перад гаспадарчымі будынкамі, свае каменныя сякеркі. Калі ж не было каменных, то стараліся выкінуць звычайную – металічную. З адзінай толькі мэтай: каб хмара з навальніцай абышла бокам, а Ілля не выказаў свой гнеў адносна гаспадароў гэтых будынін» [Тамсама, 1].

Не выключана, што з лекавай магіі многае перадавалася ў народзе ад старэйшых да маладзейшых. Нават калі дапусціць, што даволі часта ў такіх «рэцэптах» гучаў налёт прымхлівасці і цемрашальства, то ўсё роўна заставалася пэўная частка здаровай практычнасці, паводле якой і вынікала, што пры дапамозе камянёў людзі па-ранейшаму імкнуліся пазбавіцца ад пэўных хвароб і нядугаў.

ТРАДЫЦЫЙНЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

# МОГІЛКІ... ДАМАВІНЫ... ТРУНЫ...

Неабходна адзначыць, што нават у пахавальнай абраднасці беларусаў камень выконваў пэўнае ахоўнае значэнне. Паводле шматлікіх міфалагічных уяўленняў, незвычайная цвёрдасць, вялізны цяжар і пастаянная непарушнасць яго не даюць магчымасці памерлым, іхнім зданям бесперашкодна вяртацца ў свет жывых, «на зямлю назад, каб там тварыць свае злыя справы». Таму камень у галаве магілы нашы продкі клалі не толькі для таго, каб яе пазначыць, але і для таго, каб не было нябожчыку звароту да жывых. На Піншчыне да гэтага часу (вёскі Чухава, Сташаны) захоўваюцца некаторыя старыя могілкі (іхнія рэшткі), хутчэй за ўсё яшчэ язычніцкага перыяду, дзе магілы абкладзены па перыметры вялікімі ці малымі камянямі. Магчыма, што гэта не што іншае, як своеасаблівы варыянт захаванняў, над якімі некалі пад пакладзенымі на зямлю камянямі ляжаў яшчэ адзін зверху, які нагадваў сабою ўсё тую ж непераадольную каменную пліту.



*Рэшткі язычніцкіх могілак (знаходзяцца на высокай гары) ля в. Сташаны Пінскага р-на*

Агульнавядома, што ў часы язычніцтва целы памерлых людзей спальвалі на свяшчэнным вогнішчы. Менавіта агонь, лічылі нашы продкі, ачышчае душу нябожчыка, робіць яе прыдатнай для пазамагільнага жыцця. Але ў некаторых выпадках памерлых не спальвалі, а хавалі ў каменных трунах-дамавінах. Іх рабілі толькі для знатных асоб, бо патрабавалася многа працы і сродкаў, каб усё гэта давесці да ладу. У вялізным камені выдзёўбвалі столькі месца, каб пакласці туды нябожчыка. Альбо адколвалі своеасаблівую «дошку» таўшчынёй да метра і потым паступова ссякалі камень да таўшчыні ў некалькі дзясяткаў сантыметраў. Такія труны-дамавіны не закопвалі ў зямлю, а ставілі ў родавых склепах (раней можна было ўбачыць іх у Лагойску, зараз – няма).

Некаторыя археолагі падкрэсліваюць, што гэта былі не каменныя труны-дамавіны, а вырабы з чырвонага, моцна спрасаванага пясчаніку, які для такіх мэтаў прывозілі з Кіева-Пячэрскай лаўры. У Пінску, у музеі сацыялістычнага пераўтварэння беларускага Палесся, экспануецца адна з каменных трун, якую ў свой час археолагі знайшлі, раскопваючы гарадзішча тысячагадовага Турава. Сапраўды, гэта моцна і трывала сцягнутая тоўстым каваным дротам дамавіна з плітаў пясчаніку. Самае цікавае, што зусім нядаўна была знойдзена каменная труна князя Юрыя Далгарукага ў Кіеве. Дык вось, і тураўская таксама была такіх жа памераў і з такога ж матэрыялу. Тое, што ў дамавіне знаходзілася цела аднаго з тураўскіх князёў, не выклікае сумнення. Але адкуль

узялася сама дамавіна? Бо пясчаніку такой цвердыні ў ваколіцах Турава ніколі не сустракалася. Ці яе ўсё ж зрабілі ў самім Тураве з прывезенай загатоўкі ці ўвогуле труну прывезлі з аднаго з гарадоў Кіеўскай Русі, бо, як агульнавядома з гісторыі, на тураўскім пасадзе сядзелі князі, якія былі ў цесных кроўных сувязях з кіеўскімі?.. Пакуль што гэтае пытанне адкрытае, адназначнага і пераканаўчага адказу на яго вучоныя не далі.

Нават саркафаг легендарнага князя Юрыя Далгарукага, які многія стагоддзі ляжаў у зямлі невядомым, знайшлі зусім выпадкова ў 70-я гады XX стагоддзя. Зрабіў гэта кіеўскі вучоны Віктар Харламаў. Уяўляў ён сабою уражвальных памераў дамавіну з трывалага ружовага сланцу, які здабывалі тады ля г. Оўруч. Нават па знешнім выглядзе гэты саркафаг не меў нічога агульнага, напрыклад, з агульнавядомымі егіпецкімі. Гэта была звычайная славянская труна, толькі зробленая з каменя. Замест крышкі – пліта ў дзесяць сантыметраў таўшчынёю, памерам на два метры 30 сантыметраў у даўжынгю і метр у шырыню.

На дне саркафага аказаліся парэшткі чалавека магутнага целаскладу. Антрапалагічныя даследаванні, праведзеныя прама на месцы, паказалі, што касцяк належыць мужчыне сталага ўзросту. Пахаванне выразна адносіцца да XII стагоддзя.

Ю. А. Лабынцаў у сваёй кнізе «У глыбінным Палессі» пісаў адносна тураўскіх каменных крыжоў і саркафагаў наступнае: «Да ліку самых старажытных помнікаў горада адносяцца і каменныя крыжы, сёння перанесеныя ў памяшканне адзінай ацалелай у Тураве царквы. Паданне трывала звязвае іх з перыядам хрысціянізацыі Тураўшчыны. Крыжы гэтыя быццам бы самі па сабе прыплылі ўверх па цячэнні Прыпяці, а потым былі ўстаноўлены сярод палёў у паўднёва-заходняй частцы горада. Народ здавён называў гэтыя крыжы “голымі”, у адрозненне ад каменных крыжоў у вёсках Верасніца і Пагост, над якімі адразу ж былі ўзведзены капліцы. Тураўскія каменныя крыжы маюць вышыню больш за два метры і шырыню крыху меншую за метр. Больш падрабязную характарыстыку даць ім немагчыма, бо, з’яўляючыся і па сённяшні дзень прадметам асаблівага шанавання і пакланення вернікаў, яны схаваны ад вачэй пад тоўстым слоем са шматлікіх вышытых ручнікоў, якія абцягваюць іх. У былыя часы пакланяцца крыжам прыплывалі людзі са ўсёй Прыпяці. Лічылася, што крыжы гэтыя цудатворныя, вылечваюць хворых. Асабліва шмат людзей збіралася ля каменных крыжоў на Узвіжанне. У адрозненне ад гэтых вялікіх каменных крыжоў на Барысаглебскіх могілках пры пахаваннях здавён знаходзілі крыжы малыя. Яны выразаліся з мясцовага чырванаватага каменя і па велічыні былі з далонь. Такія крыжы трапляліся даволі часта, і гэта дае падставы меркаваць, што іх выраб-

лялі ў Тураве ці дзесьці паблізу ад яго. На тых жа Барысаглебскіх могілках яшчэ ў 1909 годзе на глыбіні ў паўтара метра быў знойдзены першы старажытны каменны саркафаг. Пахаванне аказалася багатым. Нябожчыкам мог быць тураўскі князь ці епіскап. У далейшым удалося адшукаць яшчэ падобныя пахаванні, у тым ліку пры раскопках Замчышча рэшткаў каменнай царквы XII стагоддзя, якія ў 1963 годзе вёў М. К. Каргер» [18, с. 34–36].

Пра тое, што пліты пясчаніку ў якасці загатоўкі прывозілі сюды, на месца, а потым ужо на іх выбівалі адпаведныя надпісы, сведчыць і кавалак надмагільнай пліты з магілы багатага пінскага залатара-ювеліра Ждана. Доўгі час захоўваўся і дэманстраваўся толькі правы кавалак пліты, пакуль недзе з дзясятак гадоў таму мясцовыя ўлады без дазволу археолагаў не ўлезлі ў ахоўную зону і там былі знойдзены каштоўныя артэфакты. У тым ліку і адсутны кавалак надмагілля. Усё ж беспамяцтва адных прывяло да зусім нечаканага выніку.

Сёння адрэстаўраваны і даступны для наведвальнікаў магільны склеп князёў Паскевічаў у гомельскім гарадскім парку культуры і адпачынку імя Луначарскага. Падчас вайны фашысты абрабавалі яго, разбурылі капліцу, што стаяла зверху, а ўнізе зрабілі пісталетны цір для афіцэраў СД. Але ўлюбёныя ў свой горад людзі старанна адбудавалі тое, што, здавалася, было амаль назаўсёды страчана.

Шырока за межамі рэспублікі вядомы таксама родавы магільны склеп Радзівілаў у Нясвіжы. Склеп самых буйных землеўладальнікаў свайго часу. Праўда, і ў Гомелі, і ў Нясвіжы труны зроблены з мармуровых пліт, бо час узнікнення іх вагаецца паміж XVI–XVIII стагоддзямі. Гэта быў ужо куды больш адукаваны час, і многае запазычвалася мясцовымі магнатамі з-за мяжы. І мармур прывозілі ў тым ліку адтуль.

# КАМЕННЫЯ КРЫЖЫ

Але ўсё ж у пераважнай большасці камяні ўжываліся ў сваім прамым прызначэнні. Здаўна сутыкаючыся з валунамі, селянін прыстасоўваў іх для гаспадарчых патрэб, нярэдка выкарыстоўваючы камяні самай мудрагелістай формы для ўпрыгожвання двара ці падмуркаў. Каб абазначыць свае зямельныя ўладанні, нейкі канкрэтны князь ці пан размяшчаў на мяжы ўласнага надзелу, лясных участкаў звычайныя камяні з выбітымі на іх крыжамі ці імем уладальніка зямлі. Па такой мяжы адразу можна было меркаваць аб багацці і знатнасці гаспадара.

У той жа час узнікненне каменных крыжоў цяжка растлумачыць адназначна. Сустракаюцца яны на тэрыторыі Усходняй і Заходняй Еўропы. Як сцвярджае даследчыца беларускіх каменных крыжоў археолаг Л. Дучыц, «па прызначэнні яны падзяляюцца на памятныя, прыдарожныя ці паклонныя і надмагільныя. Іх ставілі на перакрыжаваннях дарог, месцах бітваў, водных пераправах, межах зямель, пры пракладцы новых шляхоў, закладцы гарадоў і цэркваў, у гонар знамянальных падзей,



*Крыж Стэфана Баторыя ў Докшыцкім р-не*

па краях вёсак (для заступніцтва ад халеры), на могілках, а таксама пасля прыняцця хрысціянства на месцы язычніцкіх каменных ідалаў.

На Беларусі вядома больш за сто месцазнаходжанняў каменных крыжоў, пераважна на тэрыторыі Падзвіння і верхняга Падняпроўя... Формы каменных крыжоў даволі аднастайныя; значная частка нагадвае лацінскі крыж – вертыкальны брус (каля 1,5 м) даўжэй за перакладзіну (каля 1 м), таўшчыня каля 0,4 м. Зрэдку трапляюцца надпісы, манаграмы, часта ў сяродкрыжжы высечаны крыжыкі рознай формы. Найбольш значныя каля вёскі Палачаны (Маладзечанскі раён), Бабруйшчына, Пліса (Глыбоцкі раён), Галошава (Талачынскі раён), Мішневічы (Шумілінскі раён), Горы (Горацкі раён) і некаторыя іншыя» [22, с. 126].

Каменныя крыжы ў даўнія часы, з-за сваёй даўгавечнасці, хутчэй за ўсё, стаялі паўсюль па Беларусі. Іншая справа, што ў варунках гістарычных падзей ды са зменай розных абставін, многія з іх зніклі назаўсёды. Пра некаторыя толькі і засталіся ў памяці самабытныя паданні і своеасаблівыя гісторыі. Да такіх адносіцца і вусна-паэтычны твор «Засульскія турэ»: «Ёсць у нашым краю сяло Засулле. А каля таго сяла,

на краю Баханскага балота, ляжаць тры вялізныя каменні, што турамі завуцца. Два з іх, большыя, ляжаць поплеч, як два пірагі, зліпшыся, а трэці, меншы, круглы, як баханок, ззаду паміж пірагоў паложаны.

Вота ж старыя людзі павядаюць, гэтыя каменні кольсь-то людзьмі былі такімі, як і мы. Гэта было яшчэ тады, калі наш край у паганстве быў, а толькі чутка хадзіла, што ад Кіева нека новая вера разыходзіцца і штораз далей і далей па гарадах, сёлах і сялібах пашыраецца. І ад гэтае чуткі страшна людзям станавілася. Баяліся новае веры, як заразы якой.

Людзі сыходзіліся ў святыя дубровы ды гаі, там раіліся і прыносілі ахвяры багам, каб уласкавіць і ўпрасіць аб помачы процію насуваючай з поўдня страшнае навіны.

Вот у адным сяле пад Супаю разышоўся пагавор, што да аднаго гаспадара, каторы жыве за сялом на адзіноце і Турам празываецца, па начах прабіраецца нейкі чалавек з вялікаю барадою, з доўгімі валасамі, павучае гаспадара да новае веры. Сталі сяляне падглядаць, і дзе каторыя з іх бачылі, як невядомы з гаспадаром, з гаспадыняй і з малымі іх сынамі кланяліся нейкім рагачам. Сталі прызірацца да тых рагачоў і дагледзелі, што яны пароблены з залезных шынаў, зложаны накрыж.

Тых крыжоў налічылі тры: адзін вялікі пасярэдзіне, а два малыя абапал яго. Сабралі сход і ўраілі, каб сям'ю і сялібу тых Тураў знішчыць дазвання, каб і следу не было.

Аднэй гэтак раніцай запрагае той апрычны гаспадар валы араць ехаць, ажно бачыць з сяла да яго народ валіць – хто з сякераю, хто з пілою, хто з насекаю, а хто проста з кіем. Сцяміў ён бяду немінучую. Кінуўся ў хату. Разбудзіў жонку і сына, сам узяў вялікі крыж, а ім даў па малому і чым дужы ў лес. Сяляне тое як забачылі – зараўлі ад злосці ды кінуліся ўдагонку. Турэ тыя ўцякалі на ўсю моц, ажно разам спыніліся, бо прыбеглі к вялікаму непраходнаму балоту. І апанаваў іх вялікі страх, ды кажуць яны:

– Што мы з новае веры скарысталі? Бадай мы той час лепш каменнямі сталі, як маглі яе пазнаваць!

Тады Бог і перакінуў іх за гэта ў каменне. Прыбягаюць людзі ўслед за імі – аж нідзе нікагутка, адно тры каменні ляжаць.

– Вот табе і нашы Турэ! – кажуць сяляне, апусціўшы рукі.

Турамі завуцца тыя каменні і цяпер, а крыжы пазнаходзілі ў зямлі ўжо з нашых часоў. Яшчэ гадоў дваццаць таму жылі тыя людзі, што з тых крыжоў нарогі рабілі» [20, с. 360–361].

Чамусьці апавядальнікі, калі звярталіся да мінуўшчыны, няхай сабе і не такой ужо далёкай і сівой, тым не меней, абавязкова імкнуліся

падкрэсліць, што «даўней людзі былі намнога здаравейшыя і... разумнейшыя, з любой сітуацыі выйсце маглі запроста адшукаць, а ўсё, што знаходзілася вакол іх, побач з імі маглі прыстасаваць для сваіх гаспадарчых спраў і прылад, «з тых крыжоў нарогі рабілі». Праўда, тут, напрыклад, не адчуваецца асаблівай прыхільнасці да новай, хрысціянскай, веры, бо гэта ж з яе найбольш шанаванага сімвала мясцовыя жыхары ўмудрыліся выклепваць у каваля свае нарогі для сохаў. Такую блытаніну ў сюжэце можна зразумець даволі проста: галоўнае было «хораша і складна распавесці, а што далей атрымаецца, то тое мала каго цікавіла...». Чалавек-земляроб мог многае перайначыць, але рабіў жа ён гэта не для нейкіх там здзекаў ці кпінаў, а для таго каб хораша апрацаваць зямліцу-маці, зямліцу-карміцельку. Ці не з-за гэтага шмат што і даравалася?

У палескай вёсцы Галубіца, што непадалёку ад Петрыкава, стаіць на старых могілках парослы даўнінай чырвоны камень. На гранітнай пліце кірыліцай высечаны словы, некаторыя з іх ужо цяжка прачытаць. Вось гэты надпіс: «Року 1595 месяца июня дня помяни и (магчыма, Ісусе. – *А. Н., Я. Н.*) Андрея Калины от Ивана Радуты камень». Памеры выробленага прамавугольнага гранітнага каменя – 20 × 5 (таўшчыня) × 90 сантыметраў.

У трэцім томе «Жывапіснай Расіі» згадваецца пра наступны помнік: «У тым жа Лепельскім павеце, ля самай дарогі, якая вядзе з Сушы на Улу, знаходзіцца вялікі каменны крыж з граніту, вышынёй адзін і тры чвэрці аршына, шырынёй – адзін з чвэрцю. На крыжы высечаны славянскімі літарамі надпіс на беларускай гаворцы: «1569 тут пакладзена 200 жаўнераў (ваяроў. – *А. Н., Я. Н.*) ва Хрысце паставілі пасля бітвы», апошняе слова не прачытана» [18, с. 68]. Вось так жывыя паклапаціліся аб памяці сваіх мужных паплечнікаў, якія загінулі ў крывавай бітве з лютымі ворагамі. І стаяў бы гэты помнік многія дзясяткі, а можа, і сотні гадоў, каб не злыя людзі. Яны звалілі крыж, разбілі яго на некалькі частак і ўжылі для сваіх гаспадарчых патрэб.

Паводле літаратурных крыніц і публікацый, вядомыя каменныя крыжы каля дарогі Магілёў – в. Вендараж з надпісам «афчи иван». Звесткі пра яго апублікаваны Е. Р. Раманавым. Другі крыж знаходзіцца непадалёку ад дарогі Бягомль – Вітунічы, паміж вв. Сасновая і Асінавік. На сярэдкрыжжы яго высечана выява чалавека з мячом, шчытом і каронай на галаве, пад выявай літары – «Р», «В», а пад імі два кругі (адзін у адным). Паводле мясцовых паданняў, крыж гэты звязаны з імем польскага караля Стэфана Баторыя, які са сваім войскам ішоў сюдой на рускія землі. Тым больш, што і першапачатковыя літары: «Р» (rex) – кароль Стэфан, «В» – Batory – указваюць на гэта.

У 80-я гады мінулага стагоддзя глускі краязнаўца А. І. Аляхно паведаміў мне, што ў Старым Сяле Глускага раёна ўжо гадоў 20–25 на Акулавай гары ляжыць звалены каменны крыж, але яго мясцовыя жыхары баяцца кранаць, бо лічаць, што тады адразу Усявышні пакарае іх за гэта. Там жа знаходзіліся і святыя камяні, якім пакланяліся старадаўнія нашы продкі. Раней гаварылася ў народнай легендзе, ля іх білі гаючыя крыніцы, якія таксама з'яўляліся аб'ектамі пакланення і шанавання. На гэтай гары пастаянна гуляла моладзь, спраўляючы Купалле: спявалі песні, вадзілі карагоды і г. д. Кажуць, што на Акулавай гары ніколі не было лесу, і таму ўсё, што на ёй адбывалася, было відаць людзям на адлегласці ў дзясяткі кіламетраў.

Зрэдку з'яўленне каменнага крыжа звязвалася ў народзе з рэлігійнымі матывамі. У такіх выпадках вакол крыжоў існавала мноства самых разнастайных легендаў і паданняў, якія нібыта, на думку патрыярхальных людзей, раскрывалі іх святасць. Часам крыжы нават з'яўляліся неад'емнымі і своеасаблівымі атрыбутамі ў рэлігійнай барацьбе паміж праваслаўнымі і езуітамі. Так, непадалёку ад вёскі Купяцічы Пінскага раёна яшчэ зусім нядаўна можна было ўбачыць вялікі крыж, які стаяў побач з надмагільным каменем. Надпіс на ім сведчыў: «Представился раб божий Кирилл Семен Терлецкий... епископ Пинский и Туровский, а положен был здесь... лета божия 15... мая месяца». Ад сябе можам дадаць, што Цярлецкі быў адным з самых лютых прыхільнікаў уніі і яго дзейнасць распачала эпоху рэлігійных войнаў, якія ў свой час раздзіралі Рэч Паспалітую. І, мабыць, вельмі ўеўся ў косці мясцоваму люду, які прытрымліваўся праваслаўнай веры, бо да нашага часу існуе павер'е, паводле якога вынікала: маланка сотні разоў біла ў гэты крыж. Заўважым, што людзі хацелі падкрэсліць, што не ў высокія дрэвы і будынкі, а менавіта ў крыж, каб гэтым падмацаваць той факт, што сам Усявышні нават пасля смерці епіскапа пастаянна яго турбаваў за тое, што ён быццам бы пры жыцці ганьбаваў сапраўдную веру. У гэтай гісторыі рэальныя карані маюць толькі канкрэтная гістарычная асоба – епіскап Цярлецкі – і ўзвядзенне каменнага крыжа. Усё астатняе ні больш ні менш як прыгожая легенда.

З Гомельшчынай звязана гісторыя аднаго з самых старажытных каменных крыжоў на тэрыторыі Беларусі. Гэта так званы Тураўскі, ці Святы, крыж. Ён стаяў на могілках вёскі Пагост, што ляжыць на беразе Прыпяці ў Жыткавіцкім раёне, але ў 1979 годзе яго перавезлі ў Гомельскі абласны краязнаўчы музей, дзе ён экспануецца і ў нашыя дні. Памеры гэтага крыжа наступныя: вышыня – два метры, шырыня – 70 сантыметраў. Ён зламаны прыкладна пасярэдзіне. З ім жыхары навакольных вёсак

звязваюць некалькі легендаў. Самая прыгожая з іх, на нашу думку, вось гэтая:

Некалі, даўным-даўно, можа нават тысячу гадоў таму назад, на месцы сучаснай вёскі Пагост нічога не было. Толькі ў далечыні ад берага стаяла хаціна, у якой жылі муж з жонкай ды двое іх малых дзетак. Яны займаліся тым, што дзень і ноч, не разгінаючы спіны, працавалі, каб неяк пракарміцца, звесці канцы з канцамі, а сынкі іх заставаліся ў хаце. Праўда, часінаю вырываліся на рэчку, каб налавіць свежай рыбы, ці ў лес, каб прынесці ягад і грыбоў. Адным словам, малыя дапамагалі бацькам чым толькі маглі. Аднойчы старэйшы хлапчук вельмі моцна захварэў. Ён увесь гарэў, трызніў, клікаў маці і татку, хоць тыя і так не адыходзілі ад яго ні на крок. З кожнай гадзінай яму станавілася ўсё горш і горш, і вось наступіла ночка, якую бацькі палічылі ўжо апошняй ночкай іхняга сынка. Чаго яны толькі не давалі піць маломy, якія замовы толькі не шапталі – усё было безвынікова. Селі ўсе ля ляжанкі і заплакалі, а хворы крычаў і біўся ў непрытомнасці...

Бацька нарэшце не вытрымаў. Ён упаў на калені ля дзвярэй і закрычаў у адчаі:

– Неба! Дапамажы, а я ўсё зраблю, каб аддзякаваць!..

Побач з ім укленчылі жонка і сын:

– Неба! Не адвярніся. Дапамажы нам! Не дай бядзе прыйсці ў нашу хату!..

То ціха-ціха было на двары, а то раптоўна загуў вецер, шалёна засвістаў у верхавінах дрэў, пачала раз-пораз бліскаць маланка. Цёмныя груvасткія хмары закрылі месяц і зоркі. Бура выла гэтак, што здавалася, яна зараз узарве хаціну і панясе яе ў нязведаную далячынь. Нават сюды даносіўся плёскат прыпяцкіх хваляў, якія выбягалі далёка за берагі і не паспявалі вяртацца назад, як іх даганялі новыя, яшчэ больш буйныя.

– Людзі! Я дапамагу вам! Я вярну сілы і бадзёрасць вашаму сыну!..

– Дзякуй, дзякуй табе, – у адзін голас, стоячы на каленях ці то ад павагі, ці то ад перапалоху загаварылі мужчына і жанчына...

– Я дапамагу вам! Але вы свята шануйце ў будучым тое, што знойдзеце наступным днём, і няхай дзеці вашыя, унукі і праўнукі будуць шанаваць яго і пакланяцца!..

Неба зноў зацягнулі хмары, пайшоў дождж, загуў дзікі вецер у верхавінах лесу. Бацькі зірнулі на свайго хворага. І дзіва! Той спаў. Але спаў не гэтак, як падчас хваробы, а як і раней, аб нечым стомлена ўсміхаючыся ў сне.

Раніцай старэйшыя пакармілі дзяцей і пайшлі разграбаць сена на лузе, які быў непадалёку ад хаты, бо яго вельмі параскідала ветрам.

Адзін сын, які яшчэ не набраўся сілы, застаўся ляжаць, а другі пайшоў на рачныя мачажыны, каб там паназбіраць павыкіданай за ноч з вады рыбы. Падышоўшы да берага, малы ўбачыў нешта дзіўнае, што да гэтага часу яму ніводнага разу сустракаць не даводзілася. Нейкі доўгі каменны слуп ляжаў на пяску метраў за дваццаць ад берага. Малы са страху прыпусціў да бацькоў і расказаў ім пра ўсё. Калі старэйшыя падышлі і агледзелі дзіўны прадмет, то прыйшлі да высновы, што гэта і ёсць тое, што ім наказвала нябесная выратавальніца іхняга сына. Вырашылі адцягнуць крыж яшчэ крыху вышэй і паставіць яго на ўзгорку, каб ён быў бачны здалёку. Што рашылі, то тое і зрабілі, а з цягам часу пабудавалі над ім драўляную капліцу і сталі пакланяцца крыжу як свяшчэннай істоце. Адтуль і назва – Святы крыж. Кожны год, пасля кірмашу (гэта ўжо ў наш час. – *А. Н., Я. Н.*) мясцовыя жыхары прыносілі да капліцы своеасаблівы аброк: палатно, мяса, рыбу, птушку і пакідалі ля падножжа крыжа [УЗ, 1].

Прыгожая легенда, але факты – з'ява суровая. І таму мы прытрымліваемся думкі, у якой, як лічым, ёсць рэальныя карані. Хутчэй за ўсё крыж паставілі прапаведнікі новай веры – хрысціянскай у мясціне, дзе да гэтага язычнікі здзяйснялі свае рытуальныя абрады. На гэта ўказвае і прыкладны «ўзрост» крыжа – XI стагоддзе. Да таго ж існуе яшчэ адна легенда, якая апавядае пра тое, што пасля ўвядзення хрысціянства ў Тураве і навакольных вёсках, у Прыпяці вада была чырвонай некалькі дзён ад крыві. Гэтак сурова і бязлітасна аднесліся пасланцы кіеўскага князя да сваіх непакорлівых суседзяў, якія не надта жадалі слухаць на іхнія прамовы і адмаўляцца ад язычніцкай веры сваіх продкаў. Маўляў, ім было добра пры шматлікасці багоў, выявы якіх знаходзіліся сярод іх, а не недзе там высока і далёка на нябёсах. Таму і нам добра. За празмерную ўпартасць заплацілі тураўцы сваімі жыццямі. Так ужо павялося, што ў тыя часы ніякая падзея без крыві не абыходзілася.

У тым жа музеі экспануюцца яшчэ два каменныя крыжы, праўда, значна меншых памераў (прыкладна метр у вышыню і сантыметраў 70 у шырыню). Яны выкарыстоўваліся па сваім непасрэдным прызначэнні – стаялі на Барысаглебскіх могілках (адзіных, якія захаваліся ў старажытным Тураве) на магілах памерлых. Адзін з іх – двайны крыж. Гэта значыцца, на самім крыжы выбіты яшчэ адзін. Нейкі сумленны працаўнік доўга рыхтаваў такі просты помнік, каб потым паставіць яго на магіле блізкага яму чалавека і такім чынам захаваць памяць памерлага сярод нашчадкаў.

Як слушна адзначае ў прыватным лісце да аўтараў гэтай кнігі расійскі даследчык Ю. Лабынцаў, «да ліку самых старажытных помнікаў гара-

да (маецца на ўвазе Тураў. – *А. Н., Я. Н.*) адносяцца і каменныя крыжы, якія зараз перанесены ў памяшканне адзінай ацалелай у Тураве царквы. Паданні настойліва звязваюць іх паходжанне з перыядам хрысціянізацыі Тураўшчыны. Крыжы гэтыя быццам бы самі прыплылі ўверх па цячэнні Прыпяці і потым былі пастаўлены сярод палёў у паўднёва-заходняй частцы горада. Народ здаўна называе гэтыя крыжы "голымі", у адрозненне ад каменных крыжоў у вёсках Верасніца і Пагост, над якімі ў свой час былі ўзведзены капліцы. Тураўскія каменныя крыжы маюць вышыню больш за два метры і шырыню крыху меней метра. Больш падрабязную характарыстыку даць ім немагчыма, таму што, з'яўляючыся і па наш дзень прадметамі асаблівага шанавання сярод веруючых, яны схаваны ад вачэй пад тоўстым пластом са шматлікіх вышытых ручнікоў. У даўнія крыжы пакланіцца крыжам прыплывалі людзі з усёй Прыпяці. Лічылася, што крыжы гэтыя цудатворныя, што яны вылечваюць хворых. Асабліва шмат людзей збіралася да крыжоў на Узвіжанне. У адрозненне ад гэтых, вялікіх каменных крыжоў, на Барысаглебскіх могілках знаходзілі і крыжы малыя... з далонь велічынёй. Яны трапляліся даволі часта, і гэта дае падставы меркаваць, што іх выраблялі ў Тураве ці дзесьці паблізу ад яго» [18, с. 9].

Каменныя крыжы згадваліся ў фальклорных творах даволі часта. Гэта былі і культавыя (пакланяльныя) сімвалы, якія ўзвышаліся на высокіх пагорках і былі відаць здалёку; гэтыя крыжы маглі асацыявацца з нейкай канкрэтнай падзеяй, і нават неабавязкова, каб рэлігійнай (крыж-помнік як на брацкіх вайсковых магілах, так і на месцы пахавання звычайных людзей). А тое, што з крыжамі звязвалі легенды аб іхнім цудоўным узнікненні, то фантастычны элемент заўсёды прысутнічаў у вуснапаэтычнай творчасці. «Каменныя крыжы ля Турава»: «Паблізу Турава стаяць у полі два каменныя крыжы каля сажані вышыні. Пра іх расказваюць, што яны плылі па Прыпяці ўверх, проці вады, і калі іх перанялі ў Тураве, дык уся вада зрабілася крывёю» [20, с. 361].

Ці паданне, прысвечанае нейкай трагічнай падзеі, здарэнню. «Каменны крыж»: «Па гэтаму масту ехала аднойчы нейкая вялікая княгіня. Мост пад карэтай рухнуў, і княгіня ўтанула. Знайсці яе не змаглі. Тады князь забараніў ездзіць па гэтай дарозе, і яна засохла, а на беразу ракі з'явіўся гэты крыж» [Тамсама].

Агульнавядома, што ў культавых мэтах камень на Палессі, напрыклад, выкарыстоўваўся задоўга да прыняцця хрысціянства. Сваіх багоў язычнікі высякалі з трывалага дрэва ці з... каменя. Каменныя ідалы ці іх галовы знойдзены на Палессі ля вёсак Чаплін Кобрынскага, Залужжа Жабінкаўскага, Астрамечава Брэсцкага раёнаў. Нешматлікасць знахо-

дак язычніцкай каменнай скульптуры тлумачыцца тым, што праваслаўе, якое стала дзяржаўнай рэлігіяй, паўсюдна знішчала капішчы і ідалаў. Для адваджвання язычнікаў ад шанаваных імі свяшчэнных месцаў замест ідалаў ставілі крыжы, якія таксама высякалі з каменя.

М. Мялешка слушна адзначае, што «з прыняццем на Беларусі хрысціянства камень не страціў да сябе пашаны. Пакланенне камяням заставалася яшчэ вельмі доўга. У некаторых жа выпадках замест каменных багоў, якія былі аб'яўлены паганымі, народ стаў на камені высякаць хрысціянскія эмблемы. Там, дзе раней стаялі камяні з паганскімі багамі, паступова... пачалі з'яўляцца каменныя крыжы і г. д. Каменных крыжоў на Беларусі даволі многа. Мне асабіста здаралася бачыць каменныя крыжы на Віцебшчыне, непадалёку ад Тадулінскага манастыра, на Ласосінскіх могілках у б. Сялюцкай воласці, якія, відаць, пастаўлены тут ужо пазней і зрушаны з сваіх першых месцаў. Часта сустракаюцца агромністыя крыжы на Полаччыне па старадаўніх шляхах.

Між іншым на Полаччыне вядомы так званыя жальныя крыжы – два ў Якіманіі каля царквы і адзін каля вёскі Ксты, непадалёку ад г. Полацка. На апошнім ёсць такі надпіс: «сто въхрь станъко». Назва вёскі Ксты паказвае, што тут, відаць, быў не адзін такі крыж. Што азначае надпіс, які захаваўся на гэтым крыжы, сказаць цяжка, бо частка надпісу сцёрлася. М. Кайгародаў (дарэвалюцыйны вучоны. – *А. Н., Я. Н.*) лічыў, што Кстоўскі крыж пастаўлены на брацкай магіле ў час вайны Івана Грознага са Стэфанам Баторыем. Стаіць крыж не на старым сваім месцы, а пераастаўлены на новае. У часе сваіх археалагічных пошукаў на Полаччыне ў 1852 годзе Гаворскі (вядомы тагачасны рускі археолаг. – *А. Н., Я. Н.*) памінае аб гэтым крыжы ў в. Ксты і нават падае яго надпіс у такім выглядзе: "Стъ въ хра...нько". Кажа і аб каменным крыжы ў Бяздзедавічах, які прынесены быў сюды са старадаўняга могільніка; на гэтым крыжы Гаворскі здолеў прачытаць такі надпіс, напісаны славянскімі літарамі: "Во. мя. ца и сына и святого духа аминь. Сия паметь поставлена по рабе божіим ... хау ... а поставилъ сынъ по тщ...ахл". Каля м. Ветрына ім знойдзена некалькі каменных крыжоў, на адным з іх можна было прачытаць "Іоанко Нъманушкевичъ"... Другія літары сцёрліся» [25, с. 10].

Цікавы і даволі сціплы помнік, так званы Федзькаў крыж, які знаходзіцца непадалёку ад Заслаўя. Калі глядзець на яго з боку Заслаўя, камень мае від крыжа, а з процілеглага боку – фігуры чалавека. Паданне распавядае, што на гэтым месцы гадоў 100–150 таму разбойнікі забілі Федзьку і забралі грошы, якія ён атрымаў за апошнюю прададзеную карову. Бедна, вельмі бедна жыў той гаспадар і таму спадзяваўся, што, збыўшы жывёліну, прыкупіць тое-сёе, і вясковыя справы ў ягонай сям'і

пойдуць уверх. Але жорстка пралічыўся. І ў страшным сне падумаць нават не мог, што сусед-зайздроснік уважліва сочыць за кожным ягоным крокам. Таму ён толькі карову на кірмаш на досвітку павёў, а крывавая кампанія ўжо засела ў засадзе, рыхтуючыся да жудаснай сустрэчы. Федзьку пахавалі на вясковых могілках, а на месцы забойства яго родныя паставілі гэтакі крыж.

У Вілейскім раёне, паміж вёскамі Даўгінава і Жары, таксама стаяў ля дарогі каменны крыж. Мясцовыя жыхары здаўна ставіліся да яго з асаблівай павагай, неслі сюды па святах кветкі. Крыж высечаны з гнейсавага валуна, злёгку крануты з паверхні выветрываннем. Вышыня вырабу – 173 см, размах – 107 см. Для такіх памераў ён даволі тонкі – усяго каля 20–25 см.

Па ўсіх параметрах гэты помнік – не крыж, а ідал нейкага жаночага бажаства. Атрымліваецца, што гэта не хрысціянская святыня, а куды больш старажытная, язычніцкая.

Адметнасць помніка гэтым не канчаецца. Калі агледзець яго «са спіны», першае, на чым засяроджваецца ўвага, – чатыры не зусім зразумелыя знакі. Чымсьці яны нагадваюць своеасаблівыя квадраты або чатыры крыжыкі. Два знакі размешчаны насупраць «грудзей», трэці – ля «сэрца» ідала і яшчэ адзін на ўзроўні «жывата». Адлюстраваннем надаваўся нейкі затоены магічны сэнс, што таксама пацвярджае архаічнасць ідала.

Па-іншаму крыж называюць даследчыкі – крыж крыжоў, вогненны крыж або крыж Мары, адзін са спосабаў яе шматаблічнага вызначэння. Мара ўваходзіла ў лік самых старажытных багоў індаеўрапейцаў. Напэўна, з самага пачатку Мара загадвала многім: «адказвала» за замагільны свет, садзейнічала працягу роду, была заступніцай жанчыны і г. д. Пазней, калі развіццё грамадства дыферэнцыравала дзейнасць людзей, адбылася спецыялізацыя і багоў. На Беларусі яе замагільную іпастась пачалі звязваць з нечысцю (у беларуса Мара – прывід, злы дух), а абавязкі заступніцы жанчын, пладавітасці, ураджаю былі перанесены з іншых на Мар'ю і іншых вядомых куміраў.

# ДЗІЎНЫЯ КАМЯНІ-СЛЕДАВІКІ

Але не толькі каменныя крыжы прыцягвалі і прыцягваюць увагу даследчыкаў. Не менш цікавым аб'ектам вывучэння з'яўляюцца і камяні-следавікі.

Першым звярнуў увагу на камяні-следавікі старажытнагрэчаскі гісторык Герадот (V ст. да н. э.). У сваіх нарысах аб старажытнай Скіфіі як незвычайную з'яву ён адзначыў «ступню Геракла» ў скале на беразе Днястра і падкрэсліў, што мясцовае насельніцтва пакланялася гэтай скале і вельмі шанавала яе.

Ад гэтага ж самабытнага даследчыка захаваліся надалей звесткі пра тое, што нашы продкі былі сонца- і водапаклоннікамі, шанавалі лясы і звяроў, мелі магутных і непадатлівых татэмаў, якія старанна апекаваліся мясцовымі родамі, не дапускаючы таго, каб іх крыўдзілі больш моцныя суседзі ці нечаканыя ворагі, якія прыйшолі-наскочылі аднекуль. Герадот згадваў, што насельніцтва тэрыторыі, якая пазней стала Беларуссю, мела свой календар, які грунтаваўся на феналагічных назіраннях

і на тлумачэнні руху нябесных свяцілаў. Увогуле, прыгадваў высокую духоўнасць і самаададанасць у барацьбе-выжыванні з сіламі лютай мясцовай прыроды, у пастаянных бітвах-супярэчнасцях з зайздроснікамі-суседзямі.

Многія цікавыя выпадкі прыводзіць у сваёй працы Э. Ляўкоў, спашлемся на яго: «На Цэйлоне і ў Індыі вядомыя сляды Буды, якія існавалі ўжо ў 90-м годзе да нашай эры. Ва ўсялякім разе так іх апісалі кітайскія паломнікі. Пазней гэтыя паглыбленні шанавалі не толькі будысты, але і прыхільнікі ісламу. След Ісуса Хрыста ў Іерусаліме прыгадваецца з IV стагоддзя нашай эры».

А вось яшчэ адна «гісторыя». Упершыню яе запісаў на мяжы I і II стагоддзяў нашай эры Тацыт, які расказаў пра культ язычніцкай багіні Герты на востраве Руген. Лічылася, што яна некалькі разоў на год у ясную месячную ноч з'яўлялася ля Святога возера, схаванага ў глухім лесе. Багіня прыязджала на беласнежных валах. Яе суправаджалі вярхоўны жрэц, прыгожыя служкі, шматлікія рабы. Пасля купання багіні рабоў і выпадковых сведак тапілі ў возеры. Юныя жрыцы давалі зарок бясшлюбнасці.

Аднойчы вярхоўнаму жрацу данеслі, што адна жрыца кожную ноч таемна сустракаецца з воінам-чужаземцам. Допыт не выявіў вінаватай. Тады грозны жрэц пачаў падводзіць дзяўчат адну за другой да валуна, прымушаючы іх наступаць босай нагой на камень. І тут да жаху прысутных як толькі адна з іх даткнулася каменя, на ім з'явіўся адбітак ступні, а побач маленькі след дзіцячай ножкі. Вінаватая была знойдзена. Пацягнуў няўмольны служка няшчасную да мора і на навуку астатнім скінуў з высокай скалы. Як сцвярджае далей легенда, велікадушная Герта пашкадавала юную грэшніцу, дапамагла ёй мякка апусціцца на рукі каханага, які чакаў яе ў моры на караблі. Даўно ў нябыт адышлі язычніцкія багі і жрацы, закінута старажытнае капішча, а валун са слядамі дзяўчыны і дзіцяці дагэтуль ляжыць на тым самым месцы каля возера Герты на Ругене. Зараз гэта адна з яго славутасцяў» [22, с. 152].

Толькі, як заўсёды чамусьці здараецца ў жыцці: людзі спакойна займаліся гаспадарчымі справамі, адно пакаленне неяк незаўважна замяняла другое, пераймаць імкнуліся найбагацейшы практычны вопыт, а вось духоўны бок існавання людзей на гэтай тэрыторыі адступаў на задні план. Дарэчы, гэтая рыса характэрная не толькі для старажытных людзей.

Увогуле, больш-менш сістэматычным вывучэннем камянёў-следавікоў пачалі займацца яшчэ ў дарэвалюцыйнай Расіі. Так, у першай палове XIX стагоддзя ў Акадэмію мастацтваў дайшлі звесткі ад свяшчэнніка Андрэя Дзюкава з в. Хіціцы Асташкоўскага павета, што непадалёку

ад іх вёскі знаходзіцца камень, на якім выбіты крыж, ласіны рог і мядзведжая лапа. У тым жа павеце, паблізу вёскі Замошша, адзін селянін знайшоў валун (1888 г.), на якім былі адлюстраваны «нейкія дзіўныя крукі, вілы і сярпы». Такой была «расшыфроўка» саміх відавочцаў. Вядома ж, ніякіх замалёвак ці апісанняў убачанага каменя не захавалася (бо іх і не рабілі, пагаварылі-пагаманілі паміж сабою вяскоўцы і ўсё на тым!).

Адным з першых, хто пачаў збіраць у Расіі звесткі пра гэткія ж дзіўныя камяні, быў дзекабрыст Ф. Глінка, якога саслалі ў 1830 годзе ў Цвярскую губерню. У сваім маёнтку Кузняцова Бежыцкага павета ён стварыў нешта падобнае да музея пад адкрытым небам, дзе знаходзіліся знойдзеныя і прывезеныя ім сюды экспанаты. Як мы ўжо згадвалі, у Акадэмію мастацтваў аднойчы прыйшло паведамленне ад святара Хіціцы Асташкаўскага павета Андрэя Дзюкава пра вялікі камень, на якім выбіты крыж, ласіны рог і мядзведжая лапа. У гэтым жа павеце, паблізу вёскі Замошша, адзін селянін у 1880 годзе знайшоў валун з адлюстраваннямі «падобнымі да храпак, вілаў, кастылёў з кручкамі наверсе, трохзубцаў і сярпоў». Праўда, калі б і «дажыў» той музей да нашага часу, то мала што б мы змаглі б у ім убачыць: усе цяжкія камлыгі ўручную не выпадала ніякім чынам звезці ў адпаведнае месца. Тым болей, што знаходзіцца яны маглі за дзясяткі кіламетраў адзін ад другога. Такой нагрузкі не вытрымлівалі не толькі людзі, але і коні, і... вазы-павозкі.

Часцей за ўсё на асобных камянях, якія сустракаліся ў розных расійскіх губернях, былі выбіты (дакладней, мабыць, адлюстраваны) сляды чалавечых ног. Вось тут і пачыналася своеасаблівая «раздвоенасць» у тлумачэнні знаходак. З іншага боку, калі ўлічыць, што паводле народнага, стваральнікамі самога Сусвету і ўсяго, што ў ім жыве і расце, выступалі Усявышні і святыя, то няма чаму здзіўляцца. Таму, у адных выпадках мясцовыя жыхары называлі камяні-следавікі «чортавымі слядамі», «слядамі д'ябла» і г. д., у другіх – «боскімі слядамі», «слядамі Хрыста», «нагамі Багародзіцы». Такой рэакцыі і выпадала чакаць.

Калі першыя карысталіся дурной славай і заўсёды абміналіся насельніцтвам, то апошнія былі ў вялікай пашане. Пра «чарцяцкія» выявы так і гаварылі ў народзе: «Чаго ты туды пасунешся? Каб нячыстаму пакланяцца? Каб ягоныя дзеянні ўслаўляць? То гэтым самым ты д'ябальскае існаванне і падтрымаеш, хіба ж гэта можна рабіць? Ад цябе і іншыя могуць пераняць нешта дурное ды ліхое. Схадзі лепей да боскіх слядкоў, то ля іх нечаму і навучышся і з іншымі людзьмі сустрэнешся. Туды ж людская дарога не зарастае. Лічылася, напрыклад, што вада з «божых слядкоў» з'яўляецца моцна гаючай, дапамагае вылечваць ад усялякіх

хвароб, «ставіць на ногі самага хворага чалавека, не дае яму заўчасна памерці...». У XIX ст., а ў некаторых мясцінах то і ў наш час (напрыканцы XX стагоддзя) этнографы і краязнаўцы назіралі абрады, у якіх не апошняе месца займалі своеасаблівыя прынашэнні камяням: яйкі, дробныя грошы, матэрыя – усё ішло на падарункі. І самае галоўнае, што ўсё рабілася на поўным сур'ёзе, без нейкіх там жартачкаў.

У 1907 годзе ў Варшаве была выдадзена кніга Максіміліяна Баруха «Божыя стопкі», у якой сабраны звесткі даследчыка з усяго свету, уключаючы паданні і легенды пра высечаныя ў камянях чалавечыя сляды. Барух карыстаўся тагачаснай прэсай і даступнымі яму археалагічнымі і этнаграфічнымі справаздачамі. І тут адразу праявіліся некаторыя асаблівасці.

На паасобных следавіках, акрамя слядоў чалавека, сустракаюцца адлюстраванні мужчынскіх і жаночых сімвалаў пладароднасці, якія займалі асаблівае месца ў звычаях і вераваннях старажытных народаў. Часам гэтыя сімвалы выбіваліся на камянях і асобна. І гэта ўжо падкрэслівала факт таго, што камяням не толькі адводзілася тапанімічная роля. Былі і іншыя прычыны пакланення і шанавання.

На Беларусі камяні-следавікі здавён сустракаліся вельмі часта. Амаль аб кожным з такіх камянёў былі сярод мясцовага насельніцтва складзены легенды. На Віцебшчыне, дзе іх асабліва многа, адзін з такіх славутых



*Следавік у Музеі валуноў у г. Мінску*

камянёў з адбіткам нагі знаходзіўся ля мястэчка Дзівін. Існавала легенда, што тут нібыта некалі, даўным-даўно, жыла дзяўчына-волат, якая ўсяго ў адзін крок пераступала ўсю раку. Толькі раз яна нечакана спатыкнулася і, нібы шукаючы раўнавагі, наступіла на гэты вялізны валун, які своечасова аказаўся на патрэбным месцы, і пакінула на ім адбітак сваёй нагі. Ці не адгалоссе гэта яшчэ больш старажытнага падання, паводле якога тэрыторыю сучаснай Беларусі насяляла племя волатаў (велетаў, вялетаў), якое потым нечакана вымерла (паводле іншых звестак, было вынішчана шматлікімі крыважэрнымі суседзямі), і да нашых дзён дайшлі толькі так званыя магілы-валатоўкі. Гэта своеасаблівыя напаміны і пра людзей, і пра трагічныя падзеі, і пра слаўную ды гераічную гісторыю.

Паводле шматлікіх легенд і гісторый, адпачываючы ці вартуючы сон і працу сваіх землякоў, волат гуляўся са здаравеннымі камянямі: перакідваў іх і, шыбнуўшы высока, стараўся потым абавязкова злавіць. Тым самым развіваў і фізічную сілу і спрыт адначасова. А то пры любым зручным выпадку наладжвалі паміж сабою спаборніцтвы і іхнім вынікам падкрэслівалі тое, хто з іх быў на той момант першым: самым моцным, магутным і ўвішным. Гаварылі, што ганаравалі такога пераможцу вырваным з каранямі маладым дрэўцам, якое ўручалі волату ад імя ўсіх прысутных.

Паводле М. Мялешкі, «больш за другія адмены камянёў, якія адбіваюцца ў народных вераваннях і паданнях пашыраны на Беларусі камяні з рознымі знакамі, а асабліва ступнёй босай нагі чалавека. У м-ку Вызна на Случчыне ляжыць камень, які называецца Божа ножка. На гэтым камені выразна відаць адбітак ступні чалавечай. Над каменем пабудавана капліца. У Беларуцкай вол. на Меншчыне, недалёка ад вёскі Мачаны, каля гарадзішча, знаходзіцца камень з высечанай на ім падковай. Пераказваюць, што тут былі захаваны каштоўныя рэчы, у знак чаго і паложаны гэты камень з паметаю. Такі ж самы камень ляжаў і каля Сёмкава-Гарадка... Камень са знакам, падобным да следу чалавека, маецца яшчэ на паўдарозе з г. Слуцка ў м-ка Грозава, гэты след застаўся быццам бы ад святога Мікалая, які ішоў у бліжэйшую царкву паказваць цуды.

У Вялейскім павеце Віленскай губ. ёсць камень, на якім бачаць адбітак чалавечае нагі. У Ашмянскім павеце, пры гасцінцы з Трок у Ашмяны, ёсць камень гэтаксама з адбіткам чалавечае нагі. У двары Юзэфова, у полі, пры в. Мэйры Лідскага пав. на вялікім камені відаць адбітак чалавечае нагі; у народзе кажуць, што гэта след Багародзіцы. У Троцкім павеце, двары Міткішкі Казакіскай парафіі, на правым беразе р. Вяллі знаходзіцца такі ж самы камень, які завецца следам Маткі Боскай.

У м-ку Пераброддзе і в. Мурашках Перабродзкай вол. Дзісенскага павета Віленскай губ. знаходзяцца камяні са слядамі ног. У гэтым жа павеце на лузе засценка Заплісся на камені выбіта шабля. У двары Каменаполле Міорскай вол. Дзісенскага павета Віленскай губ., у месцы, званым Святая воля, быў камень, на якім меўся адбітак падковы і пісталета. У м-ку Пагост Дзісенскага пав. Віленскай губ. ёсць камяні з выбітымі міскамі і падковамі.

Недалёка ад в. Півачына Пружанскага пав. Горадзенскай губ. быў вялікі круглы камень, на роўным месцы каторага відаць былі два паглыбленні, падобныя да адбіткаў чалавечых ног, і ямка, якая быццам сталася ад таго, што хтось сядзеў на камені. Гэтыя сляды, паводле народнага падання, пакінуты святой Дзевай, калі яна ішла ў Іерусалім з малым Хрыстом на руках і адпачывала на камені.. Дажджавая вада на камені быццам ніколі не высыхае ў яго ямках і добра памагае ад трасцы, калі ёю памыцца» [25, с. 31].

Любы знак у «каменнай кніжцы» з лёгкасцю тлумачыўся народнымі дарадцамі, якія ўмела прыстасоўвалі ўсё гэта да пэўных падзей, да біблейскіх святых ці іхніх дзеянняў. І святыя тады па зямлі хадзілі, з людзьмі сустракаліся, нешта ім раілі-падказвалі, ад нечага адмаўлялі, не давалі саграшыць супраць Усявышняга, каб не прагневаць нябеснага валадара, бо тады б давялося напоўніцу сербануць з таго гневу і шалу. Адносна таго, што камяні былі не цвёрдыя, а мяккія, і на іх таму лёгка заставаліся сляды ад ног ці іншыя якія знакі, пераконвалі, што ў тыя часы і камяні мелі тэмпературу чалавечага цела, закамянелі і сталі цвёрдымі («ажно з іх іскры ляцяць») значна пазней, калі «назбіралі» вялікую процьму грахоў з-за адносін не толькі да святых, але і да людзей таксама. Вось тады на іх і падзейнічаў гнеўны праклён (заклён) Маткі Боскай.

У фальварку Ласёўка Б. Пагоскай вол. Ігуменскага пав. Менскай губ. знаходзяцца два камені, адзін з якіх, большы, мае форму сядла. На абодвух вельмі выразна выбіта па адным следзе босай чалавечай нагі. Не выключана, што гэта камяні-«ўказальнікі» правільнасці шляху, карыстаючыся якімі падарожны знаходзіў кірунак да пераправы, карчмы, наступнага населенага пункта. Тут галоўнае было ўмець карыстацца гэтымі каменнымі «падказкамі». Бо тое, што яны, быццам бы, ляжалі на месцы той самай пераправы, карчмы, паселішча не надта вяжацца з логікай разважанняў.

Камяні з выбітымі на іх знакамі маюцца на магільніку вёскі Азяты Азяцкай вол. Кобрынскага пав. Горадзенскай губ. Нягледзячы на тое, што навокал вёрст 10–30 няма нідзе камення, на гэтым магільніку знаходзіцца некалькі вялікіх камянёў з невядомымі малюнкамі: на адным ка-

мені, напр., выбіты малаток і абцугі, на двух другіх камянях – нажніцы і інш. Калі, дзеля чаго выбіваліся гэтыя знакі – невядома. У м-ку Нямірава Аляксандраўскай вол. Бельскага пав. Горадзенскай губ. на старасвецкім магільніку былі пліты з выбітымі на іх малюнкамі: сякеры, пілы, ботаў, нажніц і інш. Недалёка ад в. Скалімава Малешаўскай вол. Бельскага пав. Горадзенскай губ. ляжыць камень, які называецца Божа стопка. На гэтым камені выбіты след левай чалавечай нагі, ямка нібы зроблена канцом кія і малюнак месяца ў форме сярпка. Народ лічыць гэта следам Багародзіцы. У Жыровіцах Жыровіцкай вол. Слонімскага пав. Горадзенскай губ. маецца камень з адбіткам рукі» [Тамсама, с. 11].

Самае цікавае заключаецца ў тым, што язычніцкія аб'екты пакланення (камяні-следавікі) не вынішчаліся праваслаўнымі і каталіцкімі святарамі, а па магчымасці прыстасоўваліся да аб'ектаў пакланення новага веравызнання. Іх не разбівалі, не крышылі, а пераносілі на тэрыторыю храмаў, клалі там на самых бачных месцах, а то і ўзводзілі над імі невялічкія каплічкі, якія арганічна ўпісваліся ў культавыя комплексы. Гэта даволі цяжкае тлумачэнне двухвернага (мірнага!) суіснавання. Намоленасць язычніцтва не адмаўлялася, а наадварот, павялічвалася, і ўсё гэта рабілася без асуджэння і запалохвання, што «панатворыце сабе чарговых грахоў, за якія вам давядзецца абавязкова несці суровую адказнасць».

На Беларусі сустракаюцца шматлікія камяні са слядамі жывёлін. Так, каля Радашковіч вучоныя знайшлі камень з адбіткам следу аленя, а каля в. Журавец Асіповіцкага раёна ёсць валун, на паверхні якога выбіты сляды мядзведзя, зайца, ваўка, лісіцы. Згодна з паданнем, гэты камень ляжыць тут з таго часу, калі ён быў мяккі, і кожны звер, наступаючы на яго, пакідаў свой след, якому наканавана было перажыць стагоддзі. Да таго ж гэтыя каменныя сляды сведчаць пра багаты жывёльны свет Беларусі тых часоў.

Непадалёку ад в. Нясімкавічы Чачэрскага раёна, на беразе ракі Покаць ляжыць камень з выбітай на ім падковай. Зараз яна ледзьве бачна, але мясцовыя старажылы расказваюць, што раней яна была значна глыбейшай і не давала магчымасці коннікам, напрыклад, з ходу фарсіраваць водны рубеж. Для зручнасці пасланыя некалі разведчыкі, каб надоўга запомніць месца і не лазіць па рачных берагах пакінулі такі зручны знак на камені: у дадзеным выпадку падкова на камені магла азначаць, што ў гэтым месцы рэчка плыткая і можна смела, з ходу (па-вайсковаму: з маршу) перапраўляцца на другі бок. Не трэба лішні раз нагадваць ці забывацца, што ў далёкім мінулым усе без выключэння рэкі на тэрыторыі Беларусі былі паўнаводнымі і ўяўлялі сабой сур'ёзныя



*Змееў камень ля в. Гогалеўка Чашніцкага р-на*

перашкоды. Да таго ж зусім побач з каменем знаходзіцца крыніца, і не выключана, што падкова магла ўказваць і кірунак да гэтай мясціны. Не выключана, што вада з тае крыніцы некалі ў мясцовага насельніцтва карысталася славаю вялікае гаючасці, што не толькі для вяскоўцаў, але і для вайскоўцаў было важнай падтрымкай пасля чарговых бітваў.

На беразе Дняпра, таксама Мазырскі раён Гомельскай вобласці, ляжыць валун з выразна бачнай на ім падковай. Як растлумачыў нам У. Ліцвінаў (старшы супрацоўнік Гомельскага абласнога краязнаўчага музея), гэты камень мог указваць і на тое, што насупраць яго Дняпро мелкаводны і там можна смела перапраўляцца. І што час з'яўлення падковы даволі позні – XVII стагоддзе, якое прыпадае на крывавыя казацкія войны, калі шматтысячныя казацкія і літоўскія «загоны» (атрады) часта перапраўляліся туды-сюды, каб удзельнічаць у баявых дзеяннях на памежных тэрыторыях. Што ж, падобнае меркаванне не выклікае пярэчанняў.

Цікава адзначыць і тое, што ў беларускай навуковай літаратуры часам трапляюцца звесткі аб тым, што на Беларусі сустракаліся выразаныя на кладках праз рэчку сляды або на дошках, раскіданых сярод вуліц у вёсках, каб вясной і восенню можна было перабрацца праз лужыну. Даследчыкі выказваюць думку, што гэтыя сляды сведчаць аб павер'і, якое панавала сярод беларусаў, паводле яго душа чалавека пасля яго смерці некаторы час блукае па свеце, пакуль не знойдзе адведзенае

ёй месца. У гэты час душы памерлых зрэдку наведваюць жывых, прыходзяць да іх у госці (пад Каляды, памінкі і г. д.). Таму людзі і раскідвалі дошкі з выразанымі слядамі, каб душы не заблудзілі ў цемры і не шукалі падоўгу новае жыллё сваякоў, а то і старое, бо смерць надышла іхняя даўно. І чамусьці такія дошчачкі-выразанкі ўкладваліся каля водных перашкод (пачынаючы ад вялікай лужыны і заканчваючы мастком цераз буйную рэчку). Лагічна дапусціць, што ў народнай свядомасці душы нябожчыкаў не валодалі здольнасцю усюдыпранікальнасці. Паветра, суша, лес – гэта адно, а вось водны рубеж – зусім іншая справа.

Сустракаюцца і іншыя варыянты, паводле якіх вынікала, што слядочкі выразалі па памерлых жанчынах, асабліва па тых, у якіх заставаліся асірацелыя малыя дзеці; на невялікіх па сваіх памерах камянях высякалі выявы слядочкаў і потым закідвалі гэтыя вырабы ў бліжэйшае вадасховішча; на Гарадзеншчыне адзначалі, што такія каменьчыкі прыносілі дамоў і клалі побач з хатнімі бажніцамі. Даводзілася зафіксаваць на Піншчыне і даволі рэдкі варыянт: на магіле мужчыны ставілі, як помнік, каменны слуп («стод»), а ў жанчыны садзілі дрэва, абавязкова каб жаночай «прыналежнасці»: бярозку, ліпу.

І. Маланін сцвярджае, «што ўсе гэтыя следавікі адносяцца да даволі пашыранага ў першабытных людзей культу продкаў. Прыносячы ахвяру каменю з высечаным на ім следам, людзі прасілі добрага палявання, пазбаўлення ад хвароб, ураджаю. З цягам часу продкаў, якіх абагаўлялі, замянілі іншыя істоты, чые вобразы і былі адлюстраваны ў тых слядах, што высякаліся ў камянях. Міналі стагоддзі, але следавікі заставаліся аб'ектамі культу. Пасля ўвядзення на нашых землях хрысціянства царкоўнікі пачалі прыстасоўваць язычніцкія папулярныя атрыбуты да сваіх патрэб. Вось чаму следавікі можна да гэтых часоў убачыць у касцёлах, цэрквах, капліцах, вось чаму яны атрымалі назвы “слядоў Хрыста”, “слядоў Багародзіцы”» [22, с. 12]. Што ж, думка слушная і мае поўнае права на сваё існаванне.

Вядомыя савецкія вучоныя А. Фармозаў і В. Раўданікас, якія вывучалі ўсемагчымыя кампазіцыі са слядамі, крыжамі і выявамі чалавечых слядоў, звязвалі, напрыклад, сляды з магічнымі паляўнічымі абрадамі, але дапускалі таксама, што гэта маглі быць сімвалічныя выявы багоў ці герояў. Выказваліся думкі, што сляды паказвалі кірунак дарог, месцы палявання, адзначалі межы плямён, а то і прыватнаўласніцкіх уладанняў. Былі таксама думкі, што сляды на камянях высякалі жарнасекі. Адносна апошняга сцверджання нам звесткі не сустракаліся.

У апошні час распаўсюджана думка, што знакі ступні чалавека, высечаныя на камянях, – гэта праяўленне старажытнага культу антрапа-

морфнага сонечнага бога, што ідзе па Сусвеце, прыносіць святло і даруе ўрадлівасць. І таму тут выпадае абавязкова падзяляць камяні-следавікі на тыя, дзе ступня (рука) высечаныя, і тыя, дзе гэтыя знакі «прадаўленыя», што, адпаведна, сведчыць на большы ўзрост знака. З распаўсюджваннем хрысціянства царкоўнікі прыстасоўвалі старажытныя культы да сваіх мэт. Так з'явіліся ўсемагчымыя легенды аб слядах розных святых.

Пакуль што канчатковае пытанне аб датаванні следавікоў не вырашана, але несумненна, што яны высечаны ў глыбокай старажытнасці і звязаны з усемагчымымі вераваннямі нашых продкаў. Падрабязней і больш абгрунтавана з навуковага боку пра гэтыя помнікі можна будзе гаварыць пасля правядзення каля камянёў спецыяльных мэтанакіраваных археалагічных раскопак, а яшчэ збору і апрацоўкі легендаў і паданняў, у якіх часта захоўваюцца адгалоскі старажытных вераванняў ці рэальных гісторый.

Часам, асабліва ў апошнія гады, этнографы, фальклярысты імкнуцца растлумачыць гэты факт і тым, што ўсё вышэй сказанае – проста адбітак язычніцкага пакланення старажытных беларусаў усемагутнаму богу сонца, які ў любы момант мог наслаць на зямлю засуху і ператварыць усё жывое, рознакаляровае ў аднолькавае, вымерлае. Праўда, у язычнікаў было некалькі бостваў, якія ў іх «прыслужвалі» нябеснаму свяцілу, але тут мелася на ўвазе самае асноўнае – сонца, ад якога сыходзіла на ўсю зямлю жыццядайная сіла. Затое хрысціянскія царкоўнікі, каб падкрэсліць непарушную кананічнасць Бога і святых, пачалі сцвярджаць, што гэта начамі, калі людзі спяць, незаўважна прыходзяць на зямлю пасланцы багоў. Яны ціхенька ходзяць па наваколлі, прыглядаюцца да таго, што творыцца на зямных абшарах, сочаць, каб усё ішло па спрадвечных законах, а калі дзе-небудзь заўважаюць нейкі непарадак ці непакорнага, непаслухмянага селяніна, які нешта здзейсніў (робіць) супраць традыцыі, то тут жа з ім жорстка распраўляюцца. Ва ўсім павінен быць (падтрымлівацца пры любых умовах) толькі заведзены парадак, толькі прапанаваныя Усявышнім устоі.

Паміж вёскамі Лышча і Чухава (Пінскі раён), сцвярджалі старыя людзі, ляжаў здаравенны валун, на верхняй (роўнай) паверхні якога былі высечаны ажно сем паглыбленняў, як пераконвалі ведаючыя (значэнне гэтага слова паходзіць ад старажытнаславянскага слова "веды": чалавек-чараўнік, прадказальнік. – *А. Н., Я. Н.*) вяскоўцы, «талерак». Самае дзіўнае заключалася ў тым, што высеклі іх не людзі, а... чэрці. Нячысцікі ва ўсім імкнуліся паўтараць за людзьмі. Таму і тут паступілі такім чынам. Есці (абедаць, вячэраць) садзіліся толькі тады, калі нікога з сялян не было паблізу, каб ніхто не перарваў іхнюю застольную бяседу,

а, магчыма, баяліся, што потым вяскоўцы апаганяць іхні «стол», не будзе тады такой нагоды – збірацца разам. Гаварылі яшчэ, што вакол валуна садзіліся толькі самыя старэйшыя, паважаныя чэрці і быццам бы толькі тады, калі трэба было вырашыць нейкае важнае пытанне. Ва ўсе астатнія дні сілкаваліся там, дзе прыспявала патрэба ў ежы.

Распавядалі, што адзін чухавец, дабіраючыся дамоў ужо ледзьве не сярод ночы, выпадкова патрапіў на чартоўскае вяселле. Даволі добра закончылася для чалавека тая сустрэча: толькі напаілі яго нячысцікі нейкім зеллем-дурманам, што потым з паўгода не мог у сябе прыйсці ды накармілі нейкімі адкідамі, якія смярдзелі так, што ажно дых перабівала. Ці не з таго моманту пайшло ў маіх аднавяскоўцаў выслоўе: «Цябе што чэрці сёння кармілі?», якое сведчыла пра тое, што селянін, размаўляючы з імі, меў дурны пах з рота. Калі праспявалі трэція пеўні, то чэрці імгненна растварыліся, і вакол настала такая дзіўная цішыня, што ніхто ніколі і не паверыў бы, што тут усяго пару хвілін таму несліся такія зыкі ды дзікія песні, што і блізка падыходзіць страшна было, бо любы цікаўны чалавек тады рызыкаваў паплаціцца ўласным жыццём. Ды і ведалі выдатна чухаўцы, дзе знаходзяцца іхнія землі, а дзе пастаянна валадараць нячысцікі. Лішні раз імкнуліся не запінацца з чарцямі, не гнявіць тое ліха, абы каб было ціха. Вось і на той раз, адно селянін хроп на возе ды, варочаючыся, таксама спрабаваў спяваць нешта вясёлае ды яшчэ і прытанцоўваць адначасова, бо ўпарта шкроб сваімі лапцямі па глабінках. Камічная сітуацыя, але за лепшае было назіраць за ёю здалёку, асабліва не набліжаючыся. Можна ж і потым у чалавека распытаць спакойна, што ўжо там такое з ім здарылася ў той ці іншы дзень і з якой нагоды ён там апынуўся.

З цягам часу да таго валуна сяляне ўвогуле амаль забыліся дарогу. Вось, калі пастухі пасвілі жывёлу, і яны выпадкова выбівалася да каменя, тады і людзі падыходзілі ды пачыналі пра нешта меркаваць-успамінаць, пераказваць усялякія займальныя гісторыі. Так і час праходзіў хутчэй, і не так страшна-жудасна ім рабілася. Усё ж разам знаходзіліся, а не па самім адным. Затое па адным стараліся сюды ні ў якім разе не трапляць, каб потым не здарылася непажаданых наступстваў. Асабліва жудасна было, калі жывёла раптоўна збівалася вакол валуна і, без дай прычыны, пачынала раўці не сваімі галасамі. Тады і на самой справе нават бывалым людзям магло падацца, што ў кароў раптоўна ўбіралася нейкая нячыстая сіла. Вечарам таго ж дня здзіўленыя гаспадыні прыходзілі да пастуха і запытваліся: што там здарылася на пашы? Каровы, мала таго, што прыйшлі дамоў узмыленыя, успацелыя, але і малака амаль не далі. Нягледзячы на тое, што дзень быў працяглы, летні: не было

дажджу ці якой іншай непагадзі. Пастух звычайна стараўся адказваць так, каб і незнарок не прыгадаць прысутнасці нячыстай сілы, бо тады рознае б пачалі гаварыць сярод мясцовага насельніцтва, а то і самога пастуха прыплялі б умелыя языкі да тых чартоўскіх праяў. Усе выдатна ведалі, што пастух і так заўсёды лічыўся сярод сялян, як і каваль, як і музыка, служкам нячысцікаў. Асабліва вылучаўся той, які меў доўгую сівую бараду і «цяжкі», неміргаючы пагляд.

Доўга ляжаў той валун, паступова абрастаў не толькі лішайнікам у прамым сэнсе, але і ўсемагчымымі гісторыямі ў пераносным. Канец ягоны надышоў у вайну з немцамі ў 1914 годзе, калі непадалёку праходзіла лінія фронту і рускія войскі пракладвалі ракаду – дарогу, працягнутую паралельна варагуючым бакам. Гэта была вузкакалейка. Пад рэйкі насыпалі трывалы насып, падвозячы не толькі пясок, але і каменне, якое знаходзілі паблізу. Вось быццам бы тады нехта з мясцовых вяскоўцаў і падказаў вайсковаму інжынеру тое, што такі здаравенны валун ляжыць ускрай Вісліцы. Калі яго парваць порахам на часткі, то можна будзе ўмацаваць значную частку вузкакалейкі. Задумалі добра, але на справе атрымалася, як заўсёды. Калі прагрымеў магутны выбух, то аказалася, што здаравенная глыба рассыпалася на драбнюткія каменьчыкі. І мала таго, што рассыпалася, дык яшчэ і разляцелася па бліжэйшых лясах-палетках. Так і не паслужыў людзям чартоўскі камень. Толькі што ляжаў і займаў непрыкметнае месца, а калі задумаліся прыстасаваць яго да справы, то валун лішні раз падкрэсліў, што з людзьмі ён знацца не жадае, што працягвае верна служыць нячысцікам. Пачалі тады перамаўляцца паміж сабою сяляне: «Гэтулькі часу ажно паўберага займаў, вольна-прывольна сабе ўладкаваўся, але нават проста ляжаць у насыпе, каб па ім вагоны ездзілі-хадзілі, не пагадзіўся! Таксама ж праява нячыстай натуры!» Калі б у некага з сённяшніх чухаўцоў запыталіся, дзе той камень знаходзіўся, то, хутчэй за ўсё, ніхто ўжо дакладна і не адказаў бы, тым болей не паказаў.

Распавядалі здавён людзі яшчэ адну займальную гісторыю: мясцовы млынар, які ўмудрыўся сам-адзін пабудаваць сабе вадзяны млын, прыстасаваў да жарнавых камянёў здаравенную камлыгу, якая ляжала, уросшы дзірваном, непадалёку ад ягонага палетка. Пры гэтым нікога на дапамогу не клікаў. Сам раскалоў глыбу на дзве раўнюткія часткі, прасвідраваў у іх патрэбныя адтуліны, прывёз на млын і сумясціў пад струмень вады, цярпліва чакаў пакуль вада «пазлізвае» ўсе няроўнасці, каб збожжа не высыпалася цэлым ці толькі на палову раздаўленым, а выходзіла ў канаўку-жалабок бялюткая і пахучая мука. Калі ўсё было гатова, то тутэйшых людзей папярэдзіў адносна аказання сваіх млынарскіх

паслуг на бліжэйшым кірмашы ў Чухава, куды пастаянна (на белай карове, запрэжанай у воз!) вывозіў прадаваць смачную садавіну і мядок. Былі ў яго вялікія і садок, і пасека. На ўсе рукі майстар быў той гаспадар.

Калі паведаміў сялянам, што гатовы аказваць яшчэ і млынарскія паслугі, то ўсе задаволена ўздыхнулі – гэта ж было зусім блізка, а то раней даводзілася вазіць збожжа за добры дзясятак кіламетраў, ды і чэргі там збіраліся на суткі, на двое, а то і на болей часу. Неўзабаве слава пра Дзмітрыкаў млын хутка распаўсюдзілася па наваколлі: і меле якасна, і дорага не задзірае цану, і напавер зробіць, калі што якое. Таму адбою ў млынара ад наведвальнікаў не было. Усе былі задаволеныя. Толькі добрае некалі ж абавязкова канчаецца. Так і тут атрымалася. Пачалася імперыялістычная вайна, а рака Вісліца стала своеасаблівай мяжою. Некалькі разоў трапляў млын пад абстрэл нямецкай артылерыі, але пакуль што шанцавала – не было вялікіх разбурэнняў. Толькі аднаго разу прыйшоў гаспадар на свой млын, а там адно галавешкі курацца, ды край жарнавых камянёў з вады тырчыць. Папрацавала цяжкая артылерыя, наведзеная назіральнікамі на людзей, якія сюды з'язджаліся працаваць. Ваякам жа ваяваць, а не будаваць выпадала. З цягам часу ўсё навокал пазарастала, паабвалілася, азярцо і тое змялела, тванню зацягнулася. Толькі і засталося, што назва былой яміны – Млыновая.

# КАМЕННЫЯ СЛУПЫ І ВАЛУНЫ-ПІСАНІКІ

Ёсць сведчанні аб знаходжанні на Беларусі і каменных слупоў. У М. Мялешкі можна прачытаць наступнае (часта цытуем гэтага даследчыка, бо ён мэтанакіравана займаўся даследаваннем камянёў на Беларусі і сабраў шмат цікавых матэрыялаў): «Па цячэнні Случы, Бярозы і Прыпяці па лесе знаходзіліся каменныя слупы з высечаным тварам чалавека. Г. Х. Татур (беларускі гісторык, археолаг і калекцыянер. – *А. Н., Я. Н.*) таксама паказвае на камень у Чэрвеньшчыне (б. Ігуменшчына), які меў форму слупа, а наверсе вызначаўся твар чалавека. Камень гэты ў народзе завецца Цар Давід. Таксама Татур кажа, што і па цячэнні рэк Лані і Случы знаходзяцца камяні, якія маюць форму слупоў. П. Шпілеўскі (беларускі этнограф і фальклярыст. – *А. Н., Я. Н.*) перадае, што ў Берасці, у Кобрынскім прадмесці, на правым беразе Мухаўца, быў агромністы курган, акружаны насыпнымі капцамі і напоўнены дзіўнай формы камянямі. Паводле народнага падання, гэты курган з'яўляецца рэшткамі паганскага капішча багіні Мажаны (Мары) у літоўцаў ці ятвягаў, імя якой,

як кажа П. Шпілеўскі, упамінаецца ў народных песнях Горадзеншчыны. Каля кургана быццам былі раскіданы абчасаныя з выразанымі фігуркамі, абпырсканыя крывёй (?) камяні. Калі высеклі каля кургана лес, народ сабраў усе гэтыя камяні і склаў у адно месца, там, дзе было капішча Мажаны. П. Шпілеўскі рабіў спробу праверыць гэтае пытанне, але камянёў не знайшоў. Кажуць, быццам яны ляжаць у сярэдзіне кургана.

У Бабруйшчыне на Пцічы маюцца два камяні зусім незразумелай формы. Аднаго з іх у народзе завуць "воўк", а другога "гусак". В. Звітневіч (вядомы беларускі этнограф. – *А. Н., Я. Н.*) заўважае, што ў Меншчыне знаходзяцца каменныя выявы розных жывых істот. Асабіста яму прыходзілася бачыць каменную змяю і гусака. Камень, на якім высечаны змеі, знаходзіўся ў Літве каля м-ка Рогава Ковенскай губ.

М. Янчуку (беларускі фалькларыст. – *А. Н., Я. Н.*) у часе яго падарожжа 1886 года на Меншчыне казалі аб камені, які знаходзіцца каля вёскі Крынкі па дарозе з Жыціна ў Асіповічы на Бабруйшчыне, які меў быццам форму качкі і меў нейкую незразумелую моц» [25, с. 13].

Нам падаецца асабліва цікавым паведамленне пра выяву змяі (змей) на камені. Не станем забывацца на тое, што ў мясцовага насельніцтва змеі карысталіся вялікай павагай, ім пакланяліся і іх шанавалі; па-другое, гэта мог быць камень-папярэджвальнік, які сведчыў усім пра тое, што тут знаходзіцца змяінае ўрочышча і лазіць тут проста так, без дай прычыны, не выпадае, каб не рызыкаваць жыццём лішні раз. Не выключана, што яшчэ ў больш старажытныя часы мясцовае племя мела татэмам хітрую і атрутную змяю, таму і адлюстравалі яе выяву на вялікім камені. Тады такое часта практыкавалася.

Праўда, у нашым народзе больш папулярнымі былі не каменныя слупы, хоць пры дэтальным і скрупулёзным разглядзе становіцца зразумелым, што многае ў гэтым пытанні ўпушчана назаўсёды і яго не адновіш, бо звестак засталося надзвычай мала, а каб аднавіць іх – не хапае першакрыніц. Затое пра «пісанікі» згадвалася многа і часта.

Шырока вядомымі ў свой час былі не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі так званыя Дзвінскія камяні, ці, як іх яшчэ называлі, «пісанікі».

«У пяці вёрстах ад павятовага горада Дзісны, паблізу вёскі Накоўнікі, у Дзвіне, у самай сярэдзіне ракі, ляжыць шэрага колеру гранітны валун даўжынёй у 5 з паловай сажняў, у вышыню 2,3 сажні і ў акружнасці 14 сажняў. На ім... высечаны крыж, пастаўлены на дзвюх ножках у выглядзе літары "П", па баках якога высечаны надпіс "Господи помози рабу твоему Борису". Верхняя частка крыжа пашкоджана.

У дзвюх вёрстах ад гэтага каменя, амаль на сярэдзіне русла ракі, ляжыць таксама Барысаў камень, як народ увогуле называе гэтыя ка-

мяні, памерамі буйнейшыя за іншыя. Вышыня яго ад дна 3,5 сажня, даўжыня 5 з паловай сажня, акружнасць каля 24 сажняў. На пляскатай паверхні яго высечаны шасціканцовы крыж, па абодва бакі якога надпіс “Господи помози рабу своему Борису”.

Нарэшце, трэці камень ляжыць у некалькіх кроках ад левага берага Заходняй Дзвіны, пры злучэнні яе з ракой Павінушкай. Камень гэты меншы за папярэднія, мае ў папярочніку два сажні, колеру чырвонага. На ім высечаны чатырохканцовы крыж, пастаўлены на круг, з некалькімі пашыранымі перакладзінамі. Надпіс на ім не прачытаны» [Тамсама, с. 14].

Акадэмік Б. Рыбакоў бачыць прычыну ўзнікнення камянёў-пісанікаў у наступным: «Агромністыя крыжы, якія прасілі бога дапамагчы ягонаму рабу Барысу, узніклі вясной 1128 года. У дні барысаглебскіх аграрных святаў і заклікалі Усявышняга даць ураджай» [29, с. 157].

На нашу думку, меў рацыю Е. Раманаў, калі характарызуючы Дзвінскія камяні, сцвярджаў: «Па форме камяні можна падзяліць на дзве групы. Многія ўяўляюць сабой пляскатыя масівы, на верхняй плошчы якіх высечаны крыжы, і вакол іх, па баках масіваў, зроблены надпісы. На ўсіх астатніх камянях надпісы зроблены па абодва бакі вертыкальнага стрыжня крыжа.

Я схільны думаць, што крыжы з надпісамі адшукваліся полацкім князем Барысам Усяславічам і яго прыбліжанымі пераемнікамі ў мэтах распаўсюджання хрысціянства ў дзікіх народных масах. Для гэтага выбіраліся каменныя глыбы, якія сваімі памерамі здзіўлялі ўяўленні дзікуна, ці, знаходзячыся ў р. Заходняя Дзвіна, шкодзілі яму пры плаванні ці выклікалі да сябе амаль рэлігійнае шанаванне.

Каб пазбегнуць крутой ломкі векавых народных вераванняў, князі асвячалі гэтыя камяні адлюстраваннямі сімвалаў хрысціянства, і шанаванню камянёў надавалася ўжо хрысціянскае значэнне.

Гэтую думку пацвярджаюць і легенды, якія захаваліся дагэтуль у Магілёўскай і Віцебскай губернях, сцвярджаюць, што ў камянях, ці паблізу, жылі ў старажытнасці страшныя вогненныя змеі ці асілкі, варажбіты ці, нарэшце, што самі камяні ўяўляюць сабой акамянелых людзей. Ля такіх камянёў дагэтуль моляцца, ставяць свечкі, прыносяць ахвяры і г. д.» [Тамсама, с. 16].

Паводле нашага меркавання, на памылковай пазіцыі стаяў І. Крашэўскі, які звязваў Дзвінскія камяні з імем мінскага князя Барыса Усяславіча, што нібыта княжыў у канцы XI стагоддзя. Атрымліваецца, што нешта надта хутка ачомаўся мясцовы ўладар пасля ўвядзення хрысціянства, адмаўлення ад веры бацькоў і стаў своеасаблівым «рупарам» адзінага Бога.



*Валун Варацішын хрэст з в. Камена Вілейскага р-на*

Археолаг Г. Штыхаў лічыць, што гэтыя камяні напачатку былі паганскімі бажкамі, а пасля па загадзе полацкага князя Барыса Усяславіча памерлага ў 1102 годзе, для барацьбы з паганствам былі высечаны крыж і надпіс: «Помози господи рабу своему Борису» [22, с. 124].

Але ні ў якім разе нельга адмаўляць і таго, што крыжы і надпісы рабіліся, магчыма, і ў гонар прыезду ў дадзеную мясцовасць нейкай канкрэтнай гістарычнай асобы. Можна дапусціць і такі факт: часам камяням ці крыжам магло прыпісвацца імя князя, выдатнага дзеяча і г. д. нават тады, калі яны і не бывалі ў гэтым месцы. Тут важную ролю іграла багатая фантазія народных дарадцаў. Інакш чым можна растлумачыць легенду, што камень ля вёскі Крычын звязаны з падзеямі Айчыннай вайны 1812 года. На гэтым камені ў лесе нібы раней была выбіта карта-схема ў выглядзе пеўня, запрэжанага ў карэту, па якой дасведчанаму чалавеку запроста можна было расшыфраваць, дзе схавана залатая напалеонаўская карэта. Цяпер, мабыць, марна шукаць яе, бо пра месца знаходжання напалеонаўскай карэты існуюць розныя паданні і легенды ў іншых раёнах Беларусі. І сапраўды, шмат варыянтаў гэтага фальклорнага твора існуе менавіта там, дзе ні сам Напалеон, ні ягоныя войскі ніколі не былі.

Адным з так званых гістарычных камянёў быў вялізны Рагвалодаў камень, што непадалёку ад Оршы. Цела яго ўздымаецца на чатыры вяршкі ад паверхні зямлі. Гэта чарнаватая ці шэрая пліта з высечаным на ёй двайным крыжам і надпісам з глыбока выдзеўбанымі славянскімі літарамі: «В 6679 (1171) месяца мая в 7 день доспень. Господи помози рабу Василию в крещении именем Рохволода сыну Борисову». Рагвалод – асоба гістарычная, ён быў князем полацкім, гаспадарыў таксама ў Слуцку і Друцку. Камень гэты мае ў даўжыню 4 сажні 4 вяршкі, у шырыню 3 сажні 6 вяршкоў. Характэрна, што мясцовыя жыхары называюць яго не інакш як надмагільным каменем ці грабніцай. Ён у вялікай пашане ў народа. У свой час граф К. П. Тышкевіч пісаў, што мясцовыя сяляне расказваюць пачутае ад продкаў сваіх, быццам ён стаяў на чатырох нагах і меў галаву, што ў цэлым уяўляла фігуру жывёлы. Паводле падання, мясцовы млынар адсек яму галаву, перарабіў на млынарскі жорнаў, які не толькі сам перамалоўся ў пясок, але таксама перамалоў усё багацце і ўсю сям'ю мельніка. Старыя ж апавядалі Тышкевічу, што яны самі памятаюць, як пад гэтым каменем было парожняе месца, куды звычайна хаваліся ад дажджу пастухі, што пасвілі тут жывёлу. У далейшым яно засыпалася, і камень усё болей і болей паглыбляўся ў зямлю. Потым пад яго падлажылі камяні значна меншыя, але і яны ўраслі ў зямлю. Камяні маюць такую ўласцівасць: яны не толькі «паказваюцца» з зямлі, але і «хаваюцца» ў яе самастойна, не патрабуючы дадатковай дапамогі.

Рэктар аршанскай езуіцкай калегіі Дэзедэрый Рышардо ў сваім пасланні канцлеру Расійскай імперыі графу Румянцаву таксама сведчыў, што надмагільны камень трымаецца на чатырох слупах, а многія старыя людзі памятаюць, што пад ім можна было праходзіць і што дзеці, гуляючы, бегалі пад ім. Верагодна, што грабніца заглыбілася ў зямлю, бо цяпер яна зусім ляжыць на зямлі.

Ёсць і іншыя гістарычныя камяні, якія ўжо неаднаразова апісаны ў навуковай і папулярнай літаратуры. Да іх можна аднесці і Аршанскі камень, знойдзены ў 1792 годзе. Першым аб ім напісаў Мальгін у «Зерцале» (1794). У 1805 годзе над каменем была пабудавана капліца, але ў 1812, калі на тэрыторыю Беларусі ўварваліся напалеонаўскія войскі, яна была спалена. Пасля гэтага сяляне зноў пабудавалі вакол яго сцены і пакрылі дахам. У выніку атрымалася своеасаблівая капліца. У 1846 ці 1847 годзе камень займаў усю сярэдзіну капліцы, а па баках заставалася толькі вузенькая сцяжынка, па якой можна было прайсці вакол валуна.

У 1865 годзе ў Віцебску насупраць старажытнай Успенскай царквы, у 25 кроках ад падэшвы крутога берага Заходняй Дзвіны, знайшлі ка-

мень з шасцікутным крыжам, без усялякага надпісу. Ён бачны пры вышыні ўзроўню вады ў 2 сажні і 13 вяршкоў. Народ называе гэты камень Іасафатавым. Здаецца, народная легенда правільна звязвае гэты камень з гібеллю ўніяцкага епіскапа Іасафата Кунцэвіча, тым больш што цела яго знойдзена ў рацэ паблізу Успенскага храма, а вядома, што Кунцэвіч быў забіты ў сваіх жа харомах на Лысай гары, дзе сёння Успенскі храм. Пасля забойства цела Кунцэвіча зашылі ў мяшок, да ног прывязалі камяні і кінулі ў Дзвіну. Некаторыя першакрыніцы сцвярджаюць, што праз тры дні цела епіскапа было знойдзена і на лодцы перавезена ў Віцебск. Вельмі верагодна, што на тым месцы, дзе быў забіты верны служка езуітаў, і паклалі вялікі камень, каб такім чынам пакінуць знак аб ім як сярод жывых, так і для нашчадкаў [25, с. 58].

Можна таксама гаварыць пра Вілейскі камень, які знаходзіўся непадалёку ад мястэчка Далгінава, на правым беразе ракі Віліі. І ўсё ж не адныя толькі камяні ўганароўваліся сярод насельніцтва. У пераліку шанаваных стагоддзямі прадметаў сустракаем і даволі нечаканыя.

У пісьмовых крыніцах ад 1582 года згадваецца нейкі Чортаў камень, які вяскоўцы старанна аберагалі і не давалі адносна яго здзяйсняць якія б ні было ганебныя дзеянні. Гаварылі, што ён некалькі разоў даваў здароўе (вяртаў да жыцця) моцна хворых людзей, хоць і назву меў чартоўскую. І апошнім часам выратаваў ад смерці апошняе дзіця ў сям'і, дзе ўсе малыя да гэтага паміралі. Адным словам, валун быў залічаны да гаючых камянёў і за гэта вяскоўцы аказвалі яму адпаведную пашану. У адной з мясцін Мядзельшчыны ў мінулым, напрыклад, ушаноўвалі старажытную зерняцёрку. Вядома ж, яна была каменная, але з таго самага часу, як яе знайшлі і пачалі ёю карыстацца, мела такую цікавую форму. Нічога ў ёй не падладжвалі, нічога спецыяльна не падганялі. Адно адразу пачалі церці збожжа. З цягам доўгіх гадоў камень выслізгалі да такой ступені, што ён ужо проста блішчаў-адліваў сваімі бакамі. Тады зерняцёрку пачалі захоўваць як камень-сімвал вернага служэння чалавеку. У аднайменнай вёсцы Камень Вілейскага раёна таксама знаходзіцца камень дзіўнай формы – у выглядзе звана. На ім надпіс – «Воротишин хрест» і дадатковы глыбока выбіты малюнак крыжа. Надпіс гэты датуецца ранні́м XII стагоддзем [Тамсама, с. 52].

Агульнавядома, што прасіў дапамогі ў каменя (-ёў) не адзін толькі князь Барыс. Напрыклад, вядома, што ляжаў раней каля вёскі Дзятлава Аршанскага раёна буйны пляскаты валун з вялікім крыжам і надпісам, які сведчыў: «В лето 6679 мая в 7 день доспен крест сий. Господи помози рабу своему Василию в крещении именем Рогволоду сыну Борисову». Калі расшыфраваць «в лето 6679», атрымаецца 1171 год.

Якой, паводле складу, была гэтая глыба, зараз сказаць цяжка. У надпісе да адной старой фатаграфіі мімаходзь паведамлялася, што яна – нераўнамерна афарбаваны цёмны пескавік. Хутчэй за ўсё гэта памылка, бо кавалкі пескавіку такой велічыні сярод ледавіковых адкладаў амаль не сустракаюцца. Сумнеў выказаў прафесіянал-геолаг Э. Ляўкоў. Напэўна, каля Дзятлава ляжала нейкая цёмнаколерная раскрышталізаваная магматычная або метамарфічная парода, напрыклад, дыярыт, гнейс або амфібаліт. Такіх камянёў мноства было прынесена на Беларусь ледавікамі.

Тысячагоддзе назад, калі Ушацкія азёры былі больш паўнаводныя і іх амаль паўсюдна абступаў лес, у зацішным куточку возера Цётча (Павулле) уздоўж берага цягнуўся ланцуг камянёў. Сюды іх прынеслі людзі з суседніх узгоркаў. На адным з валуноў увесь час гарэў агонь, які падтрымліваў святар-вяшчун. Побач ляжаў чашападобны камень пад ахвярапрынашэнні. Быў і другі ахвярнік. Сярод натуральных камянёў узвышаўся стод, высечаны з чорнага базальту. У гэтае патаемнае месца на чаўнах прыплывалі жыхары наваколля, везлі шчодрую даніну, прасілі маўклівыя стоды прынесці ўраджай, здабычу, багацце. На капішчы святар казаў («рэкаваў») свае прамовы, вяшчаў прароцтвы. Можа, таму гэта месца зараз называюць Рэкшаты. Павінна была хоць у нечым застацца гісторыя: не захавалася ў камянях, бо іх невядома куды парасцягвалі, як і галоўны стод, то фальклорная спадчына зберагла памяць пра язычніцкія падзеі.

Па форме валун нагадваў паралелепіпед з крыху скошанымі закругленымі вугламі. Даўжыня блока дасягала 3 метраў, а шырыня 2,4 метра. На яго грані, звернутай уверх, да неба, быў высечаны шасціканцовы крыж на падстаўцы з дзвюма прыступкамі. Вышыня яго складала 1,8 метра. Надпіс двума колцамі апяразваў крыж. Велічыня літар дасягала 15 сантыметраў. Словы «сыну Борисову» не ўваходзілі ў літарны круг, а займалі месца ў цэнтры каля крыжа. Празмернае ўжыванне літары «і» замест «и» сведчыла пра тое, што майстар, які пераносіў выяву на камень, або той, хто ім кіраваў, ведалі лацінку. Дарэчы, тое самае характэрна і для іншых Барысавых камянёў. Як гэта ні парадаксальна, але гісторыю беларускага «і», відаць, можна пачынаць адсюль, з XII стагоддзя, і не акцэнтаваць асаблівую ўвагу на дзейнасці салунскіх братоў Кірыла і Мяфодзія.

Вядома, што Рагвалод-Васіль Барысавіч, па загадзе якога і быў усталяваны гэты камень, не быў асабліва ўдачлівы ў вядзенні дзяржаўных спраў. Міжусобіцы княстваў, барацьба Полацка за сваю самастойнасць, моцнае гарадское веча, якое нават не заўсёды лічылася з думкамі князёў, наклалі свой адбітак на лёс Рагвалода. Адразу пасля смерці бацькі

ён не змог як законны спадкаемца сесці на княжанне. Па загадзе Кіева яго ў росквіце сіл разам з іншымі полацкімі князямі за непаслушэнства выслалі ў далёкую Візантыю. Адтуль ён вярнуўся толькі ў 1140 годзе, калі палітычная сітуацыя ў родных землях карэнным чынам змянілася, і становішча лічылася спакойным.

Пазней, у 1146 годзе Рагвалод быў пакліканы полацкім вечам на княжанне. Ці то паўплывала доўгае жыццё за мяжой, ці то незадаволенасць яго кіраваннем прывялі да таго, што ў 1151 годзе князя выслалі ў Менск, а на яго месца запрасілі іншага. У Менску князь знаходзіўся ў такім гаротным становішчы, што за яго вымушаны быў заступіцца Юры Далгарукі, вядомы як заснавальнік Масквы. У 1158 годзе Рагвалод зноў вярнуўся ў Полацк і распачаў працяглую і беспаспяховую барацьбу з менскімі князямі. У 1162 годзе яго войска было разбіта пад Менскам. У сваю вотчыну ён болей ужо не вярнуўся, а доўгія гады хаваўся ў Друцку [22, с. 94].



*Рагвалодаў камень з в. Дзятлаўка Аршанскага р-на*

Як сцвярджаюць гісторыкі, з таго часу імя князя знікла са старонак летапісаў. Толькі камень каля старой дарогі з Друцка ў Оршу сведчыў, што ў 1171 годзе ён яшчэ быў жывы і імкнуўся нешта распачаць з дзяржаўных спраў. Раней нават дапускалі, што валун быў надмагіллем Рагвалода, але ў такім выпадку на валуне павінны былі быць словы «Помяни, господи...». Затое стары надпіс дапамог даведацца пра дакладныя імёны князя – лягчэй стала разбірацца ў летапісных сведчаннях, дзе раней з-за гэтага ўтваралася своеасаблівая блытаніна.

Рагвалодаў камень народ доўга шанаваў. У паданні гаворыцца, што раней камень нагадваў сваімі абрысамі жывёліну, бо меў галаву і чатыры нагі. І быццам бы паміж ног, пад чэравам таго звера, была свабодная прастора, у якой не без выгоды, пастухі хаваліся ад дажджу ці моцных вятроў. Аднойчы мясцовы млынар Марусевіч з Рудні вырашыў скарыстаць і прыстасаваць круглую галаву каменя на жорны і адбіў яе. Толькі нічога добрага з гэтага не выйшла: жорны самі змалоліся ў пясок, а да таго ж вынішчылі ўсю маёмасць і сям'ю Марусевіча. Згарэў і млын, які яшчэ пры жыцця гаспадара вяскоўцы ўсё болей і болей схільны былі лічыць служкам нячыстай сілы. Некаторыя характэрныя асаблівасці валуна і гэтае шырокараспаўсюджанае паданне дазволілі вядомаму даследчыку беларускай даўніны Адаму Кіркору выказаць думку, што ў далёкім мінулым камень быў дальменам – часткай дагістарычнага захавання, але пазней даследчыкі гэта не пацвердзілі.

Упершыню валун-дакумент знайшлі два стагоддзі назад, у 1792 годзе. З таго часу пра яго, як і пра Барысавы камяні, пісала шмат вучоных. У 1807 годзе над валуном паставілі Барысаглебскую царкву. Праз некалькі гадоў, у часе напалеонаўскага нашэсця, яе спалілі французы. Пазней, у 1830 годзе, камень атуліла новая бажніца. Е. Раманаў быў задаволены, што такім чынам важны гістарычны помнік «выратаваны ад знішчэння»: «...цяпер нават на каменную галаву нічога не будзе імжыць і капаць...» [Тамсама, с. 79]. Толькі ўзнікненне гісторый вакол каменя надалей на гэтым не перапынілася.

Так, у 1830 годзе святара Галошаўскай царквы Льва Ганкевіча пачалі непакоіць сны, якія ён палічыў прарочылі. Хутчэй за ўсё яны з'явіліся пад уплывам мясцовых паданняў пра Рагвалодаў камень. Наслухаўшыся іх і ўразіўшыся, святы айцец вырашыў высветліць, ці не ляжаць пад валуном мошчы якога-небудзь мясцовага праведніка. Атрымаўшы дазвол свайго царкоўнага кіраўніцтва на раскопкі, ён справіў набажэнства і разам са шматлікімі памагатымі ўзяўся за працу. Толькі не надта доўга шчыравалі, бо неўзабаве набеглі хмары, і пачалася моцная навальніца. Бацюшка палічыў гэта папераджальным знакам боскай незадаволенасці

і не пасмеў здзяйсняць задуманае надалей. У галаве цвёрда заселі прыклады з усялякімі варыянтамі пакаранняў з боку каменя. Не доўга было і тут «нарвацца» на нешта падобнае [Тамсама, с. 83].

Загубіла камень са старажытным надпісам, як і заўсёды, наша невуцтва і бескультур'е: перад вайной, у часе панавання вульгарнага атэізму, калі змагаліся не за душы вернікаў, а з атрыбутамі культу, Рагвалодаў камень узарвалі на друз. Так загінуў адзін з самых каштоўных помнікаў гісторыі старажытнай Беларусі. Мы не зберaглі адзіны дакумент з дакладнай датай (дзень, месяц, год) стварэння, што ацалеў да XX стагоддзя.

Камень Рагвалода звычайна далучаюць да Барысавых. Пэўная логіка ў гэтым ёсць. Рагвалод быў сынам Барыса, жыў у тую ж эпоху, формулу «помози» выбраў тую ж, нават назваў і змясціў на самым відным месцы, каля крыжа, імя Барыса. Але ўсё ж, відаць, правільней лічыць валун самастойным помнікам, не з гэтага цыкла: прасіў жа дапамогі не сам Барыс, а іншы князь.

Цікавасць да разгадвання таямніцы з'яўлення надпісаў прыходзіла да кожнага чалавека, якому даводзілася іх бачыць. За многія гады існавання валуноў было выказана гэтулькі меркаванняў, што, здаецца, зараз прыдумаць што-небудзь новае, адметнае немагчыма. Можна толькі далучыцца да якога-небудзь аднаго з іх. Толькі вось, не ўсе яны пацверджаны гістарычнымі фактамі.

Дастаткова будзе агаварыцца, што выраз «господі, помозі рабу своему...» быў вельмі шырока распаўсюджаны сярод усходніх славян у першыя стагоддзі пасля прыняцця хрысціянства і прыйшоў на нашу зямлю з Візантыі. Гэтыя словы ўводзілі ў летапісы, пісалі на сценах бажніц, выбівалі на манетах, ставілі на амулеты. Яны былі табуявана-традыцыйнымі. Нават манархі верылі, што такая просьба абавязкова дапаможа і ніколі не будзе лішнім да яе звярнуцца. Такім чынам, у гэтым сэнсе закліканне князёў Барыса Усяславіча і ягонага сына Рагвалода Барысавіча на фоне традыцый той эпохі нічым асаблівым не вылучалася. Аказалася, больш за тое, працягвала своеасаблівую традыцыю княскіх асоб. Але нас яшчэ вельмі цікавіць пытанне: што іх так турбавала, чаго канкрэтна прасілі-вымольвалі ў нябеснага Валадара нябедныя полацкія князі?

Гісторык і паэт Мацей Стрыйкоўскі, які жыў у Віцебску ў другой палове XVI стагоддзя і напісаў некалі папулярную «Хроніку», так тлумачыў з'яўленне надпісаў. Набожны Барыс будаваў у Полацку Сафійскую царкву, манастыры і іншыя рэлігійныя храмы. Гэта, адпаведна, патрабавала шмат цэглы, вапны і іншых будаўнічых матэрыялаў. Паводле М. Стрый-

коўскага выпадала, што іх завозілі ажно з Лівоніі. З нагоды паспяховага вырашэння гэтай задачы (узвядзення манументальных храмаў) і быў высечаны надпіс на валуне. Але праз пару стагоддзяў ад такога тлумачэння давялося адмовіцца. Па-першае, М. Стрыйкоўскі, аказалася, памыліўся і многае пераблытаў, калі звязаў Барыса з XIII стагоддзем і прыпісаў яму, спаслаўшыся на надпісы, літоўскі на той час вельмі папулярны варыянт радаводу полацкіх князёў. Па-другое, у «Жыціі Еўфрасінні Полацкай» гаварылася дакладна, што цэглу паспяхова для будаўніцтва выраблялі... на месцы, бо паклады высокаякасный гліны знаходзіліся недалёка ад горада [Тамсама, с. 56].

Граф А. Плятэр яшчэ ў першай палове мінулага стагоддзя палічыў, што Барыс быў вельмі славалюбны і для ўвекавечання сваёй памяці загадаў такім чынам пазначыць камяні. Е. Раманаў не выключаў, што гэты надпіс – памятка пра кароткачасовае знаходжанне тут (на розных участках Заходняй Дзвіны) Барыса. У каралёў і манархаў Еўропы сапраўды існавалі такія дзівацтвы, але для XII стагоддзя такое яшчэ не характэрна. А памяць пра князя Барыса захавалася – яго імя носіць буйны горад Беларусі.

Я. Тышкевіч прапанаваў больш практычны варыянт тлумачэння: камянямі пазначалі межы тагачаснага Полацкага княства. Як верагодна яшчэ раней такога погляду прытрымліваўся Я. Канкрын. Але межавымі знакамі валуны не маглі быць. Асноўная маса Барысавых камянёў «імкнулася» да рэчышча Дзвіны, тым часам як межы ўладанняў праходзілі ў іншым месцы. А камяні, як заўважыў А. Кіркор, «ляжалі пасярод краіны». Магчыма, некалі, за некалькі стагоддзяў да гэтага, калі княства толькі фарміравалася, то племянныя межы маглі праходзіць (і для зручнасці і для цяжкадаступнасці!) па водных артэрыях [25, с. 61].

Спрабавалі растлумачыць знаходжанне камлыгаў у рацэ тым, што такім чынам вызначалі незвычайнае паніжэнне ўзроўню вады, з'яўленне водмеляў. А. Сапуноў не выключаў, што крыжамі і надпісамі прымхлівыя палачане хацелі засцерагчыся ад валуноў, якія вытыркваліся з вады. Той жа Е. Раманаў дапускаў, што Барысавы камяні – своеасаблівыя лоцманскія знакі на важным водным шляху. Гэтай жа думкі ўжо ў наш час прытрымліваўся М. Варонін. Але камяні ніхто не ўстанаўліваў. Валуны з'явіліся ў выніку размыву ледавіковых адкладаў. Такія ж камяні сустракаліся і на сушы, далёка ад водных магістраляў. Таму для ўзнікнення надпісаў павінна быць іншая прычына. А ўчасткі, дзе з ракі выступалі глыбы, сапраўды ўяўлялі небяспеку для старажытных чаўноў. Нездарма, калі верыць успамінам старых людзей, раней, плывучы каля такіх мясцін, кідалі каменю і вадзе хлеб-соль і прасілі не рабіць перашкоды, прапусціць.

Больш абгрунтаваная гістарычнымі звесткамі выснова Міколы Ермаловіча, выказаная ў ягонай працы «Старажытная Беларусь»: крыжы і надпісы звязаны з ваеннымі дзеяннямі князёў, такім чынам яны хацелі атрымаць дапамогу неба ў небяспечных паходах. Сапраўды, на адным са знішчаных у 1818 годзе камянёў быў надпіс, які апавядаў пра «цвёрдую руку» Святаполка Аляксандра. Але той камень не належаў да Барысавых, і мала веры, каб прыгнечаны лёсам і немалады ўжо Рагвалод у 1171 годзе мог адважыцца на такі рызыкоўны крок з Друцка. Ва ўсялякім разе ніякіх летапісных сведчанняў пра гэта няма.

Выказвалі меркаванне, што валуны такім чынам асвячалі з мэтаю распаўсюджання хрысціянства (Е. Раманаў), для барацьбы з язычніцтвам і старажытным абагаўленнем каменя (Я. Канкрын, Г. Штыхаў і іншыя). Такое ў мінулым здаралася не раз. Пазначалі ж манахі крыжамі дагістарычныя петрогліфы на Белавым Носе на Анезе! І ўсё ж, мабыць, бліжэй за ўсіх да разгадкі таямніцы наблізіўся акадэмік Б. Рыбакоў. Яго падыход комплексны, улічвае палітычны і эканамічны фон той эпохі. Становішча ж канца XII стагоддзя было і ў нашым краі далёка не простае.

Полацкай дзяржаве даводзілася ўвесь час адбіваць удары больш магутных Кіеўскага і Наўгародскага княстваў, што вымагала вялікіх сродкаў. У горадзе зацвердзілася моцнае веча, якое канфліктавала з князямі, іншы раз выганяючы іх. Усяслаў Чарадзей памяркоўна ставіўся да дзейнасці вешчуноў (язычніцкіх святароў), у ваенных канфліктах з суседзямі часта звяртаўся па дапамогу да нехрышчаных плямёнаў і ў некаторай ступені менавіта з-за такіх учынкаў і сам лічыўся вешчуном.

Адразу ж пасля смерці князя-плюраліста сітуацыя змянілася. Ужо ў 1102 годзе яго набожнейшы сын Барыс арганізаваў карную акцыю супраць язычніцкай Літвы. Відаць, давялося ўціхамірваць і сваіх адступнікаў ад веры. Як на тое ў 1127 годзе пачаўся вялікі голад. Няшчасце абрынулася таму, што да канца красавіка ляжаў снег, затым пачалася моцная паводка, а рана ўвосень надышлі маразы, загубіўшы рунь.

Яшчэ страшнейшы быў наступны год. Цэны на хлеб сталі недаступныя простым людзям. Даводзілася есці ліпавае лісце, парахню драўніны, салому, мох, лішайнікі. Целы памерлых з голаду ляжалі на дарогах, вуліцах і рынках. У Ноўгарадзе не прыбіралі трупы – не дазваляў невыносны смурод. Маці аддавалі сваіх дзяцей іншаземцам у рабства, абы выратаваць ад смерці. Наўгародскі летапіс адзначаў: «Ово их изомроша, а друзии разодешеся по чюжим землям. И тако по грехам нашым поглыбе земля наша» [Тамсама, с. 104].

Царкоўнікі заўсёды разглядалі такую бяду як кару боскую за людскія грахі. Зразумела, што голад прыпісвалі прыхільнасці шмат каго да языч-

ніцкіх абрадаў і стодаў. Святыя язычніцкія камяні давялося хрысціць і звяртацца да бога, каб дапамог. Але паратунак не прыходзіў. «В се же лето вода бяше велика в Волхове (потони люди и жито) и хором много сноси. И князь Полотьскый умре Борис Всеславиць».

Хутчэй за ўсё сітуацыя ў наступныя гады палепшылася. Гэта маглі звязаць і з надпісамі на валунах, зробленымі па загадзе Барыса. Ва ўсялякім разе, калі зноў настаў вялікі голад у 1170 годзе і цэны на хлеб, як пісалі летапісцы, сталі такія ж, як і ў 1127 годзе, Рагвалод Барысавіч зноў выкарыстаў выпрабаваны сродак: хрысціў святы камень каля Оршы. Для пэўнасці на самым бачным месцы ў цэнтры каменя высеклі імя Барыса.

Барысавы камяні нярэдка звязваюць з папулярным у народзе культам першых айчынных святых Барыса і Глеба, што замянілі нейкія язычніцкія боствы. Некаторыя даследчыкі дапускаюць, што з'яўленне ў аднаго з валуноў назвы Барыс-Хлеб (Хлебнік) – вынік пераінтэрпрэтацыі імёнаў гэтых святых імёнаў гэтых святых, бо беларускае «г» па сваім гучанні набліжаецца да «х». Аднак тая ж традыцыя суадносіць камяні з хлебам, ураджаем; па адным з камянёў, які, відаць, быў у межань з вады, вызначалі пачатак жніва. Тут не толькі падабенства гукаў: Барыс і Глеб здаўна лічыліся апекунамі земляробства і ўрадлівасці. Менавіта таму, звяртае ўвагу Б. Рыбакоў, дата 7 мая была выбітая на Рагвалодавым камяні невыпадкова. Яна вельмі блізкая да святкавання дня памяці Барыса і Глеба. Да хрышчэння валуноў, лічыць акадэмік, язычніцкія абрады ля камянёў адбываліся ў гонар Дажбога.

А. Лозка адзначаў наступнае: «Барыс (Глеб, Барысы, Барыс Палікоп) – адзін з апекуноў земляробства. "Святы Барыс снапы возіць", "На Глеба і Барыса хлеба напарыся і за раллю бярыся", "Барыс і Глеб – паспеў хлеб" (Паўлюкоўскі, 1934). На Смаленшчыне прызнаваўся "грозным святам хлябоў", называўся "Хлеб Барыс". У полі не працавалі, засцерагаліся вятроў, заканчвалі купацца (Дабравольскі, 1914).

У некаторых раёнах лічылі, што ад Барыса на працягу трох тыдняў павінна адбыцца "рабінавая ноч", якая нібы спрыяла паспяванню рабіны і ў якую без перапынку лье дождж і шугае навальніца» [21, с. 142].

І ў яго ж: «Народ вылучыў з невялічкага шэрагу кананізаваных імён на гэты дзень князёў Барыса і Глеба, якія былі забіты іх братам Святаполкам у 1015 годзе» [Тамсама, с. 155].

Тое, што ў народным календары гэтыя святыя былі звязаны з хлебаробствам, наклала на далейшыя адносіны беларусаў да такіх камянёў, цесна звязаных з Барысам і Глебам, своеасаблівы адбітак: продкі былі перакананы, што вера ў святасць такіх камлыг, нават без розніцы – язычніцкія гэта былі варыянты ці ўжо хрысціянскія – святую надзею, што

маўклівыя ахоўнікі традыцыі ніколі не дапусцяць адсутнасці ўраджаю, а земляробы будуць з добрым прыбыткам. Але нават благую справу па перасоўванні (перавозцы, пераносцы) старадаўніх валуноў на новыя месцы, ужо да культавых устаноў хрысціянскай рэлігіі продкі суадносілі не толькі з адказнай, але і з надзвычай цяжкай працай: «Каб табе хлеб надзённы каменем аддаваў!», «Каб ты з-за сваёй ляноты камяні на бліжэйшы замак цягаў!», «Каб ты тое каменне, што ў рацэ, ды на гарадскую плошчу цягаў!», «Не памрэш, калі з сотняй такіх, як сам, велізарны камень да храма нашага прывалачэш!»

З гісторыі ўвядзення і пашырэння хрысціянства на нашых землях было добра вядома, што царкоўнікі імкнуліся любым чынам выкарыстоўваць для новай рэлігіі прадметы язычніцтва (капішчы, прошчы, дрэвы, камяні і г. д.). Тут спалучалася і традыцыя, і колішнія легенды і сённяшнія адносіны, і прыстасаванне да праваслаўя. Усё гэта выпадала ўмела прыстасаваць, каб у найбольш цікаўных і недаверлівых людзей не ўзнікала нейкіх пытанняў. Напрыклад, палачане даўным-даўно зразумелі, якое вялікае значэнне маюць для іхняга горада Барысавы камяні. Недзе яшчэ ў пазамінулым стагоддзі ўзнікла ідэя дастаць адзін з такіх гістарычных камянёў. Прывалачы ў горад і паставіць яго як помнік і сімвал-абярэг перад Сафіяй Полацкай. Нічога, што камень мае язычніцкае мінулае, але ўсё роўна будзе спрыяць ідэі земляробства і хлебаробства. Шматвяковую намоленасць ніхто з камянёў не мог зняць, ды і не паўставала перад царкоўнікамі такая задача! Выбралі для здзяйснення сваёй задумы камлыгу, якая ляжала зусім непадалёку ад Полацка ля вёскі Падкасцельцы.

Цікавай адметнасцю з'яўлялася і тое, што гэты валун называлі мясцовыя сяляне не Барысавым, а Барысам-Хлебнікам, тым самым указваючы на набыццё каменем новых функцый і ўласцівасцей. Менавіта гэты камень лічыўся ў вяскоўцаў своеасаблівай часткай агракалендара. Калі пасля паводкі нарэшце спадала вада да «крытычнай адзнакі», то палачане былі ўпэўнены, што цяпер ураджай паспеў і яго выпадала пачынаць жаць, каб не зацягнуць час і не згубіць потым ураджай на карані. Яшчэ: здалёку магло паказацца, што адкрытая з вады частка каменя нагадвала сабою агромністы бохан хлеба. Гэта было і лішнім пацверджаннем таго, што ўраджай будзе выдатны ў гэтым годзе і чаму камень насіў назву «Хлебнік».

# МЕМАРЫЯЛЬНЫЯ КАМЯНІ

Не заўсёды вялікая колькасць камянёў прылічвалася да помнікаў. Нават паводле даведніка «Помнікі прыроды Беларусі» (Мінск, выдавецтва «Ураджай», 1986 год), у ім падаецца толькі дзевяць валуноў. Усяго толькі, пра іншыя нават не згадваецца. Не праяўлялі асаблівай цікавасці да самабытных сведкаў мінуўшчыны продкі. Дакладней, праяўлялі, але толькі з рэлігійнага ды яшчэ з цемрашальска-цудадзейнага пункту гледжання, астатняе заставалася па-за ўвагай. Э. Ляўкоў, у сваёй кнізе «Маўклівыя сведкі мінуўшчыны» прыводзіць 26 камянёў – помнікаў прыроды Беларусі. З гэтага спісу выразна відаць, што пераважная большасць камянёў стала помнікамі ўжо ў 1980-я гады.

Характэрна, што пералік адкрывае камень «філарэтаў», які ляжыць ля вёскі Карчова ў Баранавіцкім раёне. «Паводле народнага падання, ля гэтага каменя збіралася тайнае таварыства “філарэтаў”, з якім быў звязаны Адам Міцкевіч. Памеры: даўжыня – 4,1 м; шырыня – 1,9 м;

вышыня – 3 м, прынесены Дняпроўскім ледавіком каля 450 тысяч гадоў назад з Фінляндыі» [37, с. 169].

Філарэты і філаматы імкнуліся да асветы беларускага (літоўскага) народа, да захавання найбагацейшай духоўнай спадчыны продкаў. «Таму імі была нават распрацавана своеасаблівая «Інструкцыя», паводле якой філаматы і філарэты па выездзе ў родныя мясціны павінны былі даць падрабязнае апісанне сваёй парафіі, асвятліўшы такія пытанні: геаграфічнае становішча, велічыня тэрыторыі, рэльеф мясцовасці, дарогі, рэкі, каналы, клімат, саслоўі насельніцтва, нацыянальны склад, веравызнанне, гаспадарка, асвета, звычаі і абрады. Акрамя гэтага інструкцыя яшчэ патрабавала адказаць на шэраг пытанняў: на якой мове размаўляюць розныя слаі насельніцтва, якія сямейныя і гадавыя спраўляюцца святы і ўрачыстасці і як спраўляюцца, якія бытуюць забабоны, у што людзі апранаюцца, якое ў іх жыллё, грамадскія звычаі, сямейныя ўзаемаадносіны. У "Апісанні" падкрэслівалася, што ўсе гэтыя звесткі патрэбны для таго, каб айчынная навука абапіралася на свае факты, а не на звесткі замежных краёў, каб яна станавілася на ўласны грунт» [36, с. 11].

На пасяджэннях філарэты, як і філаматы, чыталі свае навуковыя працы, рабілі агляды айчыннай і замежнай прэсы, вялі дыскусіі па розных пытаннях навукі і грамадскага жыцця. Адной з форм работы Таварыства было правядзенне маёвак, на якія філарэты стараліся прывабіць



*Камень філарэтаў ва ўрочышчы Кут Баранавіцкага р-на*

паболей моладзі, дзеля чаго рабілі ўсё, каб гэтыя маёўкі праходзілі як мага весела і прыгожа. Да іх старанна рыхтаваліся, складалі цэлыя сцэнарыі іх правядзення, пісаліся і развучваліся спецыяльна напісаныя да іх вершы і песні, драматычныя сцэнкі. Часта маёўкі прымяркоўвалі да імянін каго-небудзь са сваіх таварышаў [37, с. 25].

Мэты маладых людзей былі не толькі культурна-асветніцкія. Яны прадугледжвалі і барацьбу за сацыяльныя пераўтварэнні ў дзяржаве, выказваліся за адмену прыгоннага права, пры гэтым спадзяваліся на сярэдні клас – шляхту.

Камень філарэтаў ацалеў. Магчыма, ён захаваўся таму, што ляжаў наводшыбе, воддаль ад дарог і будоўляў. Але не выключана, што яго выратавала людская памяць пра вялікіх землякоў. Праўда, часам сцвярджаюць, што аднойчы ад валуна адбілі вялікі кавалак, з якога зрабілі буйны жарон для млына ў мястэчку Мір.

Камень называюць не толькі філарэтавым, але і Вялікім за яго значныя памеры. Глыба нагадвае востраверхую скалу з адной стромкай сценкай. Па сваім складзе гэта граніт рапаківі. У 1972 годзе валун абвешчаны геалагічным помнікам прыроды, хоць ёсць усе падставы лічыць яго помнікам нашай гісторыі і культуры [22, с. 198–199].

У К. Цвіркі крыху па-іншаму і больш рамантычна: «Камень быў з аднаго боку як бы ўсечаны і нагадваў сабою невялікую скалу. Ляжаў ён каля самай дарогі, у падножжы ляснога ўзгорка, што даволі крута ішоў уверх. Так, на гэтым узгорку было вельмі добра наладжваць філарэтам свае сходкі. Тым больш і мясцінка ж зацішная, убаку ад вялікіх дарог, наводшыбе ад вёскі. Прастор і воля!» [37, с. 25].

К. Цвірка прыводзіць яшчэ адну самабытную легенду, звязаную з каменем філарэтаў: «На ўскрайку Гайка пры дарозе мы ўбачылі вялікі камень-валун з надпісам, што гэта – помнік прыроды. Для Марылі (Верашчака. – *А. Н., Я. Н.*) ж ён быў незабыўнай памяткай пра сустрэчы з каханым паэтам. Пасля таго як яе назаўсёды разлучылі з Адамам Міцкевічам, выгнаўшы яго за філаматцкую дзейнасць з роднай зямлі, **яна ўласнай рукой выдзеўбала на камені крыж** (вылучана намі. – *А. Н., Я. Н.*). Крыж па сваім рамантычным каханні да вялікага паэта. Ён і цяпер значыцца на камені» [Тамсама, с. 41].

Э. Ляўкоў канстатуе наступнае: «Кажуць, што ля вытокаў вялікай паэзіі заўсёды стаіць вялікае ўзрушэнне – непадзеленае каханне. Такое каханне было і ў геніяльнага Адама Міцкевіча. Стары гранітны валун з крыжам, выбітым, як лічаць, самім паэтам, – своеасаблівы помнік гэтаму вялікаму пачуццю. Камень стаіць у лесе Гаёк, недалёка ад вёскі Балценікі Воранаўскага раёна.

...Спачатку кволая блакітнавокая Марыля прывабіла Адама сваёй непасрэднасцю, начытанасцю, музычнасцю. Яны хутка пасябравалі. Пасля былі таемныя сустрэчы ў парку, доўгія гутаркі ў зацішнай альтанцы з шасці ліп, юнацкія клятвы ў вечным каханні. Адам разумеў, што ў гэтай глушы ён знайшоў свой ідэал. Пазней ён назаве тую альтанку калыскай і магілай свайго шчасця.

Марыля пераехала ў маёнтак Путкамера, што ў вёсцы Балценікі. Паводле падання, каля гранітнага валуна паэт не раз сустракаўся са сваёй, ужо замужняй, каханай. Але аднойчы Марыля не прыйшла на прызначанае спатканне. Паэт зразумеў, што страціў яе назаўсёды. Кажуць, што тады ён і пакінуў на камені крыж як знак канчатковай разлукі. У сваім жыцці паэт не быў абдзелены жаночай увагай, але Марыля так і засталася яго адзіным каханнем. Больш моцнага пачуцця ён ужо не зведаў.

...Той валун, што ў лесе Гаёк, называюць Каменем кахання. Два разы на год моладзь высцілае сцежку да яго кветкамі. Ледавіковыя глыбы з такой жа назвай вядомыя і ў іншых куточках Беларусі. Таму цяжка сказаць, што з'явілася прычынай такога найменне каменя: ці лёс Адама і Марылі, ці што-небудзь іншае. У 1986 годзе валун быў абвешчаны помнікам гісторыі. Прыхільнікі таленту вялікага паэта імкнуцца хоць раз у жыцці наведаць гэты ўтульны куточак, пастаяць каля валуна, які шмат пабачыў на сваім вяку» [22, с. 184].



*Камень Адама і Марылі ва ўрочышчы Гаёк Воранаўскага р-на*

Быў і яшчэ адзін камень – сведка сустрэч Адама і Марылі. Пра гэта ёсць адна з запісак, якую паэт захоўваў усё жыццё як памяць аб вялікім пачуцці: «Апоўначы, у чацвер, там, дзе мяне абадрала галінка, а калі б што-небудзь здарылася надта важнае, тады каля межавога каменя ў пятніцу, а пятай гадзіне. Дзе ляжыць той межавы туганавіцкі камень? Ці захаваўся ён? Відаць, ніхто не спрабаваў адшукаць гэта патаемнае месца і валун – арыенцір закаханых» [Тамсама, с. 194–196].

К. Цвірка падае такія звесткі: «Другая дошка, здаецца, навейшая, прымацаваная трохі далей ад дзвярэй, была для мяне проста добрым сюрпрызам: яна ж ушаноўвала тую самую Мінскую гімназію, якую я спярша збіраўся шукаць немаведама дзе.

Выбітыя на дошцы словы паведамлялі пра тое, што ў гэтым будынку ў 1803 годзе была адкрыта Мінская гімназія. Потым ішоў пералік тых славутых людзей, якія ў ёй вучыліся. Пачынаўся пералік якраз з Тамаша Зана. За ім значыліся такія знакамітыя імёны, як Яўстах Тышкевіч (беларускі вучоны-краязнавец, адзін з заснавальнікаў беларускай археалогіі; быў ганаровым членам Пецярбургскай і Стакгольмскай акадэмій навук, лонданскага археалагічнага інстытута), Станіслаў Манюшка, Уладзімір Спасовіч (публіцыст, літаратуразнавец і грамадскі дзеяч; быў прафесарам крымінальнага права Пецярбургскага ўніверсітэта; прататып адваката Фецюкевіча ў рамана Ф. Дастаеўскага "Браты Карамазавы"), Бенядзікт Дыбоўскі (заолаг, прыродазнавец, публіцыст; быў прафесарам Варшаўскага ўніверсітэта, удзельнік паўстання 1863–1864 гадоў; вывучаў гісторыю і геаграфію Беларусі), Аляксандр Ельскі (беларускі пісьменнік і краязнавец. Быў членам Акадэміі ведаў у Кракаве, аўтар каля 10 тысяч артыкулаў пра гарады і вёскі Беларусі ў "Геаграфічным слоўніку каралеўства Польскага і іншых краёў славянскіх"), Антон Трусаў (беларускі рэвалюцыянер-дэмакрат, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гадоў на Беларусі, быў адным з арганізатарам рускай секцыі І Інтэрнацыянала, перапісваўся з К. Марксам), Іван Гольц-Мілер (рускі паэт-рэвалюцыянер, аўтар папулярнай рэвалюцыйнай песні "Слухай"), Янка Лучына (беларускі паэт-дэмакрат), Мікалай Мінскі (рускі паэт), Эдуард Пякарскі (вучоны і рэвалюцыянер, аўтар "Слоўніка якуцкай мовы"; быў ганаровым акадэмікам АН СССР), Ядвігін Ш. (беларускі пісьменнік) і, як адзначалася на дошцы, "іншыя вядомыя дзеячы літаратуры, мастацтва, навукі, вызваленчага руху супраць царызму"» [37, с. 95]

«Перада мною сярод кустоўя былі два роўныя, аднолькавай прамавугольнай формы гранітныя помнікі з уманціраванымі жалезнымі рэйкамі, пры дапамозе якіх, відаць, мацавалася верняя частка помнікаў.

На першым з іх было выбіта: “С. П. Брыгіда Зан”, на другім, справа – “С. П. Тамаш Зан” (усё на польскай мове). А перад абодвума помнікамі, якраз пасярэдзіне, ляжаў вялікі пляскаты валун з вычасанай на ім і добра адшліфаванай плітой. На гэтай пліце быў акуратна высечаны чыімсьці вельмі старанным долатам надпіс: “Мілы Богу і людзям Тамаш Зан, памяць якога ў блаславенстве... Жыў шэсцьдзесят гадоў. Памёр 7 ліпеня 1855 г. у Кахачыне”. А трошкі ніжэй “Брыгіда Зан з Свентажэцкіх пахавана побач з сваім мужам 23 жніўня 1900 г. ва ўзросце 81 года”.

І яшчэ адзін “імянны” валун: “Камень Багушэвіча, знаходзіцца ля вёскі Кушляны, побач з лесам, на схіле Лысай гары Смаргонскага раёна, ляжыць падоўжаная гранітная глыба вялікіх памераў. Мае гістарычнае значэнне, звязаны з жыццём і дзейнасцю беларускага паэта-дэмакрата Ф. К. Багушэвіча. Складзены трахітаідным гранітам, даўжыня – 2,6 м; шырыня – 1,3 м; вышыня – 1,5 м” (174). На надземнай частцы валуна высечана прастакутная пляцоўка, а на ёй немудрагелістыя словы: “Памяці Мацея Бурачка. 1900 г.” Надпіс зроблены лацінскімі літарамі. У самога К. Цвіркі тэкст з мемарыяльнага каменя падаецца крыху паіншаму: “Агледзеўшы Багушэвічаву сядзібу, мы пакіравалі да мемарыяльнага каменя на Лысай гары, да якога любіў хадзіць і адпачываць сам паэт і на якім у год смерці Францішка Багушэвіча яго сябры выбілі словы: “Памяці Мацея Бурачка. 1900 г.» [Тамсама, с. 254].

І зусім іншы прыклад прыводзіць К. Цвірка, прыгадваючы, як яму давялося некалі наведаць месца нараджэння славутага ўкраінскага Кабзара Тараса Рыгоравіча Шаўчэнкі. “На месцы роднай хаты я ўбачыў толькі памятны камень з прымацаванай таблiцай і надпісам на ёй, а там, дзе стаяла хата Шаўчэнкаў у Кірылаўцы, – абеліск і камень з магілы бацькі.

Вярнуўшыся ў Чаркасы... я выказаў аднаму з арганізатараў урачыстасці паэту Івану Драчу сваё здзіўленне: чаму гэта ўкраінцы не адбудавалі дасюль ні роднай хаты Тараса Рыгоравіча Шаўчэнкі ў Марынцы, ні хаты ў Кірылаўцы, з якой пайшоў ён “у людзі”.

– А нашто нам імітацыя, – адказаў на гэта Іван Драч. – Трэба захоўваць і зберагаць тое, што засталося, першароднае...» [Тамсама, с. 258].

Папулярны сярод сялян мужыцкі паэт правёў у Кушлянах апошнія гады свайго жыцця. Калі стала дрэнна са здароўем, ён пакінуў службу і, пераехаўшы ў вёску, прыдбаў сабе маёнтак. Да гэтага часу захавалася сядзіба Багушэвіча, дрэвы, пасаджаныя яго рукамі, старая капліца. Яшчэ жывуць дзеці і ўнукі тых, хто ведаў паэта, чуў яго вершы. Адметнай рэліквіяй гэтых мясцін з'яўляецца камень на Лысай гары.

Пасяліўшыся ў Кушлянах, Багушэвіч шчыра палюбіў гэты куточак беларускай зямлі. Тады на бліжэйшым пагорку ўзвышаліся тры сасны, побач ляжаў і ўтравелы валун. Сюды, да каменя, у добрае надвор'е запрашаў ён сваіх дарагіх сяброў і гасцей, тут сядзелі і гаманілі ля вогнішча, пілі духмяную гарбату, завараную з лугавых кветак.

Толькі часцей за ўсё Багушэвіч любіў прыходзіць на гэтае месца адзін. Расказваюць, што менавіта тут асабліва лёгка нараджаліся ў ягонай галаве патрэбныя словы і радкі новых вершаў. Напісанае ён старанна хаваў пад камень, а пасля, разоў колькі азірнуўшыся, вяртаўся дадому акружной сцяжынкай, нібыта проста з пагулянкі. Паэт на ўсё жыццё запомніў тыя часы, калі быў пад пільным наглядам царскіх жандараў і паліцыянтаў, таму лішні раз і стараўся асцерагацца.

Мясцовае жыхары распавядаюць і яшчэ адну гісторыю, звязаную з гэтым каменем і паэтам. Вядома, што ў Першую сусветную вайну ў сядзібе паэта размясціўся нямецкі шпіталь. Аднойчы немцы выпадкова знайшлі пад валуном вялікі скрутак спісанай паперы. Акупанты спачатку цікаўна разглядалі знаходку, а потым проста выкінулі яе, бо яна для іх не ўяўляла ніякай каштоўнасці. Вецер разнёс тыя лісты па навакольным кустоўі. На ўласныя вочы бачылі ўсё гэта вясковыя пастухі, якія паблізу пасвілі жывёлу. Нехта быццам бы і ў руках патрымаў паасобныя лісты, але захаваць іх для нашчадкаў проста не здагадаўся.

Памёр Багушэвіч у Кушлянах, а сябры пахавалі ягонае цела на могілках у Жупранах. Крыху пазней прыхільнікі таленту паэта ператварылі ў самабытны помнік ледавіковы камень з сціплым надпісам – прысвячэннем Мацею Бурачку. З таго самага часу гэтае месца пастаянна вабіць да сябе сучасных паэтаў і пісьменнікаў.

Такія камяні-помнікі сведчылі пра многія падзеі, згадвалі канкрэтных гістарычных асоб. У 3-м томе «Жывапіснай Расіі» чытаем наступнае: «Па выпадку палявання караля Аўгуста III у 1752 годзе ўсталяваны быў на правым беразе р. Нараўкі, непадалёку ад паляўнічай хацінкі ў сяле Белавежа, помнік з белага пясчаніку ў выглядзе трохвугольнай пірамiды ў 6 аршынаў вышынёю з надпісамі, якія сведчылі, што кароль разам з каралевай і двума сынамі забілі 42 зубры, 13 ласёў і 2 серны. Надпіс дадае, што самым вялікім быў зубр, які пацягнуў ажно на 36 пудоў 10 фунтаў» [25, с. 66].

Сустракаюцца камяні – сапраўдныя мемарыяльныя помнікі. Так, у англійскім парку князя М. Агінскага (Залессе Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці) захаваўся вялізны камень-валун. Паводле народнага падання, на гэтым самым месцы ў 1794 годзе з прамовай

да паўстанцаў звярнуўся іх кіраўнік Тадэвуш Касцюшка. Пра гэтую ж падзею сведчыць і надпіс на валуне.

У Туганавічах (Навагрудскі раён) у старым парку ляжыць вялікі камень, падобны да трыбуны. Яшчэ і цяпер мясцовыя жыхары называюць яго Каменем філаматаў. Тут часта збіраліся члены вызваленчага таварыства, сярод якіх быў і А. Міцкевіч. Яны пакляліся прысвяціць жыццё радзіме, свайму народу.

Сустракаюцца на Беларусі і іншыя мемарыяльныя камяні. З'яўляюцца яны аб'ектамі ўшанавання ці пакланення, захавання памяці аб выбітных асобах з розных часоў. Некага ўвекавечылі раней, а некага, адпаведна, пазней. І не заўсёды пра гэта парупіліся дзяржаўныя структуры, даводзілася чыноўнікаў «расхістваць» мясцовым краязнаўцам і ўсемагчымым грамадскім фондам і арганізацыям. Прынцып, што «так добра, не абавязкова нешта змяняць» трывала асеў у людскіх галовах.

Ці не першым у гэтым пераліку будзе мемарыяльны валун, які ў 80-я гады мінулага стагоддзя быў устаноўлены ў вёсцы Свольна Віцебскай вобласці ў гонар нараджэння ў гэтым населеным пункце сусветна вядомага географа Івана Чэрскага (1845–1892). За актыўны ўдзел



*Мемарыяльны камень пры дарозе Мінск – Вільнюс*

у паўстанні 1863 года маладога чалавека спачатку аддалі ў салдаты, а потым яго выслалі на працяглы перыяд жыцця ў Сібір. Менавіта там і раскрыўся талент нашага земляка напоўніцу. Ён даследаваў маладаступныя мясціны, адшукваў у недрах зямлі карысныя выкапні, ствараў падрабязныя карты, вёў дзённікі. Ягоным імем названы горныя хрыбты ў Якуціі і Магаданскай вобласці, у Забайкаллі. А вось на Беларусі географ быў амаль забыты. Толькі дзякуючы намаганням віцебскіх краязнаўцаў і Геаграфічнага таварыства БССР і быў устаноўлены буйны камень з адпаведным надпісам.

Вёска Акопы на Лагойшчыне ў свядомасці беларусаў трывала асацыюецца з светлай памяццю славутага класіка нашай літаратуры Янкі Купалы (1882–1942). Устаноўлена, што менавіта тут Іванам Дамінікавічам была напісана вялікая колькасць вершаў, а таксама створана бессмяротная «Паўлінка». Краязнаўцы пераконваюць, што той валун ніадкуль не прывозілі і спецыяльна яго не ўстанаўлівалі, а прынесены камень сюды самой прыродай. Іншая справа, што паэт вельмі любіў прыходзіць да здаравеннай камлыгі, разважаць пра нешта сваё, толькі яму вядомае. Магчыма, што тут узнікалі непаўторныя радкі самабытных твораў, якія спачатку шмат разоў «пракручваліся» ў галаве і толькі ўжо потым пераносіліся на паперу. Бачылі за такімі прагулянкамі Купалу мясцовыя жыхары, назіралі за ім, але блізка не падыходзілі, праяўляючы вясковую стрыманасць і далікатнасць.

Прыгадаем і тое, што бессмяротныя Купалавы радкі назаўсёды ўшанаваны на камені ў вёсцы Вязынка, а Коласавы – на роднай яму Стаўбцоўшчыне.

На Маладзечаншчыне, каля вёскі Ракуцёўшчына, спецыяльна былі пастаўлены два валуны, на адным з іх старанна ўмацавана пліта, надпіс на якой сведчыць, што ў далёкім ужо для нас 1911 годзе (улетку) тут жыў малады Максім Багдановіч (1891–1917). Прыехаўшы з глыбіні Расіі, паэт шукаў любую прычыну, каб глыбей спазнаць жыццё беларускага народа, найперш, сялянства. Яму былі блізкія беларуская міфалогія і фальклор, іх ён не толькі запісваў, запамінаў, пераймаў, але і выкарыстоўваў потым у сваіх шэдэўральных творах.

Абапал дарогі Бабруйск – Магілёў, на ўскрайку славутага Буйніцкага поля ляжыць мемарыяльны валун ружовага колеру, на якім выбіта імя і прозвішча папулярнага савецкага паэта і пісьменніка Канстанціна Сіманава. Выконваючы апошнюю волю бацькі, сын творцы развеяў ягоны прах на полі, якое шчодра было паліта гарачай крывёю абаронцаў на самым пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Знаўцы жыцця і творчасці

пісьменніка пераконваюць, што тут у тыя страшныя часы і сам ваенны карэспандэнт ледзьве ацалеў, што тут, гледзячы на дзясяткі спаленых і пашкоджаных фашысцкіх танкаў, ён зразумеў: ні за што не перамогуць гітлераўцы ў гэтай вайне, што іхняе наступленне – часовае, што ўсё павернецца ў зусім адваротным парадку.

Жонка паэта Ларыса Аляксееўна жадала, каб тут усклалі і мемарыяльны камень, але доўга не магла адшукаць такі на беларускай зямлі. У Музеі валуноў, які тады толькі фарміраваўся, жанчына ўбачыла буйны ружовага колеру гранітны камень – такім яна і ўяўляла будучы знак. Беларускія вайскоўцы замест узятай камлыгі прывезлі навукоўцам узамен ажно два вялізныя ледавіковыя валуны.

На магіле беларускага літаратара, навукоўца і праваабаронцы Алеся Міхайлавіча Адамовіча таксама ляжыць вялізны валун, які нібыта сімвалізуе той зямны цяжар, які, пастаянна супраціўляючыся і адбіваючыся ад нападак непрыяцеляў, а то і адкрытых ворагаў, валок на сабе гэты чалавек. І надпіс на валуне выразны і просты – «Алесь Адамовіч».

# КАМЕННЫЯ БАБЫ

У свой час на тэрыторыі Беларусі нават знаходзілі каменных баб-ідалаў. Вось што пра гэта пісаў М. Мялешка: «На Беларусі ёсць некалькі каменных баб. Каменная баба маецца ў Віцебскім дзяржаўным музеі, даволі груба апрацаваная. Твар яе невыразны. Рукі зложаны на жываце.

На руках вызначаюцца бранзалеты. Ногі бясформенныя. З плеч на галаву падымаецца нейкае ўбранне. Велічынёй у рост невялікага чалавека. Каменная баба была на Бабруйшчыне ў м-ку Любонічы, яна зараз перавезена ў Беларускі дзяржаўны музей, другая каменная баба на Бабруйшчыне знаходзіцца недалёка ад Дняпра па дарозе з Рэчыцы ў Бабруйск. Гэтая баба мае чатырохкантовую форму.

Каменная баба маецца і ў Мінскім дзяржаўным музеі, прывезеная з Аршаншчыны, з маёнтка Смаляны, куды яна была перавезена з маёнтка Дзядзілава. Ф. Пакроўскі кажа, што каменная баба знаходзіцца ў в. Мяжэвічай на Слонімшчыне, але апісання не дае. Дзве каменныя бабы знаходзяцца ў Гомельскім парку, быццам, паводле здагадак, пры-

везеныя некалі кн. Паскевічам з поўдня і пастаўленыя ў парку каля свайго палаца. Напэўна, шмат падобных помнікаў яшчэ не знойдзена. Шмат іх ляжыць на дне азёраў і рэк, куды іх кінулі пры ўвядзенні хрысціянства [25, с. 53].

Каменныя бабы маглі быць «мясцовага» паходжання – стоды, прысвечаныя жаночым боствам язычніцкай веры, а яшчэ гэта маглі быць і прывезеныя аднекуль здалёку (са скіфскіх ці татарскіх стэпаў) няўдалымі заваёўнікамі, якія збіраліся застацца тут назаўсёды. Так і атрымалася: засталіся, толькі большасць адразу патрапіла ў курганы-магілы, а тыя, хто ацалеў, быў асіміляваны сярод мясцовага насельніцтва і стаў верай і праўдай служыць беларускаму народу.

На востраве возера Богіна б. Дзісенскага пав. стаяла чалавекападобная фігура з шэрага граніту паўчалавечага росту, са складзенымі на грудзях рукамі, з адбітай галавой. Фігуру гэту называлі Стод. У Алізаравічах б. Рэчыцкага павета Васількоўскага с/с на могілках у капліцы таксама ёсць каменная баба.

Пытанне аб каменных бабах наогул вельмі складанае. У літаратуры яму было адведзена вельмі многа ўвагі, але прызначэнне каменных баб застаецца цёмным. Цяпер жа, калі гэтыя помнікі старасветчыны зрушаны са сваіх месц, справа яшчэ больш ускладнілася. Няма ніякіх звестак, дзе знаходзіліся ў Беларусі каменныя бабы: ці яны былі пастаўлены на могілках, ці на капішчах, ці дзе ў іншым месцы. Магчыма таксама, што некаторыя з іх прывезены ў Беларусь з поўдня. Гэтае пытанне часткова высветліцца пасля вывучэння пароды каменя, з якога зроблены гэтыя статуі. Невядома таксама, на якіх аблічча мужчыны і на якіх – жанчыны. Але незалежна ад гэтага можна з упэўненасцю сказаць, што ў сваіх вераваннях беларус ведаў каменныя чалавекападобныя статуі.

М. Весялоўскі думае, што «каменныя бабы належалі турэцкаму народу ў перыяд яго шаманскага веравання, што яны ўяўлялі ворага, які загінуў ад рукі героя, на магіле якога і ставілі каменную статую» [Тамсама, с. 17].

З археалагічных і гістарычных крыніц многа вядома пра каменныя помнікі, якія яшчэ называюць – «тыя, што гавораць, і тыя, што спяваюць».

Амаль чатыры тысячы гадоў таму назад егіпецкі фараон Аменха III [19, с. 7] загадаў высекчы з каменя дзве вялізныя статуі ў гонар свайго бацькі. Каля дзвюх тысяч гадоў яны маўкліва прастаялі на сваім месцы. Але пасля землятрусу адна з статуй раскалолася, і ў яе з'явіўся ўласны голас...

Раніцай, калі ўзыходзіла сонца, статуя працяжна і жалобна стагнала, быццам плакалася пра свой лёс. Людзі, якія хацелі ў гэтым пераканацца, пасля пачутага і ўбачанага высякалі на статуі словы, якія ўсё гэта пацвярджалі.

Цудадзейная статуя гучала не адно стагоддзе. Аднойчы паслухаць яе прыехаў сам рымскі імператар Септымій Север. Але статуя маўчала. Між іншым гэтак бывала, і не раз, і раней. Септымій вырашыў, што багі раззлаваліся на тое, што статуя пашкоджана, і загадаў аднавіць яе. Калі ўсё было зроблена, каменная глыба замаўчала назаўсёды.

Што ж было прычынай цудоўнага гучання? Раскол агаліў у камені поры. Раніцай яны звужаліся ад холаду, і паветра, якое праганялася праз іх ветрам, нараджала своеасаблівыя гукі.

У нашы дні такія «цуды» ствараюць самі людзі. У Алматы ёсць помнік легендарнаму Кар-куту. Збудаванне нагадвае смычковы інструмент кабыз, вельмі падобны да скрыпкі. У яго ўманціраваны трубы, якія ў вецер пачынаюць спяваць. Ідэю помніка падказалі «гукавыя маякі», якія ў даўнія часы ставіліся ў казахскіх аулах (трубы з адтулінамі ўсярэдзіне. Пры моцным ветры яны свісталі і тым самым дапамагалі пастухам і паляўнічым арыентавацца ў стэпе).

Пра гэткія самыя дзівосы згадваў у сваіх творах У. Караткевіч (апавяданне «Сіняя-сіняя»).

«Ясюкевіч даўно ўжо, з вялікай трывогай, чуў недзе далёка, за змрочным чырвоным гарызонтам, а потым бліжэй і бліжэй нейкія дзіўныя гукі, спявучыя, перарывістыя, нібы залатое пілавінне падала на срэбны шчыт. Нябачны хор маленькіх, з пясчынку, чалавечкаў цягнуў сваё «а-а-а-а». Спачатку весела, потым сумна, да болю, потым нібы з адчаем і галашэннем.

Што гэта было? Звінелі званочкі на дняпроўскім поплаве? Спявалі сірэны між падводных губак ля камяністых, амытых сіняй вадою скал?

І раптам голас пяскоў нібы нехта адсек, і знемаганне разлілося над усімі, а жах распасцёр свае крылы, таму што далягляд ужо зацягнуўся чырвона-чорнай смугой.

Закурылася верхавіна дзюны. А потым і другія, ніжэйшыя, пачалі струменіць у небе дымныя языкі. Шэрыя, яны паступова рабіліся бурымі, а потым чорнымі, цягнуліся вышэй і вышэй, да чырвонага, нібы к заходу, шара ў вышыні.

На ўсім абшары пяскоў варушыўся чорны тысячалапы павук, выпускаючы ўгору дрыготкія шчупальцы, каб спаймаць імі сонца. Цякучыя, зменлівыя, агідна жывыя, яны паўзлі і паўзлі з вяршынь, згіналіся, варушыліся, паўзлі вышэй і вось ужо амаль спляліся ля сонца, а потым рыўком спаймалі яго» [12, с. 280].

Даследчыкі ў галіне розных гуманітарных навук вельмі часта адзначаюць, што вялізныя валуны, якія ў народзе звязаны з рэлігійнымі і гістарычнымі падзеямі ці персанажамі, захоўваюць сваю «святасць» па нашы

дні. Э. Ляўкоў падкрэслівае, што асабліва вылучаюцца ў гэтым плане Янавы камяні. Само вызначэнне ўказвае на цесную сувязь Купалля і наступнага дня – свята Яна (Янавага) дня. Мінае сярэдзіна купальскай ночы, і ўсе прысутныя на святкаванні стараліся пакупацца ў вадаёме, ля якога гарэў свяшчэнны агонь. Такім чынам паказвалі, што хрышчэнне на беларускіх землях пайшло з вады, і пры гэтым у абавязковым парадку гучала імя Яна Хрысціцеля, адсюль і традыцыйна пашыраная назва свята – Янава (Іванава) ноч (або дзень).

Звяртаецца абавязковая ўвага на тое, што ў старажытнага земляроба не існавала зручнага календара, які б дазваляў яму без асаблівых цяжкасцей даведацца пра канкрэтны дзень бягучага года. Своеасаблівай незаменнай дапамогай былі тут усемагчымыя народныя прыкметы і ўважлівыя назіранні за развіццём (ходам) з'яў прыроды. Відаць, што таямнічыя раўчучкі на Янавых камянях як прымітыўны тэадаліт паказвалі продкам выразную кропку на небасхіле ля якой садзілася сонца ўвечары перад язычніцкім Купаллем. Такія камяні даследчыкамі называюцца арыентаванымі, і вучоныя схільны лічыць, што на тэрыторыі Беларусі існуе некалькі такіх мясцін, якія ў нечым нагадваюць старажытны Стоўнхендж, але значэнне і адметнае размяшчэнне валуноў пакуль што дакладна не расшыфраваны.

У Полацкім раёне, каля вёскі Бікульнічы на беразе возера Янава (больш чым гаваркая назва, якая ў дадзеным выпадку наводзіць на пэўныя асацыяцыі), знаходзіліся валуны. Яны займалі вяршыню пакатай горкі, прыціснутай прама да берага і прыўзнятай над вадой метраў на пяць. З двух бакоў гэтае ўзвышэнне было адрэзана ад лугу даволі глыбокай забалочанай лагчынкай. Прыродныя перашкоды і зараз не дазвалялі тэхніцы «акультурыць» яе. Сярод мясцовых жыхароў мясціна атрымала даволі празаічную назву – «Камяні» або «Пад вязамі». Назва – простая, яе лёгка запомніць і перадаць іншым пакаленням, але ніякага падрабязнага тлумачэння (расшыфроўкі), чаму гэтыя камяні былі некалі сцягнутыя ў гэтае месца (ці нечага тут апынуліся) не існуе. А дарма, бо выразна відаць і рукатворны бок гэтай справы. Камяні былі выкладзены так, што ўтваралі амаль правільную літару П. Кожны яе бок меў аднолькавую даўжыню і складаў 15 метраў. Таму фігура ў нечым яшчэ нагадвала вялізны квадрат без аднаго боку (сцяны).

У вочы адразу кідаліся некаторыя адметнасці гэтай даўняй кампазіцыі. Па-першае, яе бакі былі арыентаваныя па кірунках свету так, што яна глядзела сваёй адкрытай часткай на паўночны захад. Туды ж, дакладней па азімуце каля 320 градусаў, былі накіраваныя рыскі нашай літары.

Па-другое, яна была складзеная мноствам камянёў ружовага або чырвонага колеру, адметных ад іншых камянёў. Ледавек, ссунуўшы сваю ношу на агромністай тэрыторыі Скандынавіі, практычна заўсёды пакідаў пасля прасоўвання наперад пэўную калекцыю валуноў рознага складу і афарбоўкі (часам, самай нечаканай).

Па-трэцяе, да аднаго з бакоў фігуры была далучана яшчэ адна «прыбудова» значна меншага памеру (8–10 метраў у папярочніку). Яе складалі дзве буйныя вуглаватыя глыбы, пляскатыя грані якіх былі збліжаныя, а шчыліна паміж імі глядзела туды ж – на паўночны захад.

Нарэшце, была яшчэ адна дэталь, якую не хацелася б мінаць. Калі стаць у цэнтры каменнай літары і пагглядзець у той бок, куды яна адкрытая, то якраз насупраць, на процілеглым беразе возера, ляжыць вастраверхі ледавіковы пагорак з крутымі схіламі. Гэта самая прыкметная мясціна ў акрузе, яна нават вышэйшая за самую паверхню возера метраў на 25. Пагорак называлі гарой Валатоўкай (таксама сімвалічная назва), а каля яе падножжа раскінулася вёсачка з не менш гаваркой для гэтай сітуацыі назвай – Свяціца.

Э. Ляўкоў звязвае парэшткі гэтай старажытнай каменнай забудовы з святкаваннем (штогадовым гуляннем) у ноч на Яна (Івана) Купалу. Хутчэй за ўсё, сярод гэтых камянёў і знаходзілася тагачаснае капішча таго самага боства, якое ў народзе атрымала трывалую назву – Купала. Магчыма, вастраверхі пагорак быў арыенцірам. Калі сонца садзілася на сваёй вышыні за яго, то гэты момант і з'яўляўся сігналам для назіральнікаў, якія знаходзіліся на другім беразе возера. Момантам, які вызначаў пачатак летняга сонцавароту, і адсюль ішоў адлік святкавання купальскай ночы. Справа ў тым, што святкаванне Купалля, са спаленнем свяшчэнных вогнішчаў, адбываецца сярод камянёў і ў нашыя дні. Толькі пры гарэнні выкарыстоўваюцца не старыя рэчы і ўсемагчымае ламачча, сабранае па наваколлі, а старыя аўтамабільныя пакрышкі, якія добра гараць у любое надвор'е.

Як бачым, тут многае спалучаецца з язычніцкім пакланеннем і абагаўленнем Купалля: самі камяні знаходзяцца ў нейкай (няхай сабе і не разгаданай) канструкцыі, ляжаць на беразе возера Янава, арыентацыя іхняя на паўночны захад (прычым спецыяльна зададзеная), цёпла-ружаватая гама валуноў, якая асабліва ахвотна выкарыстоўвалася мясцовымі жыхарамі ва ўсемагчымых збудаваннях і г. д.

Улічваючы тое, што ў старажытныя часы наваколле Янава возера належала да тэрыторыі Полацкага княства – магутнага і ўплывовага сярод усходняга славянства. Агульнавядома, што яшчэ ў сярэдзіне XI стагоддзя ў Полацку на месцы драўлянага храма быў узведзены ма-



*Другі камень-ахвярнік з урочышча Рэкшаты*

нументальны Сафійскі сабор – самая старажытная забудова такога плану на Беларусі. Тут сфарміраваўся ўплывовы рэлігійна-адукацыйны цэнтр, які распаўсюджваў хрысціянства па бліжэйшых землях. Ясная справа, што ў такіх умовах няхай сабе і самае папулярнае язычніцкае капішча на Янавым возеры, у цэнтры княства і па суседстве са стольным горадам, даволі хутка спыніла сваю дзейнасць. Таму смела можна зрабіць выснову, што камяні (ці каменная канструкцыя) на беразе Янава возера ўжо шмат стагоддзяў маўкліва пазіраюць на захад сонца ў канцы самага доўгага летняга дня і на вясёлыя водбліскі купальскіх вогнішчаў, якія па-ранейшаму заклікаюць да сябе мясцовую моладзь.

Безумоўна, многае з аб'ектаў язычніцкага пакланення і шанавання знікла назаўсёды: разбурылі, пазакідалі, забыліся аб першапачатковым прызначэнні, і толькі вучоныя ды апантаныя самавукі-краязнаўцы працягваюць адсочваць найцікавейшы пласт нашай духоўна-гістарычнай памяці. Дзякуючы ім на тэрыторыі Беларусі да сённяшняга дня знаходзяць цікавыя валуны, сярод якіх асаблівую ўвагу выклікаюць камяні-ахвярнікі. Так, каля вёскі Цётча Полацкага раёна з даўніх часоў застаўся такі стол. Якому нашы продкі некалі актыўна прыносілі шматлікія свяшчэнныя ахвяры і пакланяліся пры гэтым. Распавядаюць, што гэты камень аца-

леў цудам, бо ў ім ужо нават было прасвідравана пару дзірак пад порах, каб узарваць яго пад нейкія (хутчэй за ўсё!) будаўнічыя патрэбы.

Усе тутэйшыя камяні ў гэтай мясціне ляжалі нераўнамерным ланцугом, выцягнутым уздоўж берага з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход. Усе яны спецыяльна былі перацягнутыя сюды з іншых мясцінаў. Правяраецца гэта даволі проста тым, што побач адсутнічаюць драбнейшыя камяні (ці кавалкі) падобнай пароды. Пераважная частка валуноў была самай звычайнай формы і нічым асаблівым не вылучалася. З трынаццаці валуноў, прыкладна, палова адчулі на сабе ўздзеянне майстравітых чалавечых рук. Асабліва адрозніваласся пара стодаў, якіх тагачасныя мясцовыя жыхары імкнуліся нечым прыпадабніць да людзей, бо менавіта яны, камяні-ахвярнікі, павінны былі звяртаць на сябе асаблівую ўвагу. Іншая справа, што апрацоўка камянёў была вельмі грубай і трэба было прыкласці пэўныя намаганні, каб распазнаць у іх стоды, падобныя да людзей: і плечы, і рукі, і галовы, і ногі былі непрапарцыянальныя. Тут выпадала праводзіць параўнанні і з іншымі вядомымі камянямі, якія знаходзяцца не толькі ў Беларусі, але і ў замежных краінах (Германіі, Англіі, Шатландыі, Прыбалтыцы).

Даследчыкам даволі лёгка было, карыстаючыся ўжо набытымі ведамі, устанавіць, на якім з камянёў некалі рэгулярна раскладвалі і падтрымлівалі свяшчэннае вогнішча. На такі факт указвала тое, што адзін з вялікіх камянёў нібыта адлушчваўся. Гэта сведчыла пра тое, што тэмпература на ім у пэўныя перыяды была рознай. А раз так, то разам з попелам і вуголлем з валуна змяталі і верхнюю частку глыбы, якая нібы крышылася і рассыпалася ў друз пад уздзеяннем агню і высокай тэмпературы. Улічваць абавязкова выпадае і працягласць часу, якая мінула з апошняга ўжывання гэтага валуна, як падстаўкі для распальвання ахвярнага вогнішча.

Часам даводзілася чуць і пра тое, што мясцовыя камяні маглі быць прысвечаны язычніцкай багіні Цёці. Дакладней, не ўсе камяні, а толькі нейкі адзін, які быў абчасаны пад «жаночую» фігуру і ўсведамляўся прымхлівымі продкамі як суровае язычніцкае боства. Яе атаясамлівалі толькі з летам, летнімі работамі і шчодрымі ўраджаямі, якія заўсёды сведчылі пра тое, што людзі не будуць галодныя і што ім не стане пагражаць надакучлівы голад, які даволі часта «гасцяваў» у нашых продкаў. Гэта адтуль, з той скрушлівай гаворкі: «Голад не Цёця, падапрэ, то і лазовае лыка стрэскаеш!» Таму стод багіні павінен быў уяўляць сабою каменную фігуру, усталяваную на гэткую ж падстаўку. Такі стод павінен быў мець вянок са спелых густых каласоў на галаве і невялікі сноп збажыны ў руках ці пад пахаю. Часам сцвярджалі, што мела не снапок, а бохан свежаспечанага хлеба, які мясцовыя жыхары мянялі тады, калі ён засыхаў і ператвараўся ў зацвярдзелы сухар.

ТРАДЫЦЫЙНЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

# НЯБЕСНЫЯ ПАСЛАНЦЫ – МЕТЭАРЫТЫ

У старажытнасці даволі часта метэарыты (іхні палючы палёт па небе) параўноўваліся з тымі аб'ектамі, якія сёння атрымалі ўстойлівую назву – НЛА. Гэта не здзіўляе, бо сапраўдныя і вельмі даўнія малюнкі, запісы, карціны, фрэскі, скульптуры адлюстравалі сотні НЛА ці дзіўных з'яў у небе ў абсалютна розных цывілізацый, аддаленых адна ад другой дзясяткамі стагоддзяў. Ніхто б не стаў у тыя часы маляваць ці адлюстроўваць тое, чаго не існавала (не сустракалася!) на самой справе.

Сведчанні аб незвычайных аб'ектах ідуць з каменнага веку. Так, лятаючыя дыскі адлюстраваны ў пячорах Ірландыі і Францыі (у Ла-Плата і інш.), маюцца яны і ў знакамітай іспанскай пячоры Альтаміра і ў шэрагу іншых.

Выклікае шмат пытанняў і малюнак з японскай грабніцы Чын-Сан, датаванай 2000 годам да нашай эры, на якой цар вітае сем дыскаў, якія ляцяць па небе. «Падобныя да перлін» несліся па небу нябесныя целы, лятальныя машыны – так гаворыцца ў адной з хронік старажытнага Тыбета.



*Адзін з кавалкаў метэарыта Брагін*

Не падлягае сумневу ў праўдзівасці факта з'яўлення загадкавых аб'ектаў падчас кіравання егіпецкага фараона Тутмаса, які асабіста назіраў за чартаўшчынай у небе. Гэтая падзея адлюстравана ў дакуменце «Аналы». Старажытнаегіпецкія відавочцы апісвалі ўзнікненне ў небе вогненных колаў, колькасць якіх пастаянна павялічвалася, а самі агні станавіліся ўсё ярчэйшымі і ярчэйшымі. Потым адзін з кругоў упаў на зямлю, а астатнія паляцелі ў паўднёвым кірунку. У летапісах гаворыцца, што фараон быў ашаломлены ўбачаным.

Калі на тое пайшло, то і смерць самога Аляксандра Македонскага супала быццам бы са з'яўленнем у небе НЛА: «У паветры павісла густая імгла, і на неба днём узыйшла незвычайнай велічыні зорка, якая хутка рухалася да мора і суправаджалася арлом, а куміры ў храме марудна, пазвоньваючы, калыхаліся. Потым зорка зноў пайшла ў адваротны шлях ад мора і стала, пылаючы, над полагам цара. У тое ж імгненне Аляксандр і памёр.

А ў старажытнаіндыйскіх летапісах, у прыватнасці ў «Вайманіка шастра», гаворыцца аб знакамітых сёння калясніцах-віманах, якія паводзілі сябе гэтаксама, як апісваюць сучасныя відавочцы НЛА. Гэтыя калясніцы запроста маглі перасоўвацца з агромністай хуткасцю і імгненна тармазіць, кружачыся вакол уласнай восі, насіцца па самых розных траек-

торыях, імгненна знікаць, пагружацца ў ваду і нават паралізаваць людзей і жывёл.

Сведчанні аб «бярвеннях, што свецяцца», «вогненных бочках», «вогненных калёсах», «тарчах, што лятаюць» і «дроціках», якія нечакана ўзнікалі (з'яўляліся!) у небе, можна адшукаць у працах вучоных старажытнасці: Плутарха, Сенекі, Арыстоцеля, Цыцэрона, Плінія Старэйшага, Ціта Лівія і інш.

Прыйшлі іншыя часы – узніклі новыя аспекты і гіпотэзы, распрацоўкі і зацікаўленасці. Паступова дабраліся да таямніц «Мінералаў, што блукаюць» у Сонечнай сістэме. Так, ужо многія гады грамадскасць абмяркоўвае містычны факт: камяні на паверхні зямлі «рухаюцца», «гуляюць», «блукаюць», «танцуюць». Адным словам, не ляжаць на сваім законным месцы, а паводзяць сябе з выклікам, парушаючы законы фізікі, прасторы, часу. Сваімі паводзінамі яны сведчаць аб наяўнасці духаў, патойбаковых сілаў, бесаў, «каменнага» жыцця і г. д. Асабліва пастараліся раскруціць «жывыя» камяні турыстычныя фірмы, якія арганізуюць падарожжы ў Даліну Смерці ў Каліфорніі. Яно і зразумела: у раскаленай пустыні, дзе ўстаноўлены сусветны рэкорд спёкі, глядзець няма на што, акрамя як на сляды разгулаў каменных кампаній, якія засталіся на пляскатым глеістым дне перасыхаючага возера Рэйстэк-Плайя ў «даліне, што рухаюцца».

У асвятленні гэтага пытання пачнем, бадай што з самага цікавага аспекта – Тунгускага метэарыта. Усемагчымыя «нацыянальныя» метэарыты згасаюць перад ім, як цемра перад сонечным святлом. 17 чэрвеня 1908 года ў небе над маланаселеным раёнам тайгі, непадалёку ад рэчкі Падкаменная Тунгуска, прагрымеў наймагутнейшы выбух. Многія даследчыкі лічаць, што Тунгуская падзея была выклікана метэарытам, але існуе і шмат іншых думак. Выбуховая хваля была настолькі магутнай, што яе зафіксавалі нават на супрацьлеглым баку Зямлі. На сотні кіламетраў ад эпіцэнтра выбуху былі павалены дрэвы, разбітае шкло ў вокнах, збіты з ног людзі. Паводле сучасных ацэнак, магутнасць выбуху магла дасягнуць 50 мегатон – як у страшнага тэрмаядзернага выбуху.

На вялікі жаль, першыя даследчыцкія экспедыцыі накіраваліся пасля Тунгускай падзеі да меркаванага месца падзення касмічнага цела ажно праз 19 гадоў пасля выбуху. Першую экспедыцыю ўзначальваў вучоны-мінералаг Л. А. Кулік. Усяго ім было арганізавана чатыры экспедыцыі ў раён выбуху з 1927 па 1938 год. У ходзе экспедыцый удалося ўстанавіць, што, – як сцвярджаў Л. Кулік, – у 1908 годзе у атмасферу Зямлі быццам бы ўвайшоў метэарыт, які ў выніку ўзарваўся на вышыні 5–10 кіламетраў над басейнам ракі Падкаменная Тунгуска.

Месцазнаходжанне эпіцэнтра выбуху было ўстаноўлена дастаткова надзейна, прычым розныя метады вызначэння месца выбуху даюць практычна аднолькавыя вынікі. Аднак кратэр ад падзення метэарыта не быў знойдзены. Праўда, метэарыты, якія падаюць у атмасферы, пакідаюць кратэры толькі тады, калі яны дасягаюць паверхні цэлымі і непашкоджанымі, не паспяваючы затармазіць. У выпадку, калі метэарыт разбураецца, то асколкі звычайна вельмі хутка замаруджваюцца ў атмасферы і падаюць на зямлю з хуткасцю да 220 м/с ці нават цішэй. Вядома ж, кавалкі, якія падалі з такімі хуткасцямі, не пакідаюць кратэраў. Таму, калі пасля разбурэння, якое адбылося на вышыні некалькіх кіламетраў, Тунгускі метэарыт распаўся на дробныя фрагменты, то ніякага кратэра быць не павінна.

Некаторы час назад вучоныя прапанавалі версію, што бліжэйшае возера Чэка можа быць кратэрам ад падзення метэарыта. На карысць гэтага гаворыць кананічная форма дна, зусім не характэрная для натуральных азёр і характэрная для кратэрных азёраў. Аднак даследаванні расійскіх вучоных дапамаглі адназначна ўстанавіць, што возеру не менш за 8 тысяч гадоў. Нягледзячы на вялізны аб'ём работы, праробленай падчас экспедыцый, метэарытнае рэчыва ў ходзе пошукаў знойдзена не было. Экспедыцыі Л. Куліка ў раёне падзення Тунгускага метэарыта адшукалі магнітавыя і сілікатныя шарыкі, якія, мяркуючы па выніках аналізу і высокаму ўтрыманню нікеля, могуць мець незямное паходжанне, але іх сувязь з Тунгускім метэарытам сумнеўная: такія шарыкі час ад часу знаходзяць даследчыкі ў пародах іншых рэгіёнаў Зямлі.

Здзіўляе, што асколкі не былі знойдзены? Не зусім. Па-першае, з моманту падзення да першай экспедыцыі прайшоў гіганцкі перыяд – 19 гадоў. Метэарыт мог складацца з рыхлага матэрыялу з нізкай шчыльнасцю. Прыклады такіх астэроідаў добра вядомыя, Вернадскі ўвогуле высунуў гіпотэзу, што Тунгускі метэарыт – гэта вялізны камяк зліплага касмічнага пылу.

Па-другое, асноўныя намаганні экспедыцыі Л. Куліка былі накіраваны на пошукі кратэра, бо адно з першых паведамленняў утрымлівала інфармацыю аб гарачым метэарыце, які тырчаў з зямлі. Пазней было ўстаноўлена, што паведамленне было хлуслівым, і яно накіравала Л. Куліка па падманным следзе. Шукаць асколкі метэарыта выпадала ў раёне эпіцэнтра выбуху, бо пры падзенні метэарыта яго асколкі вельмі хутка трацяць хуткасць і павінны ўпасці недзе побач.

Па-трэцяе, мясцовасць у раёне эпіцэнтра балоцістая, што моцна замаруджвала пошук. Значная частка асколкаў магла вельмі лёгка пагрузіцца ў мяккую балоцістую глебу, а 19 гадоў эрозіі і ападкаў надзейна

замуравалі іх пад паверхняй. У тыя гады такая навука, як метэарытыка, па сутнасці, толькі зараджалася, і ў Л. Куліка не было ні абсталявання, даступнага зараз, ні сучаснага метаду пошукаў метэарытаў. Цікава, што адразу пасля падзення метэарыта некаторыя эвенкі, якія жылі ў тых мясцінах, паведамлялі аб знаходках жалезістых абломкаў у раёне падзення метэарыта, але экспедыцыя Л. Куліка не змагла пацвердзіць ці абвергнуць гэтыя паведамленні.

На жаль, вайна перарвала працу Л. Куліка, які загінуў у 1942 годзе. трапіўшы ў палон да немцаў. У пасляваенныя гады даследаванні аднавіліся толькі ў 1950 – пачатку 1960-х гадоў, гэта значыць праз паўстагоддзя пасля выбуху, аднак яны таксама не прынеслі вынікаў у выглядзе знойдзенага метэарытнага рэчыва.

На дадзены момант існуе больш за 100 гіпотэз пра тое, што ж на самой справе ўзарвалася ў небе над Тунгускай: ад зусім фантастычных, быццам бы там пацярпеў крушэнне іншапланетны карабель ці праводзіў свае эксперыменты Нікола Тэсла па перадачы энергіі на адлегласці, да больш адэкватных, з поўным правам на існаванне.

У наш час, як правіла, разглядаюцца дзве асноўныя гіпотэзы аб Тунгускай падзеі – каметная і метэарытная, прычым, большасць вучоных схіляецца да каметнай. Усе апавяданні і апісанні відавочцаў вельмі хораша ўпісваюцца ў абедзве гэтыя версіі: апісанне паводзін вогненнага шара вельмі блізка адпавядае таму, як павінен весці сябе, падаючы, буйны метэарыт ці камета.

Каметы складаюцца пераважна з ільду, што выдатна тлумачыць, чаму не былі знойдзены рэшткі метэарытнага рэчыва. Слабым месцам каметнай гіпотэзы з'яўляецца поўная адсутнасць якіх-небудзь паведамленняў ад астраномаў аб прыбліжэнні каметы. Цалкам магчыма, што новыя экспедыцыі на месца выбуху дазволяць, нарэшце, адшукаць рэшткі метэарытнага рэчыва і праліць святло на тое, чым на самой справе была Тунгуская падзея.

Некалькі гадоў назад прафесар Ф. Морган з Кільскага ўніверсітэта, Германія, прапанаваў новую гіпотэзу Тунгускай катастрофы 1908 года. На яго думку, гэта быў не метэарыт, а «падземны мікраапакаліпсіс», які сведчыў аб нарастанні напругі ў раёне Сібірскай тэктанічнай пліты.

«Тунгуская падзея з'яўляецца злавесным прадвеснікам глабальнай катастрофы, якая ўжо па меншай меры чатыры разы адбывалася ў гісторыі Зямлі, – гаворыць вучоны. – Апошняя такая катастрофа, якая знішчыла ледзьве не да 95 працэнтаў усіх жывёл і раслінных відаў, якія насялялі планету, здарылася 250 мільёнаў гадоў назад у канцы пермскага геалагічнага перыяду. Пачалася яна якраз-такі ў сібірскім рэгіёне.

Прычынай яе сталі выбухованебяспечныя газы, якія пад каласальным ціскам збіраюцца пад мантыяй планеты. У адзін з момантаў яны прабіваюць зямную кару і вырываюцца на паверхню...» [8, с. 8]

Паводле камп'ютарных мадэляў, падобны катастрафічны выкід здольны справакаваць землятрус магнітудай 11 балаў. Пакуль самы магутны землятрус, зарэгістраваны вучонымі, складае 9 балаў. Ён адбыўся ў Чылі ў 1960 годзе. Пры 11-бальным землятрусе зямная кара прабіваецца, і з яе нетраў вырываецца матэрыя, якая перавышае хуткасць гуку, сеючы смерць і разбурэнні вакол сябе. Вылучаная пры гэтым энергія эквівалентна магутнасці 7 мільёнаў бомбаў, скінутых на Хірасіму. У выніку гігатоны атрутнай пароды ўздымаюцца ў атмасферу і згубна змяняюць яе склад, прыводзячы да масавай гібелі жывых істот.

Тая ж мадэль паказвае: землятрус у 11 балаў павінен прывесці да прабіву зямной кары не ў адным, а ў некалькіх месцах, што значна пагоршыць сітуацыю. Дарэчы, менавіта так і адбылося ў канцы пермскага перыяду. Каласальнай сілы выбухі прывялі да масавых вывяржэнняў вулканаў, у тым ліку падводных, што, паводле падлікаў, згубіла да 98 працэнтаў усіх насельнікаў мораў і акіянаў.

Ф. Морган знайшоў на паверхні Зямлі некалькі мясцін, якія, на ягоную думку, могуць стаць «пускавымі пляцоўкамі» будучага апакаліпсіса. Гэта кальдэры Елаўстоўн у ЗША і Тоба ў Інданэзіі, а таксама нядаўна адкрыты каласальны супервулкан на дне Ціхага акіяна. Аднак найбольш верагодным месцам пачатку катастрофы даследчык лічыць Паўночную Еўразію. Даныя шматгадовых даследаванняў паказваюць, што тут ужо даўно ідуць пагубныя зрухі зямной кары. Аб гэтым сведчыць не толькі выбух 1908 года, але і ўвесь характар руху планетарных магнітных мас, якія асабліва актывізаваліся ў рэгіёне паміж Уралам і Байкалам.

На думку вучоных, падзенне метэарыта ў звычайных месцах планеты не выклікае асабліва стратных наступстваў, а вось у пералічаных вышэй небяспечных мясцінах можа аказацца нечым падобным да іскры над вялізнай парахавой бочкай. Атрымліваецца, што ў любы момант падзенне касмічнага цела здольнае справакаваць каласальную геалагічную катастрофу і, прабіўшы зямную кару, вырвацца на паверхню, што выкліча масавую гібель жывых істот на нашай планеце... [Тамсама, с. 5].

Прырода многае хавае ад чалавека, пакідаючы яго нават да нашага часу перад неразгаданымі таямніцамі, якія не так проста было разгадаць і дайсці да іх сутнасці. Але ж нездарма гавораць, што пастаянныя пошукі даюць свой плён. Так і тут, у адносінах да славутай, здавалася б, біблейскай, а таму яна не выключае ніякіх сумненняў гісторыі.

Паводле новых даследаванняў, біблейскія гарады Садом і Гамора былі сцёрты з твару зямлі метэарытным дажджом, які спапяліў усіх восем тысяч жыхароў, якія на той момант жылі на іхняй тэрыторыі. Гэтая ж падзея магла стаць прычынай падзення сценаў Іерыхона, які знаходзіўся ў 32 кіламетрах ад двух грахоўных гарадоў.

Спецыялісты мяркуюць, што падзея, апісаная ў Бібліі, адбылася ў сапраўднасці і прывяла да шматлікіх разбурэнняў у старажытным горадзе Таль-эль-Хаман, які лічыцца апісаным у Бібліі Садомам. Падзенне метэарыта спустошыла паўночны бераг ракі Іардан, зраўняўшы з зямлёю паселішчы людзей на плошчы больш за 400 тысяч квадратных кіламетраў.

Верагодней за ўсё, на думку вучоных, адзін з буйных метэарытаў узарваўся ў атмасферы на вышыні каля 2,5 кіламетраў. Гэта прывяло да ўзнікнення ўдарнай хвалі, якая рухалася з хуткасцю 1200 кіламетраў у гадзіну. Тых, хто выжыў пасля такога, не павінна было застацца. Мяркуючы па знойдзеных парэштках, археолагі мяркуюць, што чалавечыя целы ўзрываліся ў паветры.

Вядучы аўтар даследавання прафесар Джэймс Кенет з Каліфарнійскага ўніверсітэта ў Санта-Барбары адзначае, што на месцы старажытнай трагедыі былі знойдзены пераканаўчыя доказы таго, што тэмпература тут перавышала 2000 градусаў. Напрыклад, большая частка матэрыялаў, якая ўтрымлівае пясок, ператварылася ў шкло. Археолагі знайшлі таксама на месцы старажытнага горада расплаўлены метал і пясчынкі кварцу. Для таго каб утварыўся гэты рэдкі матэрыял, неабходна ўздзеянне каласальнай сілы.

Гісторыкі пераканаўча падкрэсліваюць, што ў тыя далёкія часы ўвогуле не існавала тэхналогій, якія маглі б імітаваць прыродную з'яву падобнай сілы. Даследчыкі таксама параўноўваюць гэтую падзею з падзеннем Тунгускага метэарыта ў Сібіры ў 1908 годзе. Ці з нябеснай падзеяй, якая пацягнула за сабою знікненне дыназаўраў, толькі ў меншым маштабе.

Расшыфроўка падобнай падзеі, бясспрэчна, з'яўляецца буйным навуковым адкрыццём, якое многае прасвятляе не толькі ў біблейскіх, але і ў сацыяльных канонах, прымушае па-новаму тлумачыць, з гэтага моманту, некаторыя, здавалася б, непарушныя каноны. Тым не меней гэта гісторыя развіцця чалавецтва, і яна ў любым выпадку павінна прабіцца на паверхню. У гэтым і заключаецца складаная логіка жыцця і развіцця грамадства.

Вядома шмат выпадкаў, калі сяляне, працуючы ў полі ці ў агародзе, нечакана трапляні ў глебе на паасобныя кавалкі і глыбы чорнага каме-



*Метэарыт Грэск*

ню, які рэзка адрозніваўся па знешнім выглядзе ад усіх іншых горных парод дадзенай мясцовасці. Знаходкі такога плана былі зроблены амаль паўсюдна па вялізнай тэрыторыі былога Савецкага Саюза. Дапытлівы і ўважлівы назіральнік заўважаў, што гэтыя згладжаныя ці закругленыя камяні часам былі пакрыты густою глянцавітай скарынкай. Магло падацца, што іх нехта нібыта спецыяльна для гэтага старанна абпальваў (загартоўваў у зямным ці нябесным горане).

У чым жа заключаліся асаблівасці гэтых экзатычных камянёў? Перш за ўсё звяртаюць на сябе ўвагу тыя абставіны, што іх распаўсюджанне, памеры і частата знаходжання ніякім чынам не звязаны з карэннымі крышталічнымі пародамі дадзенай мясцовасці і яе геалагічнай будовай. Метэарыты можна сустрэць у складкавых горах і на шырокіх тэрыторыях з гарызантальнымі пакладамі пластоў, на ўзвышшах і раўнінах, у балотах і пясках. Іх знаходзяць непасрэдна на паверхні зямлі ці «закапанымі» ў глебу. На Калыме адшукалі такі даволі буйны іншародны камень у рачных адкладах на глыбіні 46 метраў пры праходцы разведачнага шурфа на адшуканне золата.

Пасупова збіраліся звесткі аб экзатычных камянях – метэарытах, якія ўпалі ў мінулым на Зямлю. Фіксаваліся і такія выпадкі, калі пасля падзення метэарыта, якое назіралі людзі, удавалася адшукаць сляды гэтага госця з космасу – глыбу ці мноства невялікіх кавалкаў, утвораных пры ягоным здрабненні.

Падзенне метэарытаў выклікала ў людзей прымхлівы страх. У старажытнасці такую з'яву прымалі за «нябесныя знакі» – прадказанні войнаў, голаду, эпідэмій, іншых важных падзей. Не здзіўляе, што метэарыты абагаўлялі, ім адводзілі месца ў храмах, часам нават знаходзілі ў пахаваннях вяльможаў і кіраўнікоў краін. Агульнавядома, што яшчэ ў першым тысячагоддзі да нашай эры культ метэарытаў быў шырока распаўсюджаны на Старажытным Усходзе і ў Рымскай імперыі, нябесныя камяні адлюстраваны і на некаторых манетах таго часу. У іншых краінах ім пакланяюцца да нашых часоў. Невялікі паўкруглы метэарыт чырванавата-чорнага колеру – гэта і сёння прадмет рэлігійнага пакланення вернікаў у мусульманскім храме ў г. Мекка (Саудаўская Аравія).

Але ў нашы дні метэарыт – найцікавейшы аб'ект для даследавання. Надзвычай цікавая гісторыя пошукаў Сіхотэ-Алінскага метэарыта, які ўпаў у лютым 1947 года ў горнай тайзе на заходнім схіле хрыбта Сіхотэ-Алінь на Далёкім Усходзе. Яго падзенне суправаджалася яркай асляпляльнай светлавой успышкай, якую па яркасці можна было параўнаць з сонечным святлом, было заўважана некалькімі выпадковымі назіральнікамі, якія ў той час знаходзіліся на адлегласці ад 9 да 60 кіламетраў.

Месца падзення метэарыта ў выглядзе варонкі, чорна-бурай ад вывaрачанай зямлі і гліны, рэзка выдзялялася на фоне заснежаных выспаў і было адшукана з самалёта, які ляцеў на вышыні 700 метраў. Геолагі, якія з вялікай цяжкасцю дабраліся ў гэты раён па бездарожжы ажно на дзясяты дзень, адшукалі мноства варонак, і ў кожнай з іх – абломкі метэарыта з сінявата-шэрай скарынкай плаўлення. Агульная маса сабраных абломкаў склала больш за 30 тон, а самага буйнога з іх – 1754 кг. Спецыялісты мяркуюць, што агульная маса Сіхотэ-Алінскага метэарыта была значна большай, хутчэй за ўсё, каля 70 тон.

Аднак большасць метэарытаў застаюцца неадшуканымі ў глебе і наносах, пустынях, тайзе і палярных краінах, на паверхні ці пад покрывам мацерыковага лёду. Не выключана, што шмат метэарытаў пахавана і ў старажытных асадачных адкладах, бо яны сустракаліся з Зямлёю і ў ранейшыя геалагічныя эпохі.

Метэарыты падаюць на нашу планету паўсюль, а значыцца, іх можна адшукаць таксама на дне мораў і акіянаў. Астраномы прыйшлі да вы-

ваду, што штогод на Зямлю (уключаючы і воды Сусветнага акіяна) трапляе не менш за 1000 т метэарытнага рэчыва. І каля 70 % яго аказваецца пад вадою. Калі зыходзіць з такіх падлікаў, то за 1 млн гадоў на Зямлю выпала не менш 1 млрд тон метэарытнага рэчыва. Такім чынам, абломкі метэарытаў і касмічны пыл адыгрываюць немалую ролю ў рэчыўным складзе нашай планеты.

Паводле хімічнага і мінеральнага складу «нябесныя прышэльцы» даволі разнастайныя. Найбольш шырока распаўсюджаны каменныя метэарыты. Цёмнае дробназярністае рэчыва, з якога яны складаюцца, падобна да рэчыва глыбінных магматычных парод асноўнага і ультраасноўнага складу – перыдацытаў і дунітаў. Падабенства пацвярджаецца і пры дэтальным вывучэнні пад мікраскопам, і пры хімічным аналізе. Каменныя метэарыты ўтвораны з алівіну, піраксену, плагіяклазу, храміту і некаторых іншых мінералаў і, такім чынам, паводле знешняга выгляду і мінеральнага складу іх цяжка адрозніць ад зямной асноўнай ці ультраасноўнай пароды.

Але маюцца і выразныя адрозненні – па будове. Метэарытам уласціва своеасаблівая хандрытавая структура. Пад мікраскопам выразна бачны цесна спрэсаваныя хондры (ад грэчаскага «хондрас» – «зерне, крупінка»), кожная з якіх мае дыяметр у некалькі міліметраў і ўяўляе сабою акруглы мінеральны агрэгат з цесна зрослых ігольчатых ці прызматычных крышталяў алівіну ці піраксену (ці абодвух мінералаў разам). Хондры злучаны дробнымі крышталікамі сілікатаў і зярняткамі рудных мінералаў.

Нярэдка сцвярджалася, што што на розных кантынентах дагістарычны чалавек, а часткова і сучасны, збіраў жалезныя метэарыты для вырабу прылад працы і зброі. У краінах Старога Свету – Еўропе, Азіі, на поўначы Афрыкі – з іх найстаражытнымі культурнымі цэнтрамі людзі вельмі рана пачалі выкарыстоўваць вялікія жалезныя метэарыты як прыдатную сыравіну жалеза, што і прывяло да рэзкай перавагі каменных метэарытаў у гэтых раёнах Зямлі.

Пра тое, што некаторыя плямёны і народы не праяўлялі цікавасці да жалезных метэарытаў, сведчаць знаходкі буйных метэарытаў Жанчына і Сабака ў Грэнландыі, пра якіх мясцовыя эскімосы ведалі вельмі даўно, але, тым не меней, не чапалі іх. І толькі амерыканскаму палярнаму даследчыку Р. Піры ў 1897 годзе з найвялікшымі цяжкасцямі ўдалося даставіць іх у Нью-Ёрк, дзе сёння яны выстаўлены на прагляд у планетарыі Амерыканскага музея натуральнай гісторыі.

Акрамя каменных і жалезных метэарытаў, вылучаецца яшчэ параўнаўча невялікая група жалезакаменных метэарытаў. Яны складаюцца

прыкладна з аднолькавай колькасці жалеза і каменных рэчываў. Адзін з найбольш вядомых жалезакаменных метэарытаў – Паласава жалеза (названы гэтак па прозвішчы рускага акадэміка П. С. Паласа, які даставіў гэты метэарыт з Сібіры ў Маскву ў 1772 годзе. – *А. Н., Я. Н.*). Будова Паласавага жалеза вельмі своеасаблівая: гэта «жалезная губка» з пустэчамі, запоўненымі алівінам.

Пасля таго як у 1969 годзе было даказана, што ільды Антарктыды – «кладоўка» метэарытаў, што ўпалі ў апошнія сотні тысяч гадоў, рэзка ўзрасла колькасць іхніх знаходак. Калі да 1970 года на ўсім зямным шары было адшукана 2300 «прышэльцаў з космасу», то ў 1969–1980 гадах толькі ў адной Антарктыдзе знайшлі больш за 5000 узораў, якія ўяўляюць сабою паасобныя часткі 300–400 метэарытаў.

Ужо гаварылася, што каменныя метэарыты паводле мінеральнага складу блізкія да такіх жа магматычных парод, як перыдатыты і дуніты. Да нядаўняга часу істотным адрозненнем паміж імі лічылася адсутнасць у каменных метэарытах вады. Але ў метэарыце Старое Барыскіна (метэарыты прынята называць па населеных пунктах, дзе яны былі адшуканы) Л. Г. Кваша знайшоў водаўтрымлівальны мінерал хларыт, а хімічны аналіз паказаў, што ўтрыманне вады ў метэарыце дасягае 8 %. Больш за тое, у некаторых метэарытах знайшлі некалькі відаў самароднага вугляроду і арганічныя злучэнні абіягеннага паходжання. Такія метэарыты вылучаны ў групу вуглістых хандрытаў. Усё гэта, мабыць, сведчыць пра тое, што, нягледзячы на агромністую тэмпературу, яе ўздзеянне, метэарыт, які падае на Зямлю, награваецца ў выніку трэння, і не ўсе ягоныя лятучыя газы і рэчывы пры гэтым выпарваюцца і згараюць, нейкая частка ўсё роўна застаецца.

Да гэтага часу сярод вучоных не існуе адзінай думкі аб паходжанні метэарытаў. Многія даследчыкі лічаць, што яны ўзніклі пры разбурэнні астэроідаў і фактычна з'яўляюцца іхнімі парэшткамі.

Недзе каля 4,5 млрд гадоў таму назад астэроіды ў ходзе распаду радыеактыўных элементаў моцна разагрэліся. Унутраныя часткі расплавіліся, знешнія ж засталіся халоднымі. Пры разагрэве ў астэроідах ішла дэфармацыя рэчыва з абасабленнем ядра, прамежкавай і знешняй абалонак рознага складу. Пасля распаду радыеактыўных элементаў пачалося ахалоджванне гэтых нябесных целаў, і праз некаторы прамежак часу іхнія нетры засталіся халоднымі.

Рухаючыся па перасечаных арбітах, сутыкаючыся і дробячыся, і час ад часу трапляючы ў калязямную прастору, астэроіды і далі пачатак метэарытам. Ахандрыты, жалезакаменныя і жалезныя метэарыты ўзніклі з унутраных частак астэроідаў, хандрыты – з прамежкавых, а вуглістыя

метэарыты – са знешняй абалонкі, якая ніколі не награвалася і таму захавала ў сабе асаблівасці першапачатковага рэчыва Сонечнай сістэмы.

У музеях часта побач з метэарытамі можна ўбачыць кавалачкі шкла акруглай, грушападобнай, кроплепадобнай і іншай формы. Светлаватае шкло пафарбавана ў зеленаваты, жоўты і карычневы колеры і знешне яно падобнае да звычайнага бутэлечнага шкла. Такія ўтварэнні называюць тэктытамі. Сам тэрмін «тэктыт», прапанаваны аўстрыйскім геолагам Ф. Зюсам, паходзіць ад грэчаскага слова «тэктас» – «аплаўлены». Звычайна тэктыты бываюць памерам з лясны арэх, а маса іхняя складае ўсяго дзясяткі грамаў, але зрэдчас сустракаюцца і велічынёй з курынае яйка і масай да паўкілаграма. Знаходзяць тэктыты на паверхні зямлі і ў рачных наносах.

Тэктыты прыцягнулі ўвагу вучоных ужо ў XVIII стагоддзі. У Чэхіі ў гэты час яны шырока выкарыстоўваліся для ўпрыгожванняў пад назвай «багемскі хрызаліт». У чэшскіх тэктытах пасля агранкі з'яўляліся густая фарба і выразны бляск. З іх рабілі жаночыя падвескі і ўсемагчымыя прыгожыя цацкі. Тэктыты прынята называць па назве мясцовасці, у якой яны знойдзены, таму чэшскія тэктыты называюць влтавінамі, ці малдавітамі – па р. Влтава (Чэхія), у басейне якой яны і сустракаюцца.

У мінулым стагоддзі вялікую цікавасць выклікалі тэктыты з вострава Тасманія, упершыню даследаваныя Ч. Дарвіным і апісанымі ў апублікаванай у 1844 годзе кнізе «Геалагічныя назіранні над вулканічнымі астравамі». Знакаміты натураліст падчас кругасветнага падарожжа на караблі «Бігль» вывучаў і мінералы, і горныя пароды. Ён нават знайшоў полыя шкляныя шары – тасманіты – у ледавіковых адкладах.

Асаблівымі формамі вылучаюцца аўстраліты, распаўсюджаныя ў цэнтральнай і паўднёвай частках Аўстраліі, яны маюць выгляд гузікаў, грыбоў, шарыкаў і фігурак, падобных да пясочнага гадзінніка. Тэктыты таксама знойдзены ў Інданэзіі на востраве Белітунг, размешчаным паміж астравамі Калімантан і Суматра, на Філіпінскіх астравах, у Індакітаі (Лаосе), Паўночнай і Паўднёвай Амерыцы.

Тым не меней, нягледзячы на шырокую геаграфію тэктытаў, на агромністай тэрыторыі СССР гэтыя своеасаблівыя шкляныя каменьчыкі не знаходзілі. Толькі ў 1970 годзе тэктыты адшукалі ў пустыннай мясцовасці паміж Мугаджарамі і Аральскім морам ля ракі Іргіз ва ўрочышчы Жаманшын. Ва ўпадзіне дыяметрам каля 10 кіламетраў сустракаюцца імпактыты – чорныя абпаленыя і перапаленыя глыбы, цёмныя шчыльныя і жаўтаватыя сітаватыя шкельцы, якія ўзніклі пры катастрафічным выбуху метэарыта. Тут жа ў вялікай колькасці адзначаюцца чорныя закручаныя ўтварэнні са слядамі кручэння і шкляныя каменьчыкі паме-

рам ад некалькіх міліметраў да 3 сантыметраў. Адныя з іх вельмі падобныя да кропелек, іншыя – да шарыкаў, вінтападобныя фігуркі і змятыя застыглыя пырскі. Гэта і ёсць тэктыты, паводле мясцовасці паходжання названыя іргізітамі.

Тэктыты ўрочышча Жаманшын выклікалі ў даследчыкаў выключную цікавасць. Упершыню на Зямлі тэктыты і імпактыты знойдзены разам у месцы падзення метэарыта. Такім чынам, урочышча Жаманшын – першае «карэннае месцанараджэнне» тэктытаў.

Самі вучоныя прапанавалі шмат гіпотэз адносна ўзнікнення тэктытаў. Ч. Дарвін меркаваў, што тэктыты ўяўляюць сабою вулканічныя бомбы, і як вынік – з'яўленне іх звязана з дзейнасцю вулканаў. Пазней праяснілася, што тэктыты Тасманіі і многіх іншых раёнаў знаходзяцца ў мясцовасцях, дзе няма ніякіх вулканаў, таму і вулканічная гіпотэза сама па сабе адпала. Да таго ж тэктыты маюць зусім іншы хімічны склад, чым лавы: у іх, у адрозненне ад зямных горных парод, вельмі шмат крэменязёму і мала гліназёму. Вельмі мала знаходзіцца і вады – у сярэднім у 10 разоў меней, чым у вулканічным шкле.

Выказваліся нават меркаванні, што влтавіны не што іншае, як прадукты старадаўняй шкляной вытворчасці ў Чэхіі. Але ў Тасманіі, Аўстраліі і некаторых іншых раёнах распаўсюджання тэктытаў яшчэ некалькі стагоддзяў таму не ўмелі варыць шкла, і таму шкляныя каменьчыкі нельга звязваць з дзейнасцю чалавека. А паводле хімічнага складу тэктыты адрозніваюцца і ад тэхнічнага шкла.

Існавалі гіпотэзы і аб незямным паходжанні тэктытаў. Лічылася, што ці гэта метэарыты асаблівага складу, ці часткі ядраў камет, або выкіды вулканічных вывяржэнняў на Месяцы, якія паступілі на Зямлю. Але ж падзенне метэарытаў неаднаразова адбывалася на вачах чалавека, але нідзе і ніколі ніхто не бачыў падзення тэктытаў.

У апошнія дзесяцігоддзі, калі ў розных раёнах Зямлі адшукалі дзясяткі метэарытных кратэраў, з'явіліся асновы разглядаць тэктыты як своеасаблівыя прадукты ўдарнага метамарфізму. Пры ўдары буйнога касмічнага цела аб Зямлю і яго выбуху горныя пароды і касмічнае рэчыва расплаўляліся, пырскі расплаву выкідваліся ў атмасферу. Не здзіўляе, што, напрыклад, тэктыты Лівійскай пустыні блізкія па складзе да кварцу, асноўнага мінералу пяску пустынь. Ну і потым ападалі ўсярэдзіну кратэра ці за ягоную вонкавую лінію разам з рэшткамі метэарыта. Зразумела, што ў гэтым выпадку склад тэктытаў залежыць і ад складу зямных горных парод, паводле складу да кварцу – асноўнага мінералу пяску пустынь.

Патрэбна адзначыць таксама, што вялікай павагай і ў беларусаў карысталіся «вогненныя камяні», ці метэарыты. Гісторыя вывучэння пакла-

нення гэтым «пасланцам нябёсаў» – «беларускіх прапісантаў» – мае ўжо свае даволі багатыя традыцыі. На пачатку XIX стагоддзя, у 1807 годзе, у Маскве, на адным са шматлюдных базараў было знойдзена каля двух цэнтнераў Паласава жалеза (так называлі тады метэарыты), якое ляжала сярод рознага друзу ў адной з лавак. Прафесар П. М. Чырвінскі лічыў, што гэта кавалкі метэарыта Брагін з Беларусі. Ён з'яўляецца самым буйным «вогненным каменем» з апісаных да нашага часу. Калі ён упаў – дакладна невядома. Знаходзілі асобныя кавалкі на працягу 1807–1967 гадоў. Усяго сабралі болей за 800 кг. Але ў апошнія гады вучоныя, зыходзячы з таго, што вельмі многа асобных частак сабрана і іх па-ранейшаму знаходзяць, выказваюць такую цікавую думку: над Брагінам тады прайшоў метэарытны дождж.

1858 год. Чэрвень месяц. Глухая палеская вёска Цмень Пінскага павета. Нечакана вячэрняе неба прарэзала асляпляльная маланка. Раздаўся працяглы рэзкі свіст, і на краі балота паказаўся дым. Не адразу знайшлі камень, але калі ён трапіў у рукі вучоных, то тыя вызначылі, што гэты метэарыт адносіцца да разраду рэдкіх. Пад назвай Жмень (вёску называюць і Цмень, і Жмень) яго зарэгістравалі ва ўсіх каталогах свету.

Заброддзе таксама адносіцца да каменных метэарытаў. Адзін з іх упаў 22 верасня 1893 года ў вёсцы Заброддзе Івянецкага раёна, пры гэтым прабіў дах вясковага дома і пакінуў папярочны шнар на сцяне. За яго падзеннем назірала група сялян. Як яны потым расказвалі, камень нагадваў сабою вогненны шар, палёт якога суправаджаўся моцным гулам. За час падзення камень, які меў форму снарада, не пашкодзіўся. Дзе ён знаходзіўся спачатку, ніхто не ведаў, але ў 1965 годзе яго знайшлі і перадалі ў Акадэмію навук Беларусі.

Ад «нябесных прышэльцаў» звернемся зноў да камянёў-валуноў. Некалькі дзясяткаў гадоў таму назад вучонымі Інстытута геахіміі і геафізікі АН Беларусі створаны ўнікальны музей пад адкрытым небам. Эксперыментальная база, якая займае плошчу ў 4,5 гектара, дакладна паўтарае граніцы Беларусі, капіруе яе рэльеф. Гэта нібыта велізарны макет рэспублікі, на якім мудрагеліста пракладзеныя сцяжынкі сталі рэкамі, невысокія насыпныя ўзгорачкі – узвышшамі, басейны – азёрамі. Цэнтральнае месца займаюць велізарныя камяні-валуны, прывезеныя з розных месцаў рэспублікі. На першы погляд здаецца, што яны раскіданы як папала, аднак за яўнай хаатычнасцю схавана добра прадуманая сістэма. Гэтак жа рассеяны па тэрыторыі Беларусі валуны, прынесеныя трыма ледавікамі, якія дайшлі да гэтых месцаў.

Для вывучэння ледавіковых валуноў і створана гэтая база. Яе тэрыторыя разбіта на геамарфалагічныя раёны – усяго іх каля 20. Супрацоў-

нікі Інстытута агледзелі ў розных кутках Беларусі каля 200 тысяч ледавіковых валуноў. Прыкладна дзве тысячы з іх – так званыя кіроўныя. Яны дазваляюць дакладна вызначыць месца свайго паходжання, а значыць, і маршруты руху ледавікоў. Самыя прыгожыя і незвычайныя камяні таксама былі дастаўлены ў Інстытут. Аб маштабах праведзенай работы дазваляе меркаваць хоць бы той факт, што сярод прывезеных такім чынам валуноў самыя дробныя маюць у папярочніку да метра і важаць 500–700 кілаграмаў. Вага ж найбольш буйных дасягае 16 тон.

Большасць з іх з'яўляецца своеасаблівымі «носьбітамі» непаўторных народных паданняў і легендаў. Так ужо здарылася, што падчас паступовага прасоўвання ледавікоў па нашай зямлі, яны абломваліся, крышыліся, шліфаваліся, адным словам, даволі часта ператвараліся ў самабытныя каменныя скульптуры, якія, з цягам часу, мясцовымі жыхарамі «прывязваліся» да нейкіх канкрэтных падзей, і падзеі гэтыя потым знайшлі яркае адлюстраванне ў вусна-паэтычных творах. Можна канстатаваць і наступны факт: не ўсе падзеі былі тут фантастычнымі, надуманымі. Былі і рэальныя. Таму, зайшоўшы на тэрыторыю музея-лабараторыі, знаходзішся пад нейкім дзіўным уражаннем – вакол цябе сівая мінуўшчына! Здавалася б, звычайныя камяні – вялікія і не надта, але за імі персанажы шматлікіх легендаў і казак, паданняў і былічак.

У далейшым экспазіцыю мяркуецца пашырыць новымі раздзеламі, якія раскажуць аб месцах паходжання камянёў і іх выкарыстанні чалавекам. Задуманы макет сярэднявечнага замка.

Цяпер старажытныя камяні напаўняюцца новай сімволікай. Вучоныя Інстытута плануюць паставіць уздоўж дарогі рад прыгожых валуноў, кожны з якіх будзе нагадваць аб адной са слаўных дат у гісторыі беларускага народа.

А да таго ж дакладнае веданне месцаў паходжання ледавікоў дае магчымасць вызначыць найбольш верагодныя раёны залягання падземных вод, якія, паводле прагнозаў вучоных, у недалёкім будучым стануць адным з найбольш карысных выкапняў.

Вось такія цікавыя гісторыі, апавяданні, легенды расказваюць аб звычайных камянях і каменных крыжах, што даволі часта сустракаюцца на прасторах Беларусі і на якія мы ўжо амаль не звяртаем асаблівай увагі.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Цікава, ці можна назваць гісторыю маўклівай? Увогуле, калі яна нічога не гаворыць, а толькі канстатуе? Відаць, не, бо яна ўсё роўна прабіваецца сваімі звесткамі-парасткамі, фактамі-драбніцамі, а то і буйнымі адкрыццямі да будучых часоў, да новых пакаленняў. І паводзіны любога даследчыка тут павінны быць дваістымі: з аднаго боку, яму неабходна шукаць-расшукваць цікавыя для яго факты, якія лішні раз будуць пацвярджаць ягоную гіпотэзу, тэорыю, выказаную думку, а з іншага – навучыцца чакаць. Чакаць не ў сэнсе таго, што сядзець склаўшы рукі і пры гэтым нічога ўвогуле не рабіць, а цярпліва чакаць таго моманту, калі нечакана бліснe прамень з даследаванай тэмы, расчысціць далейшы шлях, чарговую прыступку ў будучых памкненнях; пацвердзіць тое, што абраны кірунак быў правільным і няма чаго ў ім сумнявацца, а нярэдка, што і адмовіць, нібы адрэжа ранейшае, не дасць магчымасць і надалей блытацца, сумнявацца, а цвёрда расставіць усе акцэнты. Гэта чыста навуковы падыход да любой праблемы: калі перабіраецца і адмятаецца вялікая колькасць фактаў, звестак, паведамленняў, калі адшукваецца адзінае, але правільнае рашэнне, якое і ў далейшым не дасць вучонаму сысці з правільнага шляху.

А вось з «прыкладным» выкарыстаннем валуноў, камянёў у штодзённым жыцці, напрыклад, усё значна прасцей. Можна нават усё звесці да даволі простай формулы: «Ёсць патрэба, ёсць падручны, цвёрды і амаль непарушны матэрыял, вось і ўсё – наперад!» Любая праблема гэтакага плана не чакала доўгіх ваганняў-разважанняў, а ўсё выпадала рабіць даволі хутка: таму і разбіваліся, крышыліся агромністыя валуны-камлыгі на будаўнічы матэрыял, напрыклад, і адразу ж пускаліся ў справу. Асабліва не пашанцавала ў гэтым плане тым камяням, якія знаходзіліся ў непасрэднай блізкасці ад будаўнічых пляцовак. Таму і атрымалася, што шмат іх легла назаўсёды ў падмуркі жылых ці гаспадарчых памяшканняў, у дарожнае палатно. І будаўнікі выкарыстоўвалі свой прафесійны інтарэс, не цікавячыся асабліва, з якімі легендамі і паданнямі, павер'ямі і казкамі звязана ў народзе тая ці іншая камлыга. Магчыма, каб болей ведалі, то і вынік адносін быў бы зусім іншым. Але гэта такса-

ма не пераканаўчы факт, бо дзе гарантыя, што менавіта так усё і складзецца.

Чамусьці так атрымалася, што апошнім часам валуны найчасцей выкарыстоўваюцца ў якасці своеасаблівых помнікаў, мемарыяльных знакаў і г. д. Вельмі ўдала здаравенныя, а то і не вельмі, камлыгі ўпісваюцца ў гарадскія ландшафтныя групы, якія хораша гарманіруюць з высаджанымі вакол іх дрэўцамі і кустоўем, кветкамі і травою-муравою. Як бачым, тут выкарыстоўваецца ўсё прыроднае, спадручнае, за якім не трэба далёка хадзіць ці ездзіць. Выходзіць так, што замшэлы валун таксама атрымлівае новае жыццё, але ўжо ў крыху іншым плане.

Нездарма самым вялікім паводле аб'ёму раздзелам у нашай кнізе атрымаўся той раздзел, дзе гаворка вядзецца пра выкарыстанне (абыгрыванне) ролі валуноў, камянёў у творах мастацкай літаратуры. Атрымалася так, што ці не кожны з беларускіх майстроў слова абавязкова звяртаўся да сімвалічных маўклівых сведкаў мінуўшчыны. Маўклівых толькі на першы погляд, бо калі прааналізаваць тыя ці іншыя творы, звязаныя з канкрэтнымі камянямі, асабліва з тымі, якія вядуць свой сівы радавод з перыяду ранняга, а няхай сабе, што і позняга язычніцтва, дык атрымаецца даволі багаты змястоўны матэрыял, які пры ўмелым размяшчэнні, ужыванні дапамагае творцу стварыць цудоўны, а то проста шэдэўральны ўзор мастацкай літаратуры.

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. *Арлоў, У.* Вершы ў прозе / У. Арлоў. – ЛіМ. – 1988. – 27 мая.

2. *Афанасьев, А. Н.* Поэтические воззрения славян на природу. Опыт сравнительного изучения славянских преданий и верований в связи с мифическими сказаниями других родственных народов: в 3 т. / А. Н. Афанасьев. – М. : Современный писатель, 1995. – Т. 2. – 397 с.

3. Былины. – М. : Худож. лит., 1999.

4. *Броўка, П.* Збор твораў: у 7 т. – Мінск : Маст. літ., 1976. – Т. 3 : Вершы і паэмы. – 616 с.

5. *Буслаев, Ф.И.* О литературе: Исследования, статьи / сост., вступ. статья, примеч. Э. Афанасьева / Ф. И. Буслаев. – М. : Худож. лит., 1990. – 512 с.

6. *Бялевіч, А.* Сонцам заручоныя / А. Бялевіч. – Мінск : Маст. літ., 1975.

7. *Далідовіч, Г.* Гаспадар-камень / Г. Далідовіч. – Мінск : Маст. літ., 1984.

8. *Деникин, Алексей.* Загадка Тунгусского метеорита / Алексей Деникин. – Секретные материалы. – 2022. – Июнь.

9. *Дукса, М.* Камяні / М. Дукса. – ЛіМ. – 1981. – 18 снеж. – С. 12.

10. Египецкая мифология: энцикл. – М. : Эксмо, 2002.

11. *Жамойцін, А.* Азірнуўшыся – не скамянею / А. Жамойцін. – Мінск : Маст. літ., 1987.

12. *Караткевіч, У.* Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1982. – Т. 2 : Апавяданні.

13. *Караткевіч, У.* Збор твораў: у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ. 1989. – Т. 5 : Раман.

14. Кельцкая мифология: энцикл. – М. : Эксмо, 2002.

15. *Колас, Я.* Збор твораў: у 14 т. / Я. Колас. – Мінск : Маст. літ., 1972. – Т. 2 : Вершы.

16. *Колас, Я.* Збор твораў: у 14 т. / Я. Колас. – Мінск : Маст. літ., 1973. – Т. 5 : Апавяданні. Казкі.

17. *Купала, Я.* Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск : Маст. літ., 1994. – Т. 3 : Вершы.

18. *Лабынцев, Ю. А.* В глубинном Полесье / Ю. А. Лабынцев. – М. : Искусство, 1989.

19. *Лахов, М.* Загадка «Вафельного камня» / М. Лахов. – Секретные материалы. – 1922. – Июнь.

20. Легенды і паданні / склад. М. Я. Грынблат і А. І. Гурскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983.

21. *Лозка, Алесь.* Беларускі народны каляндар / Алесь Лозка. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Беларусь, 2002.

22. *Ляўкоў, Э. А.* Маўклівыя сведкі мінуўшчыны / Э. А. Ляўкоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992.

23. *Маеўская, А.* Балада пра камяні Беларусі / А. Маеўская. – Беларусь. – 1984. – № 4. – С. 15.

24. Мифология британских островов: Энциклопедия. – М. : Эксмо, 2003.

25. *Мялешка, М.* Камень у вераваннях і паданнях беларусаў / М. Мялешка // Отдельный оттиск из «Записок гуманитарных наук». – Менск, 1928.

26. *Никольский, Н.* Простонародные предметы / Н. Никольский. – Менск, 1933.

27. *Някляеў, У.* Камень-Жальнік / У. Някляеў. – Маладосць. – 1984. – № 12. – С. 74.

28. Помнікі прыроды Беларусі. – Мінск : Ураджай, 1986.

29. *Рыбаков, Б. А.* Язычество древних славян / Б. А. Рыбаков. – М. : Наука, 1981.

30. *Сержпутоўскі, А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1998.

31. *Сержпутовский, А. К.* Сказки и рассказы белорусов-полешуков / А. К. Сержпутовский. – Минск : Университецкое, 1999.

32. *Сержпутоўскі, А. К.* Казкі і апавяданні беларусаў Слуцкага павета / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэтскае, 2000.

33. *Сыс, А.* Лён / А. Сыс. – Мінск : Маст. літ., 2006.

34. *Топоров, В.* Еще раз о Велесе-Волосе в контексте «основного» мифа: тез. докл. Второй балто-славянской конф., Москва, 29 нояб. – 2 дек. 1983 г. / В. Н. Топоров. – М., 1983.

35. *Фаминцын, А.* Божества древних славян / А. Фаминцын. – СПб. : Алетейя, 1995. – (Славянские древности).

36. Філаматы і філарэты : зб. / уклад., пер. польскамоўных твораў, прадм., біяграфічныя даведкі пра аўт. і камент. К. Цвіркі. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1998. – 400 с.

37. *Цвірка, К.* Камяні тых сядзібаў / К. Цвірка. – Мінск : Беларусь, 1989.

38. Чарадзейныя казкі : у 2 ч. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; склад. К. П. Кабашнікаў, Г. А. Барташэвіч; рэд. тома В. К. Бандарчык. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – Ч. 2. – 691 с.

УЗ. Уласныя запісы, в. Чухава Пінскага раёна Брэсцкай вобласці, ад Уладзіміра Фёдаравіча Сыцэвіча, 1907 г. н. Запісана ў 1970-м годзе.

# ЗМЕСТ

Уводзіны . . . . . . 5
Каменныя традыцыі ў міфалогіі іншых народаў . . . . . . 15
Магутныя язычніцкія боствы і іхнія сувязі з камянямі . . . . . . 39
Камяні ў літаратурных творах . . . . . . 93
Папулярныя легенды і паданні . . . . . . 114
Камяні і праявы чорнай сілы . . . . . . 128
Адвечныя помнікі вернаму каханню . . . . . . 131
Камяні і Светабудова . . . . . . 135
Казачныя рысы валуноў . . . . . . 139
Чалавек, нячысцік і... камень . . . . . . 145
Валуны і народная медыцына . . . . . . 157
Могілкі... Дамавіны... Труны . . . . . . 162
Каменныя крыжы . . . . . . 166
Дзіўныя камяні-следавікі . . . . . . 176
Каменныя слупы і валуны-пісанікі . . . . . . 189
Мемарыяльныя камяні . . . . . . 203
Каменныя бабы . . . . . . 213
Нябесныя пасланцы – метэарыты . . . . . . 220
Заключэнне . . . . . . 235
Спіс выкарыстаных крыніц . . . . . . 237

Навукова-папулярнае выданне

*Традыцыйны лад жыцця*

**Ненадавец** Аляксей Міхайлавіч,
**Ненадавец** Ягор Аляксеевіч

**ЗАКАМЯНЕЛАЯ ПАМЯЦЬ**

Рэдактар *Т. В. Лапцёнак*
Мастацкі рэдактар *Д. А. Комлеў*
Тэхнічны рэдактар *М. В. Савіцкая*
Камп'ютарная вёрстка *С. М. Касцюк*

12+

Падпісана да друку 06.02.2023. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$.
Папера мелаваная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 13,95.
Ул.-выд. арк. 12,3. Тыраж 500 экз. Заказ 135.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі дом
«Беларуская навука». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/18 ад 02.08.2013.
Вул. Ф. Скарыны, 40, 220084, г. Мінск.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Транстэкс».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/37 ад 29.01.2014.
Вул. Чапаева, 5, 220034, г. Мінск.



**НЕНАДАВЕЦ Аляксей Міхайлавіч** — вядомы міфолаг, фалькларыст, краязнавец, літаратуразнавец. Доктар філалагічных навук, прафесар. Найбольш вядомыя кнігі: «Святло таямнічага вогнішча», «Каму пакланяліся продкі», «За смугою міфа», «Выявы міфалагічнага выраю», «Сілаю слова. Чорная і белая магія», «Нарысы беларускай міфалогіі», «У. Караткевіч. Прырода, фальклор і творца», «Сіла праклённага слова», «Легенды старых млыноў» і інш. Аўтар шматлікіх навуковых і навукова-папулярных артыкулаў і публікацый.



**НЕНАДАВЕЦ Ягор Аляксеевіч** — малодшы навуковы супрацоўнік аддзела нарадазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. Фалькларыст, нарадазнавец. Кірункі навуковых інтарэсаў: народныя промыслы, вусна-паэтычная творчасць беларусаў. Аўтар дзесяці навуковых артыкулаў. Суаўтар манаграфій: «Чухава. Фальклорна-этнаграфічны нарыс» (2013), «Нашы спеўныя землякі» (2017), «Спеўная вёска Чухава» (2018), «Жужнела пчолка, жужнела...», «Лавіся, рыбка, вялікая і малая» (2020), «Забілі зайца, не забілі...» (2020), «Залацістыя саломкі снапкі» (2021), «Старая бацькоўская хата» (2022), «Нарысы беларускай дэманалогіі» (2022).

ISBN 978-985-08-2968-9

9 789850 829689

А. М. Ненадавец,
Я. А. Ненадавец

Закамянелая памяць